Указанный декрет предоставил кустарям право объединяться в промысловые кооперативные товарищества или артели. Наименьшее количество членов для создания артели было равным пяти. Также устанавливалось, что количество лиц, работающих в артели по найму, не должно было превышать 20 % от всего ее состава. Не разрешалось одновременно состоять в двух артелях сразу. Артели получили права юридических лиц и в качестве таковых могли заключать договоры и принимать на себя обязательства, предъявлять иски и отвечать по ним в суде, закупать сырье и оборудование, арендовать помещение, открывать мастерские, магазины для сбыта своей продукции. В случае, если все же наемные рабочие составляли более 20 % численности работающих, кооперативы подлежали проверкам контролирующих органов. Устанавливалось, что средства артелей составят вступительные взносы, паи, авансы и вклады от своих членов, займы у лиц и учреждений, начисления на себестоимость производимых операций и государственное кредитование. Органами управления артелей становилось общее собрание (собрание уполномоченных) и правление. Район деятельности артелей и их союзов, порядок вступления и выбытия членов промысловых организаций, функции общего собрания или собрания уполномоченных, состав, порядок избрания и компетенция органов управления и контроля, система отчетности по делам организации определялись их уставами. Губернский СНХ обязывался зарегистрировать устав в месячный срок. Отказ в регистрации мог последовать, если устав противоречил установлениям советской власти [14].

Потребности восстанавливаемой экономики позволяли промысловой кооперации расширять производственную деятельность, в чем было заинтересовано и государство. Но решение этой задачи сдерживалось организационной и хозяйственной слабостью промысловой кооперации, отсутствием опыта заготовительной деятельности и устоявшейся системой сбыта произведенной кооперативами продукции. Накоплению собственных средств для расширенного воспроизводства в артелях препятствовали большие налоги на промкооперацию, иногда они были больше, чем налоги на частных лиц.

Для решения этой проблемы государство начало более активно предоставлять различные льготы промысловой кооперации. Постановлением ЦИК и СНК СССР от 7 декабря 1923 г. «О налоговых льготах для кооперативных организаций» предусматривалось снижение промыслового налога на 50 % со всех видов снабжения, если артель сбывала только свою продукцию, и на 25 % в том случае, если артель кроме своей продукции сбывала изделия некооперированных кустарей. Промысловые кооперативные товарищества с оборотом менее 20 тыс. руб. в год обязаны были оплачивать только патент, освобождаясь при этом от уравнительного сбора. Поощрялось создание артелями общей мастерской, так как члены артелей, работающие в общей мастерской и на дому, но сдающие всю продукцию в артель, освобождались от выборки патентов на личные промысловые занятия [15].

В последующем основные положения данного постановления были уточнены и детализированы. Постановлением ЦИК и СНК СССР от 21 ноября1924 г. «Об освобождении от промыслового и подоходного налога кустарно-промысловых товариществ или артелей, находящихся в городах» городские артели освобождались от промыслового и подоходного налога, если они через свои союзы входили в состав республиканских или всесоюзных центров производственной кооперации и их оборот не превышал 20 тыс. руб. золотом в год [16]. Декрет ЦИК и СНК СССР от 5 декабря 1924 «Об освобождении от промыслового налога на личные промысловые занятия лиц, состоящих членами кустарно-промышленных кооперативных товариществ (артелей) в сельских местностях» освободил их от уплаты промыслового налога независимо от того, работают ли они в общей мастерской или у себя на дому, при условии, что их продукция сбывалась через артель [17].

Постановлением СНК СССР от 22 июля 1924 г. «О возврате имущества сельскохозяйственной и промысловой кооперации» начался процесс возвращения ее предприятий, перешедших в собственность государства в период с 1918 по 1921 гг. [18].

В постановлении ЦИК и СНК БССР от 25 августа 1924 г. «О порядке установления прав на промышленные предприятия» содержалась отсылка к приложению 3 Гражданско-процессуального кодекса БССР 1923 г., в котором регулировался порядок возврата предприятий, национализированных у кооперативов всех видов [19]. Устанавливалось, что предприятия, оказавшиеся в фактическом распоряжении кооперативных организаций, национализации не подлежат. В дальнейшем частные предприятия, прошедшие государственную регистрацию, могли быть изъяты у собственника только в порядке реквизиции и конфискации на основании норм Гражданского кодекса [20, с. 26].

Система льгот для городских кустарей и ремесленников была изменена постановлением ЦИК и СНК СССР от 12 мая 1925 г. «О налоговых льготах для городских кустарей и ремесленников»». Согласно постановлению городские кустари и ремесленники, не имеющие наемных работников, выбирают патент первого разряда на личные промысловые занятия вне зависимости от наличия у них мастерской и механического двигателя.

Городские кустари и ремесленники, имевшие от одного до трех наемных рабочих, освобождались от уравнительного сбора, а патентный сбор платили по тому же разряду, но в двойном размере. Члены семьи кустаря или ремесленника, проживавшие и работавшие вместе с ним, при обложении в расчет не принимались. При наличии учеников первые два ученика во всех случаях обложения в расчет не принимались, а два последующих приравнивались к одному наемному рабочему.

Кустари и ремесленники облагались подоходным налогом на следующих основаниях: работавшие без наемного труда – по первой группе категории «Б» (п. 1 ст. 6 Положения о государственном подоходном налоге), имевшие от одного до трех включительно наемных рабочих – по шестой группе категории «Б» (п. 6 ст. 6) [21].

Со второй половины 1920-х гг. начинает проявляться тенденция усиления централизованного администрирования промысловой кооперации. Переломным моментом смены демократических нэповских норм в создании кооперативного первичного звена-артелей – стало введение «Положения о промысловой кооперации», принятое ЦИК и СНК СССР 11 мая 1927 г. Оно содержало статью, позже дополненную требованием, по которому регистрация кооперативов могла осуществляться только после «получения органами регистрации от соответствующего промыслового кооперативного союза заключения по уставу» [22]. Это лишало артель самостоятельности и определяло зависимость от вышестоящего кооперативного органа. На основании устава произошла унификация требований в установлении размера пая, вступительного взноса, распределения прибыли, формирования фондов и т. д. Вместе с тем, некоторые демократические кооперативные начала деятельности товариществ (явочная система их возникновения) сохранились и в данном положении.

По мере формирования административного механизма функционирования промкооперации как системы все более отчетливым становилась бюрократическая форма контроля над кооперативами – учет и отчетность. Положение о промысловой кооперации, принятое постановлением ВЦИК и СНК РСФСР от 11 июня 1928 г., предусматривало наличие в артелях годового отчета и баланса, которые необходимо было направить в две инстанции – вышестоящий кооперативный союз и государственное финансовое учреждение по месту деятельности.

Не урегулированным законодательно оставался вопрос о социальных гарантиях членов промысловых товариществ. Если они работали в общей мастерской, то, по сути, их положение не отличалось от положения фабричных рабочих. Но, в отличие от рабочих государственных предприятий, члены промысловых артелей не регистрировались на биржах труда и работа в промысловом товариществе не засчитывалась в трудовой стаж. Безработные рабочие, вступившие в артели, хотя бы на самое непродолжительное время, теряли членство в профсоюзе и лишались права быть зарегистрированным на бирже труда [23, с. 10].

Процедура регистрации артелей и союзов кустарей регламентировалась инструкциями. Так, согласно инструкции от 13 октября 1922 г., разработанной ЦИК БССР, ни одно общество, ни одна артель или союз не могло приступить к деятельности без регистрации в Наркомате внутренних дел [24].

Таким образом, первостепенным фактором, повлиявшим на становление и развитие советского кооперативного права стала ленинская концепция о кооперации, исходившая из двойственного характера промысловых артелей: в которых одновременно сочетались частная собственность на средство производства и общественный характер отношений членов артелей к этой собственности. Определенное влияние оказало и дореволюционное кооперативное законодательство.

Основу правового законодательства в исследуемый в статье период составляли законодательство Советской России и Союза ССР, адаптированные к конкретным условиям республики в соответствующих постановлениях высших органов власти и управления БССР.

С началом новой экономической политики кустарям было дано право на занятия промыслами и право объединяться в промысловые кооперативные товарищества, восстановлен явочный порядок возникновения кооперативов, введены примерные уставы. Однако практика регистрации их в судебных органах возвращена не была, что позволяло местным органам власти не соблюдать правовую основу в отношении к товариществам.

Несколько лет шло развитие демократических начал в кооперативном законодательстве (добровольность создания новых артелей, полная экономическая самостоятельность), но постепенно проявлялась тенденция усиления государственного вмешательства во внутрикооперативную жизнь (ограничения по классовому признаку, унификация уставов, ограничивающая творческую активность артельщиков).

Законодательство второй половины двадцатых годов отображает процессы огосударствления кооперации, оно становится всеобъемлющим, стремящимся всесторонне регламентировать все стороны деятельности кустарей и артелей.

В целом анализ советского промыслового законодательства 1920-х гг. показывает, что основной задачей регулирования на этом этапе являлось закрепление итогов революционной трансформации имущественных отношений и установление «границ» государственной и частной собственности, определение места промысловой промышленности в народнохозяйственном комплексе страны.

Литература

1. Сорокин, А.Н. Искушение будущим и уроки прошлого. Белорусская деревня: от Декрета до Кодекса о земле (1918–1990-е годы) / А.Н. Сорокин. – Минск : Право и экономика, 2008. – 442 с.

2. Ванькевич, А.И. Отношения собственности в промышленности Республики Беларусь [Электронный ресурс] / А.И. Ванькевич. – Режим доступа : http://www.rep.bntu.by. – Дата доступа : 25.08.2018.

3. Кулаков, В.В. Закон 20 марта 1917 г. о кооперации и его место в истории кооперативного права в России / В.В. Кулаков // Советское государство и право. – 1990. – № 10. – С. 123–129.

4. Ленин, В.И. Развитие капитализма в России / В.И. Ленин. – 5-е изд. // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Изд-во политической литературы, 1968. – Т. 3. – С. 3–791.

5. Ленин, В.И. Грозящая катастрофа и как с ней бороться / В.И. Ленин. – 5-е изд. // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Изд-во политической литературы, 1969. – Т. 34. – С. 151–199.

6. Ленин, В.И. VIII съезд РКП (б) 18–23 марта 1919 г. / В.И. Ленин. – 5-е изд. // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Изд-во политической литературы, 1969. – Т. 38. – С. 125–215.

7. О потребительских кооперативных организациях : Декрет СНК РСФСР, 10 апр. 1918 г. // Собр. узаконений и распоряжений правительства за 1917–1918 гг. – М. : Управление делами Совнаркома СССР, 1942. – 1483 с.

8. Файн, Л.Е. Отечественная кооперация: исторический опыт / Л.Е. Файн. – Иваново : Ивановский государственный университет, 1994. – 276 с.

9. О мерах содействия кустарной промышленности : постановление ВЦИК РСФСР, 26 апр. 1919 г. // Собр. узаконений и распоряжений правительства за 1919 г. – М. : Управление делами Совнаркома СССР, 1943. – 886 с.

10. Ленин, В.И. X съезд РКП (б) 8–16 марта 1921 г. / В.И. Ленин. – 5-е изд. // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Изд-во политической литературы, 1970. – Т. 43. – С. 1–127.

11. О руководящих указаниях органам власти в отношении мелкой и кустарной промышленности и кустарной сельскохозяйственной кооперации : Декрет СНК РСФСР, 17 мая 1921 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского правительства. – 1921. – № 48. – Ст. 240.

12. Об отмене, приостановке и пересмотре некоторых постановлений о мелкой и кустарной промышленности и кустарной сельскохозяйственной кооперации : Декрет СНК РСФСР, 17 мая 1921 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского правительства. – 1921. – № 48. – Ст. 240.

13. О порядке расходования кооперативами денежных средств : Декрет ВЦИК, 10 июн. 1921 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского правительства. – 1921. – № 51. – Ст. 293.

14. О кустарной и мелкой промышленности : Декрет ВЦИК, СНК РСФСР, 7 июл. 1921 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского правительства. – 1921. – № 53. – Ст. 323.

15. О налоговых льготах для кооперативных организаций : постановление ЦИК СССР, СНК СССР, 7 дек. 1923 г. // Собрание законов СССР. – 1926. – № 61. – Ст. 461.

16. Об освобождении от промыслового и подоходного налога кустарно-промысловых товариществ или артелей, находящихся в городах : постановление ЦИК, СНК СССР, 21 нояб. 1924 г. // Собрание законов СССР. – 1924. – № 26. – Ст. 219.

17. О налоговых льготах : Декрет ЦИК СССР, СНК СССР, 17 дек. 1924 г. // Собрание законов СССР. – 1924. – № 28. – Ст. 238.

18. О возврате имущества сельскохозяйственной и промысловой кооперации : постановление СНК СССР, 22 июл. 1924 г. // Собрание законов СССР. – 1924. – № 3. – Ст. 36.

19. О порядке установления прав на промышленные предприятия : постановление ЦИК, СНК БССР, 25 авг. 1924 г. // Собр. узаконений БССР. – 1924. – № 22–23. – Ст. 203.

20. Зеньков, А. Понятие экспроприации в законодательстве и доктрине советского периода / А. Зеньков // Журнал международного права и международных отношений. – 2013. – № 3. – С. 22–33.

21. О налоговых льготах для городских кустарей и ремесленников : постановление ЦИК, СНК СССР, 12 мая 1925 г. // Собрание законов СССР. – 1925. – № 32. – Ст. 213.

22. Положения о промысловой кооперации : постановление ЦИК, СНК СССР, 11 мая 1927 г. // Собрание законов СССР. – 1927. – № 26. – Ст. 280.

23. Кустарно-промысловая кооперация накануне XV съезда ВКП(б). – М. : Всекопромсоюз, 1927. – 56 с.

24. Инструкция по регистрации обществ, союзов и объединений : утв. ЦИК ССРБ, 15 нояб. 1922 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства ССРБ – 1922. – № 13. – Ст. 166.

Белорусский государственный университет

Поступила в редакцию 14.09.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

Филология

УДК 811.161.3’ 373.232.1 (476.2–37)

Прозвішчы Калінкавіцкага раёна адапелятыўнага паходжання

У.А. Бобрык

У артыкуле даецца семантычны аналіз прозвішчаў жыхароў Калінкавіцкага раёна. Вылучана 8 лексіка-семантычных груп слоў, што сталі асновай для ўтварэння прозвішчаў. У выніку аўтар даследавання прыйшоў да высновы, што найбольш ужывальнымі з’яўляюцца прозвішчы, утвораныя ад назваў прафесій, роду заняткаў, фізічных і разумовых характарыстык чалавека. Меншую частку складаюць прозвішчы, утвораныя ад прадуктаў харчавання, геаграфічных назваў.
Ключавыя словы: прозвішча, семантыка, адапелятыўнае прозвішча, адыменнае прозвішча, адтапанімічнае поле, словаўтварэнне, лексіка-семантычная група.

The semantic analysis of surnames of Kalinkavichi region citizens is given. Thirteen lexico-semantic word groups that have become the basis for surname formation are singled out here. As a result the researcher has come to conclusion that the most common surnames are the ones formed from trade (professions), physical and mental characteristics of a person. The smaller part includes the surnames formed from food products and geographical names.
Keywords: surname, semantic, appellative surname made from name, toponymic field, world-formation, lexico-semantic group.

Аналіз семантыкі і структуры прозвішчаў – цікавая, каштоўная і цяжкая справа, што прызнаецца многімі антрапанімістамі. Ён, на думку А. Суперанскай, «дае значную інфармацыю, якая ўяўляе цікавасць для гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, а таксама лінгвістаў. Пры параўнанні лексічных палёў, па якіх размяркоўваюцца асновы прозвішчаў у розных мовах, можна зрабіць вывады пра агульнасць або, наадварот, рознасць нацыянальных культур асобных народаў» [1, с. 81].

Прозвішчаў адапелятыўнага паходжання ў беларускай мове даволі многа. Гэта група складае прыкладна каля паловы ўсіх прозвішчаў. Вядомы антрапаніміст М.В. Бірыла адзначае, што «з пункту погляду гісторыі мовы адапелятыўная антрапанімія з’яўляецца захавальнікам, кансервантам лексікі папярэдніх эпох, дае матэрыял для больш глыбокага вывучэння гістарычнага слоўніка, моўных узаемасувязей» [2, с. 4]. Згодна з гэтым у якасці асноў для ўтварэння прозвішчаў магла выкарыстоўвацца лексіка, якая адлюстроўвае самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа і акаляючай яго рэчаіснасці – быт, заняткі, становішча ў сям’і і грамадстве, фізічныя, разумовыя і маральныя якасці, пачуцці, сацыяльны ўклад, жывёльны і раслінны свет і пад. У гэтым сэнсе антрапанімія, утвораная ад апелятыўнай лексікі, з’яўляецца кладоўкай гісторыка-культурнай спадчыны, дае каштоўны матэрыял для вывучэння агульнай гісторыі народа.

Намі сабрана і прааналізавана каля дзвюх тысяч прозвішчаў жыхароў Калінкавіцкага раёна. Фактычны матэрыял сведчыць, што ўсе прозвішчы паходзяць ад двух класаў лексікі: адапелятыўнага і аданамастычнага паходжання. Найбольш прадуктыўна ў якасці матывацыйнай базы задзейнічана апелятыўная лексіка.

Багацце і стракатасць асноў прозвішчаў адапелятыўнага паходжання жыхароў Калінкавіцкага раёна нагадваюць энцыклапедыю мовы. Яны адлюстроўваюць дачыненне чалавека да навакольнага асяроддзя і разнастайных заняткаў, сведчаць аб стане сацыяльнага і культурнага жыцця грамадства ў пэўны гістарычны перыяд, даносяць характар узаемаадносін паміж людзьмі.

У складзе прозвішчаў Калінкавіцкага раёна найбольш часта сустракаюцца словы, звязаныя з назвамі жывёльнага свету. Сярод іх можна вылучыць: назвы свойскіх жывёл: *Баранаў, Баранцаў, Буланаў, Булановіч* (ад буланы ‘светла-жоўты з чорным хвастом і чорнай грываю (пра масць коней)’ [3, с. 67]); *Быкаў, Бычкоў, Жарабцоў, Казлоў, Казлоўскі, Трусевіч, Цапаў* (цап ‘казёл’ [3, с. 436]), *Целеш* (целеш ‘цяля’ [4, с. 195]), *Бабук* (рус. ‘земляны заяц, тушкан’ [3, с. 29]), *Барсук, Барсукоў, Баброў, Бірукоў* (рэг. бірук ‘адзінокі воўк, які жыве па-за стаі’ [4, с. 34]), *Вількін* (параўн. польск. wilk ‘воўк’ [3, с. 87]), *Волкаў, Зайцаў, Кажанаў* (кажан ‘лятучая мыш’ [3, с. 167]), *Кротаў, Куцанкоў* (рус. куцан ‘маркач, нялегчаны баран’ [3, с. 236]), *Лісіцын, Лосеў, Мядзведзеў, Мядзведзька, Мядзведкаў, Медзвядкоў, Мышанкоў, Норкін* (заал. ‘норка’ [3, с. 300]), *Сабалеўскі, Собалеў, Хамякоў* (хамяк ‘палявая жывёла з доўгім перыядам спячкі’ [4, с. 211]), *Шашкоў* (шашок ‘тхор’ [3, с. 472]); назвы насякомых: *Біндзюкоў* (укр. биндюк ‘чмель’ [3, с. 54]), *Блахін, Жукаў, Жукоўскі, Казека* (рэг., рус. ‘вош’ [3, с. 168]), *Камароў, Караедаў* (караед ‘шкоднік лясоў, дробны жук, які грызе кару і драўніну’ [5, с. 278]), *Мухін, Мятлікаў* (разм. мятлік ‘матылёк’ [5, с. 355]), *Паплеўка, Паплеўкін* (рус. поплёвка ‘вялікая пакаёвая муха’ [3, с. 314]); назвы земнаводных: *Казюлькін* (рус, казюля ‘змяя’ [3, с. 169]); назвы свойскіх птушак: *Індзюкоў* (рэг., рус. индюк ‘індык’ [3, с. 164]), *Гусакоў, Гусеў, Квакуха* (‘курыца з куранятамі’ [3, с. 197]), *Куранкоў* (рус. куран ‘індык’ [3, с. 232]), *Курачкін, Курачэнка* (рэг. курач ‘курыца, якая не нясецца і мае выгляд пеўня’ [3, с. 232]), *Куркоў, Курчанка* (рус. курч ‘кураня’ [6, с. 173]), *Певень*, *Петушкоў*, *Пеўнеў*, *Пырко* (параўн. рэг. пырка ‘курачка’ [3, с. 341]; пырка ‘індык, кура’ [6, с. 264]); назвы дзікіх птушак: *Арлоў*, *Арляннікаў*, *Вараб’ёў* (*Вераб’ёў*), *Варонкін* (ад варона [3, с. 83]), *Галкін*, *Галко*, *Галкоў* (ад галка [3, с. 99]), *Глушакоў*, *Голубаў*, *Голубеў*, *Дзятлаў*, *Драздоў*, *Дудак* (рэг. ‘драфа’ [3, с. 139]; драфа ‘буйная стэпавая птушка з доўгай шыяй і моцнымі нагамі’ [5, с. 184]), *Жураўлёў*, *Жураўчанка* (рэг. жураў ‘журавель’ [3, с. 148]), *Зуеў* (рус. рэг. зуй ‘балотная птушка з сямейства кулікоў’ [4, с. 85]; зуй ‘хворы кулік’, ‘дзіця-гарэза’ [6, с. 125], *Кавулькін* (укр. памянш. кавулька ‘зязюля, кукушка’ [3, с. 166]), *Какушкін* (рус. кокушка тое ж, што кукушка ‘зязюля’ [4, с. 102]), *Каршуноў*, *Каршукоў*, *Коршунаў*, *Коршыкаў* (рэг. каршук ‘коршак’ [3, с. 19]), *Крумкачоў*, *Кулікаў*, *Кулікоў*, *Куліткін*, *Лебедзеў*, *Лебедзь*, *Лебядзенка*, *Пагарцаў* (укр. погарець ‘птушка ўдод’ [3, с. 304]), *Пугачоў* (пугач ‘філін, які палохае сваім крыкам’ [4, с. 162]), *Сакалоў*, *Сокалаў*, *Сакалоўскі*, *Сарокін*, *Селязнёў* (бел. рэг., рус, укр. селезень ‘качур’ [3, с. 370]), *Сініцкі*, *Слукін* (рус. слука ‘птушка вальдшнеп, слонка’ [3, с. 382]), *Стрыжанкоў* (ад стрыж [3, с. 393]), *Сураў* (магчыма ад сур ‘сурок’ [6, с. 306]), *Сычоў* (сыч ‘птушка з сям’і савіных’ [7, с. 145]), *Удодаў*, *Хулапаў* (рэг. хулапа ‘палявы голуб’ [3, с. 435]), *Чайкоў*, *Чаплін*, *Чаплінскі* (ад чапля [4, с. 216]), *Чыж*, *Чыркоў*, *Чырок* (чырок ‘невялікая вадаплаўная птушка, разнавіднасць качкі’ [4, с. 220]), *Шпакаў*, *Шчыглоў* (шчыгол [3, с. 488]); *Ястрабкоў*; назвы рыб: *Акуневіч*, *Карасёў*, *Карасік*, *Карпоўскі*, *Карпянкоў*, *Карпянок* (ад карп [3, с. 187]), *Ляшчоў* (ад лешч [3, с. 251]), *Плоткін*, *Рыбачкін*, *Рыбачкоў*, *Рыбянкоў*, *Судакоў* (ад судак [5, с. 635]), *Шчукін*, *Шчучкін* (бел. рэг., рус, укр. шчука ‘шчупак’ [3, с. 488]), *Ракаў*, *Рачкоў* (рачко, рачок ‘памянш ад рак’ [4, с. 167]).

Словы, якія абазначаюць назвы частак цела і покрыва цела чалавека і жывёлін, сустракаюцца ў прозвішчах: *Бардзюгоў*, *Бардзюкоў*, *Бардукоў* (укр. бордюг, бордюх ‘бурдзюк’, ‘страўнік жывёліны’ [3, с. 42]), *Бародка*, *Глазкоў*, *Дзебаў* (параўн. рэг. дзёб ‘дзюба’ [3, с. 128]), *Капытаў*, *Капытоў*, *Ключыненка*, *Ключынскі*, *Космыкаў* (космы, косма ‘пасма валасоў’ [6, с. 159]), *Костачка*, *Костачкін*, *Корхаў* (устар. бел. корх ‘кулак’, ‘удар кулаком’ [3, с. 214]), *Крылоў*, *Лапацін*, *Лычкоў* (ад лыка ‘лыч – свіное рыла’ [6, с. 188]), *Наско*, *Носка* (ад нос [3, с. 297]), *Рагавой, Ражкоў, Рогаў* (ад рог [3, с. 351]), *Лапін, Лапіцкі, Чачын* (тат. чэч ‘волас, валасы’ [3, с. 449]) і інш.

Значная колькасць прозвішчаў утвараецца ад назваў раслін і іх частак, назваў пладоў: *Арбузаў, Арэшанка, Асонаў* (разм. форма ад насон ‘расліна, тое ж, што дзікі мак’ [4, с. 148]), *Бакунаў, Бакуноў* (ад рэг. бакун ‘сорт тытуню’ [7, с. 38]), *Баравік, Баравікоў* (‘назва грыба [3, с. 41]); *Буракоў* (ад бурак [3, с. 68]), *Верасавы, Верасаў* (ад верас [3, с. 85]), *Вінаградаў, Галайдаў* (рэг. галайда ‘назва гатунку ячменю’ [3, с. 97]), *Грыбоўскі, Драп* (параўн. драпа ‘дзікая рэдзька’ [6, с. 102]), *Каліна, Канапелькін, Капусцін, Качанаў, Коласаў, Лапухоў, Малінаў, Малінін, Маліноўскі, Махавік* (грыб ‘махавік’ [3, с. 280]), *Нявейкаў, Нявейкін* (рус. невейка ‘нявеенае збожжа з мякінай’ [3, с. 301]), *Пастарнакаў* (пастарнак ‘агародная і дзікаслая расліна з

прыемным пахам, караняплод з жоўтымі кветкамі, ужываецца як прыправа’ [5, с. 449]), *Прышчэпаў* (прышчэп ‘прышчэпленая расліна’ [6, с. 522]), *Рабіна, Ракіцкі* (ад ракіта [3, с. 348]), *Рамашкін, Садаў, Садкоў, Садоўскі* (ад сад [3, с. 360]), *Сасноўскі, Струкаў* (ад струк [3, с. 393]), *Шаройкін* (ад рэг. шаройка ‘абдзіркі з грэчкі’ [3, с. 468]), *Шышкоў, Ягадкін* і інш.

Прафесіі і розныя віды дзейнасці, заняткі людзей, назвы службовых і ваенных асоб адлюстраваны ў пашыраных прозвішчах *Алейнікаў* (алейнік ‘той, хто робіць алей’ [3, с. 20]), *Аўчыннікаў (‘аўчыннік, майстар, які вырабляе аўчыны’* [3, с. 27]), *Ахотнікаў* (рэг. ‘паляўнічы’ [3, с. 27]), *Баброўнікаў* (ст. бел. баброўнік ‘лавец баброў’ [3, с. 29]), *Баннік, Баннікаў, Банны, Басаў* (ад слова бас ‘самы нізкі мужчынскі голас, а таксама спявак з такім голасам’ [5, с. 83], *Бліннікаў* (бліннік ‘чалавек, які выпякае ці прадае бліны’ [3, с. 56]), *Бондар, Бондараў* (бондар ‘майстар, які робіць бочкі’ [7, с. 117]), *Бортнік* (‘пчаляр, які займаецца бортнымі пчоламі’ [7, с. 118]), *Варажбітаў, Варажбітоў* (варажбіт ‘той, хто займаецца варажбой’ [5, с. 106]), *Васкабойнікаў, Васкабойны* (васкабойнік ‘той, хто робіць свечкі’ [8, с. 28]), *Веракса* (рус. варакса ‘пэцкаль, хаўтуршчык’, параўн. рус. вараксаться ‘пэцкацца, вазіцца’ [3, с. 82]), *Ганчароў* (ганчар ‘той, хто вырабляе гліняную пасуду [3, с. 101]), *Грабеннікаў* (грабеннік ‘чалавек, які вырабляе грэбні’ [4, с. 62]), *Дворнік, Дзехцяроў* (дзягцяр, дзяхцяр ‘той, хто робіць дзёгаць’ [4, с. 67]), *Дудараў* (ад дудар ‘музыка, які грае на дудзе’ [3, с. 139]), *Жарносенка* (параўн. жарнасек ‘чалавек, які насякае жорны’ [5, с. 199]), *Жывадзёраў* (жывадзёр ‘той, хто забівае і здымае скуру з забітай жывёлы’ [5, с. 201]), *Залатароў* (залатар ‘майстар па вырабу розных рэчаў з золата; ювелір’ [9, с. 235]), *Званцаў* (званец ‘царкоўны званар’, ‘званочак’ [4, с. 83]), *Каваленка, Кавалёў, Кавалькоў, Кавальскі, Кавальчук, Кажамякін* (‘аўчыннік, майстар, які вырабляе шкуры [3, с. 167]), *Кажэўнікаў* (устар. кажэўнік ‘гарбар’ [3, с. 168]), *Казакоў* (рус. рэг. казак ‘батрак, які наймаўся на год на працу’ [4, с. 90]), *Казюкін* (казюк ‘тульскі збройнік, які працуе на дзяржаўных заводах’ [4, с. 91]), *Калеснікаў, Канавалаў, Канавальчык* (ад канавал ‘знахар. які лечыць коней’ [5, с. 271]), *Капачоў* (ад капач [3, с. 179]), *Карабельнікаў, Катляроў* (катляр ‘кацельны майстар’, ‘чалавек, які вырабляе посуд з медзі і інш.’ [4, с. 107]), *Кашавараў* (кашавар ‘повар у воінскай часці або (уст.) у рабочай арцелі’ [5, с. 286]), *Кісельнікаў* (кісельнік ‘чалавек, які гатуе на продаж кісялі’ [4, с. 99]), *Клікуноў* (ст. бел. клікун ‘начны стораж’ [3, с. 206]), *Ключнікаў* (ключнік ‘слуга ў панскім маёнтку, у распараджэнні якога знаходзіліся прадукты харчавання і ключы ад месц іх захоўвання’ [9, с. 702]), *Коўшар* (устар. бел. ковшарь ‘майстар, які вырабляе каўшы’ [3, с. 193]), *Краўцоў* (ад кравец ‘спецыяліст па шыццю адзення, пераважна мужчынскага’ [5, с. 299]), *Крупадзёраў, Кузняцоў, Кузнячэнка, Куратнікаў* (куратнік ‘той, хто даглядае курэй’ [3, с. 232]), *Кухараў, Кухарэнка, Кушнераў, Кушняроў* (кушнер ‘скарняк’ [6, с. 175]), *Мазайлаў* (мазаць ‘той, хто мажа’ [3, с. 266]), *Маставы* (‘збіральнік падаткаў за праезд праз мост’ [4, с. 134]), *Матросаў, Меднік* (‘спецыяліст па вырабу і рамонту медных рэчаў’ [4, с. 340]), *Мельнікаў, Мірошнікаў* (мірошнік ‘млынар’ [4, с. 132]), *Міснікаў* (міснік ‘місачкін’ [3, с. 285]), *Музыка, Музыкін, Музычкін, Мяснікоў, Налівайка* (укр. налийвайко ‘налівальшчык, той, хто налівае’ [3, с. 296]), *Партны* (рэг. ‘кравец’ [3, с. 315]), *Пісьменнікаў, Ратнікаў* (ад ратнік ‘радавы салдат дзяржаўнага апалчэння’ [10, с. 100]), *Рашэтнікаў* (‘той, хто вырабляе рэшата’ [7, с. 140]), *Рэзнікаў* (ад укр. різник ‘прадавец мяса, мяснік’ [10, с. 101]; ад разнік ‘той, хто займаецца рэзаннем жывёлы, мяснік’ [5, с. 546]), *Рубан* (ад рубіць ‘секчы’ [3, с. 353]), *Рудкоўскі, Рудніцкі* (руднік, той, хто здабывае ці плавіць руду [3, с. 355]), *Рыбакін, Рыбакоў* (ад рыбак [3, с. 356]), *Сальнікаў* (разм. сальнік ‘гандляр салам’ [3, с. 582]), *Седлараў, Седляроў* (укр. сідляр ‘той, хто вырабляе сёдлы, сёдзельнік’ [3, с. 403]), *Скрыпнік* (рус, укр. скрипник ‘скрыпач’ [3, с. 380]), *Слесараў, Смаляроў* (рэг. смаляр ‘той, хто працуе ў смалярні, смалакур’ [3, с. 384]), *Сталяроў, Сторажаў, Стукалаў* (стукала ‘той, хто прывык стукаць чым-небудзь’ [4, с. 190]), *Ткачоў, Фабрыкант, Фабрычкін, Шапавалаў* (шапавал ‘майстар, які вырабляе валеннем шэрсці капелюшы і інш. рэчы’ [5, с. 754]), *Шаўцоў* (шавец ‘майстар па шыццю і рамонту абутку’ [5, с. 753]) *Швараў* (швар ‘кравец’ [4, с. 225]), *Шведаў, Швец* (швед, швец ‘кравец’ [4, с. 225]), *Шкляраў, Шкляроў, Шклярэўскі* (шкляр ‘работнік шкляной прамысловасці’ [5, с. 758]), *Школьнік* (ст. бел. ‘кіраўнік школы’ [3, с. 475]), *Шорнікаў* (рэг, рус. шорнік ‘рымар’ [3, с. 479]), *Шынкароў, Шынкарэнка* (шынкар ‘уладальнік шынка’ [5, с. 768]) і інш.

Не засталіся не заўважанымі і прылады працы чалавека, прадметы бытавога ўжытку і іх часткі, назвы: *Абуховіч* (абух ‘тупая частка сякеры, процілеглая лязу’ [4, с. 145]), *Абушэнка* (абух [3, с. 16]), *Барылаў* (ст. бел. барила ‘бочачка’ [3, с. 43]), *Болцікаў, Брундукоў* (рус. брундук ‘адна з вяровак парусных снасцей’ [3, с. 61]), *Булаўка* (булава ‘кароткае жазло з патаўшчэннем на канцы ў выглядзе шара’ [5, с. 96]), *Гакаў* (гак ‘востры шып у падкове’ [5, с. 140]), *Голікаў* (голік ‘венік без лісця’ [4, с. 59]), *Гунькоў* (рэг. гунька ‘пакрывала на каня’ [3, с. 121]), *Жыгалкін* (рэг. жыгала ‘металічны прут, якім кавалі выпальваюць дзіркі ў дрэве’ [3, с. 149]), *Зыбін* (зыба, зыбка ‘калыска’ [6, с. 125]), *Кадушкін* (кадушка ‘невялікая кадзь’ [5, с. 262]), *Камкоў* (камка ‘шаўковая тканіна’ [6, с. 133]), *Капылоў* (капыл ‘нешта вертыкальнае, напрыклад, брусок, які злучае палазы з санямі’ [4, с. 105]), *Каробушка, Каробушкін* (памянш. каробушка ад каробка [3, с. 186]), *Клецаў* (рэг. клёц ‘зуб бараны’ [3, с. 206]), *Кужалеў, Кужэльны* (кужаль ‘валакно ачэсанага лёну, а таксама ніткі з такога валакна’ [5, с. 306]), *Куўшынаў, Лемешаў* (ад лемеш ‘рэжучая частка плуга’ [10, с. 62]), *Лубачкін* (бел. лубка ‘кошык з луба, лубянка’ [3, с. 257]), *Лямцаў, Лямцоў* (лямец ‘тоўсты, шчыльны матэрыял, звалены з шэрсці, воўны’ [5, с. 325]), *Папруга, Папругін, Папружкін* (папруга ‘частка збруі для ўмацавання падсядзёлка на спіне каня’ [5, с. 439]), *Рагачоў* (рэг. рагач ‘ражон, палка’ [3, с. 345]), *Скоблікаў* (скобель ‘цяслярская прылада для скаблення’ [4, с. 183]), *Суднікоўіч* (рэг. суднік ‘шафа для кухоннай пасуды’ [3, с. 397]), *Сундукоў* (ад сундук [3, с. 398]), *Табакін* (разм. табака ‘тое, што і тытунь’ [5, с. 649]), *Тачылаў*, *Тачылін*, *Тачылкін* (тачыла ‘тачыльны камень, а таксама станок для навострывання рэжучых інструментаў’ [5, с. 655]), *Файкін*, *Файкоў* (бел. рэг., рус. файка ‘люлька’ [3, с. 423]), *Хатылеў* (рэг. хатыль ‘катомка’, ‘кошык з бяросты’ [3, с. 428]), *Чашаў*, *Чашачкін*, *Чашын*, *Шыцікаў* (ад рус. рэг. шыцік ‘разнавіднасць лодкі на Поўначы і ў Сібіры’ [10, с. 171]), *Шустаў* (рус., укр. шуст ‘прыстасаванне для выраўнівання ствала стрэльбы’ [3, с. 485]) і інш.

Словы, якія абазначаюць хатнія рэчы, адзенне, абутак, ежу, стравы, напіткі, таксама складаюць даволі вялікі пласт і сустракаюцца ў наступных прозвішчах: *Бурсаў* (рус. бурс, бурса ‘персідская шаўковая тканіна’ [3, с. 70]), *Кожанаў* (кожан ‘адзенне з мяккай скуры, без шэрсці’ [6, с. 146]), *Шкуратаў* (ад рус. рэг. шкурат ‘кавалак старой скуры’ [10, с. 172]); *Балахонаў* (балахон ‘халат шырокага крою, які раней насілі сяляне, а таксама (разм.) наогул шырокая бясформенная вопратка’ [5, с. 80]), *Башмакоў*, *Бурносаў* (бел. устар. бурнос ‘плашч’ [3, с. 70]), *Калпак* (каўпак ‘галаўны ўбор конусападобнай, авальнай або іншай формы’ [5, с. 285]), *Каптуроў* (каптур ‘жаночы і дзіцячы галаўны ўбор’ [3, с. 180]), *Лапцееў*, *Лапцейкін*, *Лапцеў* (ад лапаць ‘абутак з лыка’ [3, с. 246]), *Рубаха*, *Самаркоў* (рус. рэг. самара, самарка ‘доўгае, даўгаполае адзенне’ [3, с. 364]), *Цеплякоў* (магчыма ад рэг. цеплякі ‘валёнкі’ [5, с. 131]), *Чугаеў* (ст. бел. чугай ‘плашч ці епанча татарскага фасону’ [3, с. 451]), *Чулкоў* (рус. чулок ‘панчоха’ [3, с. 452]), *Шубін*, *Шубкін*; *Балабка*, *Балабкоў* (балабка, балаба ‘хлеб, калабок, бохан’ [4, с. 26]), *Баршчоў*, *Бублікаў* (бублік ‘абаранак’ [3, с. 63]), *Букатаў* (рэг. букатка ‘булка хлеба’ [3, с. 66]), *Булкін* (булка ‘хлеб з пшанічнай мукі; белы хлеб’ [5, с. 96]), *Верашчака* (рэг. верашчака ‘мачанка’ [3, с. 85]), *Гушча* (гушча ‘густая поліўка’ [4, с. 64]), *Калачоў* (калач ‘пшанічны хлеб, выпечаны ў выглядзе замка з дужкай’ [5, с. 265]), *Караваеў*, *Каржоў*, *Кельбас* (польск. kielbas ‘каўбаса’ [3, с. 199]), *Кісялёў*, *Кнышаў* (рус. кныш ‘перапечка з маслам, здобная булачка’ [3, с. 209]), *Крупень* (параўн. крупеня ‘крупяны суп’ [5, с. 302]), *Крупскі*, *Кукін* (кука ‘кулак’, ‘пірог з кашай’ [6, с. 169]), *Кулага*, *Кулагін* (рус, укр. кулага ‘страва з мукі’ [3, с. 228]), *Кулажанка* (рэг. кулага ‘страва з мукі’ [3, с. 228]), *Куляшоў* (‘густая мучная або крупяная каша з салам’ [5, с. 306]), *Лапуноў* (рэг. лапун ‘перапечка, праснак з бульбы і мукі’ [3, с. 245]), *Лапшынаў* (ад лапша [3, с. 246]), *Маслаў*, *Маслакоў*, *Палюхін* (бел. палюхі ‘клёцкі з дранай бульбы’ [3, с. 311]), *Піражкоў, Помазаў* (рэг. помаз ‘падмазка’ [3, с. 329]), *Сайкоў* (ад сайка ‘белы хлеб’, ‘невялікая рыба, род навагі’ [6, с. 277]), *Саламацін* (саламата ‘народная страва: кісель або рэдкая каша з мукі з салам ці маслам’ [4, с. 176]), *Сушчаў*, *Сушчынскі* (рус. сущ, сущик ‘сушаная дробная рыба’ [3, с. 401]), *Цеста*, *Юшкевіч*, *Юшкін* (юшка ‘заглушка ў коміне’, ‘сок ад чаго-небудзь варанага, жыжка, жыдкая частка стравы, навар з мяса ці рыбы, суп з бульбай, рыбны суп’ [3, с. 497]); *Гераловіч* (параўн. літ. geralas ‘напітак, пітво’ [3, с. 107]), *Кулагаў* (ад рус. кулага ‘напой з соладу, падобны на піва’ [10, с. 59]), *Расолаў* (расол ‘вадкасць, насычаная сокамі засоленых у ёй прадуктаў’ [3, с. 552]) і інш.

Шырока прадстаўлены ў прозвішчах Калінкавіцкага раёна фізічныя і разумовыя характарыстыкі чалавека, асаблівасці характару, яго схільнасці і прывычкі: *Астравух* (‘які добра чуе, мае вострае вуха’ [3, с. 25]), *Бабак* (рэг. ‘дурань, безгаловы чалавек’ [3, с. 28]), *Басалыка* (параўн. рус. басалыга ‘франт, фарсун’, ‘свавольнік, гарэза’ [3, с. 44]), *Батурка* (памянш. ад батура ‘балагур, пустамеля’ [3, с. 45]), *Белавусаў*, *Белік*, *Белы*, *Белякоў*, *Белянкоў*, *Брытаў (*рус. брить ‘голены ці коратка пастрыжаны чалавек’ [3, с. 62]), *Буйневіч* (ад буйны [3, с. 65]), *Галавачоў* (‘ад галавач, галаваты’ [3, с. 96]), *Гарэлік*, *Гарэлікаў*, *Гладкі*, *Гладчанка*, *Гладкоў* (ад разм. гладкі ‘сыты, адкормлены’ [5, с. 151]), *Глазуноў* (глазун ‘зіркасты’ [4, с. 58]; глазун ‘разява, гультай’ [6, с. 79]), *Глухаў*, *Глушачэнка* (‘глухі’ [3, с. 111]), *Грамыка* (ад гром, грымець, г.зн. ‘чалавек з гучным голасам’ [7, с. 122]), *Грыбанаў* (грыбака, грыбач, грыбуня ‘таўстагубы’ [4, с. 62]), *Губанаў*, *Губарэвіч*, *Губкін* (ад губа, губан ‘губаты’ [3, с. 119]), *Даўгайла* (‘высокі чалавек’ [3, с. 126]), *Даўгіх*, *Даўгулёў* (даўгуль ‘высокі чалавек’ [3, с. 127]), *Доўгі*, *Дзюбанаў*, *Дзюбін*, *Дзюбкачоў* (дзюбан ‘насаты, з вялікай дзюбай’ [3, с. 131]), *Жаўтаногаў*, *Жаўтаногі*, *Карзуноў* (карзун ‘чалавек, у якога адсутнічаюць пярэднія зубы’ [4, с. 105]), *Кароткі*, *Каротчанка*, *Каротчыкаў*, *Караткевіч* (ад кароткі [3, с. 187]), *Касмакоў*, *Касмачоў*, *Касмачэўскі* (касмач ‘чалавек з доўгімі ўзлахмачанымі пасмамі валасоў’ [5, с. 283]), *Кіслякоў* (кісляк ‘кіслы, вялы, хваравіты’ [4, с. 99]), *Клюеў* (клюй ‘чалавек з доўгім, арліным носам’ [4, с. 100]), *Краснашчокаў*, *Крывашэй*, *Крываногаў*, *Крываносаў*, *Крыўцоў* (крывец ‘крывы, г.зн аднавокі чалавек’ [4, с. 109]), *Кудлянкоў* (ад разм. кудлы ‘доўгія скалмачаныя пасмы валасоў’ [5, с. 306]), *Кудраўскі* (рэг. кудравы, кудрач ‘кучаравы’ [3, с. 226]), *Куцепаў* (цюрк. куцеп ‘каратканогі’ [4, с. 114]), *Кучаравенка* (‘кучаравы’ [3, с. 237]), *Лунеў*, *Лунёў* (лунь ‘сівавалосы чалавек’ [4, с. 123]), *Лысы*, *Лысякоў*, *Ляўшоў* (ад ляўша [3, с. 264]), *Малажаўскі* (рэг. малажавы ‘маладжавы’ [3, с. 270]), *Малагубаў*, *Малееў*, *Малей* (‘малы, невялікага росту’ [3, с. 270]), *Малюгін*, *Малюшын* (‘малы’ [3, с. 272]), *Маргуноў*, *Набокін* (набокі ‘крывабокі’ [4, с. 137]), *Надтачаеў*, *Надтачэеў* (параўн. бел. надтачыць ‘падоўжыць што-небудзь, зрабіць даўжэйшым’ [3, с. 295]), *Рабенькі*, *Рабы*, *Рагінскі* (літ raginis ‘рагавы’ [3, с. 345]), *Райкоў* (рус. райкий ‘гучны, зычны’ [4, с. 166]), *Рослікаў* (рослік ‘рослы’ [3, с. 352]), *Рудзькоў* (‘руды, рыжы чалавек; укр. рудько мянушка, рыжая, дамашняя жывёла’ [3, с. 354]), *Руды*, *Рыжанкоў* (‘рыжы’ [3, с. 356]), *Русакоў*, *Салагубаў* (рэг. ‘чалавек з тоўстымі заўсёды мокрымі губамі’ [3, с. 362]), *Салтыкоў* (ад татар, салтык ‘кульгавы’ [4, с. 176]), *Сівакоў*, *Сівалобцаў*, *Сілаеў* (сілай ‘сілач, асілак’ [3, с. 374]), *Сінягрыбаў* (са спалучэння з сінімі грыбамі (губамі) [3, с. 374]), *Суглоб* (рэг. суглоб ‘гарбаты чалавек’ [3, с. 396]), *Суханаў* (сухан ‘худы, сухі’ [4, с. 191]), *Сучкоў* (сучок ‘нізенькі, сухі чалавек’ [4, с. 191]), *Сядоў* (рус. седой, ‘сівы’ [3, с. 403]), *Таўсцянкоў*, *Усачоў* (рус. усач ‘вусач’ [3, с. 422]), *Ушанок* (рус. ушан ‘чалавек ці жывёліна з вялікімі вушамі’ [3, с. 422]), *Храмееў*, *Храмцоў*, *Храмянкоў* (рус. хромец ‘кульгавы’ [3, с. 433]), *Целепнеў*, *Целяпнёў* (целепень ‘нясклады, нязграбны чалавек’ [3, с. 437]), *Чарняк*, *Чарняўскі* (ад ‘чарнявы’ [3, с. 448]), *Чарноў*, *Чарнышэвіч* (рус. черныш ‘смуглы, чарнявы чалавек’ [3, с. 448]), *Чарнавусаў*, *Шаўкуноў* (рэг. шаўкун ‘той, хто шамкае, невыразна гаворыць з-за адсутнасці зубоў’ [3, с. 471]), *Шмаргуноў* (рэг. шмаргун ‘той, хто шморгае носам’ [3, с. 478]), *Шульгін* (шульга ‘ляўша’ [4, с. 229]), *Шыраеў* (шырай ‘шыракаплечы’ [4, с. 228]); *Алымаў* (рэг. алым ‘прасцяк’ [6, с. 13]), *Батурын* (батура ‘упарты, незгаворлівы’ [4, с. 28]; батура ‘вартавая вежа’, батыр ‘асілак, волат’ [6, с. 28]), *Башылаў* (башыла ‘свавольнік’, ‘дураслівец’ [4, с. 31]), *Буянкоў* (ад буян, дэбашыр [3, с. 74], *Гатальскі* (параўн. рэг. гаталяй ‘гультай’ [3, с. 106]), *Глазуноў* (рус. глазун ‘разявака, той, хто без справы ходзіць і разглядвае’ [3, с. 110]), *Глотаў* (глот ‘крыўдзіцель, вымагальнік’ [4, с. 58]; глот ‘скнары чалавек, п’яніца’ [6, с. 79]), *Гуз*, *Гузанаў, Гузоўскі* (гуза ‘непаваротлівы, няспрытны’ [4, с. 64]), *Драчоў* (драч ‘задзіра, крыўдзіцель’ [4, с. 69], *Дзеравяшкін* (дзеравяга ‘цурбан, балван, дурань’ [6, с. 90]), *Дзівакоў* (дзівак ‘чалавек з незвычайнымі схільнасцямі, звычкамі, поглядамі’ [5, с. 178]), *Дзікароў* (ад дзікар ‘нелюдзімы чалавек’ [3, с. 130]), *Дзюндзікаў* (рэг. дзюндзік ‘п’яніца’, ‘гультай’ [3, с. 131]), *Зацееў* (зацей ‘выдумшчык, пачынальнік’ [3, с. 158]), *Зубараў*, *Зубкоў* (ад зуб; ‘той, хто ўвесь час паказвае зубы, кпіць над іншымі’ [4, с. 85]), *Зуеў, Зыкаў* (‘чалавек з гучным голасам’ [4, с. 85]), *Кепін* (рэг. кеп ‘дурань, дурны’ [3, с. 199]), *Козыраў* (козыр ‘чалавек храбры’, ‘франт, фарсун’ [4, с. 101]), *Круцялёў* (‘хітрун, махляр’ [5, с. 302]), *Курака* (параўн. цюрк. курак ‘скупы, прагны, задумлівы, летуценнік’ [4. с. 113]), *Куракін* (ад цюрк. курак ‘сухі, задумлівы, або скупы

чалавек’ [1, с. 47]), *Лынькоў* (рус. лынь ‘гультай, хто ўцякае ад справы, бадзяга’ [3, с. 260]), *Любезны* (рус. любезный ‘ласкавы, мілы, ветлівы’ [3, с. 261]), *Мануйлаў* (рус. мануйла ‘абманшчык, той, хто ўмее выманіць’ [3, с. 274]), *Марачкоў* (рус. марач ‘той, хто пэцкае’ [3, с. 275]), *Марчанка* (параўн. рэг. марчыць ‘мучыць тугою’ [3, с. 277]), *Налётаў* (налёт ‘крыўдзіцель’ [4, с. 138]), *Недаростак*, *Недаросткаў*, *Папсуеў* (папсуй ‘той, хто псуе’ [3, с. 314]), *Пералыгін* (пералыга ‘той, хто распаўсюджвае весткі ў скажоным выглядзе’ [4, с. 152]), *Піскуноў* (піскун ‘той, хто часта пішчыць’ [5, с. 477]), *Плаксін* (плакса ‘пра таго, хто любіць скардзіцца, наракаць’ [5, с. 478]), *Прастакоў* (рэг. прастак ‘прасцяк, просты чалавек’ [3, с. 332]), *Разумаў*, *Рогачаў* (рогач ‘магутны або ўпарты чалавек’ [4, с. 168]), *Сакуноў* (рэг. сакун ‘той, хто вымаўляе [с] замест іншых гукаў ці цвёрдае [с] замест мяккага’ [3, с. 361]), *Самахвалаў*, *Саранкоў* (тат., кірг. ‘скупы, прыжымісты, прагны чалавек’ [3, с. 366]), *Сігаеў* (параўн. рус. сигала, сигун, сигач ‘скакун, прыгун’ [3, с. 373]), *Смірноў* (ад ‘смірны’ [3, с. 384]), *Сулікаў*, *Сулікоў* (параўн. рэг. сулік ‘абяцанка, абяцанне’, ‘пажаданне’ [3, с. 398]), *Сычоў* (ад сыч ‘маўклівы, пануры чалавек’ [5, с. 646]), *Трусаў* (‘палахлівы чалавек’, ‘заяц’, ‘трус’ [4, с. 199]), *Тульжанкоў* (параўн. бел. туляга ‘той, хто туляецца’ [3, с. 417]), *Філонаў* (жарг. філон ‘гультай’ [3, с. 423]), *Хазаў* (хаз ‘франт, фарсун, марнатравец’ [4, с. 209]), *Хамулькін* (параўн. хамуль ‘хам’ [3, с. 427]), *Харашуноў*, *Хахелька* (рус. хахель ‘абманшчык, які прыкідваецца прыстойным чалавекам’ [3, с. 429]), *Цікавец* (ад цікавы [3, с. 438]), *Ціханаў*, *Ціхановіч* (ціхан ‘ціхі, ціхоня’ [3, с. 438]), *Цымбалаў* (рэг. цымбал лайл. жарт ‘грыбазвон’ [3, с. 441]), *Цюрыкаў* (ад рус. дзеяслова тюрить ‘хлусіць, блытаць’ [10, с.142]), *Чванькоў* (параўн. укр. чванько, чванька ‘ганарлівец, задавака’ [3, с. 449]), *Чваркоў* (параўн. бел. рэг. чвэра ‘гаварун’ [3, с. 450]), *Шастапалаў* (ад рус. шестопалый ‘з шасцю пальцамі’ [10, с. 167]), *Шахраеў* (укр. шахрай ‘ашуканец, круцель, махляр’ [3, с. 472]), *Шаціла*, *Шацілаў* (рэг. шаціла ‘той, хто шатаецца, ходзіць без справы, бадзяга’ [3, с. 472]), *Шкрэдаў* (рэг. шкрэд ‘задзіра, упарты чалавек’ [3, с. 475]), *Шчарбакоў* (ад шчарбак ‘чалавек з тварам, на якім бачны сляды воспы, або чалавек, які не мае зуба’ [10, с. 183]), *Шэметаў* (ад рус. рэг. шэмет ‘вельмі хуткі (у хадзьбе і працы); бадзяга’ [10, с. 166]), *Юдовіч* (юда ‘здраднік; каварны чалавек, хітрун’ [3, с. 496]), *Юркоў* (ад юркі ‘хуткі, жвавы, паваротлівы’ [10, с. 186]) і інш.

Словы, якія абазначаюць асоб па сваяцтву ці па становішчы ў сям’і, па становішчы ў грамадстве, у калектыве, можна сустрэць у прозвішчах: *Адзінцоў* (адзінец ‘адзінокі чалавек, бабыль’ [4, с. 146]), *Асадчы* (укр. осадчий ‘асаднік, першапасяленец, заснавальнік паселішча’ [3, с. 24]), *Бабін*, *Бабкоў*, *Багатыроў*, *Багачоў*, *Байцоў*, *Басякоў* (басяк ‘прадстаўнік дэкласаваных слаёў насельніцтва’ [5, с. 83]), *Батракоў* (батрак ‘наёмны рабочы’ [3, с. 45]), *Баярчанка* (рэг. баяр, баярын ‘буйны землеўладальнік, які належаў да вярхоў пануючага класа’ [5, с. 84]), *Беспразванны* (‘які не мае прозвішча’ [3, с. 53]), *Блізнічэнка* (ад блізкі [3, с. 55]), *Боцман*, *Варывода* (рэг. ‘бедны чалавек’ [7, с. 119]), *Ваявода* (ваявода ‘на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1920 да 1939 і ў Польшчы: кіраўнік ваяводства’ [5, с. 108]), *Воінаў*, *Войтаў*, *Войцік* (ст. бел. войт ‘старшыня мяшчанскага ці магдэбургскага суда’, ‘наглядчык за прыгоннымі, прыганяты, прызначаны з сялян памешчыкам’ [3, с. 89]), *Гайдук* (ад гайдук ‘паўстанец-партызан на Балканах і ў Венгрыі ў эпоху турэцкага ўладальніцтва, або слуга, выязны лакей часоў прыгоннага права’ [5, с. 140]), *Гаруноў* (рус. горюн ‘гаротнік’ [4, с. 61]), *Гараднічы* (‘начальнік горада (у Расіі да сярэдзіны 19 ст.)’ [5, с. 144]), *Гарэлаў* (гарэлымі называлі людзей-пагарэльцаў [4, с. 60]), *Гарэленка* (ад гарэлы [3, с. 1051), *Дворкін* (рэг. дварак, ‘шляхціч’ [3, с. 128]), *Дзедзік*, *Дзядоў*, *Дзедаў* (ад дзед [3, с. 128]), *Дзякаў* (дзяк ‘у праваслаўнай царкве: ніжэйшы служыцель, які не мае ступені свяшчэнства; псаломшчык’ [5, с. 179]), *Дзяржаўскі* (параўн. ст. бел. державца ‘правіцель вобласці’, ‘часовы ўладальнік’ [3, с. 132]), *Дольнікаў* (уст. дольнік ‘удзельнік долі’ [3, с. 134]), *Жалдак* (рус. форма желдак, або жолдак ‘салдат, воін’ [4, с. 77]), *Жданаў* (імя Ждан бацькі давалі доўгачаканаму жаданаму сыну [4, с. 77]), *Жыхараў* (жыхар ‘той, хто жыве ў памяшканні, жылец’ [5, с. 202]), *Засядацелеў*, *Казакевіч* (казак ‘даўней на Украіне і ў Расіі: член ваенна-земляробчай абшчыны пасяленцаў на ўскраінах дзяржавы, якія актыўна ўдзельнічалі ў абароне дзяржаўных граніц’ [5, с. 263]), *Іназемцаў* (іназемец ‘іншаземец’ [3, с. 164]), *Кадзетаў*, *Камісараў* (камісар ‘службовая асоба, чыноўнік, якому давалася адказнае даручэнне’ [4, с. 103]), *Каплан* (рэг. ‘капелан’ [3, с. 180]), *Каралеў*, *Кароль*, *Катлабай* (з тат. котлы ‘шчасце’ і бай ‘багаты’ [3, с. 192]), *Каталікаў*, *Князеў*,

Коханаў (рус. коханый ‘каханы’ [4, с. 107]), *Ксяндзоў*, *Купцоў*, *Купчык*, *Купчыкаў* (ад купец [3, с. 232]), *Маёраў*, *Маёрчык*, *Малышэўскі* (ад малыш [3, с. 272]), *Манастырскі*, *Навасёлаў* (навасёл ‘новы пасяленец, жыхар’ [5, с. 358]), *Невядомы*, *Нечаеў* (нечай ‘той, каго не чакалі’ [4, с. 142]), *Новікаў* (ад новік ‘новы жыхар, які аднекуль прыйшоў’ [10, с. 82]), *Пазнякоў* (рус. поздняк ‘апошняе дзіця ў старых бацькоў, ці дзіця, якое нарадзілася праз доўгі час пасля папярэдняга’ [3, с. 308]), *Панкоў*, *Панкоўскі*, *Панчанка*, *Панчыкаў*, *Паноў* (ад пан [3, с. 313]), *Попчанка* (ад поп [3, с. 329]), *Прывалаў* (параўн. рус. привал ‘прымак’ [3, с. 334]), *Прыходзька* (‘той, хто прыйшоў, прышлы’ [3, с. 336]), *Салдаценка*, *Самажонаў*, *Самажэнаў* (са спалучэння сам жэніцца [3, с. 364]), *Скарабагаты* (рус. скоробогат ‘хто скора разбагацеў’ [3, с. 376]), *Спасенікаў*, *Спасенка*, *Спасенкаў*, *Спасянкоў* (магчыма ад спасены ‘выратаваны, уратаваны’ [3, с. 388]), *Старавойтаў*, *Старасотнікаў*, *Старасценка* (ад стараста [3, с. 390]), *Страдаеў* (магчыма, ‘той, хто шмат пакутаваў’; страда ‘гарачая пара для працы’ [6, с. 301]), *Субоцін* (‘дзіця, якое нарадзілася ў суботу’ [4, с. 190]), *Судараў*, *Сяржантаў*, *Траянаў* (укр. троян ‘бацька траіх блізнят’ [10, с. 413]), *Удовін* (ад удава [3, с. 420]), *Хрычкоў* (рэг. лайл. ‘стары хрыч, стары чорт’ [3, с. 434]), *Худзякоў* (худзяк ‘бедны чалавек’ [6, с. 344]), *Царанкоў*, *Царыкаў*, *Цуранкоў* (параўн. рэг. цурацца ‘адракацца, выракацца’ [3, с. 439]), *Чарнецкі* (чарнец ‘манах’ [5, с. 744]), *Шляхцінцаў* і інш.

Аналіз вышэй разгледжаных прозвішчаў дае нам магчымасць сцвярджаць, што самай прадуктыўнай матывацыйнай базай для ўтварэння прозвішчаў Калінкавіцкага раёна з’яўляецца апелятыўная лексіка, якая прадстаўлена разнастайнымі лексіка-семантычнымі групамі. Найбольш пашыранымі з’яўляюцца прозвішчы, што ўтварыліся ад прафесій, фізічных і разумовых характарыстык чалавека, асаблівасцей характару, яго схільнасцей і прывычак, назваў раслiннага і жывёльнага свету. Менш пашыраны прозвішчы, што ўтварыліся ад прадуктаў харчавання, геаграфічных назваў.

Літаратура

1. Суперанская, А.В. Современные русские фамилии / А.В. Суперанская, А.В. Суслова ; под. ред. Ф.П. Филина. – Москва : Наука, 1981. – 176 с.

2. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія. Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М.В. Бірыла. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1966. – 327 с.

3. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М.В. Бірыла. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1969. – 508 с.

4. Федосюк, Ю.А. Русские фамилии: Популярный этимологический словарь / Ю.А. Федосюк. – Москва : Детская литература, 1980. – 239 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко ; афармленне А.М. Хількевіча. – 3-е выд. – Мінск : БелЭн, 2002. – 784 с.

6. Веселовский, С.Б. Ономастикон. Древнерусские имена, прозвища и фамилии / С.Б. Веселовский. – Москва : «Наука», 1974. – 382 с.

7. Усціновіч, Г.К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны (XIV–XVIII стст.) / Г.К. Усціновіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 175 с.

8. Федосюк, Ю.А. Что означает ваша фамилия? / Ю.А. Федосюк. – 3-е изд. – Москва : Флинта: Наука, 2008. – 88 с.

9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыклапедыі, 1978. – Т. 2. Г–К. – 768 с.

10. Никонов, В.А. Словарь русских фамилий / В.А. Никонов ; сост. Е.Л. Крушельницкий. – Москва : Школа-Пресс, 1993. – 224 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 21.11.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3'34

Элементарнае чаргаванне: з вопыту прымянення тэорыі альтэрнацый да матэрыялу беларускай мовы

Н.М. Гардзей

У артыкуле прадстаўлена інтэрпрэтацыя некаторых элементарных чаргаванняў, якія назіраюцца перш за ўсё ў сферы дзеяслоўнай парадыгматыкі сучаснай беларускай мовы. Змест артыкула накіраваны на абгрунтаванне палажэння аб тым, што ідэнтыфікацыя сістэмных элементарных альтэрнацый не можа быць адвольным даследчыцкім актам – яна павінна абапірацца на лінгвістычную тэорыю чаргаванняў.
Ключавыя словы: элементарнае чаргаванне, вар'іраванне (мадыфікацыя) марфемы, глыбінная структура марфемы, усячэнне, нарашчэнне.

The article presents the interpretation of some elementary alternations that are observed in the sphere of the verb paradigmatics of the modern Belarusian language. The content of the article is aimed at substantiating the statement that the identification of systemic elementary alternations cannot be an arbitrary research act – it must be based on the linguistic theory of alternations.
Keywords: elementary alternation, morpheme variation (modification), deep morpheme structure, truncation, extension.

Кардынальным паняццем марфаналогіі і асноўным марфаналагічным сродкам узаемапрыстасавання марфем у структуры словаформ беларускай мовы – мовы фузійнага тыпу – з'яўляецца **чаргаванне** (**альтэрнацыя**). У сучасным мовазнаўстве чаргаванне разглядаецца як з'ява замяшчэння адных адзінак плана выражэння (фанем, марфанем або іх паслядоўнасцей, радзей – супрасегментных адзінак) іншымі адзінкамі ў межах адной і той самай марфемы, якое адбываецца паводле пэўных правілаў. Лінгвістычнае прадстаўленне чаргаванняў звязана з шэрагам праблем, такіх як выяўленне і атаясамліванне элементарных чаргаванняў, дыферэнцыяцыя чаргаванняў і іншых сродкаў марфемнага вар'іравання, вызначэнне характару абумоўленасці чаргавання і яго статусу ў моўнай сістэме, вызначэнне кірунку чаргавання, выяўленне ступені прадуктыўнасці і рэгулярнасці чаргаванняў, вызначэнне тыпаў і функцыі чаргаванняў. Падставай для вырашэння гэтых праблем з'яўляецца тэорыя чаргаванняў. Асноўныя палажэнні гэтай тэорыі ў рускім мовазнаўстве былі сфармуляваны ў працах І.А. Бадуэна дэ Куртэнэ, І.А. Мельчука, Ю.С. Маслава, С.М. Талстой [1], [2], [3], [4]. Кароткае, але інфармацыйна насычанае выкладанне данай тэорыі прадстаўлена ў «Лингвистическом энциклопедическом словаре» [5, с. 580–581], а таксама ва ўніверсальнай навукова-папулярнай он-лайн энцыклапедыі «Кругосвет» [6]. Мэта гэтага артыкула – прадэманстраваць прымяненне тэорыі чаргаванняў да фанемных альтэрнацый, што рэалізуюцца ў марфемах беларускай мовы. Паслядоўнае прымяненне тэорыі чаргаванняў да фактаў фанемнага вар'іравання марфем у некаторых выпадках прыводзіць да пераасэнсавання гэтых фактаў і перагляду іх лінгвістычнай інтэрпрэтацыі, прадстаўленай у граматычных апісаннях сучаснай беларускай мовы.

Элементарнае чаргаванне фанем – гэта фанемная пара, кампаненты якой у межах адной і той самай марфемы ўступаюць у адносіны замяшчэння, абумоўленыя пазіцыяй данай марфемы адносна іншых марфем у структуры слова. Унутрымарфемныя элементарныя альтэрнацыі, узнікненне якіх нельга патлумачыць фаналагічным кантэкстам, разглядаюцца, як правіла, у якасці прадмета марфаналогіі. Напрыклад, у «Слоўніку беларускай мовы»-87 [7] фіксуюцца словы *лак**э́**й*, *жак**э́**й*. Іх фаналагічнае афармленне сведчыць аб тым, што спалучэнне фанем ***-к'эй*** у пазіцыі канца слова не пярэчыць законам фанемнай сінтагматыкі сучаснай беларускай мовы. Аднак ёсць і такія словаформы, у фінальнай частцы якіх гэта спалучэнне фанем не дапускаецца, напрыклад, словаформы вышэйшай ступені параўнання прыслоўя, параўн.: *св**э́**тла – святл**э́**й*, але *хутка – хут**ч**э́**й*** (не ******хуткэ́й*). Пры тлумачэнні чаргавання ***цвёрдая заднеязычная к ~ шыпячая ч*** у выпадку *хутка – хут**ч**э́й* мы гаворым пра тое, што гэта чаргаванне рэгулярна адбываецца ў аснове прыслоўя пры ўтварэнні формы

кампаратыва з дапамогай суфікса ***-эй*** (параўн. таксама: *лёг**к**а – ляг**ч**э́й*). Той факт, што пры тлумачэнні мадыфікацыі асновы прыслоўя мы апелюем не да якасці галоснай фанемы пярэдняга рада ***э***, а да марфемнай структуры і граматычна-дэрывацыйнай характарыстыкі словаформы, унутры якой адбываецца чаргаванне ***к ~ ч***, і ёсць сведчаннем таго, што перад намі элементарная, абумоўленая марфаналагічнай пазіцыяй альтэрнацыя, на рэалізацыю якой уплывае як план выражэння (экспанент), так і план зместу суфікса ***-эй***.

Выяўленне і атаясамліванне элементарных чаргаванняў. У апісанні марфаналогіі беларускай мовы, як і ў апісаннях іншых моў з развітымі марфаналагічнымі характарыстыкамі, прадугледжваецца прадстаўленне па магчымасці поўнага рэестру элементарных чаргаванняў фанем, што спадарожнічаюць працэсам словазмянення і дэрывацыі слоў розных часцін мовы. Аднак гэта задача зусім не трывіяльная. Асноўная цяжкасць, з якой сутыкаецца марфанолаг пры вызначэнні элементарных альтэрнацыйных пар, – гэта выяўленне фаналагічнага субстрату даных марфаналагічных адзінак. Напрыклад, пры аналізе парадыгмы дзеяслова *спаць* выяўляецца фанемны рад: ***п*** (*спаць*) ~ ***п’*** (*спяць*) ~ ***пл’*** (*сплю*). Аднак якія фанемныя пары лічыць элементарнымі чаргаваннямі: ***п ~ п’*** (*спаць ~ спяць*) і ***п’ ~ пл’*** (*спяць ~ сплю*) ці ***п ~ п’*** (*спаць ~ спяць*) і ***п ~ пл’*** (*спаць ~ сплю*)? Аналагічная праблема ўзнікае пры выяўленні элементарных чаргаванняў у парадыгме назоўніка *дзень*, дзе ў сярэдзіне асновы рэалізуецца фанемны рад ***е*** (*дзень*) ~ ***ø*** (*дня, дні*) ~ ***о*** (*дзён*). У такой сітуацыі можна лічыць элементарнымі як чаргаванне ***е ~ ø*** (*дзень ~ дня*) і вакалічную альтэрнацыю ***е ~ о*** (*дзень ~ дзён*), так і чаргаванні ***е ~ ø*** (*дзень ~ дня*) і ***ø ~ о*** (*дні ~ дзён*).

Выяўленне элементарных чаргаванняў у сістэме мовы залежыць перш за ўсё ад таго, як прадстаўляюцца марфалагічныя і словаўтваральныя адносіны паміж тымі словаформамі, экспаненты якіх утрымліваюць пераменныя фаналагічныя сегменты. А гэта значыць, што ў ідэале прадстаўленне сістэмных элементарных чаргаванняў павінна абапірацца на экспліцытныя і несупярэчлівыя апісанні марфалагічнай і словаўтваральнай дэрывацыі і абгрунтоўвацца такімі апісаннямі. Данае палажэнне разглядаецца ў сучаснай марфаналагічнай тэорыі як найважнейшы прынцып ідэнтыфікацыі элементарных фанемных альтэрнацый [4, с. 72]. Зыходзячы з гэтага прынцыпу, трэба, відаць, прызнаць, што ў парадыгме дзеяслова *спаць* адбываюцца элементарныя чаргаванні ***п ~ п’*** і ***п’ ~ пл’***, а ў парадыгме назоўніка *дзень* – чаргаванні ***е ~ ø*** і ***ø ~ о***[1].

Яшчэ адзін важны прынцып выяўлення элементарных альтэрнацый – гэта патрабаванне **натуральнасці** чаргавання: яно не павінна пярэчыць тым гістарычным працэсам, якія адбываліся ў сістэме мовы на працягу яе развіцця. Гэта значыць, што пры выяўленні элементарных альтэрнацый неабходна ўлічваць факты дыяхраніі [8]. Так, напрыклад, інтэрпрэтацыя мадыфікацыі каранёвай марфемы ў парадыгме дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа *прын**я́**ць ~ пры́**м**уць, вы́**ня**ць ~ вы́**м**уць, успрын**я́**ць ~ успры́**м**уць* у некаторых апісаннях марфаналогіі беларускай мовы мае вынікам чаргаванне ***ня ~ м*** [9, с. 260]. Аднак недастаткова толькі зафіксаваць такую альтэрнацыю, неабходна яшчэ і патлумачыць яе, таму што чаргаванне з фаналагічным субстратам ***ня ~ м***, па-першае, не ўспрымаецца як натуральнае для беларускай мовы, у марфемах якой рэалізуюцца, як правіла, вакалічныя і кансанантныя чаргаванні, па-другое, ставіць пад сумнеў лексічнае адзінства словаформ у падобных парах: у гэтым выпадку трэба прызнаць, што каранёвыя марфемы ў аснове інфінітыва, напрыклад, *прын**я́**ць*, і ў аснове цяперашняга (будучага простага) часу, напрыклад, *пры́**м**уць*, не маюць ніводнай агульнай фанемы, а гэта значыць, трэба прызнаць, што перад намі розныя словы з рознымі каранямі, а не граматычныя формы аднаго і таго самага слова, што, канешне ж, ненатуральна[2]. Заўважым таксама, што спрошчаная інтэрпрэтацыя мадыфікацыі каранёвай марфемы ў выпадку *вы́**ня**ць ~ вы́**м**уць* не дае магчымасці патлумачыць прычыну парушэння літаратурнай нормы ў словаформах *выйму*,

[1]Чаргаванні ***е ~ ø*** і ***ø ~ о*** ў гэтым кантэксце разглядаюцца толькі з пункту гледжання іх фанемнага субстрату, без уліку накіраванасці альтэрнацый.

[2]Лексічнае адзінства словаформ у выпадках тыпу *прын**я́**ць ~ пры́**м**уць* у значнай ступені падтрымліваецца прэфіксам, які аказваецца асноўным носьбітам не толькі граматычнага, але і лексічнага значэння.

выйме, *вынімі*, якое дастаткова пашырана ў маўленні, прычым нават у маўленні аўтарытэтных асоб, напрыклад: *Бо што спісана пяром, не вы**йме** і сякера* (Я. Колас); *Тады хоць сэрца вы**німі*** (Н. Гілевіч) [10, с. 180].

Вядома, што на фанемную структуру і фанемны субстрат каранёвых марфем асноў дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа паўплывала мноства дыяхранічных фактараў: лёс спалучэнняў *галосная + насавая зычная* ў сітуацыі дзеяння закону адкрытага склада, узнікненне насавых галосных і іх дэназалізацыя; лёс рэдукаваных галосных, якія або зніклі з марфемных структур, або перайшлі ў галосныя поўнага ўтварэння; лёс спалучэнняў зычных са спрадвечна мяккім зычным гукам [***й***], або ятацыя; перараскладанне марфемнай структуры вытворных прыставачных словаформ; дзеянне закону аналогіі ў фаналагічнай пабудове марфем. Пад уздзеяннем гэтых фактараў адбылося фармальнае распадабненне асновы інфінітыва і асновы цяперашняга (будучага простага) часу дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа [11]. У такой сітуацыі дакладнае і поўнае апісанне элементарных фанемных альтэрнацый магчыма толькі праз прымяненне ў марфаналагічным аналізе некаторых марфаналагічных абстракцый, у прыватнасці, экспліцытных «глыбінных» структур моўных знакаў, якія ўтрымліваюць фанемныя сегменты, «прыхаваныя» ў сучасных беларускіх словаформах вынікамі пэўных фармальных мадыфікацый і таму «аддаленыя ад непасрэднай фанетычнай рэчаіснасці» [12, с. 53], але абгрунтаваныя як з пункту гледжання дыяхраніі, так і з пункту гледжання сінхронных сістэмна-структурных сувязей паміж моўнымі знакамі. Апора на гэты прынцып дазваляе прадставіць глыбінную структуру звязанага кораня дзеясловаў *прыня́ць*, *вы́няць*, *успрыня́ць* як паслядоўнасць марфанем **–{й#м}**[3], што абгрунтоўваецца гістарычна: даныя дзеясловы, як і ўсе дзеясловы падкласа Б VI непрадуктыўнага класа[4], паходзяць ад праславянскага дзеяслова *jьmQ*, *ęti* [13, с. 80]. У сучаснай беларускай мове паводле фаналагічнага субстрату найбольш блізкай да глыбіннага кораня аказваецца каранёвая марфема асновы будучага простага часу, а не асновы інфінітыва: *пры́муць – прыня́ць*, *вы́муць – вы́няць*, *успры́муць – успрыня́ць*. Па гэтай прычыне іменна аснову будучага простага часу мы лічым марфаналагічна зыходнай у парадыгмах названых дзеясловаў. Аналіз фармальных мадыфікацый глыбіннай каранёвай марфемы дзясловаў *пры́муць ~ прыня́ць*, *вы́муць ~ вы́няць*, *успры́муць ~ успрыня́ць* прыводзіць да выяўлення наступных элементарных альтэрнацый, што спадарожнічаюць асноваўтварэнню адзначаных дзеясловаў у сучаснай беларускай мове.

1) У фінальнай частцы формаўтваральных асноў дзеясловаў *пры́**м**муць ~ прыня́ць*, *вы́**м**муць ~ вы́няць*, *успры́**м**муць ~ успрыня́ць* адбываецца **кансанантнае чаргаванне *м ~ ø*.** У лінгвістычных апісаннях гэта чаргаванне можа быць прадстаўлена таксама як з’ява нарашчэння фанемы ***м*** у аснове цяперашняга (будучага простага) часу. Аднак з пункту гледжання дыяхраніі насавая ***м*** у зыходзе формаўтваральнай асновы цяперашняга (будучага простага) часу з’яўляецца гістарычна першаснай (яна ўваходзіла ў склад спалучэння *галосная + насавая*) і яе захаванне перад флексіяй на галосную фанему ў асабовых дзеяслоўных формах не пярэчыла закону адкрытага склада, у той час як перад прыкрытай флексіяй інфінітыва насавая ***м*** паводле таго ж самага закону ўжо не магла рэалізавацца і спачатку ўвайшла ў склад насавой галоснай, а потым і зусім знікла з экспанента асновы інфінітыва. Чаргаваннем ***м ~ ø*** маркіруюцца парадыгмы ўсіх без выключэння дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа: *абні**м**муць ~ абня́ць, зой**м**муць ~ заня́ць, возь**м**муць ~ узя́ць*. У сучаснай беларускай мове рэалізацыя зычнай фанемы ***м*** у аснове цяперашняга (будучага простага) часу дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа адпавядае асноўнаму правілу пабудовы дзеяслоўных структур, а іменна: адкрытая дзеяслоўная аснова

[3]Знак {#} (нулявая марфанема) паказвае, што ў гэтым месцы экспанента глыбіннай каранёвай марфемы дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа на паверхневым узроўні можа рэалізавацца як галосная фанема, напрыклад, *пады́муць*, так і фаналагічны нуль, напрыклад, *зо́йму**ць***.

[4]У падклас Б VI непрадуктыўнага класа ўваходзіць 24 дзеясловы (без уліку зваротных словаформ) са звязаным коранем ***-ня-/-я-*** у аснове інфінітыва: *аб**ня́**ць – абні́муць, ад**ня́**ць – адні́муць, вы́**ня**ць – вы́муць, да**ня́**ць – доймуць, за**ня́**ць – зоймуць, з**ня́**ць – зні́муць, на**ня́**ць – ноймуць, паднан**я́**ць – падноймуць, под**ня́**ць – падні́муць* і *пады́муць, па**ня́**ць – поймуць, перез**ня́**ць – перазні́муць, пера**ня́**ць – пяроймуць, пра**ня́**ць – проймуць, прынан**я́**ць – прыноймуць, пры**ня́**ць – пры́муць, прыпад**ня́**ць – прыпады́муць, прысу**ня́**ць – прысуні́муць, прыўз**ня́**ць – прыўзні́муць, раз**ня́**ць – разні́муць, су**ня́**ць – суні́муць, уз**ня́**ць – узні́муць* і *уздымуць, у**ня́**ць – уйму́ць, успры**ня́**ць – успры́муць; уз**я́**ць – возьмуць* [14].

не можа спалучацца з непрыкрытым афіксам. Паколькі ў субпарадыгмах цяперашняга (будучага простага) часу дзейнічаюць, як правіла, непрыкрытыя флексіі, дзеяслоўная аснова адпаведных словаформ павінна быць закрытай: *прым-у́*, *пры́м-еш* і г.д.; *вы́м-у*, *вы́м-еш* і г.д.; *успрым-у́*, *успры́м-еш* і г. д.

2) У ініцыяльнай частцы формаўтваральных асноў дзеясловаў *пры́муць ~ прыня́ць*, *вы́муць ~ вы́няць*, *успры́муць ~ успрыня́ць* адбываецца таксама **чаргаванне зычных фанем *й ~ н'***, аднак яго рэалізацыя прыхаваная вынікамі наступных мадыфікацый каранёвай марфемы асновы цяперашняга (будучага простага) часу, а іменна, дыярэзай фанемы ***й*** і ўзнікненнем чаргавання ***ø ~ н'***. Тым не менш, сапраўднасць чаргавання ***й ~ н'*** пацвярджаецца яго відавочнасцю ў парадыгмах іншых дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа, параўн.: *до́ймуць ~ дня́ць*, *зо́ймуць ~ зня́ць*, *пяро́ймуць ~ перня́ць*, а прысутнасць фанемы ***й*** у глыбінных структурах каранёвых марфем асноў цяперашняга (будучага простага) часу *пры*{**й#м**}*уць*, *вы*{**й#м**}*уць*, *успры*{**й#м**}*уць* пацвярджаецца аднакаранёвымі словамі, напрыклад, *пры*[***й***о́]*мнік*, *вы́*[***й***э]*мка, успры*[***й***і]*млівы*. З пункту гледжання дыяхраніі кампанент ***й*** чаргавання ***й ~ н'*** (з магчымай далейшай трансфармацыяй гэтага чаргавання ў альтэрнацыю ***ø ~ н'***) з'яўляецца гістарычна першасным. Кампанент жа ***н'*** у экспаненце каранёвай марфемы асновы інфінітыва ўзнік па аналогіі з вынікам перараскладання марфемных структур, якое спадарожнічала ўтварэнню словаформ з прыназоўнікамі на ***-н*** тыпу *съ ними → съ ними, къ нимъ → къ нимъ*. Як вядома, з цягам часу пратэза ***н*** з яе абавязковай палаталізацыяй перад коранем на ***й-*** пачала адбывацца і пасля іншых прыназоўнікаў, напрыклад, *на нихъ* [15, с. 174], а таксама і пасля прэфіксаў, якія паходзяць ад адпаведных прыназоўнікаў. Варта заўважыць, што ў сучаснай беларускай мове ініцыяльная фанема ***н'*** у аснове інфінітыва дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа, акрамя чыста структурных, прымае на сябе семантычныя (параўн.: *узя́ць* і *ўзня́ць*) і граматычныя функцыі. Так, рэгулярна маркіруюцца фанемай ***н'*** толькі інфінітыўныя асновы дзеясловаў закончанага трывання (за выключэннем *узя́ць*). У асновах жа будучага простага часу дзеясловаў закончанага трывання, а таксама ў асновах аднакаранёвых дзеясловаў незакончанага трывання фанема ***н'*** у пачатку кораня можа:

– рэалізавацца, напрыклад: *адня́ць – адні́му́*, *адні́муць*; *адня́ць – адні́ма́ць*;

– уступіць у адносіны замяшчэння з фанемай ***й***, напрыклад: *зня́ць – йму́*, *зо́ймуць*; *зня́ць – йма́ць*;

– уступіць у адносіны замяшчэння з ***фаналагічным нулём***: *прыня́ць – прыму́*, *пры́муць*; *вы́няць – вы́му*, *вы́муць*; *успрыня́ць – успрыму́*, *успры́муць*; *падня́ць – падыму́*, *падры́муць* (але і *падні́му́*, *падні́муць*); *прыня́ць – прыма́ць*, *вы́няць – выма́ць*, *успрыня́ць – успрыма́ць*, а таксама *падня́ць – падыма́ць* (параўн.: *пад'*[***й***о]*м*);

– уступіць у пазіцыйна не абумоўленыя і нерэгулярныя адносіны замяшчэння з фанемай ***д***: *узня́ць – уздыму́*, *уздры́муць* (але і *ўзні́му́*, *узні́муць*); *узня́ць – уздыма́ць*, *абня́ць – абдыма́ць* (але і *ўзні́ма́ць*, *абні́ма́ць*).

3) **Нулявая марфанема {#}** у сярэдзіне глыбіннай структуры каранёвай марфемы дзеясловаў *пры́муць ~ прыня́ць*, *вы́муць ~ вы́няць*, *успры́муць ~ успрыня́ць* знаходзіць рознае фанемнае выражэнне ў аснове інфінітыва і ў аснове цяперашняга (будучага простага) часу. У аснове інфінітыва яна прадстаўлена фанемай ***а***, якая гістарычна з'яўляецца вынікам дэназалізацыі насавой галоснай, а ў аснове цяперашняга (будучага простага) часу гэта марфанема рэалізуецца ў фанеме пярэдняга рада ***і*** (фанет. [***ы***]), якая, аднак, паглынаецца прэфіксам, што заканчваецца таксама на фанему ***і*** (фанет. [***ы***]). Па гэтай прычыне элементарная вакалічная альтэрнацыя ***і ~ а*** зацямняецца ў каранёвай марфеме формаўтваральных асноў дзеясловаў *пры́муць ~ прыня́ць*, *вы́муць ~ вы́няць*, *успры́муць ~ успрыня́ць*: каранёвая фанема ***і*** не выяўляецца на паверхневым узроўні структуры асноў *прым-*, *вым-*, *успрым-*, якія ў сучаснай беларускай мове аказаліся вынікам словаўтваральнай гаплалогіі, або частковага накладання марфем, параўн.: *пры-*(*ы*)*м-уць*, *вы-*(*ы*)*м-уць*, *успры-*(*ы*)*м-уць*. Такая ж самая сітуацыя ў арганізацыі структуры кораня назіраецца і ў адпаведных словаформах незакончанага трывання: *пры-*(*ы*)*м-а-ць* (параўн. са стараславянскай словаформай *приимати*, зафіксаванай, напрыклад, у «Старославянском словаре (по рукописям X–XI веков)» [16]), *пры-*(*ы*)*м-а*[*й-у*]*ць*; *вы-*(*ы*)*м-а-ць*, *вы-*(*ы*)*м-а*[*й-у*]*ць*; *успры-*(*ы*)*м-а-ць*, *успры-*(*ы*)*м-а*[*й-у*]*ць*. Зразумела, што накладанню прыставачнай і каранёвай марфем ва ўсіх гэтых выпадках папярэднічала выпадзенне ініцыяльнай каранёвай фанемы ***й***.

Такім чынам, выяўленне элементарных альтэрнацый у некаторых выпадках аказваецца магчымым толькі ў выніку прыцягнення метадаў і працэдур дынамічнай марфаналогіі, у прыватнасці, звароту да такой марфаналагічнай абстракцыі, як **глыбінная структура** каранёвай **марфемы** дзеяслова, а таксама прызнання таго факта, што аснова інфінітыва не заўсёды з'яўляецца марфаналагічна зыходнай у дзеяслоўнай парадыгме. Натуральна, што ў сінхроннным аспекце элементарныя альтэрнацыі ***м ~ ø***, ***ø ~ н'*** (← ***й ~ н'***), ***і ~ а***, выяўленыя ў фінальнай, ініцыяльнай і медыяльнай частках каранёвай марфемы дзеясловаў *пры́муць ~ прыня́ць*, *вы́муць ~ вы́няць*, *успры́муць ~ успрыня́ць*, не з'яўляюцца пазіцыйна абумоўленымі – у сучаснай беларускай мове гэта выключна граматычныя чаргаванні, якія маркіруюць дзеяслоўную парадыгматыку паводле традыцыі.

З праблемай выяўлення элементарных фанемных альтэрнацый звязана таксама **праблема** іх **атаясамлівання**. Пытанне заключаецца ў тым, ці можна лічыць адным і тым самым чаргаваннем, напрыклад, чаргаванне ***к ~ ч***, якое рэалізуецца:

– у адной і той самай марфеме, але ў розных сферах дэрывацыі – у парадыгме дзеяслова: *пла**к**-аць ~ пла**ч**-уць* і ў словаўтваральнай пары: *пла**к**-аць ~ пла**ч***;

– у розных марфемах, але ў аналагічных парадыгмах: *пла**к**-аць ~ пла**ч**-уць* і *кл**і**к-аць ~ кл**і**ч-уць*;

– у розных марфемах і ў розных парадыгмах: *пла**к**-аць ~ пла**ч**-уць*, *ру**к**-а ~ ру**ч**-н*(*ы*), *лёг**к**-а ~ ляг**ч**-эй*.

Адказ на гэта пытанне вызначаецца наступнымі палажэннямі тэорыі чаргаванняў: а) немэтазгодна разглядаць у якасці асобнага кожнае элементарнае чаргаванне ў кожнай канкрэтнай марфеме; б) як адно чаргаванне мэтазгодна разглядаць такія тоесныя паводле фанемнага субстрату альтэрнацыі, якія рэалізуюцца ў розных марфемах, але ў тоесных пазіцыях і апісваюцца аднолькавымі правіламі [4, с. 72]. З гэтага вынікае, што прыведзеныя прыклады дэманструюць 4 альтэрнацыі, хаця і тоесныя паводле фаналагічнага субстрату, але розныя паводле функцыі і правілаў рэалізацыі: 1) ***к ~ ч*** (*пла**к**аць ~ пла**ч**уць*, *кл**і**каць ~ кл**і**чуць*); 2) ***к ~ ч*** (*пла**к**аць ~ пла**ч***); 3) ***к ~ ч*** (*ру**к**а ~ ру**ч**ны*); 4) ***к ~ ч*** (*лёг**к**а ~ ляг**ч**эй*).

Дыферэнцыяцыя чаргаванняў і іншых сродкаў марфемнага вар'іравання. Праблема выяўлення і атаясамлівання чаргаванняў у сучаснай беларускай мове ўскладняецца праблемай іх размежавання ад іншых сродкаў марфемных мадыфікацый. У традыцыйнай марфаналогіі марфемныя мадыфікацыі падзяляюцца на лінейныя (усячэнне, нарашчэнне, мена фіналей) і нелінейныя (чаргаванні) пераўтварэнні. Такі падыход не з'яўляецца, аднак, агульнапрынятым ў найноўшых апісаннях марфаналогіі натуральных моў, у якіх у паняцце **чаргаванне** ўключаюцца не толькі паняцце **мена фанем**, але і паняцці **ўсячэнне**, **нарашчэнне**, **метатэза** [2, с. 62–69], а таксама **склейка** і **разгортка** [6]. Уласна чаргаваннямі (менамі) называюцца чаргаванні віду X ~ Y, напрыклад, *ру**к**а ~ ру**ч**ны*. Усячэнні і нарашчэнні разглядаюцца як альтэрнацыі віду X ~ Ø і Ø ~ X, напрыклад, *пля**т**у ~ плёў*, *заўтра ~ заўтра**ш**ні*. Метатэза – чаргаванне віду XY ~ YX – сустракаецца рэдка. У сучаснай беларускай мове яна прадстаўлена адзінкавымі прыкладамі: *не**рв**ы ~ не**ў**ралогія*. Склейка і разгортка – гэта чаргаванні віду XY ~ Z і X ~ YZ. Прыкладам склейкі з'яўляецца чаргаванне ***ав ~ у*** у выпадках тыпу *к**ав**аць ~ к**у**юць*, *сум**ав**аць ~ сум**у**юць*. Прыкладам разгорткі з'яўляецца чаргаванне ***о ~ ав*** у санскрыце: *st**o**tum* 'хваліць' ~ *st**av**ana* 'пахвала'. Даволі часта склейкі і разгорткі разглядаюцца як камбінацыя (накладанне) чаргаванняў: X ~ Z + Y ~ Ø і X ~ Y + Ø ~ Z [6].

У працэсе апісання марфаналагічных сродкаў беларускай мовы даследчык, незалежна ад таго, якой класіфікацыі гэтых сродкаў ён прытрымліваецца, аказваецца перад неабходнасцю аддзяліць адзін сродак ад іншага і аргументаваць прынятае рашэнне. Гэта задача далёка не простая. Так, сцвярджэнне аб тым, што ў словаформах тыпу *б**і**ць ~ б**й**уць*, *п**і**ць ~ п**й**уць* рэалізуецца мена фанем ***і ~ й*** [9, с. 255], можа быць прынята як вынік толькі першаснага, самага павярхоўнага аналізу. Больш глыбокае пранікненне ў марфалагічную сістэму дзеяслова прыводзіць да вываду аб тым, што сродкамі мадыфікацыі асновы цяперашняга часу ў прыведзеных прыкладах з'яўляюцца чаргаванне ***ø ~ й*** (або нарашчэнне) і чаргаванне ***і ~ ø*** [10, с. 34], якое, аднак, у парадыгмах аднаскладовых дзеясловаў з асновай інфінітыва на ***-і*** не з'яўляецца ў сучаснай беларускай мове рэгулярным, параўн.: у беларускай мове *бі́ць ~ б'юць*, *пі́ць ~ п'юць*, але *лі́ць ~ льюць* і *л**і**ю́ць*, *ві́ць ~ ую́ць* і *в**і**ю́ць*, *шыць – ш**ы**юць*, тады як у рускай мове толькі *бить ~ бьют*, *пить ~ пьют*, *лить ~ льют*, *вить ~ вьют*, *шить ~ шьют*.

Такім чынам, лінгвістычнае прадстаўленне сістэмных элементарных альтэрнацый беларускай мовы звязана з пэўнымі цяжкасцямі. Як правіла, яны ўзнікаюць у наступных выпадках: 1) калі парадыгма словазмянення (словаўтварэння) маркіруецца як мінімум трохчленным альтэрнацыйным радам: *спаць – сняць – сплю*; 2) калі працэс мадыфікацыі марфемы адбываецца з удзелам розных – нелінейных і лінейных – марфаналагічных сродкаў: *біць – б'юць* [бйуць]; 3) калі розныя сродкі марфемнага вар'іравання закранаюць усе сегменты марфемы, у тым ліку яе ініцыяльны сегмент, што можа прывесці да поўнага фармальнага распадабнення морфаў адной і той самай марфемы: *прыня́ць – пры́муць*. У такіх выпадках марфаналагічны аналіз канкрэтных моўных знакаў – выяўленне і атаясамліванне элементарных чаргаванняў, дыферэнцыяцыя сродкаў марфемнага вар'іравання – не можа быць зведзены да павярхоўнага аўдыё- і відэаназірання. Яго асновай становіцца тэорыя чаргаванняў, паводле якой прадстаўленне сістэмных элементарных альтэрнацый павінна адбывацца з улікам усіх структурна-семантычных сувязей слоў, фанемная абалонка якіх відазмяняецца ў працэсе форма- або словаўтварэння, і, што вельмі важна, з улікам дыяхранічных падстаў марфемных мадыфікацый.

Літаратура

1. Бодуэн де Куртенэ, И.А. Опыт теории фонетических альтернаций / И.А. Бодуэн де Куртенэ // Избранные труды по общему языкознанию / редкол. : С.Г. Бархударов (отв. ред.) [и др]. – М. : – Изд-во Академии наук СССР, 1963. – Т. 1. – С. 265–347.

2. Мельчук, И.А. Курс общей морфологии / И.А. Мельчук ; пер. с фр. под общ. ред. Н.В. Перцова, Е.Н. Саввиной. – Москва; Вена : Языки русской культуры, 2000. – Т. III. – 368 с.

3. Маслов, Ю.С. О типологии чередований / Ю.С. Маслов // Звуковой строй языка : сб. науч. ст. / Академия наук СССР, Институт русского языка ; редкол. : Р.И. Аванесов (отв. ред.) [и др.]. – М. : Изд-во «Наука», 1979. – С. 195–201.

4. Толстая, С.М. Морфонология в структуре славянских языков / С.М. Толстая. – М. : Издательство «Индрик», 1998. – 320 с.

5. Лингвистический энциклопедический словарь / Научно-редакционный совет издательства «Советская энциклопедия», Ин-т языкознания АН СССР ; редкол. : Н.Д. Арутюнова [и др.] ; гл. ред. В.Н. Ярцева. – М. : «Советская энциклопедия», 1990. – 685 с.

6. Чередование // Энциклопедия «Кругосвет» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.krugosvet.ru/node/41035. – Дата доступа : 17.12.2018.

7. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР ; пад рэд. М.В. Бірылы. – Мінск : БелСЭ, 1987. – 903 с.

8. Колосова, Т.В. Морфонологические явления и их роль в словообразовательной системе современного английского языка (на материале суффиксальных производных неисконного происхождения) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.04 / Т.В. Колосова ; МГПИИЯ. – Минск, 1990. – 21 с.

9. Русак, В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы / В.П. Русак. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 316 с.

10. Беларуская граматыка: у 2 ч. / рэд. : М.В. Бірыла, П.П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 431 с.

11. Яўгенідзэ, І.Т. Формаўтваральныя асновы дзеясловаў падкласа Б VI непрадуктыўнага класа ў дыяхранічным аспекце / І.Т. Яўгенідзэ // Наука-2013 : сб. науч. ст. : в 2 ч. ; редкол. : Г.А. Хацкевич (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2013. – Ч. 1. – С. 254–257.

12. Ворт, Д.С. О роли абстрактных единиц в русской морфонологии / Д.С. Ворт // Развитие современного русского языка. 1972. – М. : Наука, 1975. – С. 53–68.

13. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – Т. 8. Н-П / уклад. Г.А. Цыхун [і інш.] ; рэд. В.У. Мартынаў. – 270 с.

14. Граматычны слоўнік дзеяслова / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад. В.П. Русак [і інш.] ; навук. рэд. А.І. Падлужны, В.П. Русак. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 1252 с.

15. Янкоўскі, Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы: вучэбны дапаможнік. – 3-е выданне, выпраўленае / Ф.М. Янкоўскі. – Мінск : Вышэйшая школа, 1989. – 301 с.

16. Старославянский словарь (по рукописям X–XI веков) [Электронный ресурс] / Под ред. Р.М. Цейтлин, Р. Вечерки, Э. Благовой. – Режим доступа : http://www.promacedonia.org/cejtlin/. – Дата доступа : 19.12.2018.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 09.01.2019

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 81’373.612.2:597.6:398.92(=161.3)(=111)

Метафарызацыя ў фразеалогіі беларускай і англійскай моў: *жаба – frog /toad* як найменне земнаводных

В.Г. Гаўрыловіч

На аснове аналізу ўнутранай формы і фразеалагічнага значэння выяўлена спецыфіка заамарфізму *жаба – frog / toad* у беларускай і англійскай лінгвакультурах, вызначаны асацыятыўныя прыкметы (аб’ектыўныя і суб’ектыўныя), якія фарміруюць культурна-моўны вобраз жабы ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў і англічан. Выяўлена наяўнасць супадзення і разыходжання, агульнага і адметнага ў выкарыстанні працэсу метафарызацыі і спосабах наймення, створаных вобразах другасных адзінак для характарыстыкі і ацэнкі чалавека ў беларускім і англійскім соцыумах.
Ключавыя словы: фразеалагізм, кампанент *жаба*, метафарызацыя, зааморфная метафара, асацыятыўныя прыкметы, культурная інфармацыя.

In the article on the base of the analysis of the inner form and phraseological meaning the differences in assigning zoomorphism *жаба – frog / toad* in the Belarusian and English linguacultures are revealed. Associative features (objective and subjective) forming the cultural-linguistic image of the frog in the phraseological view of the world of Belarusians and Englishmen are identified. The presence of coincidence and discrepancy, the similarities and the differences in the use of the metaphorical process and the methods of naming, created images of phraseological units to characterize and evaluate a person in the Belarusian and English societies are defined.
Keywords: phraseological unit, component *жаба*, metaphorization, zoomorphic metaphor, associative features, cultural information.

Метафара – адзін з найбольш прадуктыўных сродкаў фарміравання другасных найменняў у стварэнні моўнай карціны свету.

У мовазнаўстве існуе больш за дзесяць кірункаў даследавання метафары [1, с. 58], сярод якіх прадуктыўна распрацоўваецца лінгвакагнітыўны кірунак. У межах гэтага падыходу даследуюцца кагнітыўныя ўласцівасці метафары і механізмы метафарызацыі. Метафара трактуецца як працэс мыслення, які адбываецца ў свядомасці чалавека. Кагнітыўная тэорыя метафары прадстаўлена ў працах Дж. Лакофа і М. Джонсана, Н.Д. Аруцюнавай, У.Р. Гака, В.М. Тэлія, Г.М. Склярэўскай, А.Н. Баранава, А.П. Чудзінава, І.М. Кобазевай і інш.

Даследчыкі Дж. Лакоф і М. Джонсан, аўтары даследавання «Метафары, якімі мы жывем», даказваюць, што метафара праяўляецца не толькі ў мове, але ў мысленні і дзеянні. Па словах вучоных, «наша звычайная паняційная сістэма, у рамках якой мы думаем і дзейнічаем, па сутнасці сваёй метафарычная» [2, с. 25]. Таму кагнітыўны падыход да вывучэння метафары дазваляе разглядаць метафару не толькі ў межах моўнай сістэмы, але і як феномен узаемадзеяння мовы, мыслення і культуры.

Адной з самых ужывальных метафар у мове з’яўляецца зааморфная метафара, якая пераносіць прыкметы і ўласцівасці жывёл на чалавека і якая з’яўляецца фрагментам нацыянальнай моўнай карціны свету, паколькі заонімы (разам з тэрмінамі сваяцтва, частак цела і прыродных з’яў) адносяцца да прыярытэтнай сферы метафарычнага выбару: яны першымі засвойваюцца чалавекам і належаць да ядра лексікону. Даследаванне метафарычных пераносаў дазваляе раскрыць характар мыслення чалавека і зразумець, як чалавек уяўляе сабе акаляючы свет і сваё месца ў ім. Зааморфная метафара ў гэтым сэнсе ўяўляе сабой кагнітыўную праекцыю, звязаную з прымяненнем вобраза жывёлы да характарыстыкі чалавека.

Метафарызацыя найменняў жывёл абапіраецца ў першую чаргу на веды з галіны эталогіі – навукі аб паводзінах чалавека і жывёл. Аднак падчас пошуку асноў метафары трэба ўлічваць не толькі эталагічныя веды. Метафарызацыя заонімаў абумоўлена таксама сістэмай асацыяцый, традыцый, міфалагічных уяўленняў, стэрэатыпаў і эталонаў, зафіксаваных у той ці іншай культурнай традыцыі.

Метафарычнае мысленне чалавека спрыяе замацаванню асацыятыўных прыкмет заоніма на аснове параўнання і перанясення характарыстык жывёлы на людзей. Асацыятыўныя прыкметы служаць асновай для ўтварэння зааморфнай метафары і фарміруюць *культурна-моўны вобраз* (тэрмін Ежы Бартміньскага) той ці іншай жывёлы.

У выніку метафарычнага пераносу найменне жывёлы на чалавека выдзяляем два тыпы асацыятыўных прыкмет: 1) аб'ектыўныя (рэальныя), уласцівыя ім як біялагічнаму віду (фізічныя характарыстыкі, звычкі жывёл), якія пераносяцца на чалавека, і 2) суб'ектыўныя (уяўныя), якія ўмоўна прыпісваюцца жывёлам моўным калектывам, безадносна да рэальных біялагічных характарыстык (прыкметы інтэлектуальнай, валявой, эмацыянальнай сфер).

Аб'ектам увагі ў межах прапанаванага артыкула абраны фразеалагічныя адзінкі (далей – ФА) беларускай і англійскай моў з кампанентамі *жаба – frog / toad*. Выбар гэтых кампанентаў абумоўлены адсутнасцю супастаўляльных даследаванняў на матэрыяле ФА беларускай і англійскай моў з кампанентамі-назвамі земнаводных у беларускай навуковай практыцы, а таксама тым, што група земнаводных з'яўляецца самай высокай па прадуктыўнасці сярод груп ФА з кампанентамі-герпетонімамі і адной з самых частотных сярод усіх груп ФА з кампанентамі-заонімамі: эмпірычную базу даследавання складаюць 69 ФА беларускай мовы, выбраныя з літаратурных і дыялектных фразеаграфічных крыніц, і 14 ФА англійскай мовы, выдзеленыя з аўтарытэтных друкаваных фразеалагічных крыніц англійскай мовы і электронных рэсурсаў (гл. *Спіс крыніц і іх скарачэнняў*).

На аснове аналізу ўнутранай формы і фразеалагічнага значэння выявім спецыфіку заамарфізму ў беларускай і англійскай лінгвакультурах, вызначым асацыятыўныя прыкметы (1) суб'ектыўныя і 2) аб'ектыўныя), якія фарміруюць культурна-моўны (стэрэатыпны) вобраз жабы ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў і англічан.

1. Суб'ектыўныя прыкметы ў беларускай фразеалогіі. Жабы ў традыцыйных вераваннях уяўляюцца былымі людзьмі, якія перавярнуліся ў земнаводных у выніку сусветнага патопу ці злоснага праклёна. У жывёльнай іерархіі з улікам апазіцыі *добры – дрэнны*, *прыгожы – брыдкі* жабы, як правіла, займаюць апошняе месца [3, с. 167].

Такі негатыўны вобраз жабы, яе «нечысціня» ва ўспрыманні беларусаў абумоўлівае семантыку і вобразную аснову беларускіх ФА: *жаба цыцкі дасць* 'хто-н. прападзе, загіне'; *жаба цыцкі / цыцы дасць / дала* 1) 'хто-н. памрэ, прападзе, загіне'; 2) 'хто-н. зазнае (зазнаў) шмат клопатаў, турбот, цяжкасцяў, выпрабаванняў'; *як жаба цыцкі дасць* 'нічога няма'; *глытаць жабу /жаб* 'моўчкі, цярпліва зносіць крыўду, абразу, выслухоўваць непрыемнае'; *праглынуць жабу* 'моўчкі сцярпець крыўду, абразу, выслухаць непрыемнае'; *торбу жаб прынёс*; *і жабы не квакаюць* 'ніхто не гаворыць пра каго-н., хто-н. не з'яўляецца аб'ектам увагі'; *злітавацца як вол над жабай* 'шкадуючы, без ахвоты даваць, прапаноўваць каму-н. што-н. не лепшае, малазначнае'; *пусціць жабу ў ваду* 'сказаць абы-што, недарэчнасць'.

Прататыпным вобразам ФА *жаба цыцкі дасць* служыць нейкая жаба, якая ў якасці зброі для нападзення, забівання скарыстоўвае свае грудзі. Вобраз ФА, на думку Т.В. Валодзінай, абумоўліваюць «міфалагічныя ўяўленні пра наўнасць грудзей у жабы і невыпадковасць яе ў этнамедыцынскіх кантэкстах» [4, с. 93]. Дарэчы, выраз *каб табе жаба цыцы дала* ўваходзіць у шэраг найбольш страшных і моцных праклёнаў [3, с. 167].

У ФА беларускай мовы заамарфізм *жаба* скарыстоўваецца пераважна для адмоўнай характарыстыкі чалавека. Так, для апісання гаваркога, балбатлівага чалавека ўжываюцца ФА *жаба на языку не спячэцца* ў каго. 'хто-н. вельмі балбатлівы, не ўмее трымаць сакрэты'; *жаба на языку / на языцы <не> спячэцца* ў каго; *жабу на языку не спячэш* у каго. 1) 'хто-н. вельмі дасціпны, гаваркі, балбатлівы'; 2) 'хто-н. не ўмее трымаць сакрэты, захоўваць тайну'; *жаба на языку спякецца* 'пра балбатуна'. У ФА спалучаюцца сэнсава несуадносныя ці алагічныя кампаненты, што надае ім яркую вобразнасць і выразную экспрэсіўнасць.

З жабай беларусы параўноўваюць таксама панурага і насупленага чалавека: надзьмуўся *як жаба на карчы / на купіне*; надуцца *як жаба на купіну* 'вельмі моцна (надзьмуцца, насупіцца)'; надулася *як жаба на корч*. Асновай метафарычнага пераносу, як відаць, стала такая прыродная асаблівасць некаторых відаў жаб, як наяўнасць гарлавога мяшка – пузыра са скуры ў форме

балона, які ўтвараецца ў аснове ротавай поласці жаб, пры дапамозе якога самцы ў час свайго шлюбнага перыяду ўзмацняюць прызыўныя гукі, якія прывабліваюць самак [5].

Негатыўна характарызуюць чалавека і ФА *жаба ў каляіне* ‘нікчэмнасць, асуджаная на пагібель’; *жабін поклад* ‘кепскі чалавек; экспрэсіўна-адмоўная характарыстыка дзіцяці, падлетка’; *і жук, і жаба, і чорт, і баба*; *герой з калом да жабы*; *рапуха паганая*; *як жабу праглынуўшы* ‘зусім (маўчаць)’.

Як відаць, у аснову вобразаў беларускіх ФА з кампанентам *жаба* пакладзены такія адмоўныя паказчыкі ўяўленняў аб жабе, як хтанічнасць, сувязь з іншасветам. Аналіз ФА беларускай мовы паказвае, што ўсе яны надзелены адмоўнай канатацыяй, у сувязі з чым уяўляецца магчымым вывесці канцэптуальную прыкмету ‘жаба – дрэнны чалавек’. Толькі ФА *з-пад жабы яйкі выме* ‘вельмі хітры, пранырлівы, вёрткі, зухаваты’ можа мець станоўчую канатацыю. З іроніяй і жартаўліва скарыстоўваюцца ФА *за капейку жабу да Барысава дубцом пагоніць*; *за рубель жабу ў Вільню пагоніць*, якія збліжаюцца паводле значэння і выкарыстання: яны служаць для абазначэння такіх заганных рыс чалавека, як скарэднасць, сквапнасць. У функцыі ідэнтыфікацыі выступае ФА беларускай мовы *грудная жаба* ‘сардэчная хвароба з моцным болем у грудзях; стэнакардыя’.

2. Аб’ектыўныя прыкметы ў беларускай фразеалогіі. У аснову вобразаў пераважнай большасці беларускіх ФА з кампанентам *жаба* пакладзены аб’ектыўныя асацыятыўныя прыкметы, што вызначаюць прыродныя характарыстыкі жабы, якія пераносяцца на чалавека. Так, на аснове назіранняў за знешнім выглядам, дзеяннямі і фізіялогіяй жабы, а таксама яе арэалам пражывання, намі выдзелены шэраг аб’ектыўных асацыятыўных прыкмет.

Знешні выгляд. Непрывабны знешні выгляд, пачварнасць жабы (рапухі) сталі асновай метафарычнага пераносу ў ФА *жаба апоўзлая / разлезлая / аблезлая / віславухая / карэлая*; *рапуха распоўзлая* ‘поўная, непаваротлівая, няўклюдная жанчына’. ФА матываваны кампанентамі дэнататыўнага значэння заоніма *жаба (рапуха)*: ‘бясхвостыя земнаводныя жывёлы з бугрыстай, часта бародаўчатай слізкай скурай бурага, шэрага або зялёнага колеру [6]. ФА рэалізуюць прыкметы ‘пачварнасць’, ‘брыдкасць’.

Такая прыродная ўласцівасць жаб, як пражэрлівасць, а таксама асяроддзе іх пражывання, відавочна, паслужылі асновай для ўзнікнення беларускіх ФА набрацца / набірацца *як / што жаба гразі* ‘вельмі моцна (пра п’янага), ‘піць, не ведаючы меры, моцна напівацца, многа выпіць (гарэлкі)’; набрацца / набірацца *як жаба мулу* ‘вельмі моцна; пра п’янага’; *як жаба мулу / калу* 1) ‘вельмі моцна (набрацца); пра п’янага’; 2) ‘вельмі, празмерна (набрацца)’; набрацца *як жаба твані / мулу / гразі*; *як жаба да гразі / да мулу* ‘з прагнасцю (дабрацца, дапасці і да т. п.)’. Тут магчыма апеляцыя да міфалагічнага пласта культурных ведаў. Так, у розных міфалагічных сістэмах жабы звязваюцца з хтанічным светам, а часам з воднымі элементамі хаосу, першапачатковага глею, з якіх узнік свет [7, с. 84]. Усе пералічаныя ФА, якія параўноўваюць п’янага чалавека з жабай, скарыстоўваюцца з асуджэннем, што сведчыць аб неадабрэнні беларусамі п’янства.

Аб’ектыўная прыкмета ‘пукатыя вочы’ рэалізуецца ў ФА *глядзець як жаба на купіне* ‘пільна, не зводзячы вачэй’; *як жаба на купіне* ‘на віду’; *вырачыў вочы як жаба* і рытмічна арганізаваная ФА *вырачыць вочы як жаба з ночы* ‘ўтаропіцца на каго-н., што-н. ад здзіўлення, разгубленасці і да т. п.’.

Невялікі памер жабы паслужыў асновай для пераносу гэтай характарыстыкі на адпаведныя рэаліі свету чалавека. Так, адразу некалькі беларускіх ФА рэалізуюць аб’ектыўную прыкмету ‘невялікі памер’: *жабе па калена* ‘вельмі нізкага росту, зусім малы’; ‘вельмі мелка, неглыбока дзе-н.’; *ад жабы не адрос (-ла, -лі)* ‘малы ці занадта малы’ (каб рабіць што-н.); *ад жабы не адрос* ‘вельмі нізкага росту’; *на жабін скок* 1) ‘вельмі малы (па даўжыні, плошчы)’; 2) ‘вельмі мала’; *і <кожны> жук і жаба* ‘ўсе без выключэння; усякі, кожны чалавек’; *як з жабы сала* ‘зусім няма ці вельмі мала (карысці, толку з каго-н.)’; *з жабіны прыгаршчы* чаго ‘вельмі мала (шчасця, радасці, здароўя і пад.)’; *<як> стане /станеш на калена <то / дык / і> жабе па калена*; *як стане на калені то жабе па калені* ‘вельмі малы, нізкарослы хто-н.’.

Рух, перамяшчэнне ў прасторы. На аснове назіранняў за паводзінамі і рухамі жабы ўтвораны цэлы шэраг ФА: *як жаба пад купінаю* ‘ціха, моўчкі (сядзець)’; *сядзіць як жаба / зялепуха <на купіне>*; *сядзіць як жаба пад мяжою*; маўчы *як жаба ў карчы* ‘зусім (маўчы)’; *пнецца як жаба на купіну* ‘пішчом лезе куды-н., каб дамагчыся свайго’; *як жаба на купіну* ‘з вялікімі намаганнямі (лезці)’; *пнецца / лезе / ушчарэпілася / дзярэцца як жаба на купіну / корч / кол* ‘бярэцца за непасільную работу’; *знаць жабу па пліганні*; *як рак за жабаю* ‘неадступна’; *боўтнуць як жаба ў калодзежы*.

Найбольш характэрны спосаб перамяшчэння жаб – скачкі – матываваў з’яўленне ФА *як жаба з купіны* ‘проста, лёгка’; *выскачыў як жаба з куста*; *на жабін скок*. Аднак не ўсе жабы могуць скакаць. Напрыклад, земляная жаба аддае перавагу павольнаму перамяшчэнню [8]. Адсюль, відаць, ФА *нязграбны як жаба*; *цягнуцца <ззаду> як жаба*; *цягнуцца як рапуха*.

Фізіялогія. Некаторыя віды жаб (квакша, вастрамордая, азёрная і ядомая жабы) валодаюць добра пастаўленым гучным голасам, іх хоры могуць быць чутныя на вельмі вялікіх адлегласцях [9, с. 43]. Цікава, што не ўсе віды жаб, паводле сведчання вучоных-заолагаў, маюць непрыемны голас. Так, напрыклад, самцы сямейства сапраўдных рапух у шлюбны перыяд выдаюць вельмі меладычныя спевы. А вось самцы звычайных рапух спяваюць дрэнна. «Іх цяжкаўзнаўляльны «рохкаючы» голас саступае па прыгажосці гучання шмат якім бясхвостым амфібіям» [10]. Прыкметы ‘гучны голас’ і ‘непрыемны голас’ абраны асновай вобразаў ФА *драцца як жаба на купіне* ‘вельмі моцна і непрыемна’ (крычаць, спяваць і да т. п.); *драцца як жаба* ‘вельмі дрэнна спяваць, непрыемным голасам, няправільна падцягваць’; *дзярэцца як жаба старая*; *боўнуць як жаба ў калодзежы* ‘сказаць не тактоўна’.

Прыкмета ‘халаднакроўе’ аб’ектывуецца ў ФА *рукі як жабы <як у жабы>* ‘вельмі халодныя’; *халодная як жаба*; *рукі як жабіны лапы*.

Існаванне, асяроддзе пражывання. Усю зіму жабы праводзяць на дне азёр, рэк і глыбокіх сажалак, дзе яны хаваюцца ад холаду [11]. Гэтая асаблівасць жабы, хутчэй за ўсё, была пакладзена ў аснову ФА: *заняло як жабе на зіму* ‘зусім; пра таго, хто змоўк, перастаў удзельнічаць у размове’; *заняло / зарвала як жабе зімою / на зіму*; *і жабы не квакаюць* ‘ніхто не гаворыць пра каго-н., хто-н. не з’яўляецца аб’ектам увагі’. ФА рэалізуюць прыкмету ‘маўчанне’.

Жабы, як вядома, жывуць паблізу вадаёмаў і сырых месцах, адсюль, відаць, ФА *жабы параслі* на чым. ‘што-н. заплеснела, пакрылася цвіллю’.

Заўважым, што ў жывой прыродзе жабы – вельмі карысныя жывёлы. Роля жаб, як і шматлікіх іншых земнаводных, у забеспячэнні раўнавагі ў прыродзе досыць вялікая. Гэтыя земнаводныя знішчаюць вялікую колькасць шкоднікаў сельскай гаспадаркі [12].

Як відаць, аб’ектыўны жывёльны свет, які эмпірычна пазнаецца і ацэньваецца чалавекам, з’яўляецца прадуктыўнай крыніцай інтэрпрэтацыі фразеалагізмаў з кампанентам *жаба*.

1. Суб’ектыўныя прыкметы ў англійскай фразеалогіі. ФА з эквівалентным кампанентам *frog /toad* ‘жаба’ ў англійскай мове таксама абавязаны ўяўленнямі англічан аб гэтай жывёле.

Так, ФА *a frog in one’s / the throat* (дасл. – жаба ў горле) ‘хрыпата; спазмы ў горле’ і *have a frog in your throat* (дасл. – мець жабу ў горле) ‘мець цяжкасці ў маўленні па прычыне сухасці або блакавання горла’ ўзыходзяць да старога веравання, паводле якога ў целе чалавека, які вып’е ваду з жабінымі яйкамі, вырастуць жабы.

Негатыўны вобраз жабы ва ўспрыманні англічан абумоўлівае семантыку і вобразную аснову ФА *finer than frog hair* (дасл. – лепшы за волас жабы) ‘добры, выдатны’.

2. Аб’ектыўныя прыкметы ў англійскай фразеалогіі. Асаблівасці вонкавага выгляду жабы (або пэўных відаў жаб), відаць, паслужылі асновай для ФА *frog face* (дасл. – жабін твар) ‘батанік, кампутарнік’ і *<as> ugly as a toad* (дасл. – брыдкі як жаба) ‘вельмі брыдкі’. ФА аб’ектывуюць прыкметы ‘пачварнасць’ і ‘брыдкасць’.

Асаблівасцю англійскай мовы з’яўляецца скарыстанне заоніма *frog* для сацыяльнай характарыстыкі чалавека: *a small frog in a big pond / a little frog in a big pond* (дасл. – маленькая жаба ў вялікай сажалцы) ‘той, хто ў вялікай камандзе або арганізацыі менш важны або менш кваліфікаваны, чым астатнія’; *a big frog in a small pond* (дасл. – вялікая жаба ў

маленькай сажалцы) ‘сітуацыя, калі адзін чалавек валодае большым уплывам, ведамі, вопытам, чым іншыя ў невялікай групе’ (мяркуецца, што чалавек можа не мець такога ўплыву ў большай групе)’; *the biggest frog in the puddle* (дасл. – самая вялікая жаба ў лужыне) ‘самы ўплывовы і дасведчаны чалавек у невялікай групе (мяркуецца, што чалавек можа не мець такога ўплыву ў большай групе)’.

Розныя з’явы жыцця і абстрактныя паняцці перадаюцца ў англійскіх ФА: *boiling frog* (дасл. – вараная жаба) ‘праблематычная сітуацыя, якая будзе пагаршацца, пакуль не дасягне маштабу бедства, а людзі, уцягнутыя ў яе, не заўважаць небяспекі, пакуль не стане зусім позна’; *boiling frog syndrome* (дасл. – сіндром варанай жабы) ‘няздольнасць прыняць, прызнаць або дзейнічаць супраць праблематычнай сітуацыі, якая будзе пагаршацца, пакуль не дасягне маштабу бедства’; *frog slicing* (дасл. – нарэзванне жаб) ‘клас /курс біялогіі’; *a <real> frog-choker* /*a <real> toad-choker* (дасл. – <сапраўдны> душыцель жаб) ‘праліўны дождж’; *like herding frogs* (дасл. – як жабы, якія пасуцца) ‘хаатычны, бязладны’.

З пералічаных ФА звяртаюць на сябе ўвагу дзве ФА – *boiling frog* і *boiling frog syndrome*. Вобразны змест гэтых ФА заснаваны на рэальных эксперыментах XIX ст. Сэнс эксперыментаў заключаўся ў тым, што, калі кінуць жабу ў кіпень, то яна адразу выскачыць або пастараецца выскачыць, але калі кінуць яе ў халаднаватую ваду і вельмі павольна награваць, то ніякіх рэфлексных рухаў не будзе, а жаба, якая не ўспрымае небяспеку, гіне, бо зварана [13]. Як відаць, метафара пабудавана на параўнанні людзей, якія не здольныя або не маюць жадання рэагаваць нават на нязначныя змены, што адбываюцца паступова, з паводзінамі жабы ў кіпню.

У англійскай мове з кампанентам *frog* зафіксавана таксама ФА *the frog / frog’s march* (дасл. – жабіна хада) ‘распластаўшы як жабу’ (спосаб абыходжання са зняволеным або п’яным, які супраціўляецца, якога чацвёра цягнуць за рукі і за ногі тварам уніз), у якой адлюстравана назіранне сітуацыі.

Такім чынам, у трактоўцы вобраза жабы ў фразеалогіі двух народаў адзначаецца як агульнае, так і адметнае. Агульнае заснавана на назіраннях за паводзінамі гэтых земнаводных, на вераваннях і міфалагічных уяўленнях аб іх, аднак выяўлены толькі дзве агульныя аб’ектыўныя прыкметы – ‘пачварнасць’ і ‘брыдкасць’. Найбольш біялагічных уасцівасцей і прыкмет жабы адзначаецца пры ўтварэнні значнай колькасці ФА беларускай мовы – гэта невялікі памер, пражэрлівасць, гучны, непрыемны голас і інш. Адсутнасць эквівалентных ФА з кампанентам *жаба – frog / toad* у дзвюх мовах сведчыць пра адметнасць гэтага фрагмента фразеалагічнай карціны свету носьбітаў розных культур.

Беларускія ФА з кампанентам *жаба* прадстаўляюць даволі адметны фрагмент фразеалагічнай карціны свету беларусаў, вылучаюцца індывідуальнай і непаўторнай унутранай формай. Асобныя беларускія дыялектныя ФА маюць у сваім складзе каларытныя кампаненты (*пліганне*, *апоўзлы*, *карэлы*, *боўтнуць*, *ушчарэпіцца*, *вырачыць*), якія садзейнічаюць выяўленню нацыянальна-культурнага складніка ФА.

Інтэрпрэтацыя вобразных фразеалагічных адзінак з кампанентам *жаба – frog / toad* у беларускай і англійскай мовах мае ярка выражаную адмоўную семантыку, накіравана найперш на ацэнку і характарыстыку чалавека, яго дзеянняў, стану і пад. Гэта дазваляе вывесці канцэптуальную прыкмету-метафару ‘жаба – дрэнны чалавек’, што тлумачыцца хтанічнай сімволікай жабы, а таксама больш вострай эмацыянальнай рэакцыяй людзей менавіта на негатыўныя з’явы жыцця.

Літаратура

1. Кравцова, Ю.В. Метафора как объект лингвометафорологии / Ю.В. Кравцова // Спадчына Скарыны: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання : зб. навуковых артыкулаў: у 2 ч. / рэдкал. : А.М. Ермакова (гал. рэд.). – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2017. – Ч. 2. – С. 99–104.

2. Лакофф, Дж. Метафоры, которыми мы живём / Дж. Лакофф, М. Джонсон. – М. : Едиториал УРСС, 2004. – 256 с.

3. Міфалогія беларусаў: эцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

4. Валодзіна, Т.В. Калі, каму і навошта дае жаба цыцкі / Т.В. Валодзіна // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах : материалы IV Междунар. научн. конф. / Отв. ред. В.И. Коваль. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2005. – 286 с.

5. Горловой мешок [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/Горловой_мешок. – Дата доступа : 03.08.2018.

6. Жывёльны свет: тэматычны слоўнік [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.slounik.org/160306.html. – Дата доступу : 05.10.2018.

7. Мифы народов мира. Энциклопедия : в 2 т. / С.А. Токарев (гл. ред.) [и др.]. – М. : НИ «Большая Российская энциклопедия», 1997. – Т. 2. К–Я. – 719 с.

8. Жаба земляная. Образ жизни и среда обитания земляной жабы [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://givotniymir.ru/zhaba-zemlyanaya-obraz-zhizni-i-sreda-obitaniya-zemlyanoj-zhaby/ – Дата доступа : 03.10.2018.

9. Зуёнак, С. Земнаводныя. Паўзуны. Успамін пра забыты палёт. Нарысы / С. Зуёнак, Р. Навіцкі, С. Драбянкоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – 63 с.

10. Рапуха шэрая, ці звычайная / М.М. Пікулік (рэд.) // Земнаводныя. Паўзуны : энцыклапедычны даведнік (Жывёльны свет Беларусі). – Мінск, 1996. – 240 с.

11. Михайлова, Н. Где зимуют лягушки и что они делают зимой? Как лягушки готовятся к зиме? [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://fb.ru/article/135385/gde-zimuyut-lyagushki-i-chto-oni-delayut-zimoy-kak-lyagushki-gotovyatsya-k-zime. – Дата доступа : 03.10.2018.

12. Малюскі, п’яўкі і жабы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.gorybalka.com/by/moluski3.html. – Дата доступу : 05.10.2018.

13. Boiling frog [Electronic resource]. – Mode of access : // https://en.wikipedia.org/wiki/Boiling_frog. – Date of access : 05.10.2018.

Крыніцы і іх скарачэнні

2.1. Метафорическая идентификация с другим известным лицом, для чего используется обращение к прецедентным фоновым онимам, обычно из сферы литературы и культуры: *Я – Гамлет. Холодеет кровь, / Когда плетёт коварство сети, / И в сердце – первая любовь / Жива – к единственной на свете* (А. Блок); *Я – Гойя! / Глазницы воронок мне выклевал ворог, / слетая на поле нагое* (А. Вознесенский); *Я человек – вот мой дворянский титул. / Я, может быть, легенда, может, быль. / Меня когда-то называли Тилем, / и до сих пор – я тот же самый Тиль* (Е.Евтушенко); *Я – композитор: под шум колес / Железнодорожных – / То Григ, то Верди, то Берлиоз* (И. Северянин); *Я – Санчо Панса твой, я – счетовод* (В. Нарбут); *На зямлі я найпершы Адам* (М. Кавыль); *З нас таксама, напэўна, хлопцы, / Кожны – крышачку Адысей* (А. Сербантовіч).

Прецедентное имя может быть вовлечено в автометафору не только с целью уподобления членов концептуальной оппозиции друг другу, но и для концептуализации их различия, что как бы дополнительно подчёркивает «самость» лирического «Я», ср.: *Поэты русские, / друг друга мы браним. / Парнас российский дрязгами заселен, / но все мы чем-то связаны родным – / любой из нас хоть чуточку Есенин. / И я Есенин, / но совсем иной. / В колхозе от рожденья конь мой розовый. Я, как Россия, более стальной / и, как Россия, менее берёзовый* (Е. Евтушенко).

Крайним случаем выступает антагонизация членов концептуальной оппозиции в отрицательной автометафоре: *Нет, я не Байрон, я другой, / Ещё неведомый избранник. / Как он, гонимый миром странник, / Но только с русскою душой* (М. Лермонтов); *А слева Сцилла, а справа Харибда – / Я не Одиссей!* (И. Чиннов); *Я ніколі ня буду Буддам, / На зямлі не знайду нірваны* (М. Кавыль); *Я ня слаўны Ленскі, / Ты-ж і не Тацьяна... / Родам я з-пад Менску... Часта, часта п'яны* (М.Кавыль); *І каб заўсёды мог / З сумленнем чыстым / Сказаць Айчыне: / – Тваім сынам верным быў, / хаця не стаў / Бетховенам ці Лістам* (А.Барскі); *Я не быў ніколі Герастратам. / Хутка вы забудзеце мяне* (І. Лагвіновіч). В подобных случаях, как видно, оппозиция «Я – ДРУГОЙ» накладывается на оппозицию «СВОЁ – ЧУЖОЕ» и решается в пользу «левого элемента».

2.2. Репрезентация отношений лирического «Я» с совокупностью других «Я» (ЯЯЯ), например, с социумом, нацией и т. п.: *Я – / безоговорочно и бесповоротно – / капля / в океане моего народа* (Р. Рождественский); *И всё же ты лишь капля в океане / Истории народа* (В. Луговской); *Я – інтэрнацыяналіст / І ў шумнай кроне чалавецтва / З тутэйшае галінкі ліст.* (Р. Барадулін); *Я – галіна ад дрэва маёй Беларусі* (Г. Дашкевіч); *Ты стаіш, Беларусь, / Завадская, зубрыная... / Я – пясчынка твая. / Я – крывінка твая* (Г. Бураўкін). Отличительной чертой метафор такого рода у белорусских авторов является то, что в качестве контекст-партнёра лирического «Я» у них чаще выступает топоним *Беларусь*, тогда как в аналогичных контекстах из русской поэзии доминирует лексема *народ*.

2.3. Репрезентация отношения «Я» к некоторому иерархически высшему началу (Я), т. е. БЫТИЮ, ТВОРЦУ, БОГУ, СОЗДАТЕЛЮ. Ср.: *Благодарю, необъятный Создатель, / что я мгновенный твой соглядатай – / Сидоров, Медичи или Борджиа – / скрепочка*

Божья! (А. Вознесенский); *И в солнце, среди синевы / расцветшее, нацелясь мною, / меня спускают с тетивы / стрелою с тонкою спиною. / Весёлый центробежный вихрь / меня из круга вырвать хочет. / О, Жизнь, в твою орбиту вник / меня таинственный комочек!* (Б. Ахмадулина); *Я ў Сусвеце – нібы Планета* (М. Арочка); *«Не гавары: Зямля мая, – / Казаў мудрэйшы з інкаў, – / А гавары: Зямля, я – твой...» / Бо кожная травінка / І кожны з нас удзячны ёй / Спрадвечнай, жыццядайнай, / Сваім з'яўленнем, хоць на міг, / Сваім знікненнем тайным. / Таму і ў космасе, калі / Загубіцца шлях мой, / Я пазыўныя буду слаць: /«Дзе ты, Зямля? Я – твой...»* (М. Танк).

В структурном отношении конструкции, реализующие автометафоры, помимо двучленных, достаточно широко представлены и «многократными», «веерными», соответствующими формуле $A = B_1, B_2 \ldots B_N$. Такого рода построения способствуют созданию многомерных, порой амбивалентных образов лирического «Я». Ср.: *Я – слых, і зрок, і палец указальны, / Што націскае спускавы кручок* (Хв. Гурыновіч); *Жыццё маё ў двухколерным свячэнні, / Як доўгі фільм. Я – аўтар і глядач* (А. Пысін); *Быў я ант, быў я смерд, / Быў радзіміч, крывіч, дрыгавіч* (М. Купрэеў); *Я – космас і пылінка. І між намі – / Адзін агонь. Як вечнасці уток* (В. Зуёнак); *Я – Поле, / Сонечнае Поле, / Я – Памяць. / Я – Жыцця Калыска. / Я перапёлкаю, ад болю, / Прасіла піць у хмары нізкай* (В. Шніп), *Я падающий сквер средь падали и скверны. / Я – пыль заблудшего луча!* (В. Кривулин); *Я – смешеньем сахара и соли, / странной смесью гордости и боли / отмечаю путь свой на земле* (А. Присманова); *Я выдохся. Я – как город, / Открывший врагу ворота. / А был я – юный и гордый / Солдат своего народа* (Б. Слуцкий); *Я – ухо мира! Я – его рука! / Он мне диктует* (Б. Слуцкий); Что я земле? *Я – след слезинки, / Морщинка на лице жены. / Я – нерастаявшая льдинка, / Что в чаще ждет еще весны* (В. Шаламов).

Реже автометафора включается в многофокусную развёрнутую метафору в качестве одного из её смысловых звеньев, ср.: *Я – актер, а лампа – рампа…* (В. Шаламов); *Я – полымя, / каханая – бы лёд* (М. Федзюковіч).

Нередко автометафора реализуется в форме диалога, ср.: *– Я, выгнаінік вясны, / Страціў, чым валадарыў... / – Хто ты? / – Я – сувязны / Успамінаў і мараў* (П. Макаль); *Но уже готов ответ Глубочайшего прозренья, / Соломонова решенья – / В этом и сомненья нет: / «Я – строка стихотворенья / Посвященного судьбой – С уваженьем – мне самой»* (И. Одоевцева).

Наконец, отметим, что для автометафоры в высокой степени характерна текстообразующая функция. Ср., например, стихотворения *«Я – семья»*, *«Гойя»* (А. Вознесенский), *«Песня самолёта-истребителя»* (В. Высоцкий); «*Бабий Яр", «Я хотел бы", «Я кошелек»* (Е. Евтушенко), «*Скрижали завета»* (В. Князев), «*Назими»* (К. Симонов), «*Я – железо*» (С. Щипачев), «*Подражание Мильтону»* (С. Липкин) и мн. др.;*«Я – толькі ўсхліп…»* (З. Дудзюк); «*Я»* (А. Балуценка); «*Столькі сонца…»* (А. Пысін); «*Я – Зерне»* (А. Наўроцкі); «*Ноч»* (С. Блатун); «*Жыццё маё ў двухколерным свячэнні…»* (А.Пысін); «*Маналог лугу»* (Р. Барадулін); «*Я – рака*» (А. Разанаў), «*Два каласы»* (М. Лужанін), «*Балада вуліцы»* (М. Стральцоў), «*Я ў Сусвеце – нібы Планета*» (М. Арочка), «*Нафта», «Песня завадного салдаціка», «Кола», «Кропля дажджу»* (П. Макаль) и мн. др.

Некоторые из таких текстов основаны на прецедентных образах, например, «*Я – арыец»* (Р. Барадулін), «*Я – дзяўчынка на шары»* (Р. Баравікова), «*Бабий Яр»* (Е. Евтушенко), «*Я сослан в себя…»* (А. Вознесенский), «*Гулливер»* (И. Сельвинский) и др.

Ряд зафиксированных нами конструкций, аналогичных в смысловом плане рассмотренным выше, отличается тем, что «правый элемент» вводится с тем или иным компаративным показателем, в результате чего модальность метафорической идентификации уступает место модальности сравнения: *Я ў кватэры – як частка кватэры – сама, / Гарадскі чалавек, папяровае тло* (Л. Рублеўская); *Я свой тут, нібы клён, я свой, бы звер* (М. Рудкоўскі); *І мяне, як злачынцу-прыблуду, / Павядуць сумаваць без цябе* (Ул. Жылка); *Мяне, нібы палонніцу, / Ты цераз кладку нёс* (Я. Янішчыц); *я – подобье адресата / в чьих раздавленных очах / буквы строясь как солдаты / под Очаковым, во прах / повергают то ли турок / то ли хищных крымчаков – / я читаю, полудурок, / ноты полковых значков* (В. Кривулин); *Я – как поле ржаное, / Которое вот-вот поспеет, / Я – как скорая помощь, / Которая вот-вот успеет* (М. Светлов); *Мне кажется – / я – это Анна Франк, / прозрачная, / как веточка в апреле* (Е. Евтушенко).

Не менее характерны конструкции, которые демонстрируют близкий к метафоре троп – метаморфозу, основанную не столько на ассоциациях сходства (аналогии), сколько на мифологических представлениях о способностях живых существ превращаться в иные существа (в этом случае «правый элемент» метафоры выражается творительным падежом существительного), ср.: *Яшчэ шалясцець мне былінкай малой між трысця…* (Ул. Паўлаў)*; Я ўстану, як зубр, / Над скупой неадольнасцю лёсу, / Груз гадоў, скрухі груз / Спапялю перуном* (М. Рудкоўскі)*; Я дрэвам стану, цяністыя галіны раскіну / Над табой, / Засерабруся крынічнай вадой* (А. Наўроцкі); *Ты пайшла, /ты чамусьці пайшла, / і я стаў калодзежам без вады, / стаў вясновым кустом без лісця, / але болей за ўсё / стаў падобны на клетку, / якую пакінула птушка…* (М. Стральцоў); *Я стал разноцветной метелью / Моих легких мгновений, я стал огоньком мотылька* (В. Блаженный); *Я стану ветром в челке / и там, внутри иголки, / как в низенькой светелке, / войду в погасший свет* (И. Жданов); *Оборачиваясь то страхом, / то любовью, гонит меня, / и лечу я летучим прахом / по кружной территории дня* (Б. Слуцкий); *Я кристалликом соли из ваших растворов / выпал* (Б. Слуцкий); *Не век мне, нищему, скитаться, / Скитаться странником с клюкою, – / Я стану птицей, может статься* (В. Блаженный). Среди подобных конструкций встречаются и конструкции с отрицанием (своеобразные антиметаморфозы), ср.: *Я не дымом в чужую одежду вошел, / и не скука глаза мне кусает* (М. Айзенберг).

Заключение. Таким образом, автометафора обнаруживает себя в поэтическом дискурсе в качестве одной из его «сильных позиций», с одной стороны, выступая в качестве средства структурирования Я-концептов, входящих в концептуальное ядро антропоцентрического (в том числе Я-центрического) по своей природе лирического дискурса, а с другой – являясь стимулом генерации контекстов разной протяжённости вплоть до интертекста.

В языке русской и белорусской поэзии выработаны в целом аналогичные модели метафорической репрезентации лирического «Я» как с точки зрения содержания, так и со стороны структуры, но при этом наблюдаются и определённые национально-стилевые особенности анализируемых конструкций и текстов.

Литература

1. Гоготишвили, Л.А. Непрямое говорение / Л.А. Гоготишвили. – М. : Языки славянских культур, 2006. – 720 с.

2. Левин, Ю.И. Лирика с коммуникативной точки зрения / Ю.И. Левин // Избранные труды. Поэтика. Семиотика. – М. : Язык русской культуры, 1998. – С. 464–480.

3. Безкровна, І.О. Комунікативна структура поетичного тексту (семантичний та прагматичний аспекти) : автореф. дис. … канд. філол. Наук : 10.02.02 / І.О. Безкровна ; Ін-т мовознавства ім. О.О. Потебні НАН України. – Київ, 1999. – 16 с.

4. Кисель, Е.В. Функциональная семантизация / характеризация личных местоимений как средство создания художественного образа в поэтическом тексте (на материале творчества русских и белорусских авторов XX века) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01; 10.02.02 / Е.В. Кисель ; Белорусский государственный ун-т. – Минск, 2014. – 24 с.

5. Старычонак, В.Д. Фрэйм «Другасныя займеннікавыя намінацыі» / В.Д. Старычонак // Мнагазначнасць слова ў беларускай мове: у 3 кн. – Мінск : Колоград, 2017. – Кн. 2. Семантычная прастора чалавека ў мове і маўленні. – С. 201–225.

6. Новиков, Вл. Философия метафоры / Вл. Новиков // Новый мир. – 1982. – № 8. – С. 246–251.

7. Ревуцкий, О.И. Анализ художественного текста как коммуникативно обусловленного связного целого / О.И. Ревуцкий. – Минск : НИО, 1998. – 68 с.

8. Толочин, И.В. Метафора и интертекст в английской поэзии / И.В. Толочин. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 1996. – 95 с.

Мозырский государственный педагогический
университет им. И.П. Шамякина

Поступила в редакцию 11.01.2019

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3’373:398.92:677.074.33

Сімвалічнае прачытанне фразеалагізмаў беларускай мовы з кампанентам *пояс*

В.А. Ляшчынская

На матэрыяле фразеалагічных адзінак з кампанентам *пояс*, сабраных метадам суцэльнай выбаркі з фразеаграфічных крыніц беларускай літаратурнай і дыялектнай мовы, выяўляюцца ўласцівыя ім сімвальныя прачытанні, характэрныя культурныя канатацыі праз вобразы, унутраную форму, адбор агульнага слова-кампанента пры іх утварэнні і перадачу ўстойлівага, рэгулярнага каштоўнаснага зместу культуры, яго катэгорый і сэнсаў. Устанаўліваецца ўзаемадзеянне мовы і культуры пры ўтварэнні фразеалагізмаў, выяўляецца каштоўнасны змест, здольнасць да захавання і перадачы сімвалічнага сэнсу ў прасторы касцюмна-рэчавага кода культуры беларусаў.
Ключавыя словы: фразеалагізм, кампанент *пояс*, касцюмна-рэчавы код культуры, культурная інфармацыя, сімвал, эталон, стэрэатып.

Belarusian phraseological units with the component "*пояс*" are considered. The material of phraseological units with the "*пояс*" component, collected by continuous sampling from phraseological sources of Belarusian literary and dialect speech, reveals their characteristic combinations of reading symbols, characteristic cultural connotations through images, internal form, selection of a common component when they are formed and transferring sustainable, regular value content of culture, its categories and meanings. The interaction of language and culture in the formation of phraseological units is established. The value content and the ability to preserve and transmit symbolic meaning in the space of costume-material code of the culture of Belarusians are expressed.
Keywords: idiom, component *пояс*, costume and clothing culture code, cultural information, symbol, standard, stereotype.

Мова выступае важнейшым сродкам не толькі абагульнення і выражэння думкі, але акумуляцыі ведаў аб культуры народа. Асабліва значнымі ў адлюстраванні, захаванні і трансляцыі культурнай інфармацыі з’яўляюцца ўстойлівыя адзінкі кожнай мовы, сярод якіх выдзяляюцца фразеалагічныя адзінкі. Цікавасць да фразеалагічных адзінак абумоўлена яшчэ і тым, што яны, па-першае, на працягу стагоддзяў застаюцца нязменнымі паводле формы і зместу, па-другое, усе яны звязаны з чалавекам, па-трэцяе, менавіта ў іх і праз іх выкарыстанне ў маўленні чалавек выяўляе свае погляды і меркаванні, вызначае правілы і ўстаноўкі жыцця, выражае сваю ацэнку, ці, як зазначае расійскі фразеолаг М.Л. Каўшова, «раскрывае сваю культурную пазіцыю – годна ці нягодна чалавеку тое, што адбываецца ў свеце, прыстойна чалавеку што-небудзь рабіць ці не прыстойна» [1, с. 42]. Апісваючы, характарызуючы і ацэньваючы свет ў яго праяўленнях, чалавек праз фразеалагічныя адзінкі (= ідыёмы) перадае сваё ўяўленне пра свет і пра сябе ў гэтым свеце, выступае творцом створаных ім акультураных уяўленняў.

Вядома, што фразеалагізмы паводле свайго ўтварэння з’яўляюцца другаснымі адзінкамі мовы, яны не прама называюць прадметы, з’явы ці паняцці, а характарызуюць іх праз створаныя пэўныя вобразы, якія ўспрымаюцца носьбітамі мовы ў адпаведнасці з іх ведамі сваёй культуры, з іх кампетэнцыяй. Акрамя таго, у аснове вобразнасці фразеалагізмаў ляжыць не адзінкавы, асобны элемент ці факт рэчаіснасці, а вызначаны фрагмент свету. Менавіта таму фразеалагізмы нярэдка называюць мікратэкстамі, лінгвістычнымі знакамі, якія абазначаюць складаныя дэнататы нашай рэальнасці, якімі часта з’яўляюцца цэлыя сітуацыі. Культурная інфармацыя, якую даносяць фразеалагізмы, не заўсёды ляжыць на паверхні, для яе выяўлення неабходна «прачытанне» фразеалагізмаў.

Для ілюстрацыі і пацвярджэння адзначанага прааналізуем адну групу фразеалагічных адзінак беларускай мовы, культурная семантыка якіх носіць сімвальны характар і словы-кампаненты валодаюць сімвалічным значэннем. Аб’ектам вывучэння ў межах артыкула

абраны фразеалагізмы з кампанентам-найменнем адной дэталі адзення – *пояс.* Выдзяленне фразеалагізмаў з кампанентьам *пояс* тлумачыцца тым, што яны не былі аб'ектам вывучэння, па-другое, яны дапаўняюць прастору касцюмна-рэчавага кода культуры беларусаў як мікрасістэму характарыстык такога аб'екта карціны свету, паколькі большасць фразеалагізмаў беларускай мовы касцюмна-рэчавага кода, што разумеецца як сукупнасць тых найменняў прадметаў адзення, абутку, галаўных убораў, якія функцыянуюць як знакі «мовы» культуры, ужо прааналізавана [2], [3], [4], [5], [6].

Лексема *пояс*, згодна з «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы», абазначае: 1) ‘рэмень, шнур і пад., якімі падпяразваюць адзежу па таліі’ // ‘паласа тканіны, якая прышываецца да верхняй часткі спадніцы, штаноў; паясніца’; 2) (*пераважна з прыназ.*) ‘паясніца, талія’; 3) ‘што-н., размешчанае паласой’; 4) ‘брусы (распоры) паміж кроквамі’; 5) *спец.* ‘частка паверхні зямнога шара паміж двума мерыдыянамі’; 6) *спец.* ‘частка паверхні зямнога шара, якая з’яўляецца пэўнай кліматычнай зонай’; 7) *спец.* ‘частка краіны, якая адрозніваецца ад іншай тэрыторыі якімі-н. эканамічнымі прыкметамі’; 8) *спец.* ‘частка шкілета ў пазваночных жывёл і чалавека, якая служыць для прычлянення да тулава і апоры канечнасцей’ [7, с. 297–298]. Ужо толькі прыведзеная семантычная парадыгма лексемы *пояс* гаворыць пра значную ролю абазначаных ёю прадметаў, з’яў у жыцці чалавека.

Пояс як дэталь адзення чалавека вядомы з глыбокай старажытнасці, у славян з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя былі ўжо паясы са скуры (дзяга, папруга, пас), з валакністых раслін, воўны, шоўку. Поясам падпяразвалі верхняе адзенне, і паколькі спачатку кішэняў не было на адзенні, то пояс выконваў успамагальную ролю: за яго закладвалі сякеру, рукавіцы, на ім падвешвалі, паводле заўваг спецыялістаў, тры прадметы – нож, грабеньчык і каліту (маленькая сумачка, якая «служыла для складвання “каштоўных” прадметаў: бірак, талісманаў, абярэгаў» [8, с. 169]). Пояс як матэрыяльны прадмет выконвае прыкладную функцыю: гэта важная дэталь традыцыйнага беларускага строю, якая надавала адзенню цэласны выгляд, і сёння застаецца неабходнай часткай адзення.

Аднак, паводле заўваг этнографаў, фальклярыстаў, пояс у народнай культуры беларусаў як моўны знак служыць найменнем сімвалаў, за ім замацавана багацце сімвалічнага значэння.

Так, лічылася, што пояс ахоўвае цела чалавека ад хвароб і няшчасцяў, а таму без пояса хадзіць было грэх, а «падпяразанага чалавека і д’ябал баіцца». Як адзначае беларускі этнограф, фальклярыст і краявед М.Я. Нікіфароўскі, з’яўленне на людзях чалавека без шапкі ці босым не так магло здзівіць, як «появление без опояски», якою на хуткую руку мог быць абрывак вяроўкі, путы ці нават лыка, паколькі быць без пояса лічылася прыкметай дурнога густу і грахом, паколькі пояс надзелены ахоўнымі і прадуцыраванымі ўласцівасцямі. Нават дзіцячыя кашулі дзяўчынак ці хлопчыкаў «всегда опоясаны» [9, с. 107]. Жняя не павінна была здымаць чырвоны пояс у час жніва альбо затыкала ў час жніва за пояс каласкі, карэньчыкі каласкоў, галінку дуба, паколькі пояс служыў засцярогай, аховай спіны ад болю. Цяжарная жанчына, якая чаго-небудзь палохалася, павінна была вялікі палец левай рукі засунуць за пояс. Ужо толькі прыведзеныя асобныя звесткі пра магічную ролю пояса ва ўяўленнях беларусаў у мінулым даводзяць, што пояс з даўніх часоў выступае як найменне сімвала абярэгу, аховы чалавека [10].

Яшчэ пояс выступае сівалам моцы ў дачыненні да мужчынскага пачатку і сімвалам цнатлівасці ў дачыненні да жанчыны. Так, дзеянні мужчыны, што не стасуюцца з агульнапрынятымі нормамі і правіламі паводзін, назвалі словам *распераза́цца*, якое захавалася да сённяшняга дня і выступае ў двух значэннях – ‘зняць з сябе тое, чым быў падперазаны (пояс, папругу, рэмень і пад.)’ і *перан.* ‘перастаць стрымліваць сябе; стаць недысцыплінаваным, нахабным’ [7, с. 662], другое з якіх перадае захаванае за словам народнае ўяўленне пра ролю і сімволіку пояса. У народнай практыцы да апошняга часу лічыцца, што хадзіць жанчыне ў кашулі, якую звычайна носяць без пояса, ці ў сукенцы прамога і шырокая крою – быць распусцёхаю.

Пояс у адзенні чалавека служыў адзнакай сацыяльнага стану, сімвалам улады, знатнасці і багацця, паколькі ў багатых былі спецыяльныя паясы на будніе і святочныя дні, у час вяселля і пахавання, якія былі рознай шырыні (на святы шырокія ўзорныя, з шоўку ці

дарагой кашміравай тканіны «(паясы князёў, магнатаў)»), што прывозілі з іншых краін [10, с. 369]. Да месца тут узгадаць і пра выраб шаўковых слуцкіх паясоў, што бярэ пачатак на Беларусі ў XVIII ст., а пазней ператыкаліся залатымі і сярэбранымі ніткамі, якія сёння з'яўляюцца адной з каштоўнасцей матэрыяльнай культуры беларусаў. Слуцкія паясы, як адзначае даследчыца гісторыі ўнікальнай шаўковай вытворчасці на Беларусі, у Слуцку, Л.І. Якуніна, лічыліся не толькі элементам мужчынскага касцюма ў часы Вялікага Княства Літоўскага, але з'яўляліся прыкметай знатнага паходжання ўладальніка такога пояса, яго багацця і ўлады [11].

«Сімвалам згоды на шлюб былі падараваныя нявестай паясы сватам і жаніху», «звязванне поясам маладых перад шлюбам сімвалізавала моцны шлюб, устанаўленне сваяцкіх дачыненняў паміж роднымі жаніха і нявесты» [10, с. 369]. І ў пахаванні паясы служылі сімваламі акрэслівання і замацавання мяжы «паміж бачным і нябачным светамі» [10, с. 369].

Зразумелым становіцца выбар лексемы *пояс*, стварэнне вобразаў з гэтай лексемай пры ўтварэнні фразеалагічных адзінак з іх адметнай функцыяй і роляй як знакаў не толькі мовы, але і знакаў «мовы» культуры. Праўда, як кампанент і аснова вобразаў новых адзінак беларускай мовы лексема *пояс* зафіксавана ў складзе толькі пяці фразеалагізмаў, у лік якіх уключаны фразеалагізм з кампанентам *пояс* у яго памяншальна-ласкальнай форме – *па Марусін паясок*. Але кожная з выдзеленых пяці фразеалагічных адзінак беларускай літаратурнай мовы вызначаецца сваім вобразам, адметным значэннем, якое ўтвараецца з некалькіх складнікаў, служыць для абазначэння і характарыстыкі розных абстрактных паняццяў, пераводзячы іх з «нябачных» у «бачныя» з дапамогай створаных вобразаў, даводзіць адметную і значную культурную інфармацыю, набывае сімвалічную функцыю і выступае ў ролі эталона, сімвала ці стэрэатыпа.

Вядомыя і сёння звесткі пра пояс як неабходную дэталь у адзенні, як правіла, мужчын, яго ролю ў практычнай дзейнасці чалавека (пояс для нашэння прылад), яго сімволіка моцы выяўляецца ў вобразе фразеалагізма *заткнуць за пояс* – 'перасягнуць, перавысіць у чым-н.' (Л-2008-1: 472), *затыкаць за пояс* 'пераўзыходзіць ва ўсім' (Ю-1972: 248). Маецца на ўвазе, што хто-небудзь у пэўнай справе, часцей чалавек у фізічнай працы, радзей – горад, краіна, прадпрыемства, дабіваецца перавагі, пераўзыходзіць другога ці што-небудзь, вызначаецца ў параўнанні з кім-, чым-небудзь, паказвае лепшыя вынікі, апярэджвае, асабліва пры выкананні якой-небудзь сумеснай работы, дзеянняў, спаборніцтве, і становіцца лепшым, чым іншы ці іншыя. Напрыклад: *Валодзя быў хлопец такі, што адарві ды падай: ён і ў танцы, ён і ў пяшчотах, і ў гарачых, як прысак, словах – ва ўсім* ***заткнуў за пояс*** *ціхмянага Болеся* (Р. Сабаленка); *Вось і жанчына, а любога хлопца* ***за пояс заткне****!* (М. Нікановіч); *Багацце маючы такое, раўні не знаеш ты ў цане, / На рынак выйшаўшы,* ***за пояс*** *Сібір Амерыку* ***заткне*** (Я. Непачаловіч).

У аснове вобраза названай адзінкі ляжыць метафара, паводле якой той, каго хто-небудзь другі пераўзышоў, пакінуў ззаду і вызначыўся як самы лепшы, абставіў іншых у чым-небудзь, прыпадабняецца да непатрэбнай рэчы, якую заткнулі за пояс. Параўн. *заткнуць сякеру*, якой не карыстаешся ў нейкі час, альбо рукавіцы, у якіх няма патрэбы ці ў якіх горача альбо нязручна працаваць. Менавіта такой сітуацыі прысвечаны радкі ў паэме «Тарас на Парнасе», з дапамогай якіх апісваецца сам герой: *Чуць золак – ён стрэльбу за плечы, /* ***Заткне сякеру за паяс,*** *– / Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы / І птушак біць з ружжа Тарас*, дзе кожнае з выдзеленых слоў захоўвае сваё прамое значэнне.

У вобразе фразеалагізма *заткнуць за пояс* – 'перасягнуць, перавысіць у чым-н.' пояс як носьбіт сімвалічнага значэння моцы чалавека спрыяе яму, служачы месцам «хавання», адстаўкі таго, хто не вызначаецца, не выдзяляецца, у параўнанні з гаспадаром пояса. Фразеалагізм *заткнуць за пояс* узыходзіць да архетыпічнай апазіцыі «добра – дрэнна», «лепшы – горшы». Праз кампанент *заткнуць* фразеалагізм суадносіцца з антропна-дзейнасным кодам культуры, называючы чалавека выканаўцам дзеяння, праз кампанент *пояс*, як і ўсе астатнія фразеалагізмы, – з касцюмна-рэчавым, а праз спалучэнне *за пояс* – з прасторавым, служачы ўказаннем накірунку дзеяння і месца размяшчэння ў прасторы. Зразумела, што вынік параўнання і прызнанне перавагі таго, хто другога заткнуў за пояс,

ухваляецца, паколькі быць лепшым у калектыўнай працы, у пэўных сумесных дзеяннях, выяўляючы лепшыя якасці чалавека, якія вызначаюцца, напрыклад, у спаборніцтве, лічыцца важным, паколькі задаецца дух спаборніцтва, прызнаецца ўзорам, за якім ідуць і з якога бяруць прыклад. Усё гэта дазваляе адзначыць, што фразеалагізм *заткнуць за пояс* набыў сімвалічную ролю і служыць для перадачы стэрэатыпнага ўяўлення пра станоўчую ролю перавагі аднаго чалавека перад другім, як правіла, у працы, у выкананні якой-небудзь работы, пры параўнанні ці спаборніцтве ў чым-небудзь.

Цікавы вобраз фразеалагізма *<браць> ногі за пояс*, які часткова блізкі і разам з тым адметны ад папярэдняга найперш сваім вобразам і значэннем – ‘як можна хутчэй бегчы, уцякаць і пад.’) (Л-2008-1: 143), а ў выніку месцам і роляй у выкарыстанні: фразеалагізм служыць для выражэння жартоўных адносін да таго, каму патрэбна хуценька збегчы, уцячы. Напрыклад: *Слухай маю каманду. Убачыш ворага – чашы за трэцюю гару, там брахні пану богу па вокнах і – далей,* ***ногі ўзяўшы за пояс****, да самых казармаў* (Я. Брыль).

Акрамя прасторавага і рэчыўнага, фразеалагізм праз кампанент *ногі* выяўляе суадносіны з саматычным кодам культуры, які разумеецца як сукупнасць абумоўленых культурай стэрэатыпных уяўленняў пра ўласцівасці, характарыстыкі, дзеянні, прасторавыя і часавыя «вымярэнні» цела чалавека ўвогуле ці яго частак, што выступаюць крыніцай асэнсавання чалавекам свету. Вобраз фразеалагізма ўтрымлівае антропную метафару, якая заснавана, з аднаго боку, на сімвальнай «рухальнай» функцыі ног ці асноўнага «інструмента», з дапамогай якога чалавек перамяшчаецца ў прасторы; з другога – у складзе адзінкі ногі як нераздзельная частка цэлага (цела чалавека) замяшчаюць чалавека на аснове старажытнага метанімічнага атаясамлівання часткі і цэлага (ногі і чалавек).

З улікам факультатыўнага кампанента *браць*, які суадносіцца з фізічна-дзейнасным кодам культуры, у вобразе фразеалагізма адлюстроўваецца метафара пра стварэнне дзеяння як стэрэатыпнага ўяўлення пра хаванне ног за пояс, ці ўяўлення пра неабходнасць чалавеку ў пэўнай сітуацыі як мага хутчэй выканаць гэта дзеянне (параўн. *<браць> ногі на плечы і…; <браць> ногі ў рукі і…* з тым жа значэннем і той жа стылістычнай функцыяй, што і фразеалагізм *<браць> ногі за пояс*). Фразеалагізм *<браць> ногі за пояс* набывае ролю стэрэатыпа, эталона хуткаснага, імгненнага ўцякання ці знікнення чалавека.

Трэці фразеалагізм з кампанентам пояс – *зацягваць / падцягваць паясы*, які зафіксаваны ў лекіскаграфічнай крыніцы літаратурнай фразеалогіі беларускай мовы са значэннем ‘адчуваць вострую нястачу, жыць у крайняй беднасці’ (Л-2008-1: 475). На нашу думку, гэты фразеалагізм больш дакладна было б суправадзіць семантыкай ‘вымушана абмяжоўваць сябе ў расходах на пражыванне з прычыны наступлення нястачы, недахопу і пад.’. Маецца на ўвазе, што пасля добрага, нармальнага жыцця ў выніку нейкіх прычын наступае перыяд нястачы, у часе якога чалавек усё менш ужывае ежы, абмяжоўвае сябе ва ўсім, што вядзе да яго «пахудання» і змяншэння аб’ёму ці памераў. А паколькі пояс, як вядома, з’яўляецца элементам адзення, у прыватнасці, ім падтрымліваюцца штаны ў мужчын, спадніцы ў жанчын і інш., то і прыходзіцца падцягваць ці зацягваць тужэй паясы. Тут дзеянне з лексемай-кампанентам *паясы* выступае своеасаблівым паказчыкам матэрыяльнага становішча чалавека, дакладней, адсутнасці матэрыяльных сродкаў для нарамальнага харчавання ці ўвогуле пражывання. Напрыклад: *З скаромным праца йдзе спарней, і сала з’еў бы я кусок, ды абагулілі свіней, і вось –* ***падцягвай паясок*** (К. Крапіва).

У аснове вобраза фразеалагізма *зацягваць / падцягваць паясы* ляжыць антропная метафара, паводле якой вымушанае абмежаванне ці недахоп матэрыяльных сродкаў для пражывання, надыход перыяду нястачы прыпадабняецца да зацягвання паясоў. Фразеалагізм *зацягваць / падцягваць паясы* перадае стэрэатыпнае ўяўленне пра наступленне змены ад добрага жыцця да востpай нястачы, беднага жыцця, як правіла, у параўнанні з ранейшым ці з матэрыяльным становішчам каго-небудзь іншага.

Што датычыць фразеалагізма *ўдар ніжэй пояса* – ‘раптоўная і балючая непрыемнасць, нечакана і нетактоўна прычыненая каму-н.’ (Л-2008-2: 552), то ён даводзіць, што нечаканыя і крыўдныя словы, выказаныя нярэдка ў грубай і / ці рэзкай форме, нейкія

неспадзяваныя, але нядобрыя, як правіла, выказванні адной асобы ў адносінах да другой прыносяць ёй моцны душэўны боль, даводзяць да перажывання, урэшце, вельмі крыўдзяць. Напрыклад: *«[Святлана Уладзіславаўна:] Я не думала, што вы такі маленькі і худзенькі…». Для Лукіна, які і сапраўды быў на цэлую галаву ніжэй за Святлану Уладзіславаўну, гэта быў* ***удар****, як кажуць баксёры,* ***ніжэй пояса*** (В. Праўдзін).

Вытокам фразеалагізма, відавочна, можна лічыць забаронены ўдар адным мужчынам другому пры іх бойцы ці ў час бою на рынгу адным баксёрам другому ў пэўнае месца цела праціўніка, што звязана з мужчынскім пачаткам. Метафарычны вобраз фразеалагізма пабудаваны на прыпадабненні такога абстрактнага паняцця, як прычыненне каму-небудзь нечаканай непрыемнасці, да канкрэтнага дзеяння – удару па балючым месцы цела мужчыны. Фразеалагічны выраз паходзіць ад свабоднага спалучэння слоў, дзе *ніжэй пояса* служыць эўфемістычным найменнем, з аднаго боку, і выконвае ўказанне на ніжнюю частку цела чалавека як яго прасторы. Фразеалагізм *ўдар ніжэй пояса* выступае ў ролі стэрэатыпа, эталона асабліва крыўднай непрыемнасці, што зыходзіць нечакана і нярэдка ў грубай форме.

І заключае лінгвакультуралагічнае прачытанне і інтэрпрэтацыю фразеалагізмаў з агульным для іх кампанентам фразеалагізм *па Марусін паясок* – ‘амаль да самага верху (шклянкі, чаркі), крыху няпоўна (наліваць, выпіваць і пад.)’ (Л-2008-2: 202), які скарыстоўваецца як жартоўнае вызначэнне аб’ёму ў сітуацыі пры разліве пераважна спіртных напояў у посуд ці ўжыванні такога значнага аб’ёму. Узнікненне фразеалагізма хутчэй за ўсё звязана з існаваннем у савецкі перыяд гранёнай шклянкі цыліндрычнай формы як амаль адзінага посуду ў грамадскіх месцах для чая, кампоту альбо спіртных напояў, аб’ём якіх вызначаўся паяском-рубчыкам на верхняй частцы такіх шклянак, які і служыць мяжой налівання для аб’ёму 200 г (калі наліваць да краёў, то ўжо 250 г). Можна выказаць меркаванне і яшчэ аб адным вытоку новай адзінкі мовы, асабліва з улікам кампанента *Марусін*: вобраз фразеалагізма створаны ў выніку метафары, паводле якой мяжа, мера налівання вадкасці, як правіла, спіртных напояў як амаль поўнай шклянкі ці часткі прыпадабняецца да месца знаходжання Марусінага пояса, што атаясамліваецца з указаннем мяжы знаходжання пояса на адзенні жанчыны, якая даходзіла амаль да грудзей з прычыны вялікага аб’ёму, паўнаты і страты ў выніку гэтага лініі таліі жанчыны.

Усё гэта дазваляе адзначыць, што вобраз фразеалагізма заснаваны ўвогуле на прасторавай метафары, паводле якой мяжа запаўнення прасторы шклянкі спіртнымі напоямі пры іх разліве ці вызначэнні аб’ёму выпітага, прыпадабняецца да месца лініі-пояса ў верхняй частцы шклянкі ці вертыкалі «прасторы» цела жанчыны – Марусі (узгадаем бел. прыказку *На Беларусі ўсе Марусі*). Такі вобраз і кампанентны склад новай адзінкі мовы для абазначэння і выражэння жартоўных адносін да значнага аб’ёму налітага ці выпітага чалавекам яшчэ раз сведчыць пра кемлівасць розуму, асацыятыўнасць і метафарычнасць мыслення, дасведчанасць і вобразнасць чалавека. І фразеалагізм *па Марусін паясок* набыў ролю эталона, стэрэатыпа аб’ёму пры наліванні амаль поўнай шклянкі ці чаркі, як правіла, спіртнога альбо выпівання адразу такога аб’ёму.

Такім чынам, выяўленыя фразеалагізмы беларускай мовы з кампанентам *пояс* дапаўняюць пералік кампанентаў фразеалагічных адзінак і пашыраюць прастору тэматычнага касцюмна-рэчавага кода культуры як абраных слоў, што існавалі ў культуры беларусаў з сімвалічным сэнсам яшчэ ў дафразеалагічны перыяд. Аналіз і лінгвакультуралагічная інтэрпрэтацыя фразеалагізмаў з гэтым кампанентам паказвае, што ўвага да такога матэрыяльнага прадмета, як пояс, пры ўтварэнні другасных адзінак абумоўлена прыналежнасцю яго да знака вербальнага кода культуры, здольнага да далейшай актуалізацыі свайго сімвалічнага сэнсу, да развіцця сімвальнасці ў семантыцы фразеалагізмаў, якія, застаючыся знакамі мовы, пачынаюць выконваюць ролю знакаў культуры – выступаюць у ролі сімвалаў, эталонаў і стэрэатыпаў.

Літаратура

1. Ковшова, М.Л. Лингвокультурологический метод во фразеологии. Коды культуры / М.Л. Ковшова. – М. : Книжный дом ЛИБРОКОМ, 2012. – 456 с.

2. Ляшчынская, В.А. Культурная канатацыя фразеалагізмаў з агульным значэннем ‘адзенне-абутак’ / В.А. Ляшчынская // Беларуская лінгвістыка. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – Вып. 74. – С. 19–29.

3. Ляшчынская, В.А. Фразеалагізмы з кампанентам-найменнем віду адзення ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў / В.А. Ляшчынская // Граматичні студії: збірнік наукових праць. – Вінниця ДонНУ імені Васіля Стуса, 2017. – Вып. 3. – С. 74–79.

4. Ляшчынская, В.А. Фразеалагізмы беларускай мовы з кампанентам *кішэня* – складнікі канцэпту *‘адзенне-абутак’* / В.А. Ляшчынская // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – 2017. – № 4. – С. 105–111.

5. Ляшчынская, В.А. Сімволіка фразеалагізмаў беларускай мовы з кампанентам-найменнем галаўнога ўбору / В.А. Ляшчынская // Филологическая регионалистика. – 2017. – Т. 9, № 1 (21). – С. 5–10.

6. Ляшчынская, В.А. Сімволіка фразеалагізмаў з кампанентам *шапка* ў беларускай мове / В.А. Ляшчынская // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – 2018. – № 1 (106). – С. 64–70.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5-ці т. / Рэд. тома Г.Ф. Вештарт, Г.М. Прышчэпчык. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыклапедыі, 1980. – Т. 4. П–Р. – 768 с.

8. Молчанова, Л.А. Материальная культура белорусов / Л.А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 231 с.

9. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский // Этнографические данные. – Витебск, 1895. – 548 с.

10. Валодзіна, Т. Пояс / Т. Валодзіна, Л. Дучыц, Н. Муляронак // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 368–369.

11. Якунина, Л.И. Слуцкие пояса / Л.И. Якунина. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 240 с.

Спіс скарачэнняў

Д-2000 – Даніловіч, М.А. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны / М.А. Даніловіч. – Гродна : ГрДУ, 2000. – 267 с.; **Л-2008-1** – Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1. А–Л. – 672 с.; **Л-2008-2** – Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 2. М–Я. – 704 с.; **М-К-1972** – Мяцельская, Е.С. Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі / Е.С. Мяцельская, Я.М. Камароўскі. – Мінск : БДУ, 1972. – 320 с.; **Ю-1972** – Юрчанка, Г.Ф. І коціцца і валіцца (Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны) / Г.Ф. Юрчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 288 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 31.08.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 821.161.3.09

Суб’ектная арганізацыя ў беларускім рамане першай паловы 1980-х гадоў

Г.В. НАВАСЕЛЬЦАВА

У беларускім рамане заяўленага перыяду значная эстэтычная ўвага надаецца суб’ектнай арганізацыі, што ілюструюць творы Івана Пташнікава, Васіля Быкава. Дзякуючы пісьменніцкаму наватарству адбываецца развіццё змястоўнай формы, дзе актуалізуюцца мастацкі псіхалагізм, тыпізацыя, іншасказанне, лірычнае пісьмо.
Ключавыя словы: жанр, раман, галоўны герой, Васіль Быкаў, Іван Пташнікаў.

The Belarusian novel of the first half of the 1980s is considered. In the Belarusian novel of the declared period, considerable aesthetic attention is paid to the subject organization, which is illustrated in the works of Ivan Ptashnikau and Vasil Bykau. Thanks to the writer's innovation, the development of the content form takes place, where artistic psychologism, typification, allegory and lyrical writing are actualized.
Keywords: genre, novel, protagonist, Vasil Bykau, Ivan Ptashnikau.

Як вядома, этычны змест падзеі выступаў прадметам мастацкай увагі ў беларускай літаратуры першай паловы 80-х гг. мінулага стагоддзя. Да такога роду творчага даследавання звяртаецца Іван Пташнікаў, Васіль Быкаў, у спадчыне якіх прадстаўлены адметныя ўзоры рамана. Пісьменнікі асэнсоўваюць актуальныя праблемы ў шырокім грамадскім кантэксце, звяртаюцца да аксіялагічнай інтэрпрэтацыі ваеннай тэмы. На ідэйна-мастацкім узроўні ўвасабляюць жаночыя вобразы, дзякуючы якім кожны з мастакоў слова рэпрэзентуе адметную філасофскую канцэпцыю.

Творчасць Івана Пташнікава і Васіля Быкава дазваляе прасачыць дынаміку рамана. Пісьменніцкае наватарства раскрываецца і на ўзроўні суб’ектнай арганізацыі, шмат у чым вызначальнай для мастацкай формы, паказальнай для ідэйнага зместу. Спецыфічнай вобразнай сістэмай вылучаецца раман «з выразна суб’ектыўным, філасофскім пачаткам», калі звярнуцца да азначэння, дадзенага П.К. Дзюбайлам, які ў беларускай раманістыцы 70-х гг. акрэсліў дзве эстэтычныя тэндэнцыі: першая з іх атаясамліваецца з раманам аб’ектыўна-аналітычным, другая – з раманам «суб’ектыўным» [1]. Д.У. Затонскі прасачыў эвалюцыю жанру ад «цэнтрабежнага» да «цэнтраімклівага» рамана на прыкладах знакамітых твораў з сусветнай літаратуры. «Цэнтраімклівы» раман адметны не толькі формай, але і зместам, паколькі пісьменнік разумее гуманізм не толькі як светапоглядную, але і эстэтычную катэгорыю, «напрамак мастацкага, рамннага пошуку, дзе чалавек прыняты не проста за галоўны аб’ект, але менавіта за цэнтр, засяроджанне і адначасова ракурс, у якім разглядаецца ўвесь малюнак рэчаіснасці» [2, с. 384]. Мастацкае дзеянне засяроджваецца вакол пераломнага, рашаючага моманту, які перажывае герой. Шляхам рэфлексій, абумоўленых ідэйна-мастацкай неабходнасцю, можа раскрывацца значная частка жыцця або ўсё жыццё персанажа, у выніку чаго звычайна парушаецца храналогія падзей. Развіццё рамана такога тыпу адбывалася пад уплывам усведамлення мастакамі слова фенаменальнасці гістарычнага працэсу, які не заўсёды паддаецца вытлумачэнню ў строгіх лагічных катэгорыях.

У прыватнасці, пра Васіля Быкава ў айчынным літаратуразнаўстве слушна зазначаецца, што пісьменнік найбольш поўна паказаў вайну праз маральны вопыт радавога салдата. Мастак слова не толькі стварыў багатую галерэю вобразаў чалавека са зброяй у руках, але і звярнуўся да асэнсавання мірных жыхароў, вяскоўцаў, якія апынуліся ў надзвычайных ваенных умовах. Гэта і стала прадметам мастацкай увагі у творы «Знак бяды» (1982), што традыцыйна вызначаецца як аповесць, ілюструе як мастацкія дасягненні аўтара, так і выступае значным набыткам беларускай прозы вызначанага перыяду. Дз.Я. Бугаёў слушна акрэслівае пашырэнне тэматычнага дыяпазону: «Знак бяды» ўвогуле можна назваць «творам не толькі пра вайну, але і пра даваеннае жыццё беларускага сялянства» [3, с. 174], што ў цэлым дае падставы для ўдакладнення жанравага вызначэння. Ускладненай тэматыцы адпавядае сюжэтная будова, якая дазваляе ахапіць значны часавы перыяд, хоць сэнсавазнакавае даваеннае мінулае і рэпрэзентуецца праз успаміны галоўнай гераіні. Рэальны мастацкі час падкрэслена лаканічны: чытач можа з лёгкасцю пералічыць дні, на працягу якіх адбываецца трагедыя, а пасля яе

застаецца толькі напамін пра людскую бяду – рэшткі хутаранскай сядзібы, вобраз якой сімвалічна глыбокі, надзелены пазачасавым значэннем. У лепшых традыцыях лірычнай прозы перадаецца, што знак даўняй бяды ляжыць «на скупых рэштках сядзібы, зараснікаx дзядоўніку і крапівы, якія буйна раскашавалі ў спакоі, на самазадаволенай непрыступнасці калючай шыпшыны і нават мізэрнай, з пакручастым голлем дзічцы» [4, с. 6]. Такім чынам дынаміка часу заяўляе па-сапраўднаму раманныя хранатапічныя характарыстыкі, гуманістычную філасофскую канцэпцыю, якую доказна абгрунтоўвае аўтар.

У творы раскрываецца шматузроўневая канфліктная сітуацыя, якая дазваляе прасачыць развіццё трагедыі, скіроўвае чытача на ўсведамленне яе маральнага зместу. Калі напачатку паказваюцца героі, якія спадзяюцца ацалець падчас ваеннага ліхалецця, дзеля чаго згодныя падпарадкавацца сіле, то ў працэсе развіцця мастацкай падзейнасці выяўляецца, што фізічнае выжыванне яшчэ не самы галоўны прыярытэт, які можа быць заяўлены асобай. Крытыкамі неаднаразова адзначалася, што пісьменнік па-мастацку даследуе, якім чынам і ў якіх умовах герой здольны адстойваць сваю чалавечнасць, а ў якіх умовах гэта становіцца больш важным, чым захаваць уласнае жыццё. Для раскрыцця нетыповай, звышскладанай сітуацыі выбраны героі, якіх Дз.Я. Бугаёў слушна называе тыпова быкаўскімі, героі, у лёсе якіх найбольш паслядоўна і наглядна прасочваецца народны лёс [3]. Думаецца, тыпізацыя выступае ў гэтым творы адметным, сэнсаваўтваральным прыёмам, які дазваляе праз шэраг лакальных эпізодаў перадаць значны, змястоўна поўны малюнак, які ўласцівы не столькі аповесці, колькі раману.

На першым узроўні канфлікт раскрываецца праз маральнае супрацьстаянне Сцепаніды і Петрака Багацькаў немцам, якія размешчаны для часовага жылля на іх сядзібе. Галоўныя героі шмат у чым перадаюць чытачу сваю маральную падрыхтаванасць да таго, што не змогуць па-чалавечы ўжыцца з ворагамі. Пісьменнік паслядоўна паказвае, як упершыню ў жыцці Сцепаніда перажывае прыніжэнне, якое не зможа дараваць, як страчвае Бабоўку, як адбываецца забойства нямога падлетка Яначкі. Апошняе выступае своеасаблівай кропкай невяртання да мірнага жыцця, калі застаецца мажлівай толькі барацьба, чаго б яна не каштавала. З ворагам нельга дамовіцца, дарэмна спадзяваццa на літасць, сцвярджае мастак слова і псіхалагічна глыбока раскрывае вобраз нямецкага афіцэра. Аўтар адлюстроўвае як характэрную рысу тое, што Петраку ніяк не ўдаецца разгледзець яго вочы «пад шырокім казырком-катыпам». Паказальна, што нават не названа імя афіцэра, тады як сярод салдат ёсць, напрыклад, у нейкай меры спачувальны Карла. Нямецкі камандзір бярэцца за зброю без усялякіх пачуццяў: «У цёмных вачах афіцэра бліснула гняўлівая строгасць, хоць цвёрды чарнявы твар заставаўся ранейшы – спакойна-няўрымслівы, але рука пацягнулася на жывот, дзе злева ад спражкі грувасцілася тоўстая скураная кабура. Рука гэта з блішчастым вузкім пярсцёнкам на пальцы нетаропка расшпіліла язычок кабуры і ашчаперыла чорную рукаяць пісталета з тонкім даўгаватым ствалом» [4, с. 59]. Такім чынам эпізадычны ў раманнай сітуацыі вобраз тыпізуецца, раскрываецца з дапамогай іншасказальных сродкаў. Чытач можа праводзіць асацыятыўныя паралелі паміж нямецкім афіцэрам і варонай, якую раней беспаспяхова імкнулася адагнаць ад сядзібы Сцепаніда, каб адвесці наклiканую бяду.

З вялікім маральным болем адлюстроўвае Васіль Быкаў другі, паглыблены, узровень канфлікту, які датычаць супрацьстаяння Багацькаў і паліцаяў, што значыць зацятае змаганне са сваімі. Нікога не дзівіць жорсткасць ворагаў-захопнікаў, але шмат у чым іх пераўзыходзяць Гуж, Каландзёнак, Недасека, і ў гэтым яшчэ давядзецца пераканацца Сцепанідзе і Петраку. Крытыкай справядліва зазначалася, што пісьменнік паглыблена даследуе тэму здрадніцтва, якое разумее як адмаўленне ад выпрацаванай духоўным вопытам народа маральна-этычнай традыцыі. Паказальна, што ў «Знаку бяды» ўвасабляюцца розныя тыпы здраднікаў, якія абумоўлены не столькі ваеннай рэчаіснасцю, колькі грамадска-сацыяльнымі працэсамі папярэдніх дзесяцігоддзяў. Так, Гуж, які ўзначальвае мясцовую паліцыю, бачыць сваёй мэтай не службу немцам, а найперш асабістую помсту за раскулачванне сваёй сям’і. Каландзёнак яшчэ падлеткам прыглядаўся да жорсткіх праяў калектывізацыі і ўсвядоміў, што любой уладзе патрэбны той, хто забывае пра сумленне. Шукае матэрыяльных выгодаў Недасека, як рабіў гэта і ў савецкі час, дзеля чаго без ваганняў гатовы выканаць усё, што загадаюць. Галоўным героям давядзецца на ўласным вопыце спасцігнуць, што дамовіцца і пагадзіцца з такімі аднавяскоўцамі не атрымаецца.

Думаецца, не будзе перабольшваннем удакладніць, што галоўны ідэйна-мастацкі акцэнт прыпадае на вобраз Сцепаніды, які тыпалагічна блізкі пташнікаўскай Алімпіядзе. Абедзве гераіні трапляюць у падобныя складаныя сітуацыі, дзе актыўна праяўляюць сябе. Пісьменнікі паказваюць моцныя характары, на раскрыццё якіх паспяхова працуе нават такі сродак, як ідэалізацыя. Невыпадкова Сцепаніда і Алімпіяда выступаюць выразнікамі аўтарскай думкі, акаляючая рэчаіснасць рэпрэзентуецца праз іх індывідуальнае ўспрыманне. Быкаўская гераіня вызначаецца схільнасцю да валявых рашэнняў, што прыкметна адцяняецца памяркоўнасцю і мяккасцю яе мужа Петрака. Тады як апошні частуе паліцаяў, гоніць для іх самагонку, Сцепаніда крадзе ў немцаў вінтоўку, як лагічны працяг гэта ўчынку ўспрымаюцца яе захады з перахоўваннем бомбы. Аповед пра Петрака завяршаецца апісаннем гвалтоўнага захопу, і чытач можа толькі здагадвацца пра далейшы лёс героя, верагодна, што трагічны: «Пятрок знік, прапаў з гэтага свету, як і для яго прапалі гэты хутар, роў, Сцепаніда, іхнія дзеці Фенька і Федзя – прапаў цэлы свет. І засталіся, можа, успаміны, калі яшчэ было каму ўспомніць, ягоныя жыццёвыя пакуты, дробныя і вялікія клопаты» [4, с. 218]. Аповед пра Сцепаніду даведзены да паказу глыбока сімвалічнага малюнка: згарэў хутар, дзе загінула гераіня, аднак бомба на ўзгорку чакае сваёй пары. І паліцаем застаецца яе баяцца, як і выбуху народнага гневу, што праз нейкі час немінуча абрынецца на здраднікаў, асацыятыўна падказвае чытачу аўтар.

Раман І. Пташнікава «Алімпіяда (воблакі шасцідзесятых)» (1984) выступае цэнтральным у творчай спадчыне аўтара, выразна ілюструе дынаміку змястоўнай формы і з'яўляецца яркім наватарскім узорам у літаратуры вызначанага перыяду. На ідэйна-мастацкім узроўні акцэнтуецца вобраз галоўнай гераіні – Алімпіяды Падаляк, пры гэтым суб'ектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці рэпрэзентуецца праз асобасны свет шэрагу герояў, сярод якіх Таня, Ратнікаў, Фірага і некаторыя іншыя. У творы з адметнымі рысамі лірычнага пісьма аўтарская ўвага скіравана на асэнсаванне грамадскай атмасферы часу ў разнастайных яе праявах, што заяўлена ўжо ў назве рамана.

Нельга не пагадзіцца з доказным меркаваннем С.А. Андраюка, што вобраз Алімпіяды Падаляк у найбольшай меры раскрывае аўтарскае стаўленне да жыцця, «выпраменьвае тое маральнае цяпло, якім сагрэта ўся эмацыянальная атмасфера ў рамане» [5, с. 434]. Думаецца, ідэйнай устаноўкай твора прадвызначана тое, што гераіня выступае скразным вобразам, які звязвае мінулае і сучаснасць, яе адносіны да іншых герояў абумоўліваюць аўтарскую маральна-этычную ацэнку апошніх. Так, «калі іншыя вобразы пададзены ва ўсёй іх складанасці і супярэчнасці, з падкрэсліваннем, магчыма, дзесьці і свядомым, негатыўных момантаў у іх паводзінах, узаемадачыннях, учынках, а найбольш у выказваннях, то Алімпіяда пазбаўлена гэтага поўнасцю. У ёй засяроджаны ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе і ў форме надзвычай чыстай і непасрэднай духоўныя якасці, уласцівыя характару народнаму ў яго ідэальным увасабленні» [5, с. 468]. Крытыка своечасова звярнула ўвагу на аўтабіяграфічную аснову і зазначыла, што пісьменнік ідэалізуе вобраз маці, а гэта заканамерная псіхалагічная з'ява. Думаецца, пісьменнік мэтанакіравана звяртаецца да эстэтычнай стратэгіі, якая дазваляе засяродзіць увагу на маральным змесце падзей з акаляючай рэчаіснасці, што і выступае прадметам мастацкага даследавання.

У рамане «Алімпіяда (воблакі шасцідзесятых)» пісьменнік імкнецца да шырокага ахопу рэчаіснасці, закранае значны шэраг грамадскіх праблем, кожную з якіх рэпрэзентуе выбраны герой. Даследчыкі справядліва звярталі ўвагу на тое, што цяжка вылучыць канкрэтную праблематыку, на асэнсаванні якой найбольш засяроджаны аўтар. У выніку кожнаму з персанажаў мастак слова перадае некаторую меру аўтарскага аўтарытэту, праз жыццёвыя перыпетыі прасочвае тыповыя з'явы рэчаіснасці, раскрывае філасофскую канцэпцыю. Найбольш выразна прадстаўлены голас аўтара пры адлюстраванні вобраза Міфодзі, з дапамогай якога асэнсоўваецца ўжо сучасная ваенная небяспека, што пагражае з такой цяжкасцю пабудаванаму мірнаму ладу. Невыпадкова Міфодзя – ваенны, пасля яго кароткай пабыўкі маці з газет здагадваецца, што сын знаходзіцца на Кубе. Сучаснасць героя кантрастуе з ваенным мінулым, якое для маладога чалавека з'яўляецца гісторыяй, што ўключаецца ў агульнабыццёвы кантэкст: «Ён стаяў на высокім беразе, глядзеў, як унізе сярод ніцых лоз блішчыць ад сонца і неба рака, і здавалася, чуў, як яна на вачах зносіць у вечнасць і заставу, і партызанскія акопы, і кожны міг, пражыты ўсім жывым на зямлі» [6, с. 509]. У чуйным бачанні Міфодзі свет малой радзімы поўніцца чалавечымі слядамі, жыццямі людзей: «А колькі іх

хадзіла, ездзіла, садзіла і рэзала лес, ваявала і паміралa на гэтай зямлі да цябе і да твайго бацькі… <…> Зямля нарадзіла, зямля і забрала» [6, с. 507–508]. Герой усведамляе сябе часткай вялікага жыцця, выступае выразнікам аўтарскай думкі пра яго сілу і невычэрпнасць. Разам з тым Іван Пташнікаў уводзіць цэлы шэраг персанажаў, для якіх падзеі Вялікай Айчыннай вайны сталі неад’емнай і трагічнай часткай мінулага, дзе жыццё неаднойчы страчвалася. Так, «“воблакі шасцідзесятых” усё яшчэ нясуць у сабе дым і полымя саракавых. Вайна жыве ў лёсе ўсіх старэйшых герояў рамана. Алімпіяда, Харбін, Корань… Найбольш трагічна-балючае водгулле вайны нясе ў сабе вобраз Сцяпанаўны» [5, с. 464]. Пісьменнік такім чынам раскрывае суб’ектыўнае бачанне падзей з розных пунктаў погляду, што стварае мастацкі эфект эпічнага шматгалосся, прымушае чытача прадумана фарміраваць адносіны да герояў і падзей.

Падчас напісання рамана крытыкай выказвалася думка, што тэма Вялікай Айчыннай вайны, якой ужо прысвечана значная колькасць твораў у розных жанрах, не будзе да канца вычарпанай, пакуль не прадстаўлена мастацкага асэнсавання жанчыны ў надзвычайных абставінах. Успаміны галоўнай гераіні прачытваюцца як «сюжэт у сюжэце», з якіх раскрываецца даваенная і ваенная падзейнасць, што выступае адзіным сэнсавым цэлым. Аўтар паказвае рэчаіснасць да ўз’яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, пры гэтым невыпадкова тое, што Алімпіяда і яе сям’я жыве каля самай мяжы. Дзякуючы смеласці галоўнай гераіні быў затраманы злачынца, а ў выніку выкрыты бацька і сын Кукаевы. Малодшы Кукаеў ужо ў час ваеннай акупацыі становіцца паліцаем, маральным антыподам і галоўным ворагам Алімпіяды, з якім яна змагаецца, ратуючы параненых лётчыкаў, хоць і рызыкуе собою і блізкімі. Такую рысу ў характары гераіні, як здольнасць да самаахвярнасці, пісьменнік у значнай меры тыпізуе, паказвае і ў мірны час праз адносіны да працы. Для Алімпіяды найвышэйшай каштоўнасцю выступае жыццё, і чытач прымае яе светапогляд. У святле духоўнасці галоўнай гераіні выглядаюць дарэмнымі і нават недарэчнымі дзеянні партызан, пра якія пісьменнік апавядае нейтральна, у выніку пакідае чытачу мажлівасць самому расстаўляць эмацыйныя акцэнты. Партызаны агітуюць вяскоўцаў, пластрэльваюць бідоны з малаком, каб тое не дасталося немцам, але не адгукаюцца на маленне Алімпіяды вызваліць захопленых лётчыкаў. Такім чынам Іван Пташнікаў паказвае грамадскую сітуацыю праз асобныя характэрныя дэталі.

Пісьменнік па-мастацку даследуе этычны змест чалавечых учынкаў, асэнсоўвае іх на пазачасавым узроўні. Маральны канфлікт, звязаны з ваенным мінулым, вырашаецца ў аўтарскай сучаснасці. Характар гераіні выяўляюць адносіны да былога паліцая, Далідчыка-Мамкі, які не столькі просіць, колькі патрабуе захаваць ў таямніцы яго ўдзел у мінулых падзеях. Сам герой не прычыніўся да забойстваў, у небяспечнай сітуацыі нават імкнуўся абараніць Алімпіяду, пры гэтым за сваю здраду Далідчык нямала адпакутваў у зняволенні. Здавалася б, мяккая і спагадная гераіня, якая ці не кожнаму выказвае сваё спачуванне, можа яго прабачыць. Тым не менш, Іван Пташнікаў паказальна адлюстроўвае, што гэтага не адбываецца, і чытач паступова разумее: Алімпіяда нават не дапускае такой мажлівасці. Кожны раз з’яўленне былога паліцая выклікае моцныя эмацыйныя ўражанні і прымушае пакутваць. На асацыятыўным узроўні яго вобраз атаясамліваецца са стратамі, што раскрываецца аўтарам шляхам акцэнтавання балюча-хваравітых уражанняў Сцяпанаўны, якая, убычыўшы Далідчыка, адчайна просіць «не пускаць вайну». Гэты эпізадычны персанаж не толькі адцяняе ўнутраны стан галоўнай гераіні, але і выяўляе завострана трагічны варыянт развіцця вобраза. У паказе знешне зусім не падобных Алімпіяды і Сцяпанаўны раскрываецца нешта агульнае, што і выступае тыповым, у новым святле рэпрэзентуе надзвычайныя абставіны ваеннага часу, якія ў любым сваім праяўленні жахлівыя для жанчыны і маці.

Для супастаўлення маральнага кодэксу людзей розных узростаў у рамане ўвасабляюцца героі малодшага пакалення, адносна якіх Алімпіяда выступае ўзорам чалавечых паводзін, што яшчэ павінен быць усвядомлены. Як трапна зазначае С.А. Андраюк, у рамане адлюстроўваецца жыццё як выключна складаная праява, жыццё, дзе «побач з чалавечай прыгажосцю, працавітасцю, сумленнасцю, чуласцю зусім, здаецца, нармальна існуе п’янства, подласць, гультайства, безадказнасць» [5, с. 425]. Думаецца, паказальным творчым дасягненнем мастака слова можна лічыць тое, што ён не пазбаўляе аўтарскай сімпатыі герояў, якім уласцівыя нейкія заганы. Напрыклад, здольны на глыбокія шчырыя пачуцці малаадказны, схільны да выпіўкі Фірага, які рос сіратою і ў нейкай меры адчувае сябе

сіратою ў жыцці, што ў цэлым выяўляе тып чалавечых паводзін у сучаснай аўтару рэчаіснасці. Паказаны як упэўнены і надзейны чалавек працаўнік Ратнікаў, якому не хапае душэўнай чуласці, герой мала здольны да спагады і прабачэння. Цікава, што аўтар дазваляе чытачу правесці асацыятыўныя паралелі паміж гэтым персанажам і яго машынай, што істотна паглыбляе псіхалагічны партрэт асобы: «Ваенны “газон”, спісаны з вайсковай часці, цягнуў, як звер. Гружоны аж праз борт, ён рваў на трэцяй па тарфяных мяккіх разорах на Дроздцы ля камбайнаў; звінеў, як струна, на роўнай старасвецкай яшчэ дарозе за вёскай на загуменні; поўз, здавалася, быў не на колах, а на лапках, як яшчарка, на грэблі па ямах і ад маста на гару, дай толькі роўненька газу і не тузай, каб не закашляўся…» [6, с. 44]. Заблытаную гісторыю распавядае пра сябе Корань, «Фінагент, Лайдак, як хочаш мяне заві. І ніякі стратэгічны запас без мяне не пройдзе» [6, с. 123], паводле самакрытычнага прызнання героя. Ён здаецца бязвольным не толькі з-за сваёй схільнасці да выпіўкі, але і з-за таго, што не можа разабрацца ў жыццёвай сітуацыі. Нялёгка складваюцца адносіны з жонкай, якую ніяк не рашаецца кінуць, тады як бязбацькавічам расце ягоны сын Валерка. Разам з тым чытач не столькі асуджае, колькі спачувае гэтай асобе, не пазбаўленай духоўнай чуласці.

Такім чынам, праз пакуты і страты сярод мірных вяскоўцаў рэпрэзентуе Васіль Быкаў пачатковы, найбольш складаны перыяд Вялікай Айчыннай вайны, для мастацкага асэнсавання якога выкарыстаны паглыблены псіхалагізм, тыпізацыя, іншасказанне, лірычнае пісьмо. Пісьменнік асацыятыўна супастаўляе час калектывізацыі, даваенных рэпрэсій і ваенны перыяд, асэнсоўвае іх агульныя сацыяльныя працэсы ў маральна-этычных каардынатах, што абумоўлівае па-сапраўднаму раманную глыбіню філасофскай канцэпцыі твора. Думаецца, справядліва зазначыў Дз.Я. Бугаёў, што эпічнае дыханне ў гэтым мастацкім палатне адчуваецца асабліва моцна [3]. У цэлым твор ілюструе эстэтычную тэндэнцыю да трансфармацыі мастацкай формы, калі сэнсавая ёмістасць, адпаведная раманнаму ўзору, раскрываецца ў маштабе аповесці. Відавочна, аказала ўплыў творчая практыка аўтара, які найчасцей звяртаўся менавіта да так званага сярэдняга жанру.

Як бачым, Іван Пташнікаў дынамічна спалучае розныя апавядальныя стратэгіі: стварае шматгеройны раман, але пры гэтым вылучае вобраз галоўнай гераіні, праз суб’ектыўна афарбаваную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці, дзе дамінуе не столькі паказ падзей, колькі ўвага да духоўнага свету асобы, рэпрэзентуе шырокаахопны малюнак часу. Мастак слова звяртаецца да паглыбленага псіхалагізму, ужывае тыпізацыю, выкарыстоўвае прыёмы лірычнага пісьма для шматграннага паказу грамадскай атмасферы. Ускладненая суб’ектная арганізацыя прадвызначае сюжэтны рух, выяўляе адметныя хранатапічыя каардынаты. Такім чынам, нельга адназначна пагадзіцца з традыцыйным меркаваннем некаторых крытыкаў, што талет пісьменніка падкрэслена эпічны. Эстэтычныя магчымасці лірычнай формы рамана істотна трансфармуюць эпічную аснову, выяўляюць новыя мастацкія дасягненні ў развіцці змястоўнай формы і разам з тым пісьменніцкае наватарства.

Літаратура

1. Дзюбайла, П.К. Беларускі раман : гады 70-я / П.К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 176 с.

2. Затонский, Д.В. Искусство романа и XX век / Д.В. Затонский. – М. : Худож. лит., 1973. – 535 с.

3. Бугаёў, Дз. Праўда і мужнасць таленту : выбранае : кніга пра Васіля Быкава. Артыкулы. Дыялог / Дз. Бугаёў ; прадм. І. Чыгрынава. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 414 с.

4. Быкаў, В. Поўны збор твораў : у 14 т. / В. Быкаў. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : Время, 2005. – Т. 2. Аповесці. – 624 с.

5. Андраюк, С. Чалавек на зямлі. Нарыс творчасці Івана Пташнікава / С. Андраюк // А жыццё – вышэй за ўсё : выбранае : літ.-крыт. арт. ; нарыс творчасці / С. Андраюк ; прадм. А. Рагулі. – Мінск, 1992. – С. 267–490.

6. Пташнікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – Т. 4. Раман. – 575 с.

Витебский государственный
университет им. П.М. Машерова

Поступила в редакцию 17.06.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 821.161.3.09-31«19/20»

Мастацкая інтэрпрэтацыя асобы і дзейнасці У.С. Караткевіча ў беларускай прозе XX – пачатку XXI ст.

Н.М. НАЛЁТАВА

Аналізуецца мастацкае адлюстраванне асобы і творчасці У.С. Караткевіча ў беларускай прозе XX – пачатку XXI ст. Сцвярджаецца, што зварот пісьменнікаў да ўзнаўлення вядомай беларускай асобы дэтэрмінаваўся яго значнай роллю ў нацыянальнай культуры.
Ключавыя словы: мастацкая інтэрпрэтацыя, культура, дзеяч культуры, творчая індывідуальнасць, беларуская проза, эсэ, раман-эсэ.

The article examines the artistic reflection of the personality and creativity of U.S. Karatkevich in the Belarusian prose of the XX – beginning of XXI century. It is argued that the writers' appeal to the revival of a famous Belarusian personality was determined by its significant role in the national culture.
Keywords: artistic interpretation, culture, cultural, creative personality, Belarusian prose, essays, novel essay.

Другая палова XX – пачатак XXI ст. – гэта перыяд істотных грамадска-палітычных зрухаў на Беларусі, якія станоўча паўплывалі на яе сацыяльна-эканамічнае і духоўнае развіццё, а таксама на літаратурны працэс, у рэчышчы якога развівалася мастацкая проза.

Агульнавядома, што дзейсным сродкам выхавання патрыятычных пачуццяў суайчыннікаў з'яўляецца іх знаёмства з гістарычным мінулым, што становіцца найбольш актуальным для аднаўлення гістарычнай памяці ва ўмовах існавання нацыянальнага нігілізму. Таму значнае месца ў беларускіх празаічных творах XX – пачатку XXI ст. займае мастацкая інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных асоб (асветнікаў, пісьменнікаў, грамадска-палітычных дзеячаў, мастакоў), што адыгралі важную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры. Сярод іх варта назваць *Еўфрасінню Полацкую* («Прыдыслава» В. Іпатавай, «Святыя грэшнікі» А. Асіпенкі, «Спакуса» Т. Бондар, «Нібы прамень сонечны» У. Арлова, «Пакліканыя» В. Коўтун), *Францыска Скарыну* (раздзел «Беларускія гуманісты» з «Зямлі пад белымі крыламі» У. Караткевіча, «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» і «Скарына на Градчанах» А. Лойкі), *Міколу Гусоўскага* («Час чумы» У. Арлова), *Пятра Мсціслаўца* («Мсціслаўцаў посах …» Э. Ялугіна), *Кастуся Каліноўскага* («Сярэбраны яздок» С. Яновіча, «Кастусь Каліноўскі» А. Якімовіча, «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча, «Восень пасярод вясны» А. Мальдзіса, «Літоўскі воўк» А. Наварыча), *Францішка Багушэвіча* («Пры апазнанні – затрымаць» В. Хомчанкі), *Алаізу Пашкевіч* («Крыж міласэрнасці» В. Коўтун, «Стану песняй …», «На струнах буры» і «На полымі любві» Л. Арабей), *Максіма Багдановіча* («Загадка Багдановіча» М. Стральцова), *Цішку Гартнага* («Пасля нябыту» і «Без эпітафіі» Э. Ялугіна), *Янку Купалу* («Ой, рана на Івана» З. Бандарынай, «Незабыўныя дарогі» і «Дарогі песняра» В. Віткі, «Як агонь, як вада …» А. Лойкі), *Якуба Коласа* («Колас расказвае пра сябе» і «Песні з леснічоўкі» М. Лужаніна; «Ад роднае зямлі», «Далёкія зарніцы», «На шырокі прастор», «Крыжавыя дарогі» С. Александровіча), *Міхася Стральцова* («Гарэла свечачка» В. Карамазава), *Уладзіміра Караткевіча* («Наш Караткевіч» Я. Брыля, «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне» М. Купрэева, «Уладзімір Караткевіч» В. Макарэвіча, «Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча» А. Мальдзіса, «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» А. Лойкі), *Станіслава Жукоўскага* («Мой брат духоўны …» В. Карамазава), *Міколу Тарасікава* («Урокі мастака» В. Карамазава), *Антона Бархаткова* («Зачараваная душа» і «Антон» В. Карамазава), *Васіля Супруна* («Васілёк за калючым дротам» А. Лойкі), *Уладзіміра Дамашэвіча* («Просты і шчыры» А. Лойкі), *Самсона Пярловіча* («Паэзія супрацьстаяння» А. Лойкі), *Анатоля Бараноўскага* («Жавароначкам бласлаўлёнае» В. Карамазава) і інш.

Прыведзеныя намі вышэй прыклады сведчаць аб тым, што аб'ектам мастацкай інтэрпрэтацыі беларускіх пісьменнікаў акрэсленага перыяду з'яўляюцца дзеячы культуры як аддаленых часоў, так і сучаснасці. Пры гэтым усіх пералічаных асоб аб'ядноўвае, несумненна, важнае значэнне ў развіцці і папулярызацыі нацыянальнай культуры.

Розныя падыходы пісьменнікаў у асвятленні вобразаў вядомых дзеячаў культуры (напрыклад, тыпалагічныя і індывідуальна-аўтарскія мадэлі мастацкай рэпрэзентацыі, суадносіны мастацкай фальсіфікацыі і факта) прыцягваюць увагу многіх сучасных айчынных літаратуразнаўцаў, як В.К. Шынкарэнка, І.М. Запрудскі, В.Ю. Бароўка, Л.Г. Кісялёва, В.І. Локун, Т.А. Фіцнер, І.І. Дамарад, А.М. Дарагакупец, Г.М. Друк, С.М. Тарасава, Н.М. Кунгер, Д.І.-Т. Дудзінская і інш.

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена адсутнасцю ў беларускім літаратуразнаўстве сістэмнага навуковага асэнсавання вобразаў пісьменнікаў, створаных іншымі пісьменнікамі.

Мэта дадзенага даследавання – выявіць асаблівасці мастацкай інтэрпрэтацыі асобы і дзейнасці класіка беларускай літаратуры У.С. Караткевіча (1930–1984) у айчыннай прозе XX – пачатку XXI ст.

Матэрыялам для нашага даследавання абраны эсэ «Наш Караткевіч» (1985) Я. Брыля і «Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека» (1987–1988) А.В. Мальдзіса, раман-эсэ «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (2009) А.А. Лойкі. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі прыёмы канкрэтна-гістарычнага, параўнальнага і дэскрыптыўнага метадаў.

Адной з самых яркіх асоб беларускай і сусветнай гісторыі XX ст. з'яўляецца таленавіты паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, літаратуразнаўца і сцэнарыст У.С. Караткевіч. Літаратуразнаўца А.Л. Верабей слушна назваў яго «гонарам і сумленнем беларускай літаратуры, … сапраўдным апосталам духоўнасці, прадвесцем новага беларускага Адраджэння» [1, с. 390]. Мы поўнасцю пагаджаемся з гэтым выказваннем, бо цяжка пераацаніць ролю У.С. Караткевіча у абуджэнні нацыянальнай свядомасці і папулярызацыі гісторыі беларусаў, у чым пераконваюць яго раманы «Нельга забыць», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі», аповесці «Сівая легенда», «Цыганскі кароль», «Ладдзя Роспачы», «Зброя», апавяданні «Паляшук», «Паром на бурнай рацэ» і драматургія.

У эсэ «Наш Караткевіч» Я. Брылём, які сябраваў з У.С. Караткевічам, засяроджваецца ўвага на складаным творчым шляху будучага класіка беларускай літаратуры, у прыватнасці, на гісторыі выдання раманаў «Нельга забыць» і «Каласы пад сярпом тваім». Больш падрабязна гэта сітуацыя аналізуецца ў рамане-эсэ «Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека» (1987–1988) беларускага пісьменніка, літаратуразнаўцы, гісторыка і журналіста А.В. Мальдзіса, аднаго з найбліжэйшых сяброў У.С. Караткевіча.

Зробім агаворку, што пасля публікацыі рамана «Нельга забыць» у газеце «Літаратура і мастацтва» 17 ліпеня 1962 г. з'явілася рэцэнзія «Права мастака» гэтага літаратуразнаўцы, у якой быў высока ацэнены наватарскі ў вобразным плане твор, які стаў «сведчаннем сталасці беларускай літаратуры» [2, с. 8]. Пасля ў газеце «Советская Белоруссия» быў надрукаваны артыкул «Пошукі, знаходкі, страты» Я. Герцовіча, дзе літаратурны крытык абвінавацiў аўтара рамана ў фармалізме, што, па словах А.В. Мальдзіса, было не «выражэннем прыватнай думкі, а дэрэктыўным указаннем» [2, с. 23].

Як заўважае ў эсэ «Наш Караткевіч» Я.Брыль, крытычныя выказванні ў «застойны» перыяд негатыўна паўплывалі як на асобу з «чулым сэрцам, вострай сумленнасцю» [3, с. 429] і «абражанай годнасцю» [3, с. 429], так і на развіццё айчыннай літаратуры: «Няўжо так было заўсёды і так заўсёды будзе, што некаторым з найбольш таленавітых трэба прабівацца да чытача з незвычайнымі цяжкасцямі ды перашкодамі, як потым акажацца – лішнімі і шкоднымі не толькі для носьбіта таго жывога агню, але і для сапраўднай літаратуры? Потым акажацца… А тое потым прыходзіць не толькі позна, але ж і запозна. І вінаватых як быццам няма…» [3, с. 428].

У эсэ Я. Брыля выказваецца думка, што падобнае стаўленне вульгарызатарскай крытыкі да У.С. Караткевіча, папулярнага за межамі СССР, было неаргументаваным і не дазволіла яшчэ пры жыцці самога творцы ацаніць яго набыткі належным чынам, як у іншых краінах. Напрыклад, талент нашага земляка высока ацэньваўся ў тагачаснай Чэхаславакіі.

У прааналізаваным намі эсэ «Наш Караткевіч» пісьменнік падаецца эрудыраванай, начытанай, працавітай, мэтанакіраванай, высакароднай, прынцыповай, моцнай духам, часам крыўдлівай, ранімай і рамантычнай асобай; чалавекам незвычайнага, рэнесанснага таленту; «замілаваным знаўцам роднай даўніны» [3, с. 432], які зрабіў важны ўнёсак ў папулярызацыю айчыннай гісторыі і развіццё прозы пра мінулае, значна апярэдзіўшы свой час.

Даследчык творчасці Караткевіча А.У. Русецкі сярод асаблівасцей гістарычнай прозы У.С. Караткевіча вылучае «рэалістычны падыход да адлюстравання роднай гісторыі праз праўдзівы аналіз фактычнага матэрыялу, шырокае выкарыстанне гістарычных дакументаў, летапісаў, хронік, вуснай народнай творчасці, увядзенне ў тканіну мастацкага твора падзей і імён рэальна існаваўшых людзей» [4, с. 56–57]. На гэта звяртаецца ўвага і ў эсэ «Наш Караткевіч» Я. Брыля: «Ён праўдзівы і сам. Верыў у тое, што гаварыў. І ў жыцці быў праўдзівы, і ў творах застаўся. У творах – наколькі ўдалося…» [3, с. 426].

Янка Брыль, бясспрэчна, высока ацэньвае значэнне У.С. Караткевіча ў гісторыі нацыянальнай літаратуры, слушна заўважаючы: «Беларусь даўно чакала такога пісьменніка.

І радасна, што ён прыйшоў.

І горка, балюча, што ён не змог, не паспеў разгарнуцца яшчэ больш глыбока і шчодра» [3, с. 436].

У самой назве эсэ «Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека» А.В. Мальдзіса падкрэсліваецца значная роля гэтага творцы, што «ўзнёсся над сваім часам, <…> да вяршынь айчыннай і сусветнай літаратуры» [2, с. 3].

Мастацкае адлюстраванне жыцця і творчасці У.С. Караткевіча абумоўлена законамі жанру эсэ: суб'ектыўнасць выказвання, свабодная кампазіцыйная структура, матэрыял выкладаецца непаслядоўна (даецца агляд жыццёвага шляху, падрабязна аналізуецца сама творчасць, даследуюцца фактары, якія паўплывалі на фарміраванне і развіццё таленту гэтай асобы). Дакументальны пласт тэксту ствараецца за кошт уключэння архіўных матэрыялаў, літаратурна-крытычных артыкулаў, згадак, успамінаў сяброў, інтэрв'ю, дзённікавых запісаў, лістоў У.С. Караткевіча, вершаў-прысвячэнняў і інш., што дазволіла пісьменніку ўзмацніць аргуметаванасць свайго мастакоўскага бачання гэтай асобы.

У эсэ падаюцца цікавыя развагі самога У.С. Караткевіча аб сусветных класіках (Л.М. Талстым, Ф.М. Дастаеўскім), творчым працэсе, законах, задачах і эстэтычных прынцыпах літаратуры як аднаго з відаў мастацтва: «Верш у мяне пачынаецца з думкі. Потым узнікае фраза – з сярэдзіны, з канца. А ўсё астатняе падганяецца пад яе. <…> Для мяне важны асноўны радок. Радок-бацька ці маці. Ён цягне за сабой іншыя – спераду ці ззаду. Яны могуць быць лепшыя ці горшыя. Але пачатак, аснова – у тым, першым» [2, с. 65]; «У прозе ўсё пачынаецца з настрою. Настрой нараджае адпаведную думку. Разам узятыя, яны і даюць той ключ, у якім будзеш весці апавяданне, якім «адамкнеш» тэму…» [2, с. 86]; «Літаратура павінна быць сумленнем сваёй эпохі. Не хлусіць! Акрамя ж літаратуры, ніхто не скажа чалавеку, як жыць. Літаратура адлюстроўвае не столькі жыццё, колькі адносіны паміж людзьмі» [2, с. 146].

А. Мальдзісам апісваюцца стасункі будучага класіка нашай літаратуры з айчыннымі і замежнымі пісьменнікамі, да прыкладу, моцнае сяброўства з Р.І. Барадуліным: «Дробныя шпількі і шпілечкі не перашкаджалі іх сапраўднай мужчынскай дружбе. Былі ва ўзаемаадносінах і суперніцтва, і зайздрасць, і спрэчкі, і дні адчужэння, і нават, казалі, ледзь не бойка. Але не прыпомню ніводнага выпадку, каб яны дайшлі да непавагі, узаемных абраз <…> Вельмі розныя па характары і мастацкім бачанні свету (Валодзя больш рацыяналістычны, «зададзены», Рыгор больш эмацыянальны, непасрэдны), яны цудоўна сябе ўзаемна дапаўнялі» [2, с. 73].

Па ўспамінах А.В. Мальдзіса, У.С. Караткевіч «часам крыху задзірліва» [2, с. 73] адносіўся да творчасці свайго старэйшага сабрата Я. Брыля, які маральна падтрымліваў яго ў перыяд глыбокіх дэпрэсій, выкліканых адмоўнымі водзывамі крытыкі. Як заўважае А.В. Мальдзіс, «самым цяжкім перыядам у жыцці Караткевіча была другая палова шасцідзясятых – пачатак сямідзясятых гадоў, калі аўтар «Каласоў…» сапраўды хадзіў у «чорным целе», калі ў кожным яго радку шукалі крамолу» [2, с. 95]. Такім чынам, пісьменнік прытрымліваецца гістарычнай дакладнасці пры апісанні псіхічнага стану чулага, сумленнага і з абвостраным пачуццём справядлівасці творцы ў неспрыяльны перыяд 1950–1970-х гг.: «Часам задумённы і сумны – асабліва калі сустракаўся з праявамі чалавечай дурасці і кар'ерызму. Часам – у апошнія гады жыцця – раздражнёны і гнеўны» [2, с. 200].

У эсэ А.В. Мальдзіса класік беларускай літаратуры падаецца шматграннай, інтэлігентнай, энцыклапедычна дасведчанай, надзвычай таленавітай, адданай Радзіме, дасціпнай, гасціннай, высакароднай, сумленнай («хлусні ён не любіў» [2, с. 88]; «усе выпрабаванні ён перамог з годнасцю, не пераступіўшы свой талент і сваё сумленне» [2, с. 188]; «у Кіеўскім універсітэце Караткевіч быў душой курса, яго сумленнем» [2, с. 22]), шчырай, адкрытай, па-дзіцячы наіўнай, натуральнай у паводзінах, прынцыповай і крытычнай у адносінах да існуючых кансерватыўных дагматаў («свайго непрыняцця застою, сваёй нянавісці да яго носьбітаў ён не хаваў, выказваў з трыбуны» [2, с. 97]; «многае ў жыцці не прымаў, намагаўся змяніць да лепшага» [2, с. 199]; «У гады застою ён дзейнічаў» [2, с. 199]), не помслівай і ўседаравальнай («Ён ніколі не апускаўся да дробнай помсты. Часам толькі кіне ў адказ рэпліку з залы або складзе дасціпную прыпеўку» [2, с. 220]), дзейснай і сацыяльна актыўнай («ён быў само дзеянне» [2, с. 198]; «не любіў агульных гучных слоў, балбатні і цаніў канкрэтныя справы» [2, с. 101]; «Са слоў кашы не зварыш. Вы лепш зрабіце» [2, с. 198]; «Калі не лічыць перыядаў дэпрэсій, Уладзімір Караткевіч быў увесь у руху» [2, с. 198]), працавітай («нястомны працаўнік» [2, с. 187]), самаахвярнай і моцнай духам асобай, якая добра ўсведамляе сваю «абуджальную» місію і месца ў тагачаснай беларускай літаратуры і грамадстве.

Заўважым, што ў эсэ пісьменнік уключыў успаміны пра выкананне самім У.С. Караткевічам беларускіх і ўкраінскіх народных песень, удалыя малюнкі, апісанні яго вандровак з жонкай Валянцінай Браніславаўнай па Беларусі з мэтай захаваць помнікі нацыянальнай архітэктуры і г. д., што пацвярджае шматграннасць і шырокае кола інтарэсаў гэтай асобы. Так, зварот У.С. Караткевіча да кінематографа, як сцвярджаецца ў эсэ, быў звязаны з неабходнасцю больш моцна ўздзейнічаць на пачуцці суайчыннікаў (не толькі словам, але і рухамі, гукамі, колерамі), якія, на думку творцы, з недастатковай павагай, абыякавасцю ці нават пагардай адносіліся да ўсяго беларускага: «Караткевіч бачыў, да чаго вядзе адсутнасць патрыятызму, асабліва сярод моладзі, – вядзе да таго, што чалавек становіцца касмапалітам, у якога няма ні каранёў, ні памяці, ні гісторыі. <…> Таму ён раз-пораз звяртаўся да вопыту гісторыі, гэтай мудрай і аб'ектыўнай настаўніцы жыцця» [2, с. 199].

Як і Я. Брыль, А.В. Мальдзіс сцвярджае, што заўчасная смерць чулага творцы стала наступствам тагачаснай грамадска-палітычнай атмасферы і тых выпрабаванняў, якія выпалі на долю беларускай літаратуры і нашага народа ў сталінскія і «застойныя» часы: «Ён абвострана, пакутліва ўспрымаў усе нягоды і бядоты <…> А колькі горкіх асабістых крыўдаў і зняваг давялося праглынуць яму моўчкі, амаль без слёз. Яны не праходзілі бясследна. Яны таксама набліжалі канец» [2, с. 184]. Гэта падзея стала вялікай стратай для беларускай і замежнай грамадскасці (нагадаем, што У.С. Караткевіч з цікавасцю і павагай ставіўся да іншых культур і падтрымліваў цесныя сувязі з іх дзеячамі).

Асэнсоўваючы жыццёвы і творчы шлях У.С. Караткевіча, які, несумненна, апярэдзіў свой час і стаў эпахальнай з'явай не толькі ў працэсе развіцця беларускай культуры, але і адраджэння нацыянальна-гістарычнай свядомасці нашага народа, А.В. Мальдзіс адзначае: «… ён ведаў, на што ідзе. <…> Іншыя лягчэй або цяжэй прыстасаваліся да застойнага перыяду. А ён – не. Ён горда, нібы Юрась Братчык крыж на Галгофу, нёс цяжкую ношу «заступніка» беларускай гісторыі і беларускай культуры. Быў праведнікам і прарокам» [2, с. 225]. Па велічы зробленага на карысць Айчыны і ідэйных перакананнях гэты пісьменнік ставіць У.С. Караткевіча ў адзін рад з Ф. Скарынам і К. Каліноўскім, слушна называючы іх «тытанамі» [2, с. 228] і «людзьмі прадвесня» [2, с. 228].

Як і ў прааналізаваных намі творах Я. Брыля і А.В. Мальдзіса, у рамане-эсэ «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (2008) аўтар падсумаваў і канцэптуальна выявіў уласны эстэтычны погляд на мастацкую творчасць У.С. Караткевіча.

Пісьменнік прытрымліваецца дакладных фактаў пры адлюстраванні складанага творчага шляху свайго блізкага сябра, будучага класіка беларускай літаратуры, які, па яго словах, яшчэ «на самым пачатку зазнаў разноснай крытыкі дагматаў у роднай Воршы і цярпець не мог мінскіх герцовічаў, маскоўскіх чалмаевых» [5, с. 9] (гаворка ідзе аб негатыўнай ацэнцы савецкай крытыкай яго паэтычных зборнікаў «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі» і многіх празаічных твораў). Па слушным прызнанні А.А. Лойкі, у складаны перыяд канца 1950-х гг. савецкія літаратурныя крытыкі («партыйныя артадоксы» [5, с. 38]) не ацанілі належным чынам першы зборнік «Матчына душа» У.С. Караткевіча (1958). У рамане-эсэ «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» аўтар у адносінах да У.С. Караткевіча

выкарыстоўвае трапныя перыфразы-азначэнні тыпу «валадар мастацкага слова» [5, с. 5] (разам з І. Мележам і В. Быкавым), «геній нашай літаратуры» [5, с. 9], «трэці волат літаратуры беларусаў» [5, с. 7] (пасля Ф. Скарыны і Я. Купалы), «мастацкі летапісец паўстання 1863 г.» [5, с. 10], «беларускі Сянкевіч» [5, с. 10], «кароль пяра» [5, с. 23], «стаханавец» [5, с. 22], «рэнесансны чалавек» [5, с. 82] і інш., якія яскрава выяўляюць яго адносіны да гэтай асобы.

Дакументальны пласт тэксту рамана-эсэ А.А. Лойкі ствараецца за кошт уключэння ўспамінаў (У.А. Калесніка, М. Танка і Ф. Няўважнага), вытрымак з літаратуразнаўчых артыкулаў, дзённікавых запісаў, лістоў У.С. Караткевіча да вядомых асоб нацыянальнай гісторыі (Я. Коласа, Я. Брыля, М. Танка), якія даюць магчымасць пазнаёміцца, да прыкладу, з яго творчым крэда, пачаткам літаратурнай дзейнасці, філасофскімі развагамі аб повязі часоў, адносінамі да беларускай гісторыі і яе велічных дзеячаў, асаблівасцямі характару і г. д., а таксама робяць больш аргументаваным і аб'ектыўным мастакоўскае бачанне гэтай таленавітай асобы. Напрыклад, у лістах да свайго латышскага сябра па Вышэйшых літаратурных курсах Стулпана Гераніма У.С. Караткевіч выяўляецца суровай, бескампраміснай, катэгарычнай у суджэннях, да канца шчырай і праўдзівай асобай [5, с. 78–79]. Па ўспамінах жа М. Танка і А.А. Лойкі, будучы класік беларускай літаратуры любіў у маладосці «парысавацца».

Варта заўважыць, што А.А. Лойка ў сваім рамане-эсе плённа выкарыстаў і набыткі караткевічазнаўства, у прыватнасці, уключыў свае рэцэнзіі «На пачатку дарог!», «Выхаванне таленту» (на зборнікі «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі» адпаведна). У творы А.А. Лойкі, па словах літаратуразнаўца А.Л. Вераб'я, «натуральна спалучыліся асабістае, лірычнае, паэтычнае і даследчыцкае, праблемна-аналітычнае» [6, с. 7].

З тэксту рамана-эсэ вынікае, што А.А. Лойка надзвычай высока ацэньваў адметную творчасць У.С. Караткевіча: «Караткевіч з самага пачатку свет арыгінальным бачыў, разумеў, выяўляў. Творчай эвалюцыі, эвалюцыі таленту ў Караткевіча не было. Якім талентам Уладзімір Караткевіч нарадзіўся, такім талентам быў усё сваё жыццё!» [5, с. 21].

На падставе сказанага намі вышэй можна зрабіць выснову, што мастацкая інтэрпрэтацыя асобы і шматграннай творчасці У.С. Караткевіча ў прааналізаваных намі эсэ Я. Брыля і А.В. Мальдзіса, рамане-эсе А.А. Лойкі накіравана на асвятленне той вызначальнай ролі, якую ён адыграў у гісторыі беларускай культуры (у тым ліку кіно, тэлебачанні, тэатры). Празаікі не ставілі за мэту падрабязна ўзнавіць біяграфічныя факты і стварыць хроніку жыцця і творчасці У.С. Караткевіча, а зрабілі стаўку на адлюстраванне тых ключавых момантаў, якія дапамагаюць раскрыць асаблівасці яго індывідуальнасці і даць яму характарыстыку. Так, ва ўсіх прааналізаваных намі творах, аўтары дакладна, у адпаведнасці з гістарычнай праўдай, вызначылі энцыклапедычныя веды, высакароднасць, прынцыповасць, мужнасць, працавітасць, самаахвярнасць, апантанасць, шчырасць, шматграннасць, чуласць творцы. Варта таксама адзначыць, што ва ўсіх прааналізаваных творах вобраз У.С. Караткевіча не ідэалізуецца, а падаецца з усімі недахопамі (наступствы дэпрэсій, «ясенінскі» стыль жыцця).

Літаратура

1. Верабей, А.Л. Уладзімір Караткевіч / А.Л. Верабей // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы ; нав. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 4, кн. 1. – С. 361–390.

2. Мальдзіс, А.В. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А.В. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 230 с.

3. Брыль, Я. Запаветнае. Выбраныя творы / Я. Брыль. – Мінск : Беллітфонд, 1999. – 448 с.

4. Русецкі, А.У. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю і сучаснасць: нататкі літаратурнай творчасці / А.У. Русецкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 300 с.

5. Лойка, А.А. Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі : раман-эсэ / А.А. Лойка // Полымя. – 2009. – № 1. – С. 3–43 ; № 2. – С. 63–96.

6. Верабей, А.Л. Подзвіг творцы / А.Л. Верабей // Літаратура і мастацтва. – 2009. – 20 лістапада. – С. 7.

Витебский государственный
университет им. П.М. Машерова

Поступила в редакцию 04.05.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

*УДК 811.161.3'01:929*М.Сматрыцкі*

Непераўзыдзены ўзор старажытнага мовазнаўства (да 400-годдзя «Граматыкі» М. Сматрыцкага)

Д.Д. ПАЎЛАВЕЦ

Артыкул прысвечаны 400-годдзю «Граматыкі» М. Сматрыцкага, разглядаюцца падставы яе з'яўлення, роля ў нармалізацыі царкоўнаславянскай мовы, развіцці граматычнай думкі ў Вялікім Княстве Літоўскім і славянскім свеце, выпрацоўцы мовазнаўчай тэрміналогіі, працягу традыцый Ф. Скарыны. Падаецца ацэнка граматыкі ў навуковай літаратуры.
Ключавыя словы: граматыка, М. Сматрыцкі, філалагічная думка, рэнесансна-гуманістычныя традыцыі, царкоўнаславянская мова, нармалізацыя мовы, школьная адукацыя, пераемнасць.

The article is dedicated to the 400th anniversary of «Grammar» by M. Smatritsky. The bases of its appearance, the role in the normalization of the Church Slavonic language, the development of grammatical thought in the GDL and the Slavic world, the development of linguistic terminology, the continuation of F. Skaryna's traditions are considered. Grammar in the scientific literature is assessed.
Keywords: grammar, M. Smatritsky, philological thought, Renaissance-humanistic traditions, Church Slavonic language, language normalization, school education, continuity.

Старажытныя рымляне гаварылі habent suam fatum libelli 'кнігі маюць свой лёс'. Сапраўды, у кожнай кнігі свая гісторыя, адметны лёс. Не выключэнне і выданне, пра якое пойдзе гаворка ў нашым артыкуле і якому доля падаравала шчаслівы лёс. Гэта **«Грамматіки Славенския правилное синтагма»** Мялеція Сматрыцкага, якая ўбачыла свет 400 гадоў таму ў Еўі, непадалёку ад Вільні і якая прынесла аўтару ўсеславянскую вядомасць. Яна адкрыла новую старонку ў развіцці філалагічнай думкі не толькі ў ВКЛ, але і ў суседніх краінах.

Не выпадкова і тое, што яна з'явілася ў гэтым месцы і ў гэты час. Якраз тады Вільня стала буйным асяродкам духоўнага, культурнага і рэлігійнага жыцця, сапраўдным цэнтрам творчай асобы. Тут жылі і працавалі самыя вядомыя дзеячы праваслаўя, уніяцтва і каталіцызму (браты Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, Лявонцій Карповіч, Мялецій Сматрыцкі, Кірыл Транквіліён, Язафат Кунцэвіч, Іпацій Пацей, Вельямін Руцкі, Пятро Скарга), функцыянавалі Віленская езуіцкая акадэмія, Віленская брацкая школа, для якой пачатак XVII ст. стаў зорным часам. Тады яе ўзначальваў выдатны старабеларускі рэлігійны пісьменнік-палеміст, архімандрыт Лявонцій Карповіч. У Вільні працавала друкарня братоў Мамонічаў, а ў Еўі – віленскага Свята-Духава брацтва. Да гэтага часу ў Еўінскай друкарні ўбачылі свет такія выдатныя помнікі старабеларускай рэлігійнай літаратуры, як «Казанне двое», «Евангелле павучальнае», перакладзенае на старабеларускую мову М. Сматрыцкім, нарэшце адзін з яго самых вядомых антыкаталіцкіх твораў «Трэнас, або Плач праваслаўнай царквы» і першы падручнік для пачатковага навучання грамаце «Букварь языка славенска», аўтарам якога, верагодна, быў М. Сматрыцкі. Вядомасць да яго прыйшла найперш як да аўтара «Трэнасу». Нават калі б не было дзейнасці на літаратурнай ніве, ён усё роўна застаўся б у гісторыі навукі як выдатны філолаг, аўтар «Грамматіки Славенския правилное синтагма», які быў самай прыкметнай постаццю грамадскага і рэлігійнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага І-й трэці XVII ст. У яго за плячыма была выдатная еўрапейская адукацыя, атрыманая спачатку ў Віленскай езуіцкай акадэміі, а пасля ўдасканаленая ў найлепшых універсітэтах Нямеччыны. Ён меў неблагі настаўніцкі досвед як педагог брацкай школы, хатні настаўнік дзяцей князя Багдана Саламярэцкага з Баркулабава, знакаміты пісьменнік-палеміст, тэолаг. Прынамсі, «…біяграфія Мялеція Сматрыцкага становіцца тыповай біяграфіяй беларуска-ўкраінскага інтэлігента эпохі барока. <> Гэты інтэлігент арыентуецца не столькі на ўсходнеправаслаўных "айцоў", колькі на антычных, дахрысціянскіх аўтараў: іх слава становіцца яго "пуцяводнай зоркай". Здабыўшы славу сённяшнюю, ён спадзяецца праз

яе пасярэдніцтва далучыцца да славы вечнай» [1, с. 114]. М. Сматрыцкі стаў адным з найбольш яркіх спадкаемцаў і паслядоўнікаў заснаванага Ф. Скарынам накірунку, якія працавалі на сумежжы грэка-візантыйскай і лаціна-рымскай культур, сінтэзавалі рэнесансна-гуманістычныя традыцыі, інтэгравалі веравызнанні і культуры Усходу і Захаду [2, с. 7], найбольш поўна адлюстраваныя ў ягонай «Граматыцы», якая да нашага часу не пакідае абыякавымі гісторыкаў мовы, педагогікі.

Свежыя павевы заходнееўрапейскага Адраджэння і Рэфармацыі садзейнічалі імкліваму вызваленню чалавечага розуму з рэлігійных цянётаў, пашырэнню кнігадрукавання і школьнай адукацыі, якая вымагала адпаведных падручнікаў, дзе былі б сфармуляваны правілы карыстання мовай. Гэта з'явілася адной з падстаў для напісання граматыкі. Беручыся за напісанне граматыкі, М. Сматрыцкі кіраваўся як патрэбамі грамадска-прыкладнога, так і канфесійнага характару. Па-першае, узяцца за працу вучонага падштурхнула адсутнасць «славенскай» граматыкі, падобнай да грэцкай і лацінскай. Ён планаваў навучыць *«именъ склоненія, а глаголовь спряженія... порядку і сопряженія слов»,* а таксама добра *«читати по славенску, и писати розделне, и чтомое вырозумевати»* [2][1]. Па-другое, не менш важнае, як вынікае з прадмовы, – ён кіраваўся жаданнем узвысіць царкоўнаславянскую мову сярод народа, надаць ёй пашану, разуменне, пашырыць ужыванне, таму што яна, з'яўляючыся прыроднай мовай нашай царквы, занядбаная і забытая. Сапраўды, у канцы XVI – пачатку XVII ст. царкоўнаславянская мова ў ВКЛ перажывала заняпад, станавілася малазразумелай, насычалася беларускімі моўнымі элементамі. М. Сматрыцкі добра ведаў пра тое, што ўжо многія прадстаўнікі праваслаўнага духавенства «и писмом се своим, а злаща в слове божем, встыдають! А на остаток, што может быти жалоснейшое, што шкарадша, иж и тые, се межи нами зовуть духовными и учители, смеле мовлю намней его не вмеють, намней его вырозуменя не знають, а ни се в нем цвичать, але а ни школы ку науце его нигде не мають, за чим в полские або в иные писма за такою неволею… немало заправують» [3, с. 34]. Апаненты з каталіцкага лагера не беспадстаўна даводзілі, што з царкоўнаславянскай мовай «ніхто вучоным быць не можа, бо гэтая мова не мае ні слоўнікаў, ні правілаў, ні граматыкі, ніхто на ёй не размаўляе, а святары, калі хочуць зразумець славянскае пісанне, звяртаюцца за тлумачэннем да польскага» [4, с. 486]. Абараняючыся, асобныя праваслаўныя іерархі з запалам пераконвалі вернікаў, што граматыкі патрэбны толькі для грэцкай і лацінскай моў, на якіх створана шмат «поганскіх хитростей и руководств, се же ест граматик, риторык, диалектик и прочих коварств тщеславных діавола вместных» [5, с. 23]. Сукупнасць гэтых акалічнасцяў стала галоўнай падставай і асноўным стымулам, які прымусіў «Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, дзеячоў Астрожскага гуртка і іншых узяцца за нармалізацыю старажытнаславянскай мовы ў плане лінгвістычным, за абарону яе аўтарытэту і пашырэнне ў плане грамадска-палітычным» [6, с. 258]. Аўтарытэт «Граматыкі» быў настолькі высокі, што непрыяцелі царкоўнаславянскай мовы спынілі нападкі на яе праз незразумеласць, граматычную неўпарадкаванасць. Прынамсі, стварэннем «Граматыкі» Сматрыцкі пераканаўча давёў, як «неабходна служыць сапраўдным, а не адцягненым патрабаванням свайго часу» [7, с. 115].

Як бачым, жыццёвыя абставіны, рэнесансна-рэфармацыйныя настроі, грамадска-палітычная і канфесійная сітуацыя патрабавалі дзейнічаць, адказваць узважана, па-навуковаму доказна, пераканаўча. Прынамсі, складальнік «Граматыкі» не толькі паспяхова вырашыў задачу граматычнай нармалізацыі царкоўнаславянскай мовы, умацавання яе становішча, аўтарытэту ў грамадстве, пашырэння сферы яе выкарыстання, але і адэкватна адказаў на закіды сваіх апанентаў з абодвух бакоў. Ён падкрэсліваў неабходнасць свядомага засваення граматычнага матэрыялу – «розумам слова разумей», – прытрымліваўся некалькіх ступеняў навучання – «глядзі, слухай, разумей, разглядай, запамінай». Нарэшце, неабходна зазначыць, што «Граматыка» – гэта адказ на запатрабаванні новай сацыяльнай праслойкі еўрапейскага

[1]Смотрицкий, М. Грамматіки Славенския правилное синтагма / М. Смотрицкий. – Евье, 1619. – 252 аркушы. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем старонкі; у дужках адваротная пазначана літарай *б.*

тыпу, якая сфармавалася ў ВКЛ цягам XV–XVI стст., – мяшчанства, якое складалася з купцоў, цэхавых майстроў, аб'яднаных у брацтвы, пры якіх дзейнічалі школы, функцыянавалі друкарні. Да ўсяго ж, Сматрыцкі як прадстаўнік гэтага класу ўсведамляў сваю этнічную ідэнтычнасць, таму ў граматыцы ўжываў побач з тэрмінам «славенский язык» тэрмін «рускі», вядомы для выданняў Ф. Скарыны, Статутаў ВКЛ і для іншых старабеларускіх твораў.

Працуючы ў русле рэнесансных традыцый, М. Сматрыцкі адмовіўся ад надання граматыцы тэалагічных функцый, падкрэсліваў яе свецкі характар. У прадмове ён пісаў, што мэта граматыкі – садзейнічаць разуменню мовы, маўлення, трываламу засваенню і авалоданню пісьмом. Аднак пры гэтым ён, сугучна з патрабаваннямі часу, як і Ф. Скарына, падтрымліваў традыцыю вывучэння граматыкі па кнігах Святога Пісання – Часаслове і Псалтыры.

М. Сматрыцкі выдатна ўсведамляў, што ў ВКЛ функцыянуюць дзве пісьмовыя мовы – царкоўнаславянская і руская (старабеларуская) – і паслядоўна размяжоўваў іх, спасылаючыся на адметнасці апошняй у шматлікіх вытрымках з правілаў або тлумачачы асаблівасці царкоўнаславянскай. Абапіраючыся на кніжную традыцыю, закладзеную старажытнаславянскімі асветнікамі, ён не цураўся і народнай мовы, як гэта за сто гадоў да яго ажыццявіў Ф. Скарына. Пра гэта пераканаўча сведчыць матэрыял з парадыгмаў скланення назоўнікаў, дзе паралельна падаюцца варыянтныя як тардыцыйныя, архаічныя, так і новыя, беларускія словаформы. Напрыклад: *врачь, грех, друг і врачев, грехов, другов; мятежей, пастырей і мятежь, пастырь; воинами, сынами, сердцами і воины, сыны, сердцы*. Апеляцыя да народнай мовы заўважаецца і ў сінтаксісе словазлучэнняў: *По сказуемое росски ведлуг* (191б); *Удержи язык свой от зла и устне свое еже не глаголати льсти. Руски истолковуемъ: Гамуй языкъ свой от злого и уста твои нехай не мовять зрады* (221); *Скоро предвари, даже не поработимся. Руски: Рихло упереди, поки не будем зневолени* (230б). Гэта дастаткова выразна паказвае, што Сматрыцкі абраў прынцып паступовага руху наперад – вызвалення ад застарэлых царкоўнаславянскіх формаў.

Імкнучыся стварыць на айчыннай глебе арыгінальныя духоўныя каштоўнасці, М. Сматрыцкі ў «Граматыцы» плённа выкарыстоваў грэцкія і лацінскія філалагічныя традыцыі. Сярод аналагічных прац таго часу кніга вылучаецца ўменнем аўтара аналізаваць моўныя факты і рабіць высновы, поўным выкладам арфаграфіі, этымалогіі (марфалогіі), прасодыі (вучэнне пра націск, яго віды, абазначэнне на пісьме), сінтаксісу простага (словазлучэнняў) і вобразнага (стылістычнага), тэорыі вершаскладання.

Глыбіня філалагічнай думкі ў арфаграфіі, праяўляецца ў правілах правапісу і вымаўлення асобных славянскіх літар і гукаў, дыферэнцыяцыі на галосныя і зычныя, падзеле галосных на *«самогласная»* (поўнага ўтварэння) і *«припряжногласная»* (рэдукаваныя **ъ, ь**), правіла пра якія падмацавана практычнымі рэкамендацыямі і адпаведным ілюстрацыйным матэрыялам. Так, ён пісаў, што ***ъ, ь «сама собою гласа издати не могуть»***, а ў словах, далучаныя да зычных, абазначаюць цвёрдасць **(ъ)** або мяккасць **(ь)**: ***кровъ – кровь, частъ – часть.*** Гэта першая ўдалая спроба характарыстыкі літар **ъ, ь** для абазначэння рэдукаваных з боку гістарычнай фанетыкі. Сучаснае адрозненне звонкіх і глухіх прадказана праз падзел зычных на *«полгласна»* і *«безгласна»*. Спасцярожлівасць і аналітычнае мысленне бачныя ў правілах правапісу асобных літар. Так, кіруючыся ўласнымі назіраннямі за арфаэпічнымі асаблівасцямі старабеларускай і царкоўнаславянскай моў, папярэджваючы памылкі, абумоўленыя вымаўленнем жывой народнай мовы, якія нярэдка сустракаліся ў тагачасных пісьмовых помніках, лінгвіст даводзіў, што нельга пісаць *хв, щ* замест *ф, сч* і наадварот: *форма,* а не *хворма; хвала,* а не *фала, нищъ,* а не *нисч, несчетный,* а не *нещетный* (13). Абапіраючыся на старабеларускую пісьмовую традыцыю, у якой ужо з XIV ст. выбухны **[г]** перадаваўся лігатурай *КГ*, асветнік размяжоўваў характар гука **[г]** у пазычаных і ўласна славянскіх словах і ўвёў спецыяльную графему **Ґ** для абазначэння выбуховага гука **[г]** у запазычаных словах, патрабуючы пісаць *одиҐітрія, гора,* а не *одигітрія, Гора.*

Знаёмства з раздзелам «Этымалогія», прысвечаным апісанню васьмі часцін мовы, дае падставы сцвярджаць, што М. Сматрыцкі быў першаадкрывальнікам многіх лінгвістычных тэрмінаў, якія захаваліся і замацаваліся ў «Российской грамматике» М. Ламаносава,

граматыках сучасных рускай і балгарскай, зрэдку беларускай і ўкраінскай моў. Прынамсі, М. Сматрыцкі нярэдка заўважаў, што тая ці іншая рыса *«от греков»* або з лаціны *«привзята и славенску языку»* не ўласцівая. Ён адмовіўся ад традыцыйных васьмі часцін мовы, выдзеленых у грэцкай граматыцы, увёў выклічнік (междометие), даволі пераканальна і доказна падмацаваўшы свой погляд: *«Во осмую же слова часть междометіе, латінску interiectio называемую свойственне прияхом»* (20).

Тонкае адчуванне мовы дазволіла М. Сматрыцкаму зрабіць наступны крок у тэарэтычнай распрацоўцы склонавых асаблівасцей: падзяліць усе склоны на прамыя і ўскосныя, сфармуляваць правіла пра сёмы *сказательный* (месны) склон. Тут ён ішоў «наперадзе многіх, нават наступных па часе заходнееўрапейскіх граматыстаў, якія дастасоўвалі формы жывых простых моваў – нямецкай, французскай, англійскай – да пракруставага ложка лацінскай граматыкі» [8, с. 29]. Ён глыбока спасцігнуў асаблівасці словазмянення іменных часцін мовы, аб'яднаўшы іх у пяць тыпаў скланення, якія амаль поўнасцю супадаюць з падзелам у сучасных граматыках. Новым, у параўнанні з граматыкай Зізанія, быў падзел прыметнікаў на поўныя і кароткія, тэрміны *имя числительное, имя прилагательное*.

Семантычны прынцып класіфікацыі грэцкай і лацінскай граматык вельмі моцны ў вучэнні пра дзеяслоў. Ім абумоўлена вылучэнне пяці станаў, шасці ладоў і часоў, катэгорыі роду ва ўсіх часах, тэмпаральных формаў загаднага ладу і дзеепрыметніка як самастойнай часціны мовы. Два тэматычныя Зізаніевы спражэнні былі дапоўнены *«стропотным»* (нетэматычным). Заслуга М. Сматрыцкага ў выдзяленні асабовых і безасабовых дзеясловаў, подступах да асэнсавання катэгорыі пераходнасці – непераходнасці. Ён упершыню адзначыў такую спецыфічную рысу славянскіх моў, як дзеепрыслоўе, увёўшы тэрмін *«деепричастие»,* дакладна акрэсліўшы яго генетычную сувязь з дзеепрыметнікам. Назіранні вучонага ў гэтай галіне канстатавалі, што ў канцы XVI ст. дзеепрыслоўе ўжо існавала як асобная дзеяслоўная форма. Сказанае сведчыць, што Сматрыцкі аддаваўся сваёй працы самаддана, з усёй сур'ёзнасцю, грунтоўна і высокапрафесійна. Каб больш выразна паказаць уклад М. Сматрыцкага ў распрацоўку тэрміналогіі, разглядзім параўнальную табліцу тэрмінаў з «Российской грамматики» М. Ламаносова, сучасных граматык рускай і балгарскай моў.

Табліца – Параўнанне тэрмінаў

Граматыка Сматрыцкага	**«Российская грамматика» М. Ломоносова**	**Граматыка балгарскай мовы**	**Грамматика русского языка**
Самогласная	Самогласные	Самогласка	гласные
Двогласная	Двоегласные	Двугласна , дифтонг	дифтонг
Знаки препинания			
Единатная -	Единительный	Съединителна чертица	знак переноса, дефис
Вопросная ;	Вопросительный знак	Вопросителен знак	Вопросительный знак
Вместная ()	Вместительный	Скоби	Скобки
Падежи			
Именительный	Именительный	Именителен	Именительный
Родительный	Родительный	Родителен	Родительный
Винительный	Винительный	Винителен	Винительный
Дательный	Дательный	Дателен	Дательный
Творителный	Творителный	Творителен	Творителный
Звательный	Звательный	Звателен	Вокатив, звательная форма
Сказательный	Предложный	Местен	Предложный
Косвенный падеж	Косвенный падеж	Косвен падеж	Косвенный падеж
Имя существительное	Имя существительное	Съществително име	Имя существительное
Имя собирательное	Собирательные существительные	Събирателно съществително	Собирательные существительные
Имя нарицательное	Имя нарицательное	Нарицателно име	Имя нарицательное
Имя прилагательное	Имя прилагательное	Прилагателно име	Имя прилагательное
Степени уравнения прилагательных:	Степени уравнения	Степенуване	Степени сравнения

Канец табліцы

Положительная	Положительный	Положителна	Положительная
Разсудительный	Разсудительный	Сравнителна	Сравнителная
Превосходительная	Превосходный	Превъзходна	Превосходная
Местоимение	Местоимение	Местоимение	Местоимение
Имя числительное	Имя числительное	Числително име	Имя числительное
Глаголы личные	Глаголы личные	Личен глагол	Глаголы личные
Безличные	Безличные	Безличен глагол	Безличные
Междометие	Междуметие	Междуметие	Междометие
Наклонения: изъявительное	Наклонения: изъявительное	Наклонения: изявително	Наклонения: изъявительное
повелительное	повелительное	повелително	повелительное
сослагательное	сослагательное	условно	сослагательное
Деепричастие	Деепричастие	Деепричастие	Деепричастие
Спряжение	Спряжение	Спрежение	Спряжение

«Граматыка» М. Сматрыцкага адрозніваецца ад аналагічных папярэдніх прац дэталёвым апісаннем сінтаксісу словазлучэнняў і сінтаксічнай сінанімікі, адметнасцей стылістыкі і вершаскладання, выкладам практычных рэкамендацый, дакладнай сістэмай апісання, якая грунтуецца на семантычнай і марфалагічнай асновах з улікам семантыка-сінтаксічных асаблівасцяў самастойных і службовых часцін мовы і на практыцы тагачаснага кніжна-пісьмовага ўжывання. Правілы *«О сочинении осміи частій слова»* фармулююцца з улікам такіх відаў сувязі, як дапасаванне і кіраванне, вылучаюцца падрабязным разглядам словазлучэнняў іменных часцін мовы, дзеяслова і яго форм, прыслоўяў, прыназоўнікавага кіравання. Новым быў і параграф пра «сінтаксіс вобразны», стылістычны, створаны ўжываннем *«искусных писателей»*, у якім пададзены азначэнні разнастайных мастацкіх тропаў і прыклады іх ужывання.

Праца М. Сматрыцкага – неад'емная частка не толькі сярэднявечнай навукі, але і культуры ўвогуле. Разам з граматыкаю Л. Зізанія яна паклала пачатак аналітычнаму падыходу да асэнсавання мовы і моўных з'яў, іх пісьмовай кадыфікацыі ў граматыках. Кнізе М. Сматрыцкага было наканавана адыграць важную ролю ў станаўленні і далейшым удасканаленні мовазнаўчай славянскай (найперш расійскай, балгарскай, сербскай) тэрміналогіі, пашырэнні ў іх філалагічных ведаў (больш падрабязна гл.: [9, с. 102–111]).

Пра паважлівае стаўленне да «Граматыкі» сведчыць і тое, што яна двойчы (1648, 1722) перавыдавалася ў Маскве і на працягу амаль двух стагоддзяў была асноўным падручнікам для вывучэння граматыкі ў Масковіі, ажно да з'яўлення «Расійскай граматыкі» Міхаіла Ламаносава, які, дарэчы, надзвычай ухвальна адгукаўся пра працу М. Сматрыцкага, назваў яе, разам з «Псалтыром рыфматворным» Сімяона Полацкага і «Арыфметыкай» Лявонція Магніцкага, *«вратами своей учёности»*. Праўда, маскоўскія выдаўцы 1648 г. выкінулі імя аўтара-адступніка, замянілі яго прадмову разважаннямі Максіма Грэка, накіраванымі на тое, каб давесці, што вывучэнне граматыкі не вядзе да ерасі. Асноўная мэта гэтага перавыдання – ачысціць тэкст ад усяго лацінскага, ерытычнага, беларускага, якое здавалася ім «богомерзким». Маскоўскім выдаўцам не падабаліся не толькі развагі пра **Ґ і г**, але і правіла пра выкарыстанне *s* (*зяло*), *з* (*зямля*). Быў выбраны варыянт *з*, хаця сам Сматрыцкі падкрэсліваў, што *зяло* пазычана з грэцкай, дзеля абазначэння ліку, а для славянскіх моў яно непатрэбнае, яго замяняе *з*. Былі знятыя напісаныя па-лацінску прыклады назоўнікаў. Усе змены найперш унесены таму, што ў Маскве з недаверам адносіліся да рэкамендацый «заходніка» і рэнегата Сматрыцкага.

«Граматыка» М. Сматрыцкага працяглы час фарміравала моўную адукацыю агульнай і вышэйшай школ не толькі на радзіме, але і за яе межамі, вызначыла новы этап у вывучэнні як царкоўнаславянскай, так і народных моў, была ўзятая за ўзор пры распрацоўцы сербскай, харвацкай, балгарскай, румынскай граматык. Думка пра адзіную ўніверсальную мову ўсіх славянаў, выказаная М. Сматрыцкім, паўплывала на мовазнаўчыя даследаванні сербскага філолага XVII ст. Юрыя Крыжаніча, які ўвасобіў гэтую ідэю ў працы «Граматично изсказание об руском языку» (1666). Безумоўна, гісторыка-культурнае і навуковае значэнне

«Граматыкі» М. Сматрыцкага выключнае. Аўтар кнігі поўна і падрабязна сістэматызаваў моўны матэрыял, дапоўніўшы і ўдакладніўшы свайго папярэдніка Лаўрэнція Зізанія. Выдадзеная для практычных патрэбаў школьнага навучання, яна перасягнула сваё прызначэнне, стала прыкметнай культурна-грамадскай з'явай.

Большасць даследчыкаў падкрэсліваюць высокую навуковую і гісторыка-культурную вартасць «Граматыкі», называюць адным з самых выдатных твораў старажытнага славянскага мовазнаўства: «вратамі учености» (М. Ламаносаў), «старой настаўніцай Русі» (П. Жыцецкі), «путеводительницей Ломоносова» (М. Качаноўскі), «пярлінай старажытнага мовазнаўства» (В. Німчук), «самым знакамітым помнікам традыцыі» (Н. Мячкоўская). Больш за тое, «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага – гэта маніфестацыя новых культурных каштоўнасцей. Ідэал аўтара – норма, арыстоцелеўская мерка, г. зн. чалавечы розум. Моваю культуры не можа быць мова, пакладзеная па-за граматыкаю: у ёй няма нормы і няма меры, праз мноства гавораў, мясцовых і індывідуальных адхіленняў яна быццам бы апынаецца па-за навукай [1, с. 121]. Усё гэта спрыяла таму, што яна «надоўга стала непераўзыдзеным узорам школьнага падручніка, пабудаванага са смакам і беззаганным метадычным майстэрствам» [10, с. 56]. Не выклікае сумнення і тое, што «ў гэтай кнізе былі ўпершыню абагулены звесткі па логіцы, граматыцы, рыторыцы, правапісе і вымаўленні царкоўнаславянскіх тэкстаў. Такое поўнае апісанне фактаў царкоўнаславянскай мовы разам з асаблівасцямі усходнеславянскіх моў (рускай, беларускай, украінскай) стварыла аснову для фарміравання Ламаносава як моваведа» [11, с. 51].

Праўда, сярод гэтых водгукаў сустракаюцца і адрозныя меркаванні Івана Франко ды Вацлава Ластоўскага. Так, першы, падкрэсліўшы станоўчую ролю працы М. Сматрыцкага для маскоўскіх і сербскіх школ, зазначае, што яна «мела часцей шкодны, чым карысны ўплыў, бо, грэбуючы той літаратурнай мовай, якая так дыхтоўна выпрацавалася ў рэпрэзентантаў мяшчанства ў канцы XVI і пачатку XVII ст., распачала рэакцыю на карысць мёртвай царкоўнаславянскай мовы» [12, с. 238–239]. Пазней другі назваў «Граматыку» ўніверсальнай, адзначыў, што яна, «напісаная з вялікім талентам і ведай, паўплывала на ўсё праваслаўнае славянства і выціснула жывую крыўскую мову з твораў пісьменнасці другой паловы XVII і XVIII ст., замяніўшы яе вучонай баўгарска-крыўска-ўкраінска-маскоўскай кніжнай тарабаршчынай, – і дадаў: – Дата выхаду ў свет граматыкі Сматрыцкага – гэта паваротны стоўп да ўпадку гісторыі нашай народнасці і яе незалежна дзяржаўнага існавання» [13, с. 525]. Як бачна, і І. Франко, і В. Ластоўскі адмоўна ацэньвалі ролю «Граматыкі» М. Сматрыцкага ў гістарычным лёсе дзяржаўнай мовы ВКЛ (старабеларускай). З гэтым можна пагадзіцца, бо, як вынікае з прадмовы да «Граматыкі», М. Сматрыцкі жорстка патрабаваў, каб пад пагрозай пакарання сярод вучняў захаўваўся «*діалекть в звыклой школьной размове Славенскій»* [3]. Гаворачы сучаснай тэрміналогіяй, гэта не што іншае, як падтрымка адзінага моўнага рэжыму ў асяродку навучэнцаў. Адсюль вынікае, што забаранялася ўжываць родную мову нават ў звычайнай школьнай размове, што, безумоўна, садзейнічала замацаванню ў свядомасці і ўжытку мёртвай і малазразумелай царкоўнаславянскай мовы, якая на Беларусі на працягу XV–XVI стст. ператварылася ў асобную мясцовую рэдакцыю. Якраз з пачатку XVII ст. у беларускай пісьменнасці і кнігадрукаванні набіраюць моцы царкоўнаславяншчына, пальшчызна і лаціна, што ўрэшце рэшт прывяло да заняпаду старабеларускай мовы і пісьменнасці на ёй. Аднак вялікую ролю ў гэтым адыграла тое, што беларуская кіроўная вярхушка, шляхта імкнуліся будаваць жыццё на польскі лад, не аднойчы звярталіся да караля Рэчы Паспалітай з просьбай дасылаць дакументы на польскай мове, аддавалі дзяцей у польскія школы. Па сутнасці перастаў дзейнічаць адпаведны запіс са Статута ВКЛ 1588 г. Неабходна ўлічваць і тое, што, ствараючы «Граматыку», М. Сматрыцкі найперш кіраваўся надзённымі патрэбамі праваслаўнай царквы і нармалізацыі царкоўнаславянскай мовы, што галоўным для яго было супрацьпаставіць царкоўнаславянскую польскай і лацінскай у навуковым і рэлігійным ужытку, супрацьстаяць чужамоўнаму ўплыву ў адукацыйным працэсе. У той жа час усе палемічныя творы М. Сматрыцкага напісаны на польскай мове.

Бясспрэчна, «Граматыка» сапраўды ўмацавала пазіцыі царкоўнаславянскай мовы, павялічыла яе вагу ў грамадстве, заклала падмурак усходнеславянскай філалагічнай школы, стала яскравым прыкладам выкарыстання мовы як дзейснага сродку нацыянальна-вызваленчай і рэлігійнай барацьбы.

Літаратура

1. Короткий, В.Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого / В.Г. Короткий. – Минск : Наука и техника, 1987. – 192 с.

2. Падокшын, С.А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох / С.А. Падокшын. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 118 с.

3. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; уклад.; уступ. арт. і камент. У.І. Кароткага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 309 с., іл.

4. Памятники полемической литературы в Западной Руси / сост. П. Гильтебрандт. – СПб., 1882. – Т. 7, кн. II. – 911 с.

5. Вишенский, И. Сочинения / И. Вишенский. – М.-Л. : Издательство АН СССР, 1955. – 372 с.

6. Толстой, Н.И. Взаимоотношение локальных типов древнеславянского литературного языка позднего периода (вторая половина XVI – XVII вв.) / Н.И. Толстой // Славянское языкознание : V Международный съезд славистов. Доклады советской делегации. – М. : Наука, 1963. – С. 230–272.

7. Прокошина, Е.С. Мелетий Смотрицкий / Е.С. Прокошина. – Минск : Наука и техника, 1966. – 160 с. с ил.

8. Кузнецов, П. У истоков русской грамматической мысли / П. Кузнецов. – М. : Издательство АН СССР, 1958. – 78 с.

9. Німчук, В.В. Граматика М. Смотрицького – перлина давнього мовознавства / В.В. Німчук // Смотрицькій Мелетій. Граматика (факсимильне видання та дослідження пам’ятки В.В. Німчука). – Київ : Наукова думка, 1979. – 112 с.

10. Яременко, П.К. Мелетій Смотрицький. Життя і творчість / П.К. Яременко. – Київ : Наукова думка, 1986. – 160 с.

11. Лопушанская, С.П. Врата учености / С.П. Лопушанская. – Волгоград : Изд-во Волг. гос. ун-та, 1998. – 190 с.

12. Франко, І. Нарис історії українсько-руської літератури : збір творів: у 50 т. / І. Франко. – Київ : Наукова думка, 1984. – Т. 41. – 378 с.

13. Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В. Ластоўскі. – Коўна : Друкарня Сакалоўскага і Лана, 1926. – 776 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 27.10.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 81’255.2:82=581=161

Теория фасцинации в контексте проблем художественного перевода (на примере переводов китайской классической поэзии «ши»)

Е.В. Романовская

Обосновывается возможность применения теории фасцинации в качестве новой методологии исследования художественного перевода. Формулируется определение фасцинации, вводятся понятия фасцинационной и фактической информации. Рассматриваются принципы ритмической организации китайской классической поэзии «ши». Приводится обоснование переводческих решений проблем эквилинеарности и эквиритмии, использования рифмы в переводах китайских классических стихов на русский и белорусский языки. Адекватность перевода оценивается с точки зрения фасцинационного соответствия оригиналу.
Ключевые слова: фасцинация, художественный перевод, китайская классическая поэзия «ши», русский язык, белорусский язык.

The paper presents the theory of fascination as a new methodology of literary translation. The author defines the term «fascination», distinguishes fascinative and factual information. The paper describes rhythmic structure of the Chinese classical poems «shi», analyzes rhyme use, rhythmic and line length equivalence in the translations of Chinese classical poems into the Russian and Belarusian languages. Target-text is evaluated from the position of fascination adequacy to the source-text.
Keywords: fascination, literary translation, Chinese classical poetry «shi», the Russian language, the Belarusian language.

Художественный перевод является одним из наиболее трудных видов переводческой деятельности. Специфика художественного перевода подробно анализируется в работах Л.С. Бархударова, В.С. Виноградова, И.Р. Гальперина, К.И. Чуковского, В.Н. Комиссарова, А.Д. Швейцера, Р.К. Миньяр-Белоручева, Н. Галь, Ю.П. Солодуба и др.

Перевод произведений китайской классической поэзии на европейские языки представляет собой еще более трудную задачу, в силу кардинальных различий не только в языках, но и в культурах. Проблемы перевода китайской поэзии рассматриваются в трудах В.М. Алексеева, Л.Н. Меньшикова, Л.З. Эйдлина, М.Е. Кравцовой, И.С. Смирнова, О.М. Городецкой и др.

Круг работ, посвященных исследованию фасцинации, ограничивается трудами лишь нескольких авторов: Ю.В. Кнорозова, В.М. Соковнина, В.Д. Ширшова, А.Ш. Сафаргалиной. При проведении анализа художественных текстов понятие «фасцинативной составляющей» использует Е.В. Омельченко.

Цель исследования состоит в определении возможности применения теории фасцинации в теории и практике художественного перевода. Задачи исследования включают выделение аспектов художественных произведений, способных оказывать фасцинационное воздействие на читателя; поиск переводческих решений для наиболее удачного отображения этих аспектов в переводах на другие языки. В качестве материала исследования выступают произведения китайской классической поэзии «ши» и их переводы на русский и белорусский языки (включая авторские переводы).

Слово «фасцинация» происходит от лат. fascinatio *завораживание, зачаровывание*, в свою очередь, образованного от лат. fascinare *околдовывать*. В период Средних веков понятие фасцинации ассоциировалось с колдовством. Вслед за развитием научной и философской мысли эпохи Просвещения, фасцинация стала рассматриваться как метод суггестивного воздействия. Это нашло отражение в определении фасцинации, сформулированном Джеймсом Эсдейлом в 1847 г.: «фасцинация – сосредоточение взгляда гипнотизируемого на гипнотизирующем или на специальном предмете (блестящий металлический шарик)» [1].

Понятие фасцинации было развито в рамках теории информации и фасцинации, предложенной выдающимся советским ученым Ю.В. Кнорозовым в 1961 г. Согласно Ю.В. Кнорозову, современную человеческую сигнализацию в двух ее основных разновидностях (оп-

тическая и акустическая) можно подразделить на нейтральную, в которой преобладающую роль играет информация (смысл сообщения), и фасцинирующую, в которой основную роль играют физические свойства сигнального ряда. Понятие фасцинации в теории Ю.В. Кнорозова понимается как «шум в анализаторе, который помешал бы выполнять другие команды и создал бы тем самым благоприятные условия для восприятия именно данной информации» [2]. В качестве критерия отнесения к фасцинирующей сигнализации Ю.В. Кнорозов выделяет «желание адресата получить дважды и более уже принятое сообщение (например, прослушать второй раз уже известную песню)» [3, с. 332–333].

Можно предположить, что фасцинирующий сигнал также несет в себе определенную информацию[1]. В таком случае понятия информации и фасцинации сводятся к информации, подвергающейся рациональному либо иррациональному способу обработки индивидом. Музыка, которую Ю.В. Кнорозов считал чистой фасцинацией, также может быть воспринята рационально (путем анализирования ладовых, тембровых, композиционных характеристик, способа исполнения музыкального произведения и пр.), но основной целью является эстетическое переживание, порождаемое фасцинационным воздействием музыки.

Одним из важнейших механизмов иррационального восприятия служат эмоции. Возникновение у индивида эмоциональной реакции способствует выделению сообщения из множества других, фокусированию внимания на конкретном сообщении и его последующему запоминанию: «На эмоциональной памяти непосредственно основана прочность запоминания материала: то, что у человека вызывает эмоциональные переживания, запоминается им без особого труда и на более длительный срок» [5, с. 221].

Целью рационального восприятия информации является понимание (дешифрование), целью фасцинационного восприятия информации – переживание (сочувствие). В первом случае информация воспринимается рациональным способом как фактическая информация, формирующая и изменяющая знания индивида о мире, во втором – как эмоционально воспринимаемая фасцинационная информация, формирующая и изменяющая отношение индивида к миру.

Произведение художественной литературы представляет собой целостную систему, обладающую сложной внутренней структурой и специфической формой организации текста[2]. Художественный текст обладает способностью концентрировать информацию различных видов. Это отмечает В.В. Сдобников, давая характеристику художественным текстам, которые «…отличаются от логических не только ***целью создания,*** но и ***характером передаваемой информации,*** так как в художественном тексте обычно передается информация и интеллектуальная, и эмоциональная, и эстетическая» [6, с. 351]. Эстетическое и эмоциональное воздействие на читателя выделяется многими исследователями как основополагающий признак художественного текста [7, с. 21], [8]. Как мы полагаем, и эмоциональное, и эстетическое (также имеющее эмоциональную природу) воздействие художественного текста во многом обусловлено именно фасцинационными свойствами. Чем больше фасцинационный потенциал произведения, тем выше вероятность повторного обращения к нему читателя после извлечения фактической информации. В целях унификации терминологии мы предлагаем использовать термин «фасцинационное воздействие» вместо синонимичных терминов «эстетическое (эмоциональное, художественное, художественно-эстетическое, эмоционально-эстетическое) воздействие», а художественную (эстетическую) информацию относить к фасцинации.

---

[1]Ю.М. Лотман относил к процессу получения информации и чувственное восприятие: «Нельзя не признать, что всякий процесс чувственного освоения также можно представить как получение информации… Любой контакт с внешней средой, любое биологическое усвоение представляет собой получение информации и может быть описано в терминах теории информации» [4].

[2]Об этой общей закономерности, присущей сложно устроенным системам, Ю.В. Кнорозов писал: «Возникновение системы высшего порядка в результате качественного скачка приводит к появлению новых свойств, которые, естественно, не могут быть сведены к свойствам составляющих систему единиц. Так, свойства элементарных частиц не аналогичны свойствам основной дифференцированной системы неживой природы – атома, а свойства высших интегрированных систем – молекула, кристалла – не являются суммой свойств составляющих их атомов» [3, с. 325–326].

Характерные особенности художественных текстов определяют специфику художественного перевода. Под художественным переводом понимается «вид переводческой деятельности, основная задача которого заключается в порождении на языке перевода речевого произведения, способного оказывать художественно-эстетическое воздействие на рецептора перевода, равное тому воздействию, которое оказывает данное художественное произведение на исходном языке» [8]. Иными словами, целью художественного перевода является создание текста, призванного оказывать на читателя фасцинационное воздействие, если не равное (что на практике редко достижимо), то максимально приближенное к воздействию оригинального произведения. В этом заключается основная трудность художественного перевода, поскольку для носителей различных языков и культур средства фасцинационного воздействия могут быть различны.

Фасцинационный потенциал текста не будет реализован, если в сознании читателя нет готовности к его восприятию. Как отмечает Ю.М. Лотман, «…для того чтобы **текст** мог функционировать как **поэтический**, нужно присутствие в **сознании** читателя ожидания поэзии, **признания** ее возможности, а в **тексте –** определенных **сигналов**, которые позволили бы **признать** этот **текст** стихотворным» [9]. Особенности восприятия художественных произведений во многом обусловлены этнокультурной принадлежностью читателя, установками, заданными определенной культурной традицией[3].

В процессе художественного перевода часто возникает противоречие между отображением фактической (смысловой) и фасцинационной (художественной) информации. Стремление переводчика максимально точно передать содержание оригинала может проявиться в буквальном копировании его элементов. При этом во многих случаях возникает парадокс: чем ближе переводчик таким образом старается «приблизиться» к оригиналу, тем дальше от оригинала оказывается перевод по своему фасцинационному воздействию.

Решению этой проблемы может способствовать разграничение уровней перевода[4]. Например, Линь Юйтан выделяет «перевод отдельных иероглифов (слов)» (字译) и «перевод предложений» (句译). В первом случае «переводчик должен переводить значения каждого иероглифа (слова) поочередно одно за другим, с тем чтобы значения этих разрозненных иероглифов (слов) собрать воедино, и затем получить смысл всего предложения… При переводе предложений следует гибко относиться к значению отдельных слов; предложение представляет собой организованную структуру, и концентрированное значение всего предложения есть «артерия» предложения, а значения слов являются «обобщенным значением» (总意义) взаимосвязанных и соединенных вместе компонентов» [11, с. 12].

Принцип «перевода отдельных слов» фактически сводится к отображению отдельных элементов. Поскольку художественный текст – сложная система, свойства которой не равны свойствам ее элементов, для художественного перевода применим, в первую очередь, принцип «перевода предложений», который должен распространяться на перевод всего текста как единого «сверхпредложения». При этом перевод художественных текстов требует внимания не только к «общему значению» (总意义), но и «общему впечатлению» (总印象). Поэтому для адекватного художественного перевода необходимо найти баланс между отображением фактической и фасцинационной информации. В большинстве случаев неизбежна частичная потеря информации, однако мастерство переводчика помогает ее минимизировать.

Ритмизация является одной из основополагающих характеристик стихотворения и служит важным средством фасцинационного воздействия. Как пишет Ю.В. Кнорозов, «человеческая сигнализация с длинными рядами является весьма удобной для использования фасцинирующих приемов, в том числе для ритмической организации» [3, с. 332]. При этом важ-

[3]Степень фасцинационного воздействия художественного текста также может быть различной, в зависимости от момента прочтения, степени подготовленности читателя к восприятию определенной информации, общего уровня интеллектуальной и духовной зрелости читателя. Все эти факторы следует учитывать, однако изучение особенностей модели мира отдельного читателя выходят за рамки данного исследования.

[4]Согласно замечанию Э. Бенвениста, «только понятие уровня поможет нам обнаружить во всей сложности форм своеобразие строения частей и целого» [цит. по 10, с. 3].

ную роль играют не только соблюдение ритмического рисунка, но и отклонения от него, которые трактуются как метод борьбы с «антирезонансной защитой», в силу того что организм через некоторое время перестает воспринимать воздействие ритмически повторяющихся раздражителей (например, тиканье часов) [3, с. 333].

При отображении ритмической организации поэтических произведений переводчики, как правило, стремятся сохранить метрическую структуру оригинала (принцип эквиритмии). Однако нужно учитывать, что даже в рамках европейских языков «точное повторение расстановки ударных и безударных слогов вовсе еще не означает точности в передаче ритма подлинника, поскольку остальные элементы той сложной системы, которой является ритм, в условиях иного языка уже не совпадают» [12][5].

Принципы ритмической организации поэзии «ши» (诗), ведущего поэтического жанра в Китае в III–XIII в., включают фиксированное число слогов в строке: четыре, пять, семь, реже шесть; четкие правила чередования тонов; использование цезуры перед третьим слогом от конца строки. Ритмико-мелодическую структуру китайских стихов чрезвычайно сложно отобразить средствами европейских языков, поэтому переводчик обладает правом самостоятельного выбора стихотворного размера. Как правило, при переводе китайской классической поэзии на русский и белорусский языки используются регулярные метры силлаботонического стихосложения.

Еще одним параметром, который не представляется возможным отобразить в переводах, является односложность слов в китайском классическом языке, что продемонстрировал В.М. Алексеев в пародийном «переводе» стихотворения Ли Бо (см. таблицу 1).

Таблица 1 – Стихотворение Ли Бо «Думы тихой ночью»

Оригинал	Перевод
静夜思 床前明月光， 疑是地上霜。 举头望明月， 低头思故乡。	Думы тихой ночью Ночь... Сплю... Там есть свет... Что там? Снег иль что? Взгляд вверх: свет средь гор. Взгляд вниз: где мой дом?

Подобный перевод призван проиллюстрировать неприемлемость отображения односложности китайского классического языка посредством односложных слов русского языка. Поэтому наиболее часто используется следующий принцип: одно слово оригинала передается одной стопой перевода.

Важным элементом ритмической организации стихотворения является рифма. Поскольку композиционно наиболее сильный акцент приходится на конец строки, то рифма неизменно попадает в центр внимания читателя. Рифма обладает стихообразующей функцией, придавая стихотворению целостность и способствуя более легкому запоминанию стиха.

Вопрос о необходимости применении рифмы в переводах китайских классических стихов вызывает среди переводчиков серьезные разногласия. Многие переводчики (например, Л.З. Эйдлин, М.Е. Кравцова, И.С. Смирнов и др.) отказываются от применения рифмы в своих переводах, мотивируя это тем, что с течением времени чтение многих иероглифов изменилось и при чтении стихов на современном китайском языке рифма иногда вообще не слышна. В то же время, полный отказ от рифмы в переводах может стать одной из причин их тяжеловесности, совершенно не свойственной китайским стихам, и, как следствие, «нецита-

[5]У каждого народа сформированы свои установки, определяющие особенности стихотворных размеров, собственное «стиховое мышление». К.И. Чуковский писал: «Каким размером, например, переводить узбекам стихотворения Лермонтова, если четырехстопный ямб для них экзотика, совершенно чуждая их стиховому мышлению? Тут никакая эквиритмия немыслима, потому что в богатой, утонченной и сложной поэтической традиции узбеков четырехстопному ямбу нет места, и узбеки, которые в течение многих столетий накопили огромный поэтический опыт, воспринимают европейскую форму стиха совершенно иначе, чем мы» [13].

тоспособности» переводов (термин Л.Н. Меньшикова)[6]. В этом случае перевод не может считаться адекватным, поскольку отсутствие рифмы лишает перевод фасцинационного воздействия, производимого оригиналом при помощи его четкой ритмической организации[7].

Для классической китайской поэзии, в силу ограниченного числа слогов китайского языка, характерны повторяющиеся рифмы (чаще всего, используется монорифма). В русском стихосложении монорифма встречается довольно редко, а богатство и разнообразие рифм служит одним из важнейших показателей поэтического мастерства. Монорифма может снизить фасцинационное воздействие перевода, поэтому большинство переводчиков отказывается от нее в пользу более привычных видов рифмовки: парной (aabb), перекрестной (abab) либо кольцевой (abba). Кроме того, отступление от единообразия рифм также является методом борьбы с «антирезонансной защитой». Например, в китайских классических стихах широко распространена рифмовка *aaba*. Следовательно, в переводе можно использовать более сложные способы рифмовки с элементами монорифмы. Рассмотрим авторский перевод стихотворение Ли Хэ на белорусский язык (см. таблицу 2).

Таблица 2 – Стихотворение Ли Хэ «Столица»

Оригинал	Перевод
京城 驱马**出**门**意**, **牢**落长**安心**。 **两**事谁**问道**, **自**作秋风**吟**。	Сталіца Калі я з дому выязджаў, Зрабіць так многа важных спраў Я меў ахвоту, Хутчэй за вецер я скакаў, Але ў Чан'ані адшукаў Адну самоту. Як гэта мне асэнсаваць, Каму аб гэтым расказаць У цэлым свеце? Я вершы буду зноў складаць І сам сабе услых чытаць Пра стылы вецер.

Концевые иероглифы во второй и четвертой строках оригинала 心, 吟 принадлежат группе рифм 侵 [14, с. 6–7]. В переводе применяется тернарная рифмовка *aabaab*. Несмотря на то, что перевод включает множество глагольных рифм (в теории стихосложении относящихся к бедным рифмам), достаточно сложный способ рифмовки препятствует возникновению ощущения однообразия рифм.

Проблема соблюдения принципа эквилинеарности также может рассматриваться с позиции теории фасцинации. В силу того что длина строки перевода на европейские языки намного превышает длину строк китайского стиха, Ю.К. Щуцким был предложен метод, который состоит в отображении одной строки оригинала двумя строками перевода (с разделением строки оригинала по цезуре). Некоторые переводчики выступают против подобного приема. Например, М.Е. Кравцова полагает, что удвоение строк «нарушает эстетику китайской поэзии» [15, с. 16] и настаивает на необходимости соблюдения принципа эквилинеарности, потому что это позволит сохранить объем и ритмику оригинального текста.

Поскольку длина слова в русском языке в среднем в 2–3 раза превышает длину слова китайского классического языка, строгое соблюдение принципа эквилинеарности может привести к появлению слишком длинных строк, что создаст ощущение громоздкости и затрудненности восприятия перевода. Это свойственно, например, переводам Л.З. Эйдлина. Рассмотрим отрывок из стихотворения Тао Юаньмина (352/365–427) «Возвратился к садам и полям» и его перевод на русский язык (см. таблицу 3).

[6]Сравните с индексом удобочитаемости, предложенный Р. Флешем для определения сложности восприятия текста читателем.

[7]Мы поддерживаем мнение, что критерием удачного поэтического перевода становится легкость заучивания его наизусть.

Таблица 3 – Стихотворение Тао Юаньмина «Возвратился к садам и полям»

Оригинал	Перевод
方宅十余亩， 草屋八九间。 榆柳荫后檐 桃李罗堂前。	Вся усадьба составит десять му или больше немногим, Дом, соломою крытый, восемь-девять покоев вместит. Ива с вязом в соседстве тень за домом на крышу бросают, Слива с персиком рядом вход в мой дом закрывают листвой.

Каждая строка оригинала состоит из пяти односложных слов. Число слогов в строках перевода равно: 16-16-17-16, что превышает длину строк оригинала более чем в три раза. В отличие от лаконичных, зарифмованных, «цитатоспособных» строк оригинала, перевод Л.З. Эйдлина, хоть и отличается высокой степенью смысловой точности, весьма труден для восприятия и запоминания. Следовательно, такой перевод не может считаться фасцинационным аналогом оригинала.

Более удачными нам представляются переводы, в которых одна строка оригинала передается двумя строками перевода, например, в переводе стихотворения «Домик в бамбуковой роще» Ван Вэя, выполненного А.И. Гитовичем (см. таблицу 4).

Таблица 4 – Стихотворение Ван Вэя «Домик в бамбуковой роще»

Оригинал	Перевод
竹里官 独坐幽篁里， 弹琴复长啸。 深林人不知， 明月来相照。	Домик в бамбуковой роще В бамбуковой роще Я ночь коротаю мою, Я трогаю лютню И песни протяжно пою. А людям неведом приют мой, И только луна В бамбуковой роще Меня навещает одна.

Переводчик соблюдает принцип разделения строки по цезуре: доцезурная часть в переводе отображена двумя стопами, послецезурная – тремя (исключение составляет третье двустишие). Амфибрахий[8], избранный переводчиком в качестве стихотворного размера, придает переводу неспешный, размеренный ритм, настраивая читателя на восприятие содержания стихотворения и помогая прочувствовать уединение автора среди бамбуковых зарослей в тихую лунную ночь.

Итак, художественный текст является сложной целостной системой, для которой характерна высокая степень насыщенности информацией различных видов. Фасцинация, понимаемая нами как эмоционально воспринимаемая информация, формирующая и изменяющая отношение индивида к миру, чрезвычайно широко задействована в произведениях художественной литературы. Переводчик оказывается перед задачей не только отображения фактической информации художественного текста, но и создания его фасцинационного аналога средствами другого языка и другой поэтической системы.

В силу ограниченности объема статьи, нами проанализированы лишь некоторые аспекты китайской поэзии «ши», значимые для оказания фасцинационного воздействия на читателя, а также рассмотрена возможность их отображения в переводах на русский и белорусский языки. Способы решения проблем эквиритмии, эквилинеарности, применения рифмы проанализированы с точки зрения их фасцинационного воздействия. Мы пришли к выводу, что строгое соблюдение принципа эквилинеарности, отказ от рифмы могут затруднить восприятие и запоминание перевода, его «нецитатоспособности», в то время как соответствие оригиналу в легкости восприятия и запоминания служит одним из критериев адекватного поэтического перевода.

[8]Трехстопный амфибрахий – одна из наиболее часто используемых разновидностей этого стихотворного размера в русском стихосложении.

Литература

1. Блейхер, В.М. Толковый словарь психиатрических терминов [Электронный ресурс] / В.М. Блейхер, И.В. Крук. – Режим доступа : http://mreadz.com/read-115036/p312. – Дата доступа : 15.03.2018.

2. Соковнин, В.М. Фасцинация. Коммуникация. Общение / В.М. Соковнин. – Екатеринбург : Изд-во Авторской Академии фасцинологии, 2010. – 134 с.

3. Кнорозов, Ю.В. К вопросу о классификации сигнализации / Ю.В. Кнорозов // Основные проблемы африканистики. – М. : Наука, 1973. – С. 324–334.

4. Лотман, Ю.М. Структура художественного текста [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.ruthenia.ru/lotman/papers/sht/4.html. – Дата доступа : 03.03.2018.

5. Немов, Р.С. Психология / Р.С. Немов. – М. : ВЛАДОС, 2003. – Книга 1. Общие основы психологии. – 930 с.

6. Сдобников, В.В. Теория перевода: учебник для студентов лингвистических вузов и факультетов иностранных языков / В.В. Сдобников, О.В. Петрова. – М. : АСТ: Восток-Запад, 2007. – 448 с.

7. Солодуб, Ю.П. Теория и практика художественного перевода: учеб. пособие для студ. лингв. фак. высш. учеб. заведений / Ю.П. Солодуб, Ф.Б. Альбрехт, А.Ю. Кузнецов. – М. : Издательсткий центр «Академия», 2005. – 304 с.

8. Фурсова, И.Н. Специфика перевода художественного текста [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.alba-translating.ru/ru/ru/articles/2015/fursova.html. – Дата доступа : 20.03.2018.

9. Лотман, Ю.М. Анализ поэтического текста [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://gramma.ru/BIB/?id=4.30. – Дата доступа : 20.03.2018.

10. Гальперин, И.Р. Текст как объект лингвистического исследования / И.Р. Гальперин. – М. : КомКнига, 2006. – 144 с.

11. Щичко, В.Ф. Китайский язык. Теория и практика перевода: учебное пособие / В.Ф. Щичко. – 2-е изд. – М. : АСТ: Восток-Запад, 2007. – 223, [1] с.

12. Литературная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://dic.academic.ru/dic.nsf/enc_literature/3999. – Дата доступа : 21.03.2018.

13. Чуковский, К.И. Высокое искусство [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.e-reading.club/book.php?book=98909. – Дата доступа : 21.03.2018.

14. 诗韵词韵手册/申忠信编 – 北京：商务印书馆国际有限公司，2014.7 – 535 页。. Справочное руководство по рифме в стихах ши и цы / Под ред. Шэнь Чжунсиня. – Пекин, 2014. – 535 с.

15. Кравцова, М.Е. Хрестоматия по литературе Китая / М.Е. Кравцова. – СПб. : Азбука-классика, 2004. – 768 с.

ГНУ «Центр системного анализа
и стратегического исследования»
НАН Беларуси

Поступила в редакцию 13.05.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3’42’373.6:198.8

Дэрывацыйны паўтор і яго структурна-семантычная роля ў пазаабрадавым народна-песенным дыскурсе

А.А. Станкевіч

Апісваецца дэрывацыйны паўтор як важны спосаб структурна-семантычнай арганізацыі народна-песеннага пазаабрадавага дыскурсу. Выдзяляюцца дзве асноўныя яго разнавіднасці – каранёвы і афіксальны (прэфіксальны і суфіксальны) паўторы, разглядаецца іх структура, семантыка, граматычная характарыстыка, стылістычныя функцыі. У групу каранёвых паўтораў уключаюцца таксама таўталагічны паўтор і рэдуплікацыя, якія традыцыйна адносяцца да адметных асаблівасцей мовы народна-паэтычнай творчасці.
Ключавыя словы: пазаабрадавая паэзія, звязнасць тэксту, дэрывацыйны паўтор, каранёвы паўтор, таўталогія, рэдуплікацыя, афіксальны паўтор, сінтаксічны паралелізм.

The derivational repetition as an important way of structural and semantic organization of folk-song extra-ritual text is described. There are two main types of it – root and affixal (prefixal and suffixal) repetitions. Their structure, semantics, grammatical characteristic, stylistic functions are considered. The group of the root repetitions also includes tautological repetition and reduplication, which traditionally belong to the distinctive features of the language of the people's poetry.
Keywords: non-ritual poetry, text connectivity, derivational repetition, root repetition, tautology, reduplication, affixal repetition, syntactic parallelism.

Вусная народна-паэтычная творчасць, якая з’яўляецца важнейшай часткай нацыянальнай духоўнай культуры, адыграла істотную ролю ў фарміраванні светапогляду і нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Багаты і разнастайны ў тэматычных і жанравых адносінах пласт у традыцыйным песенным фальклоры беларускага народа складае пазаабрадавая лірыка [1, с. 6].

Пазаабрадавыя песні, у адрозненне ад каляндарна-абрадавых, выконваюцца незалежна ад абрада ці календара, у любы час, у розных канкрэтных жыццёвых абставінах і адлюстроўваюць самыя розныя бакі побыту нашага народа. «У гэтых песнях выяўляюцца лепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў: смеласць, адвага, праўдзівасць, працавітасць, гасціннасць, гуманізм, чуласць, сціпласць, імкненне да свабоды і нянавісць да прыгнятальнікаў. У іх знайшла адлюстраванне народная мараль, светапогляд працоўных» [2, с. 465].

Прадметам нашага даследавання з’яўляюцца творы пазаабрадавай паэзіі, змешчаныя ў зборніку «Лірычныя песні», які Н.С. Гілевіч слушна назваў «зборнікам узораў паэзіі» [1, с. 8], мэтай артыкула – вызначэнне сутнасці і ролі дэрывацыйнага паўтору ў пазаабрадавых песенных тэкстах.

Сярод асноўных катэгорый тэксту І.Р. Гальперын называе кагезію, якая ўключае звязнасць і цэласнасць [3, с. 11]. Адным з важнейшых сродкаў звязнасці тэксту лічыцца паўтор [4, с. 52–58]. Асаблівае значэнне паўторы набываюць ў тэкстах вуснай народна-паэтычнай творчасці, дзе яны, як вядома, выконваюць некалькі функцый – структурную, тэкстаўтваральную, калі фарміруюць кампазіцыю твора, з‘яўляюцца важнейшым моўным сродкам звязнасці яго асобных фрагментаў; сэнсаўтваральную, калі садзейнічаюць актуалізацыі значэння паўтораных моўных элементаў, лагічнаму выдзяленню і ўзмацненню іх сэнсу, семантычнаму разгортванню канцэптуальнага зместу тэксту і функцыю рыфма- і рытміка-інтанацыйнага афармлення маўлення, стварэнню яго напеўнасці і меладычнасці [5, с. 5], [6, с. 3].

Даследчыкі вуснай народна-паэтычнай творчасці, адзначаючы паўтор як неад’емную рысу фальклора, неаднаразова ўказвалі на шырокае выкарыстанне ў ім устойлівых, тыповых моўных формул. Так, паводле меркавання А.М. Весялоўскага, «народная паэзія жыве формуламі», яе адметнай асаблівасцю з’яўляюцца «пастаянныя паўторы-формулы .. для

вядомых сцвярджэнняў, непадзельныя з імі» [7, с. 76]. Такія ўстойлівыя моўныя формулы называюцца таксама тыповымі, агульнымі месцамі, у якіх «канцэнтравана выражаюцца стылёвыя асаблівасці народна-паэтычнага жанру» [8].

Да такіх тыповых моўных формул, на наш погляд, можна аднесці дэрывацыйны, або частковы паўтор, у які традыцыйна ўключаюць паўтор аднакаранёвых слоў, марфемны паўтор, паўтор формы слова [9], [10], [11]. Як адзначаюць даследчыкі, «дэрывацыйны паўтор – прыватная разнавіднасць моўнага паўтору, якая прадугледжвае рэгулярнае ўзнаўленне ў мікра- і макратэксце асобных марфем у розных словах: пры каранёвым паўторы – паўтор кораня ў словах з рознымі афіксамі, пры афіксальным паўторы – паўтор афіксаў у рознакаранёвых словах, які мае тэкстаўтваральную функцыю і служыць для звязнасці тэксту, стварэння лейтматыву, актуалізацыі асацыяцыйнай, сімвалічнай інфармацыі і іншых функцый» [11, с. 77]. Каранёвы паўтор садзейнічае стварэнню новых адценняў сэнсу выказвання, а афіксальны паўтор – стварэнню новых слоў, аднастайнаму афармленню іх структуры.

Каранёвы паўтор у тэкстах вуснай народна-паэтычнай творчасці часта збліжаюць з таўталагічным паўторам. Як вядома, таўталогія – спалучэнне або паўтор адных і тых жа або блізкіх па сэнсе слоў, паўтор аднакаранёвых слоў выкарыстоўваецца ў фальклоры са старажытных часоў і выконвае функцыю «выражэння агульнага, тыповага, што характэрна для мастацкага стылю вуснай паэзіі» [12, с. 139]. Актыўнае выкарыстанне таўталогіі ў вуснай народна-паэтычнай творчасці даследчыкі звязваюць з песенным характарам жанра, які вымагае запаўнення “музыкальнага часу”, вымушае затрымаць увагу слухачоў, уздзейнічаць на іх падсвядомасць. Пры дапамозе таўталогіі складальнікі фальклорных твораў імкнуліся ўзмацніць сэнс выказвання, канкрэтызаваць яго змест, выдзеліць найбольш істотныя прыкметы і характарыстыкі прадметаў або з’яў, дзеянняў, перажыванняў, падкрэсліць дэталі аповеду [8], [12], [13].

Каранёвыя паўторы ў пазаабрадавых песнях даволі разнастайныя па структуры, пазіцыі ў сказе, колькасці кампанентаў і функцыі.

У іх складзе вызначаюцца словазлучэнні, звязаныя пэўнай сінтаксічнай сувяззю. Так, аднакаранёвыя дзейнік і выказнік, звязаныя сувяззю каардынацыі, вызначаюць не толькі дзеянне, але і аднайменны суб’ект, які выконвае гэта дзеянне, пры гэтым узмацняецца і ўдакладняецца з’ява праз выражэнне яе працягласці ў часе. Такі паўтор актуалізуе значэнне каранёвай марфемы: *Ой, там* ***прачкі*** *плацце* ***пралі****, Сваіх мужоў з вайны ждалі* [1, с. 83]; *Ой, калі той* ***вечар*** *ды* ***павечарэе****, Калі маё сэрца павесялее?* [1, с. 108]; ***Мельнік мене*** *і пытлюе, Адвернецца – пацалуе* [1, с. 299]; ***Варожка варожа*** *– праўды не кажа* [1, с. 212].

Словазлучэнні, звязаныя аб’ектнымі адносінамі, выдзяляюць аб’ект, на які накіравана аднайменнае дзеянне або праз які яно ажыццяўляецца: *Ў адну* ***трубу затрублю****, з двара выязджаючы, .. А ў другую затрублю, з матуляй прашчаючысь* [1, с. 67]; *Да вярніся, сынку,* ***пасцялю пасцельку*** [1, с. 72]; *А я тую крынічаньку* ***Тыччам ператычу****, А я ж тую дзяўчынаньку Да се пераклічу* [1, с. 94].

Таўталагічныя спалучэнні аднакаранёвых дзеяслова і назоўніка з аб’ектнымі адносінамі перадаюць замаруджванне развіцця дзеяння, ствараюць плаўнасць і напеўнасць аповеду: *Сын у мамачкі* ***ночку начаваў****, .. дзіўны* ***сон сасніў*** [1, с. 283]; *Сядай ты са мной, маладзенькаю,* ***Вячэру вячэраці*** [1, с. 155]; *Я навучылася, Як* ***гора гаравaці*** [1, с. 179].

Некаторыя таўталагічныя спалучэнні з аб’ектнымі адносінамі набліжаюцца да ўстойлівых выразаў: *А што мы будзем снедаці? – Я – бела булкі, ты –* ***думай думкі*** [1, с. 127]; *Стала мая мамка* ***паслы слаць****: – Едзь, маё дзіцятка, ў госці к нам* [1, с. 180]; *Пакінь, пакінь, мая міла,* ***Жарты жартаваці*** [1, с. 219]; *Лепей было, мамачка, тры гары капаць, Як з нялюбым дружочкам* ***век векаваць*** [1, с. 221].

Атрыбутыўныя адносіны падкрэсліваюць азначэнне прадмета, акцэнтуюць увагу на яго характарыстыцы, канкрэтызуюць змест азначальнага слова, выражанага аднакаранёвым назоўнікам: ***Малады малойчык****, чаму смутны ходзіш: Ці вайны баішся, ці айцоў жалееш*? [1, с. 125]; ***Багатая багатырка*** *– Яна ўсё дзьмецца, А бедная сіраціна К сэрцу прыхільнецца* [1, с. 220]; *Убярыся, бабка, У* ***белае белле****, Тады пойдзем, бабка, з табой на вяселле* [1, с. 296].

Акалічнасныя адносіны паміж аднакаранёвымі назвамі ўзмацняюць ступень праяўлення пэўнага дзеяння: *Даюць, даюць, ды й прыказываюць, Каб без вады* ***бела***

выбеліла**, Каб без сонца **суха высушыла [1, с. 82]; *А я тую крынічаньку **Плавам пераплаўлю**, А я ж тую дзяўчынаньку Да се перабаўлю* [1, с. 94].

Паводле колькасці кампанентаў каранёвыя паўторы найчасцей бываюць двухкампанентнымі: ***Перавознік**, **перавознік** малады, **Перавязі** Дунай-рэчку на той бок* [1, с. 152]; *Просіць маці **вячэраці** – **Вячэра** не міла* [1, с. 101].

У некаторых выпадках сустракаюцца трохкампанентныя каранёвыя паўторы: *А мой міленькі **касіў**, **касіў**, На **пракосіцу касу** палажыў* [1, с. 333]; *Да **вецер вее**, вецер **павявае**, Да маці ў донькі пра жыццё пытае* [1, с. 183]; *Я ў суседа на бяседзе была, Я ж у яго **піва п'янае піла*** [1, с. 264].

Паводле размяшчэння каранёвых паўтораў у сказе выдзяляюцца кантактныя і дыстантныя паўторы. Кантактны дэрывацыйны паўтор, акрамя звязнасці, выконвае ролю ўзмацнення сэнсу і ідэйнай значнасці паўтораных слоў: *Ці **свет**, ці **світае**, Ці на зоры займае* [1, с. 130]; *Ой, пайду я ў **даль даліною** Да знайду я каліну з вярбою* [1, с. 142].

Дыстантны дэрывацыйны паўтор выконвае ў першую чаргу функцыю звязнасці тэксту, аб'ядноўвае адасобленыя адзінкі тэксту, узмацняючы іх значэнне і ролю ў раскрыцці зместу маўлення: *Не п'е, не гуляе, ў **радні** не бывае. – А я к свайму **роду** пайду цераз воду* [1, с. 201]; *Златы персцень **барабаншчыку** дам, Каб ён добра ў **барабан** выбіваў* [1, с. 64].

Аднакаранёвыя словы могуць ствараць своеасаблівы сінтаксічны паралелізм, калі выкарыстоўваецца ланцужок аднатыпных паўтораў: ***Пісар** едзе – **пісьмо** вязе, .. **Пагоршнік** едзе – **гаршчок** вязе, .. **Пірожнік** едзе – **пірог** вязе, .. **Дудар** едзе – **дудку** вязе* [1, с. 313], што садзейнічае маляўнічасці аповеду, экспрэсіўнасці выкладу.

Паводле граматычнай аформленасці большасць каранёвых паўтораў належаць да розных часцін мовы, што спрыяе стварэнню рознабаковай характарыстыкі апісваемых з'яў. Яны падкрэсліваюць суб'ект і яго дзеянне: *Ах, мамка мая, ты мая **парадніца**, **Парадзь** жа ты мне, як нямілага звацi* [1, с. 200]; *Не ўмееш, мой **міленькі**, **мілававаці**, Толькі ўмееш, мой **міленькі**, ругаці* [1, с. 204];

– асобу і яе характарыстыку: *Растужылася, расплакалася Сувячора **малодачка малада*** [1, с. 82]; ***Маладзюсенькі малойчык**, Няма праўданькі ў цябе* [1, с. 157];

– дзеянне і яго аб'ект: *Я табе, шэльма, бок наб'ю, – Шаўкову хустку ў **склад складу**, Тонку кашулю сам знашу* [1, с. 224].

Радзей каранёвыя паўторы належаць да адной часціны мовы - назоўніка: *Ой, пайду я ў **даль даліною** Да знайду я каліну з вярбою* [1, с. 142]; *А на моры ды на Дунаі **Рыбак рыбку** ловіць* [1, с. 148]

Павышэнню вобразнасці выказвання садзейнічае ўключэнне ў склад кампанентаў дэрывацыйнага паўтору аказіяналізмаў, якія ажыўляюць паэтычнае маўленне і павышаюць сэнсавую напоўненасць слова: *Хаця ж майго **гараваннейка** паглядзі, Як я на чужой старонцы **гарую*** [1, с. 213]; *Птушачкі, ўставайце, да **росаў** спявайце, Каб я , маладзенька, не **ўрасілася**, Каб па мне свякроўка не журылася* [1, с. 202]; ***Прашчай**, айцец, прашчай, маменька мая, А вам, браткі вам **прашчаннячка** няма* [1, с. 63]; *Каб **стучыкі** не **стучэлі** І падкоўкі не звінелі* [1, с. 342]; *А свякроў нявехны Да й **жадом жадала**, Ў вішнёвым садочку Хатку збудавала* [1, с. 259].

Каранёвы паўтор садзейнічае, такім чынам, узнаўленню ўнутранай формы аднакаранёвых слоў, актуалізацыі іх семантыкі і лагічнаму выдзяленню ў кантэксце.

Паводле сваёй стылістычнай функцыі і механізму ўтварэння да дэрывацыйнага паўтору набліжаецца **рэдуплікацыя** – падваенне пачатковага складу (частковая рэдуплікацыя) або цэлага кораня (поўная рэдуплікацыя) [14, с. 408].

У пазаабрадавых песнях сустракаецца як поўная, так і частковая рэдуплікацыя: *Удова можа **чаравaці**. **Счаравала** мужа свайго, **Ачаруе** сына майго. – А я чараў не баюся Ды й на ўдаве ажанюся* [1, с. 160]; *Не стой, не стой, вербіна, пры мху, пры балоцечку, Ой, **лёлі**, **палёлюшкі**, пры мху, пры балоцечку* [1, с. 66].

Рэдуплікаваныя формы ўтвараюцца найчасцей у выніку далучэння прэфікса да дзеяслоўных форм, што садзейнічае стварэнню эфекту працягласці пэўнага працэсу ў часе, паступовасці, паэтапнасці, шматразовасці выконваемага дзеяння: *Тудой **ішлі-прайшлі** ўсё два малайцы .. абодва холасты* [1, с. 104]; ***Еду-ад'язджаю** На Ўкраіну далёку* [1, с. 128]; *А я*

стала *й* ***пастаяла****, Пакуль вада чыста стала, А я* ***села*** *й* ***пасядзела****, Пакуль вада пасвятлела* [1, с. 113]; *Там дзяўчына ваду брала, ..* ***Брала, набірала*** [1, с. 133]; *Мыла я кашулю Ды народнай матцы. Ой, мыла я,* ***мыла*** *Ды і* ***перамыла****, Сушыла,* ***сушыла*** *Ды* ***перасушыла****, .. Качала,* ***качала*** *Ды* ***перакачала****, Народная мамачка Ўсё перавучала* [1, с. 249].

Рэдуплікацыя назоўнікаў структурна і сэнсава вылучае назвы асобы або пэўныя з'явы: *Ах ты,* ***дзевер-дзевярусенька****, Вядзі мяне памалюсеньку* [1, с. 333]; *Сустрэла жонка ў* ***паўдарозі****, .. З беленькім сырам, з маленькім сынам, .. Сустрэла мачыха ў* ***паўпарога*** *.. Ды з горкім дымам, з дубовым кіем* [1, с. 87].

Рэдуплікаваныя прыметнікі падкрэсліваюць, удакладняюць азначэнне прадметаў: *Вылятала пташка морская, Пташка* ***морская-заморская****. Прынасіла пісьмо царсткае, Пісьмо царскае, гасударскае* [1, с. 63]; *Як паехаў мой міленькі Ды ў поле араць, А я* ***млада-младзюсенька****, – Ў карчомку гуляць* [1, с. 264]; *Ажанілі мяне* ***малалетняга****,* ***Малалетняга, малацельнага*** [1, с. 266]; прыслоўі ўказваюць на акалічнасць дзеяння: *Ой, устану* ***рана-ранюсенька****, Памыюся* ***бела-бялюсенька*** [1, с. 208].

Асобнай разнавіднасцю дэрывацыйнага паўтору з'яўляецц**а афіксальны паўтор** – паўтор афіксаў у рознакаранёвых словах, які служыць для аднаструктурнага афармлення супастаўляемых слоў, важных для раскрыцця асноўнага зместу маўлення. У складзе афіксальнага паўтору выдзяляюцца прэфіксальны і суфіксальны паўторы.

Часцей за ўсё ў пазаабрадавых песнях ужываецца дэрывацыйны прэфіксальны паўтор. Гэта паўтор прэфіксаў:

– ад- : ***Адчыніся****,ваконачка,* ***адапрыся****,* ***Адклікніся****, матулечка,* ***адзавіся*** [1, с. 69];

– вы- : ***Выбірала****,* ***выглядала*** *– Дурны розум мела: На лічынька спадабала, Натуры не ўзнала* [1, с. 237];

– за- : *Да пайду ж я да сама будзіць, Да дзверцамі не* ***заскрыпнуці****, Чаравічкамі не* ***застукаці****, Сукеначкай не* ***зашастаці*** [1, с. 189];

– на- : У *канцы століка* ***настаялася****, Лічаных кусочкаў* ***наглыталася****, Саломкаю пескі* ***напалілася****, Гаршчочкам вадзічкі* ***нанасілася*** [1, с. 239];

– па-: *Святі, месяц,* ***пасвячайся****, Бяжы, конік,* ***паспяшайся*** [1, с. 135];

– пад-: *Як да быстрай рэчанькі* ***падхадзіла****, На мяне ўсё сонейка засвяціла. Аж тут родна мамачка* ***падскачыла****, За белыя ручанькі* ***падхапіла*** [1, с. 217];

– пера-: *Русу косу* ***перачэсывала****, Чорным шоўкам* ***пераплётывала*** [1, с. 193];

– пра-: *Няхай жа мой конь* ***прагарцуецца****, А жана-шэльма* ***прамуштруецца*** [1, с. 214];

– пры- : *Там казачанька каня паіў, Напаіўшы, ды ён* ***прывязываў****, .. Прывязаўшы, ды ён* ***прыказываў*** [1, с. 118];

– раз- : ***Рассудзілі*** *мяне людзі,* ***Рассудзілі****,* ***разлучылі****, каб мы ў пары не хадзілі* [1, с. 96];

– у- : *А ні я* ***ўпіла****, а ні я* ***ўела****, Ні харашо* ***ўхадзіла*** [1, с. 190].

Прэфіксальны паўтор у многіх выпадках дапамагае структурна выдзеліць паралелізм – супастаўленне дзеянняў, паводзін, стану, знешняй або ўнутранай характарыстыкі асоб з разнастайнымі з'явамі жывой або нежывой прыроды: *Ужэ ж ясны месяц* ***акружыўся****,* ***Акружыўся****, Ужэ ж наш бацюхна* ***адслужыўся****,* ***Адслужыўся*** [1, с. 88]; ***Зарадзіла*** *многа ягад у лясу,* ***Заблудзіла*** *красна дзеўка у бару* [1, с. 152]; *У бары сасонка* ***зашумела****, А ў мяне галоўка* ***забалела*** *– Яна ж віна-мёду захацела* [1, с. 272].

Кампаненты прэфіксальнага паўтору могуць утвараць градацыйныя або ампліфікацыйныя рады, якія садзейнічаюць узмацненню выражаемага зместу і павышаюць экспрэсіўнасць выкладу: *А я пайду ж я,* ***разыдуся****, Аб бел камень* ***разаб'юся****, Драбней маку* ***рассыплюся*** [1, с. 97]; *Яны скачуць, яны йграюць – Гэтым дзевак падманяюць. Яны твае белы ручкі ..* ***паламаюць****, Яны твае златы кольцы ..* ***пасымаюць****, Яны тваю русу косу ..* ***паплутаюць*** [1, с. 99].

Суфіксальны паўтор, як і прэфіксальны, дазваляе выдзеліць з тэксту, структурна абазначыць супастаўляемыя намінатыўныя адзінкі з мэтай актуалізацыі іх значэння, стварэння асацыятыўнай або лагічнай сувязі. Пры гэтым выдзяляюцца назвы асобы: *Чорна хаджу* ***«лянівіца»****, Бела хаджу –* ***«хваслівіца»****, Многа ем –* ***«пражорліца»****, Трошку ем –* ***«сухотніца»****; Ціха хаджу –* ***«мядзведзіца»****, Скора хаджу –* ***«прабегліца»*** [1, с. 225];

– дзеяння: *Не жаль мне таго чаўночка, А жаль* ***малявання****. Не жаль мне таго платочка, А жаль* ***вышывання****. Не жаль мне тае дзяўчыначкі, А жаль* ***закахання*** [1, с. 148];

– акалічнасці: *Мой мілы па сенях ідзе* ***Паціхеньку, памалюсеньку*** [1, с. 181] і інш.

Суфіксальны паўтор дазваляе супаставіць паводзіны і характарыстыку, становішча дзеючых асоб з канкрэтнымі або адцягненымі з'явамі аб'ектыўнай рэчаіснасці: *Каціласа гарошынка з гары ў* ***падоллейка****. Аддала мяне мамачка З роскашы ў* ***бяздоллейка*** [1, с. 247]; *Аддалі мяне на* ***чужынаньку****, Не маюць мяне за* ***дзяцінаньку*** [1, с. 279]; *Ці не едзе* ***маладзюсенька****? Доля ж яе ўсё* ***ліхусенька*** [1, с. 250].

Акрамя таго, ён садзейнічае рытмічнай арганізацыі вершаванага радка, выконвае адметную рыфмастваральную функцыю: *Устань, мой міленькі,* ***мілюсенькі****, Бо ўжо на дварэ дзень* ***бялюсенькі*** [1, с. 248]; *Ай, маць мая, маць* ***радненькая****, Што ў полі за рабіна* ***зеляненькая***? [1, с. 288].

Такім чынам, дэрывацыйны паўтор выконвае важную структурна-семантычную і выяўленча-выразную ролю ў пазаабрадавым песенным тэксце. Ён садзейнічае стварэнню цэласнасці і звязнасці тэксту, актуалізацыі семантыкі паўтораных моўных адзінак, спрыяе ўзнаўленню іх унутранай формы, устанаўленню асацыятыўных сувязей, узмацненню сэнсу выказвання, канкрэтызацыі і дэталізацыі зместу твора, выдзяленню і рознабаковаму апісанню найбольш істотных прыкмет і характарыстык асоб або прадметаў, іх дзеянняў і стану, а таксама рытмічнай арганізацыі вершаванага радка, што ў цэлым значна павышае экспрэсіўны патэнцыял народна-паэтычнага маўлення.

Літаратура

1. Лірычныя песні / Уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Выд.-ва БДУ, 1976. – 464 с.

2. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / складальнікі К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка. – Выд. 3. – Мінск : Выш. школа, 1985. – 749 с.

3. Гальперин, И.Р. Текст как объект лингвистического исследования / И.Р. Гальперин. – М. : Наука, 1981. – 137 с.

4. Валгина, Н.С. Теория текста: учебное пособие / Н.С. Валгина. – М. : Логос, 2004. – 280 с.

5. Амроян, И.Ф. Повтор в структуре фольклорного текста (на материале русских, болгарских и чешских сказочных и заговорных текстов) / И.Ф. Амроян. – М. : Государственный республиканский центр русского фольклора, 2005. – 296 с.

6. Васильева Ю.В. Повтор как принцип организации фольклорного текста: лексико-синтаксический повтор в произведениях русского и англошотландского фольклора : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Ю.В. Васильева. – Саратов, 2004. – 24 с.

7. Веселовский, А.Н. Историческая поэтика / А.Н. Веселовский ; сост. В.В. Мочалова. – М. : Высш. школа, 1989. – 405 с.

8. Шибанова М.П. О функциях повторяемости в поэтическом языке фольклора (в отличие от языка художественной литературы) / М.П. Шибанова // Афанасьевский сборник. Материалы и исследования. Воронеж, 2005. – Вып. 2. – 216 с.

9. Словарь лингвистических терминов. 2012 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://slovar.cc/rus/term.html. – Дата доступа : 10.09.2018.

10. Кечик, Е.В. Деривационный повтор в художественном прозаическом тексте : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Е.В. Кечик. – М., 1995. – 285 с.

11. Надежкин, А.М. Корневой повтор в художественной речи М.И. Цветаевой : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / А.М. Надежкин. – Нижний Новгород, 2015. – 208 с.

12. Евгеньева, А.П. Очерки по языку русской устной поэзии в записях XVII–XX вв. / А.П. Евгеньева. – М.-Л. : Изд.-во АН СССР, 1963. – 348 с.

13. Невская Л.Г. Тавтология как один из способов организации фольклорного текста [Электронный ресурс] / Л.Г. Невская. – Режим доступа : http://mirznanii.com/a/269768/tavtologiya-kak-odin-iz-sposobov-organizatsii-folklornogo-teksta. – Дата доступа : 15.09.2018.

14. Лингвистический энциклопедический словарь / В.Н. Ярцева (гл. оед.). – М. : Сов. энциклопедия, 1990. – 685 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 17.10.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.1'42

О типах отраслевого профессионального дискурса

В.В. Степанова

Уточняются сущностные признаки профессионального дискурса. Вводится понятие отраслевого профессионального дискурса. Определяются критерии, на основании которых дифференцируются типы профессионального дискурса в отрасли стекольной промышленности. Выделяются собственно профессиональный и смешанный типы отраслевого профессионального дискурса.
Ключевые слова: коммуникация, профессиональный дискурс, отраслевой профессиональный дискурс, собственно профессиональный дискурс, смешанный профессиональный дискурс.

The essential features of professional discourse are defined more precisely. The notion of industry-specific professional discourse is introduced by the author. The criteria forming the basis for the differentiation of types of professional discourse in the glass industry are defined. The true professional and combined types of industry-specific professional discourse are found out.
Keywords: communication, professional discourse, industry-specific professional discourse, true professional discourse, combined professional discourse.

В современной лингвистике профессиональный дискурс (ПД) выделяется в сопоставлении с дискурсом непрофессиональным. Разница между этими типами дискурсов интуитивно устанавливается уже на уровне понимания самих названий: профессиональный / непрофессиональный, то есть связанный с профессиональной деятельностью человека или нет.

Дефиниции терминологических понятий обычно строятся на описании наиболее существенных признаков определяемых понятий. Так, Е.И. Голованова под профессиональным дискурсом понимает «вербально опосредованную коммуникацию как процесс контролируемого взаимодействия субъектов профессиональной деятельности, характеризующийся определенным комплексом норм, стереотипов мышления и поведения» [1, с. 32]. В данном определении автор подчеркивает, что взаимодействие коммуникантов в рамках ПД подчинено определенным нормам и протекает по заданным сценариям.

По мнению Л.С. Бейлинсон, профессиональный дискурс определяется как «общение специалистов между собой или с теми, кто к ним обращается для получения консультации либо профессиональной помощи» [2, с. 145], или, в более поздней трактовке, как «общение специалистов в связи с решением задач, требующих профессиональной подготовки» [3, с. 182]. В данных определениях автор акцентирует внимание на целенаправленном характере коммуникации в рамках ПД и возможности осуществления ее в двух форматах: «специалист – специалист» и «специалист – неспециалист».

К. Конг считает, что важным критерием отнесения речи к профессиональному дискурсу является не только то, что речь продуцируется профессионалами со специальной подготовкой, но и то, что эта речь отражает направленность коммуникантов на достижение результата профессиональной деятельности, связываемой с определенным «рабочим местом» [4, с. 2].

Как видим, дефиниции ПД, предлагаемые разными учеными, обнаруживают как общие, так и отличительные черты в наборе сущностных, дифференциальных признаков ПД. Так, не всегда в определениях ПД уточняется, являются ли все коммуниканты профессионалами. Не все исследователи считают необходимым относить к обязательным признакам ПД такие его характеристики, как стереотипность организации речевого взаимодействия, подчиненность коммуникации решению профессиональных задач, локализованность.

Под профессиональным дискурсом, на наш взгляд, следует понимать процесс коммуникации в определенной сфере профессиональной деятельности человека, характеризующийся совокупностью следующих сущностных признаков:

1) наличием продуцента и реципиента информации (находящихся в непосредственном / опосредованном контакте), из которых хотя бы один является специалистом (то есть челове-

ком, который получил профильное образование либо обладает необходимыми навыками для работы в той или иной сфере профессиональной деятельности);

2) наличием профессионального пространства (стационарного, в котором по сложившейся традиции осуществляется профессиональная деятельность, или специально назначенного места для решения задач, связанных с профессиональной деятельностью);

3) использованием специальной лексики (терминологии в письменной и устной коммуникации и профессиональных жаргонизмов в устной речи специалистов);

4) детерминированностью коммуникативной активности продуцента речи возложенными на него обязанностями, целями его профессиональной деятельности.

Важно подчеркнуть, что все эти признаки должны проявляться в совокупности. Это значит, к примеру, что не любая коммуникация между профессионалами на рабочем месте может быть отнесена к соответствующему профессиональному дискурсу. Если инженер дает команду своим подчиненным устранить неполадку в работе оборудования, это коммуникация в рамках ПД, так как в этой ситуации обнаруживаются все вышеназванные признаки ПД. Если же инженер на своем рабочем месте поздравляет коллегу с днем рождения, то этот вид общения нельзя относить к ПД, так как отсутствует направленность на достижение цели, детерминированной профессиональной деятельностью, и не используется профессиональная лексика.

Разумеется, что состав названных здесь сущностных признаков ПД определен с опорой на уже имеющиеся дефиниции ПД и отдельные комментарии к ним. Так, на то, что участниками ПД наряду с профессионалами могут быть и непрофессионалы, указывает Л.С. Бейлинсон: «профессиональный дискурс базируется на специальной подготовке как минимум одного из участников такого дискурса» [2, с. 146]; Е.И. Голованова употребляет понятие «наивный (обыденный) формат», говоря о формате ПД, представляющем общение специалиста и неспециалиста [1, с. 33]. На различия в профессиональных статусах коммуникантов обращает внимание Б.-Л. Гуннарссон. Исследователь говорит о том, что коммуникация в рамках профессионального дискурса происходит между профессионалами с различным уровнем знаний, между профессионалами и полупрофессионалами (учениками) и между профессионалами и дилетантами [5, с. 5].

Названные нами сущностные признаки ПД образуют минимальный и достаточный набор дифференциальных признаков ПД, в то же время это далеко не исчерпывающий список общих для всех профессиональных дискурсов характеристик. Б.-Л. Гуннарссон считает, к примеру, что профессиональным дискурсам свойственен не только целенаправленный, но и экспертный, ситуативно-обусловленный характер; признаками ПД, по мнению Б.-Л. Гуннарссон, являются также конвенциональность, зависимость от различных социальных фреймовых систем, подверженность динамическим изменениям, тесная взаимосвязь с общественным статусом коммуникантов внутри организации [5, с. 5]. Эти признаки, тем не менее, не позиционируются исследователем как сущностные.

Когда речь идет о дискурсе отдельно взятой отрасли профессиональной деятельности человека, например, определенной отрасли промышленного производства, логично говорить об отраслевом профессиональном дискурсе (ОПД). Поэтому далее понятия профессиональный дискурс стекольной промышленности и отраслевой профессиональный дискурс будут употребляться как синонимичные.

Профессиональный дискурс обладает сложной и неоднородной структурой. На примере ПД стекольной промышленности установим, каким образом структурируется ОПД.

В первую очередь следует отметить, что ОПД по своей сути – это «макроструктура», в рамках которой, а точнее, по законам и целеполаганию которой, функционируют структурные элементы ОПД (далее типы ОПД).

Итак, типами ПД стекольной промышленности (на основании профессиональной специализации коммуникантов и, как следствие, использования ими соответствующей терминологии) можно считать:

1. собственно профессиональный дискурс (коммуникация осуществляется между специалистами, непосредственно отвечающими за процесс подготовки, производства и обработки стекла, терминология функционирует в «чистом» виде):

1.1. технический дискурс – в его рамках реализуется коммуникация, связанная с заказом, монтажом, сборкой, эксплуатацией, ремонтом, техобслуживанием и модернизацией основного и вспомогательного оборудования, его узлов, деталей и запасных частей;

1.2. технологический дискурс, в рамках которого осуществляется коммуникация, связанная с процессами производства и обработки стекла (подготовка и закладка шихты, варка стекломассы, отжиг, резка стекла и др.);

2. смешанный профессиональный дискурс (является вспомогательным по отношению к собственно профессиональному дискурсу; в рамках этого типа дискурса осуществляется взаимодействие представителей различных профессий либо специалистов и неспециалистов, наблюдается проникновение отдельных терминологических единиц или целых текстов из других типов дискурсов):

2.1. строительный (строительство, реконструкция, модернизация цеховых, складских и прочих помещений, выполняемые в соответствии с определенными нормами и требованиями промышленного производства и др.);

2.2. экономический (проведение тендеров, заключение договоров на поставку и ремонт оборудования и запчастей и др.);

2.3. юридический (правовые аспекты заключения контрактов, решение спорных вопросов в судебном или досудебном порядке, охрана интеллектуальной собственности, взаимодействие с государственными органами по стандартизации и сертификации продукции и др.);

2.4. научный (разработка новых технологий производства и обработки стекла, нового оборудования, новых составов стекол и др.);

2.5. деловой или бизнес-дискурс (официальная переписка / устные переговоры уполномоченных лиц в процессе осуществления ими профессиональной деятельности);

2.6. рекламный (продвижение на рынке и продажа как конечного продукта производства, то есть стекла и изделий из него, так и производственного оборудования и технологий);

2.7. массмедийный (профессиональные периодические издания, в которых печатается вся актуальная информация в стекольной промышленности, профессиональная коммуникация в рамках проведения международных специализированных выставок);

2.8. учебный (подготовка кадров для работы в данной отрасли).

Подчеркнем, что описанные здесь типы смешанного профессионального дискурса не являются факультативными, они представляют собой обязательные составные части ОПД на современном этапе развития анализируемой отрасли промышленности.

В собственно профессиональном (техническом и технологическом) дискурсе сущностные признаки ПД проявляются в наивысшей степени: оба коммуниканта являются профессионалами (например, инструкция по монтажу написана инженером для инженера; устные или письменные указания относительно регулирования производственного процесса отдаются в устной или письменной форме главным технологом своим компетентным подчиненным); «профессиональное пространство» представлено цехом, складом и т. д.; терминология стекольного производства употребляется в полном объеме, продукты устной и письменной речевой деятельности характеризуются высокой плотностью использования терминологических единиц; коммуникативная активность продуцента речи обусловлена целями его профессиональной деятельности.

Однако при всей кажущейся простоте в разграничении типов ОПД на практике порой оказывается достаточно сложным отнести текст / устное высказывание к определенному типу ОПД. Безусловно, есть такие тексты, например, техническое описание отдельных узлов оборудования или руководство по эксплуатации, которые можно с уверенностью квалифицировать как письменные фиксации профессиональной коммуникации в рамках технического дискурса. Сложнее, если то же самое техническое описание дается в виде рекламного буклета или предлагается в виде статьи в специализированном периодическом издании. Из этого можно сделать вывод, что различные типы ПД стекольной промышленности постоянно взаимодействуют, оказывают влияние друг на друга.

Заметим, что предлагаемый нами подход к классификации типов отраслевого профессионального дискурса отчасти перекликается с подходом, применяемым к дифференциации типов ПД П. Линеллом. П. Линелл различает «интрапрофессиональный дискурс» (коммуникацию между специалистами одной профессии), «интерпрофессиональный дискурс» (коммуникацию представителей различных профессий) и «дискурс между профессионалом и дилетантом» [6, с. 143].

Итак, профессиональный дискурс может считаться таковым, если в нем фиксируются следующие признаки: наличие коммуникантов-профессионалов (или хотя бы одного профессионала), наличие стационарного или назначенного «профессионального пространства» для осуществления профессиональной коммуникации, использование специальной лексики и детерминированность коммуникативной активности продуцента речи возложенными на него обязанностями и целями его профессиональной деятельности.

Отраслевой профессиональный дискурс по своей структуре неоднороден, в нем сосуществуют и контаминируются различные типы дискурсов: технический и технологический дискурсы, представляющие собственно профессиональный отраслевой дискурс; строительный, экономический, юридический, научный, деловой, рекламный, массмедийный, учебный дискурсы, являющиеся смешанными профессиональными дискурсами в рамках отрасли, в иных обстоятельствах способные выступать как независимые профессиональные дискурсы.

В заключение отметим, что вышеописанная структура ПД стекольной промышленности может быть использована для изучения ПД в иных отраслях промышленности.

Литература

1. Голованова, Е.И. Профессиональный дискурс, субдискурс, жанр профессиональной коммуникации: соотношение понятий / Е.И. Голованова // Вестник Челябинского государственного университета. – 2013. – № 1 (292). Филология. Искусствоведение. – Вып. 73. – С. 32–35.

2. Бейлинсон, Л.С. Профессиональный дискурс как предмет лингвистического изучения / Л.С. Бейлинсон // Вестник Волгоградского государственного университета. Серия 2. Языкознание. – 2009. – № 1. – С. 145–149.

3. Бейлинсон, Л.С. Профессиональный дискурс: профильные признаки / Л.С. Бейлинсон // Гуманитарные и социальные науки. – 2016. – № 6. – С. 179–182.

4. Kong, K. Professsional discourse / K. Kong. – Cambridge : Cambridge University Press, 2014. – 288 p.

5. Gunnarsson, B.-L. Professsional discourse / B.-L. Gunnarsson. – London and New York : Continuum, 2009. – 275 p.

6. Linell, P. Discourse across boundaries: On recontextualizations and the blending of voices in professional discourse / P. Linell // Text & talk : an interdisciplinary journal of language, discourse & communication studies. – 1998. – Vol. 18, № 2. – P. 143–157.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 04.01.2019

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3'42'367.623:398.8(=161.3)

Аб ролі ад’ектываў у экспрэсівізацыі паэтычнага кантэксту беларускай народнай пазаабрадавай лірыкі

К.Л. Хазанава

Даследуюцца выражаныя рознымі формамі прыметнікаў мастацкія азначэнні, выяўленыя ў беларускіх народных пазаабрадавых песнях. У творах сустракаюцца кароткія і ўсечаныя формы прыметнікаў, ад’ектыўныя колераабазначэнні. Эпітэты ўжываюцца ў прэпазіцыі і ў постпазіцыі адносна азначаемага слова. Пашыраны дэмінутыўныя прыметнікі. Выкарыстанне розных прыметнікавых формаў у функцыі эпітэтаў спрыяе экспрэсівізацыі народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу, стварае эмацыянальнасць і вобразнасць пазаабрадавай беларускай народнай паэзіі.
Ключавыя словы: эпітэт, прыметнік, экспрэсіўнасць, пазаабрадавы фальклор, азначэнне, колер, метафара.

The artistic definitions expressed by various forms of adjectives and presented in Belarusian folk extra-regular songs are investigated. In the works there are short and truncated forms of adjectives, adjectival color designations. Epithets are used in the preposition and in the postposition regarding the designated word. The use of diminutive adjectives is expanded. The use of various forms of adjectives in the function of epithets contributes to the expression of the popular poetic extra-sacred discourse, creates emotionality and imagery of extra-ceremonial Belarusian folk poetry.
Keywords: epithet, adjective, expressiveness, non-ritual folklore, definition, color, metaphor.

Беларускі народна-паэтычны пазаабрадавы дыскурс з’яўляецца неад’емнай і арганічнай часткай духоўнай скарбніцы народа. Творы пазаабрадавай лірыкі не маюць дакладнай часавай або падзейнай арыентаванасці і выконваюцца «пад настрой» у любы дзень і час. Такая прызначанасць абумовіла тэматычна-жанравую разнастайнасць пазаабрадавых тэкстаў (песні пра цяжкую долю, пра каханне і сямейнае жыццё, пра службу ў войску, жартоўныя і сатырычныя песні), а таксама надзвычайную экспрэсіўнасць іх мовы.

Калі абрадавыя творы прымеркаваны да календарных або сямейных падзей, што ўжо актывізуе ўвагу ўспрымальнікаў, то пазаабрадавыя творы не маюць гэтай папярэдняй падрыхтоўкі аўдыторыі. Пазаабрадавы тэкст сам па сабе выяўляе пэўнае лірычнае пераўвасабленне рэчаіснасці, адлюстраванне пэўнай жыццёвай сітуацыі, прапушчанай скрозь паэтычнае мысленне стваральнікаў народнага тэксту, за кошт чаго экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу надзвычай канцэнтраваная.

Экспрэсівізацыі пазабарадавых фальклорных твораў спрыяе наяўнасць у тэкстах разнастайных моўных сродкаў. Увагу прыцягваюць вобразна-выяўленчыя сродкі мовы пазаабрадавых тэкстаў. Сярод тропаў назіральна колькасна пераважаюць мастацкія азначэнні. Ва ўмовах народна-паэтычнага дыскурсу надзвычайную выразнасць набываюць шматлікія азначэнні, якія ў тэкстах іншай жанрава-стылістычнай накіраванасці не будуць вызначацца як вобразныя. Многія ад’ектывы ў лінгвістычным кантэксце фальклорнага твора набываюць вобразнасць і становяцца эпітэтамі.

Мэта артыкула – характарыстыка ролі прыметнікаў-эпітэтаў у экспрэсівізацыі мовы беларускіх народных пазаабрадавых тэстаў.

Спецыфіка ўжывання мастацкіх азначэнняў у беларускіх народных пазаабрадавых тэкстах праяўляецца ў тым, што інтэнсіўнасць насычэння эпітэтамі твора звязана з жанрава-тэматычнай вызначанасцю. Эпітэты перапаўняюць песні пра цяжкую долю:

*Ой, асіна **вілаватая**, Не шумі ты нада міной* [1, с. 22];

*Я й малада схілілася, **Дробнай** слёзкай залілася* [1, с. 23].

У песнях нядолі і змагання (тэрмін, прапанаваны Н. Гілевічам [1]) амаль не ўжываюцца адзінкавыя эпітэты. Як правіла, тэкст прапануе некалькі мастацкіх азначэнняў:

*Вылецела ластаўка з-пад **яснай** зары,*
*Прыехала сястра к братцу з **чужой** стараны* [1, с. 25];

*Ой, **глыбокія** ды калодзісі, **Кароткія** ключы* [1, с. 20].

Заканамерна, што ў беларускіх народных пазаабрадавых песнях часта выкарыстоўваюцца сталыя мастацкія азначэнні. Гэтыя вобразна-выяўленчыя сродкі праз шматразовае ўжыванне ў фальклорных тэкстах ужо замацаваліся ў народнай свядомасці ў спалучэнні з адпаведным азначаемым словам:

*Вылецела ластаўка з-пад **яснай** зары, Прыехала сястра к брату з **чужой** стараны,*
*А прыйшла ў хатачку, прывіталася, А пра **дробных** дзетачак папыталася* [1, с. 22].

Такая спаянасць, аднак, не зніжае эмацыянальнасці і выразнасці моўных адзінак. Наадварот, веданне аўдыторыяй спалучэння ад'ектыва і назоўніка актуалізуе ўвагу, узмацняе ўспрыманне:

*Каб была я ды **шэрай** зязюлькаю Да каб умела лятаці*
*Паляцела б на **родну** стараначку Сваю маці шукаці* [1, с. 21];
*Ужо ж на дварэ не ранюсенька – **Краснай** дзеўкі з церама няма* [1, с. 32].

Устойлівасць традыцыі выкарыстання ў фальклорных творах пастаянных спалучэнняў *прыметнік + назоўнік* выражаецца ў пазаабрадавай лірыцы ў частотнасці колеравых эпітэтаў. Менавіта традыцыйнасць выкарыстання пэўнага колераабазначэння з адпаведным субстантывам стварае своеасаблівую вобразнасць выяўленчага кантэксту.

Мора ў песнях чакана *сіняе*: *Затапіла галовачку На дно **сіня** мора* [1, с. 37].

Прыметнік *шэры* звычайна азначае назвы птушак:

*А не нашла а **шэрая** пава Сваіх дробных дзетак* [1, с. 31];
*Скуль ўзялася **шэрая** зязюля, Стала кукаваці* [1, с. 51].

Прыметнік *сівы* часта ўжываецца ў функцыі азначэння назвы дамашняй жывёлы, што выкарыстоўваецца ў гаспадарцы: *Запрагу я **сівы** валэ, Паеду ў поле араць* [1, с. 36].

Асобныя колеравыя намінацыі адзначаюцца разнастайнасцю прымеркаванасці да азначаемых аб'ектаў:

*Пад **белаю** бярозаю Стаіць браток з сястрыцаю* [1, с. 21];
*Як спаймалі, так і ўзялі Пад **белыя** рукі* [1, с. 39];
*А з-пад гаю з-пад **зялёнага** Выходзіла туча чорная* [1, с. 31];
*Ой, дубе мой, дубе, Дубочак мой **зялёненькі*** [1, с. 37];
*Паіце сястру **зялёным** віном* [1, с. 16].

Пазаабрадавыя тэксты прапануюць іншы раз не зусім чаканае колеравае вызначэнне: ***Чырвона** каліна ў лузе схілілася, А я, маладая, зжурылася* [1, с. 35]. Тут экспрэсіўнасць дасягаецца праз акцэнтаванне ўвагі аўдыторыі на падставах выкарыстання дадзенага колеравага наймення: успрыманне дрэва ў такой колеравай гаме абумоўлена колерам яго пладоў.

Часта ў беларускіх пазаабрадавых тэкстах ужываецца некалькі колеравых прыметнікаў:

*У **цёмным** лесе грыбы зарадзілі, Там дзяўчаты па грыбы хадзілі.*
*Адна дзеўка па грыбы хадзіла. Прыбледзіла к **зялёнаму** дубу*
*Ды сказала: – «Начаваць тут буду». Я думала, што дуб **зеляненькі**,*
*Ажно стаіць хлопец **маладзенькі*** [1, с. 106].

Пры гэтым выкарыстанне некалькіх колераабазначэнняў спалучаецца з ужываннем эпітэтаў, якія вобразна характарызуюць іншыя якасці:

*А з-пад лесу, лесу **цёмнага**, а з-пад гаю з-пад **зялёнага** Выходзіла туча **чорная***
*Да **чорная, неспакойная**, І **грамлівая**, й **даждлівая*** [1, с. 31].

Ад'ектыўныя назвы колераў у пазабрадавай лірыцы могуць мець стылістычную функцыю актуалізацыі ўвагі аўдыторыі праз зварот да кантрастаў:

*Маеш ручкі, ножкі, **Светленькія** вочкі –*
*Будзеш ты рабіці Да **цямненькай** ночкі* [1, с. 28].

Яскравая марфалагічная адметнасць эпітэтаў-ад'ектываў, адзначаных у мове беларускай пазаабрадавай лірыкі – кароткія формы прыметнікаў:

*– Бярыце, служкі, за **белы** ручкі, Вядзіце, служкі, яе да пакоя* [1, с. 16].

З гісторыі ўсходнеславянскіх моў вядома, што кароткія формы прыметнікаў больш раннія за поўныя. Для сучаснай беларускай мовы кароткія прыметнікі не з'яўляюцца ўласцівымі. І фальклорныя творы захавалі са старажытнасці кароткія прыметнікі, даючы сучаснай аўдыторыі ўяўленні пра асобныя граматычныя формы мовы мінулых эпох. У асобных тэкстах адзначаюцца спецыфічныя кароткія формы, поўных адпаведнікаў якіх не захавалася ў сучасных усходнеславянскіх мовах або, магчыма, кароткая форма страцілася яшчэ

да часоў утварэння поўных прыметнікаў. У старажытнарускай мове ўжываўся прыметнік *буи* ‘храбры, адважны, моцны’. У функцыі эпітэта лексема *буи (буй)* выкарыстана ў «Слове пра паход Ігаравы»: ***буй*** *тур Всеволодъ* [2, с. 29], ***буй*** *Рюриче* [2, с. 41]. У сучаснай беларускай мове ўжываецца вытворны ад старажытнарускага *буи* прыметнік *буйны*, які пашырыў семантыку і мае намінатыўна-першаснае значэнне ‘вялікі па памерах’, ‘значны’. Пазаабрадавыя тэксты характарызуюцца захаваннем старажытных кароткіх формаў прыметніка *буйны*:

У чыстым полі ***буён*** *ветрык веець* [1, с. 25].

Ад кароткіх прыметнікаў неабходна адрозніць беларускую граматычную спецыфічную адметнасць – сцягнутыя, або ўсечаныя, прыметнікавыя формы. Сцягнутыя прыметнікі ўтварыліся ад поўных формаў праз выпадзенне [j] і сцяжэнне (усячэнне) дзвюх аднолькавых галосных. Асаблівасці развіцця спрыялі захаванню ўсечаных прыметнікаў толькі ў асобных граматычных формах: назоўны і вінавальны склоны адзіночнага ліку жаночага роду і назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду. Гэтыя формы дастаткова пашыраны ў пазаабрадавых беларускіх тэкстах:

А не нашла ***малада*** *сіротка Сваёй роднай мамкі.*

Толькі нашла ***глыбоку*** *крыніцу,* ***Сцюдзёну*** *вадзіцу:*

– Скалыхніся, ***глыбока*** *крыніца,* ***Сцюдзёна*** *вадзіца* [1, с. 31];

– Ой вы, дзеці мае, дзеці, А дзе ж ваша ***родна*** *маці?* [1, с. 29].

Азначэнні, выражаныя кароткімі і ўсечанымі формамі прыметнікаў, валодаюць своеасаблівай эмацыянальнасцю і экспрэсіўнай насычанасцю. Гістарычны каларыт гэтых ад’ектываў узмацняе іх мастацкасць і робіць гэтыя прыметнікі мастацкімі азначэннямі.

Выразнасці пазаабрадавых песень беларусаў садзейнічаюць сінанімічныя эпітэты-ад’ектывы, выкарыстанне якіх суправаджаецца часта паўтарэннем аднаго з іх. Паўторы могуць быць дыстантныя, а паўтараныя эпітэты адносіцца да розных азначаемых слоў:

Сястра да брата ў госці едзіць. Ды ці не тая, што ***гарутная****,*

На ***благім*** *конічку, ў* ***благім*** *вазочку?* [1, с. 15].

Стылістычны прыём спалучэння сінанімічных эпітэтаў з паўтарэннем можа ўтрымліваць і кантактны паўтор постпазіцыйнага прыметніка, прычым ад’ектывы азначаюць адзін і той самы назоўнік:

Едзе сястра ***бяздольная, Бяздольная, галодная*** [1, с. 17].

Прыведзены фактычны матэрыял паказвае разнастайнасць становішча эпітэтаў адносна азначаемага слова ў беларускіх пазаабрадавых тэкстах. Постпазіцыйнае размяшчэнне даволі характэрна для эпітэтаў-прыметнікаў у мове пазаабрадавай лірыкі:

Запрагу я валы ***крутарогі*** *Ды паеду араць край дарогі*

Ды наару я поля ***шырокага****, Ды пасею я хмелю* ***высокага****,*

Да нажану ж я піва ***салодкага*** *Ды для свайго роду* ***далёкага****,*

Ды й для бацькі і мамачкі, Ды й для сястрыцы ***багатай*** [1, с. 15];

Прысніўся мне сон ***дзіўненькі****, што памёр мой брат* ***радненькі*** [1, с. 18].

Сустракаецца і прэпазіцыйнае выкарыстанне мастацкіх азначэнняў-ад’ектываў:

А ў ***роўным*** *полюшку Стаяла каліначка* [1, с. 29];

Прыхаджу я ка дварочку, К ***высокаму*** *церамочку* [1, с. 29];

Ля ***крутога*** *бераэочку – Тама браццы сена косяць* [1, с. 29].

Адным са спосабаў стварэння экспрэсіўнасці паэтычнага кантэксту ў пазаабрадавых песенных тэкстах становіцца ўжыванне ў функцыі мастацкіх азначэнняў формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў:

Ой, маю слоўца ***найвярнейшае****, Што з ім гаварыць* [1, с. 26].

Адметнае выкарыстанне ў пазаабрадавых тэкстах набывае спалучэнне прыметніка з суплетыўнай формай вышэйшай ступені параўнання таго самага прыметніка. Выразнасць тэксту ўзманяецца за кошт ужывання ад’ектыўных формаў з рознымі азначаемымі словамі, што стварае своеасаблівую градацыю выражэння прыметы, названай прыметнікавымі формамі: *Ой, палын, палын – трава* ***горкая****, А доля мая – яшчэ* ***горшая*** [1, с. 33].

Марфемна-словаўтваральная структура ад’ектываў таксама ўплывае на павышэнне выразнасці і эмацыянальнасці твора. Насычанасць дэмінутыўнымі формамі фальклорных твораў увогуле не магла не адлюстравацца ў пазаабрадавай лірыцы:

Сеець яна да ***позненькай*** *ночкі, Выплакала свае ясны вочкі* [1, с. 25];

Панічок ***малодзенькі*** *Словамі прыяцен* [1, с. 37];

У ***сцюдзёненькай*** *крынічаньцы Там сіротка ваду чэрпала* [1, с. 32].

У пазаабрадавых тэкстах адзначаецца неаднаразовае ўжыванне памяншальна-ласкальных формаў прыметнікаў у спалучэнні з паўтарэннем адной з іх, што актуалізуе ўвагу аўдыторыі і садзейнічае павышанай эмацыянальнасці радкоў. Пры гэтым паўтораны дэмінутыўны эпітэт выкарыстоўваецца з рознымі азначаемымі словамі:

*Пайду я ў **вішнёвенькі** садок, Ёсць у садзе **цукровенькі** гарох –*

*Я кінуся свайму брацейку да ног. Ёсць у садзе **цукровенькі** аграст* [1, с. 16].

Для пазаабрадавых паэтычных тэкстаў уласціва не толькі выкарыстанне сталых пастаянных эпітэтаў-прыметнікаў. Некаторыя мастацкія азначэнні характарызуюцца індывідуальна-аўтарскім падыходам і нясуць адбітак індывідуальнага майстэрства асобных стваральнікаў фальклорных твораў:

*З бору **гаманлівага** Рэчанька цякла* [1, с. 32];

*Карміце **сытым** пірагом* [1, с. 16].

Назіранне за моўна-стылістычнымі рысамі беларускай народнай пазаабрадавай лірыкі выяўляе неаднароднасць выкарыстання прыметнікавых эпітэтаў у розных жанрава-тэматычных групах пазаабрадавых твораў. Вышэйназваныя спосабы экспрэсівізацыі народна-паэтычнага кантэксту праз ужыванне ад'ектываў былі зафіксаваныя ў сацыяльна-бытавых песнях. У песнях пра каханне мастацкія азначэнні-прыметнікі распаўсюджаны менш:

*Мой міленькі, едз дадому – На **цёплую** вячэраньку, На **белую** пасцеляньку:*

*Вячэранька **мядовая**, Пасцель **бела пуховая*** [1, с. 97].

У песнях пра каханне адзначаюцца сталыя эпітэты-найменні колераў:

*Чые гэта **шэры** валы Па гарах хадзілі?* [1, с. 98];

*А ты, **шызанькі** саколік, Што ты ў сад не лятаеш* [1, с. 100];

*Чаравала ручкі, ножкі, Шчэ **карыя** вочкі,*

*Што ж не хадзіў да другея **Цёмненькаю** ночкай* [1, с. 101].

У сатырычных і жартоўных песнях эпітэты таксама сустракаюцца не настолькі часта, як у сацыяльна-бытавых тэкстах, аднак становяцца складнікамі супрацьпастаўлення і ствараюць вобразны паралелізм:

*– Ты, бяроза **кудрава**, Як табе не здакучыла,*

*– За **сухім** лесам стоячы, На **зялёненькі** гледзячы?*

*Маладзіца **маладая**, Як табе не здакучыла,*

*За **благім** мужам жывучы, На **харошых** гледзячы?* [1, с. 309].

Праведзенае даследаванне стылістычных адметнасцей выкарыстання ад'ектываў у беларускіх народна-паэтычных пазаабрадавых творах паказвае дастаткова вялікую колькасную насычанасць песень, асабліва сацыяльна-бытавых, прыметнікавымі формамі. Старажытнасць узнікнення і трывалае функцыянаванне пазаабрадавай лірыкі паўплывала на ўжыванне ў тэкстах прыметнікавых формаў, што амаль не ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове. Замацаванасць і ўстойлівасць выкарыстання асобных прыметнікаў з адпаведнымі азначаемымі словамі стварае іх вобразнасць і мастацкасць, з прычыны чаго шматлікія прыметнікавыя формы ў пазаабрадавай лірыцы становяцца эпітэтамі. Часта ў пазаабарадавых песнях сустракаюцца кароткія і ўсечаныя формы прыметнікаў, ад'ектыўныя колераабазначэнні. Эпітэты ўжываюцца як у прэпазіцыі, так і ў постпазіцыі адносна азначаемага слова. Пашыраны таксама дэмінутыўныя прыметнікі. Выкарыстанне разнастайных прыметнікавых формаў у функцыі мастацкіх азначэнняў спрыяе экспрэсівізацыі народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу, стварае эмацыянальнасць і вобразнасць пазаабрадавай беларускай народнай паэзіі.

Літаратура

1. Лірычныя песні / Укладанне і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 464 с.

2. Слово о плъку Игоревѣ, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова // Слово о полку Игореве. – М. : Художественная литература, 1987. – С. 26–52.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 13.06.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3'42'367.622.22'373.2:398.838(=161.3)

Памяншальна-ласкальныя найменні ў мове беларускіх народных песень пра каханне

Н.П. Цімашэнка

Аўтар даследуе памяншальна-ласкальныя найменні ў мове беларускіх народных песень пра каханне, выяўляе суфіксы, з дапамогай якіх утвараюцца такія лексемы, характарызуе лексіка-тэматычныя групы назоўнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі.
Ключавыя словы: памяншальна-ласкальныя найменні, суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі, лексіка-тэматычная група, суб'ектыўнае значэнне.

The diminutive-hypocoristic nominations in the language of Belarusian folk songs about love are studied, the suffixes which help to form such lexemes are revealed. The lexical-thematic groups of nouns with the meaning of subjective evaluation are characterized.
Keywords: diminutive-hypocoristic nominations, suffixes of subjective evaluation, lexical-thematic group, subjective meaning.

На працягу многіх стагоддзяў фальклор жыў у асяроддзі сваіх стваральнікаў, чуйна рэагуючы на ўсе змены, што несла з сабой гістарычнае развіццё. Фальклор – гэта мастацкі летапіс народа, захавальнік працоўнага вопыту, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, і ў той жа час узбуджальнік творчай энергіі і новых ідэй. Вусна-паэтычная творчасць замацоўвала многія маральна-этычныя нормы, якія рэгулявалі адносіны людзей у грамадстве і ў сям'і. Дзякуючы гэтым нормам, чалавек доўгі час жыў у суладдзі з прыродай, абагаўляў і абараняў яе, ахоўваючы тым самым сваё асяроддзе існавання. Многія песенныя тэксты былі накіраваны на ўмацаванне сям'і і сямейных адносін, на выхаванне новых пакаленняў у адпаведнасці з высокімі нормамі і патрабаваннямі народнай маралі. Тая ж мараль патрабавала ад людзей справядлівасці, праўдзівасці, працавітасці і многіх іншых якасцей, якія адносяцца да агульначалавечых каштоўнасцей. Да нашага часу фальклор не страціў сваёй важнай уласцівасці – задавальняць эстэтычныя патрэбы народа. Характэрнай рысай нашай нацыі з'яўляецца жаданне спяваць у любых умовах: калі цяжка і горка на сэрцы, то хочацца напяваць сумную мелодыю; калі ў жыцці ўсё цудоўна – так і просіцца вясёлая песня. Фальклорны тэкст – гэта заўсёды адносна ўстойлівая камбінацыя элементаў традыцыі, якая ўзнікае пры кожным новым выкананні.

У фальклорных творах усё багацце ідэй выяўляецца праз мастацкія вобразы. Галоўнымі героямі ў беларускіх народных песнях пра каханне з'яўляюцца закаханыя – Ён і Яна, хлопец і дзяўчына, малады і маладая. Гэтыя вобразы напоўнены цеплынёй і пяшчотай, што перш за ўсё перадаецца праз лексічнае напаўненне песні. Характэрнай асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца наяўнасць у ёй вялікай колькасці памяншальна-ласкальных слоў. Памяншальна-ласкальная форма, як правіла, утвараецца пры дапамозе спецыяльных суфіксаў. Вельмі часта пры дапамозе гэтых марфем мы можам перадаць свае эмоцыі і адносіны да таго, пра што гаворым. Ужываючы памяншальна-ласкальныя або павелічальныя словаформы, мы можам перадаць пяшчоту, ласку, захапленне, замілаванне, пагарджэнне, нянавісць і г.д. У даным артыкуле наша ўвага накіравана на спосабы перадачы пяшчоты, ласкі і замілавання. Калі мы сёння размаўляем з дзецьмі або бацькамі і іншымі блізкімі сваякамі, мы пастаянна ўжываем памяншальна-ласкальную форму: замест нейтральнага наймення «сын», мы перавагу аддаём такім формам, як «сынуля», «сыначка», замест сухога «дачка», мы будзем ужываць «дачушка», да маці будзем звяртацца ласкава «матулечка», "мамачка" і г. д. Тое ж можна назіраць і ў беларускіх народных песнях пра каханне: *Я не малявана, / Такая ўжо з роду, / Што* ***ў*** *майго* ***татанькі*** */ Добрая выгода* [1, с. 50]; *Я ў крутыя беражкі глядзела, Ці наедзе* ***мамачка*** *вечарком* [1, с. 50]; *Там за гарой, там за другой мяне* ***мамка*** *кліча* [1, с. 53]; *Чым ты хворая,* ***дачушка****?* [1, с. 56].

Перадача дабрыні, пяшчоты і ласкі ў нашым маўленні вельмі неабходна, як і добрыя ўчынкі ў жыцці. Утварэнне памяншальна-ласкальных форм пры дапамозе суфіксаў служыць для суб'ектыўнай ацэнкі і ўласціва размоўнаму, экспрэсіўна напоўненаму маўленню. Такім чынам, усе найменні ў беларускай мове можна падзяліць на дзве групы. Да першай групы будуць адносіцца словы, якія называюць прадметы і з'явы рэчаіснасці, але не ацэньваюць іх: *Занядужыла* ***дзяўчына****, / Не ходзіць гуляці* [1, с. 56]; *Ой,* ***у полі за гарою*** */ Расце* ***жыта з лебядою*** [1, с. 56]. Другая група найменняў не толькі называе з'яву рэчаіснаці, але і выражае адносіны да іх людзей: *Абляцела ўсю Украіну / І цёмны* ***лясочак*** */ І пачула* ***міленькага*** */ Ціхі* ***галасочак*** [1, с. 57]; ***Травачка-муравачка****, /* ***Зялёненькі лужок****. / Я па табе скучыла, / Мой* ***міленькі дружок*** [1, с. 81]; *На гары* ***дубочак****, / Зялёны* ***лісточак****, / Няма майго* ***міленькага*** */ Ўжо трэці* ***дзянёчак*** [1, с. 118].

Для беларускага фальклору характэрны вобраз дзяўчыны-каліны (або рабіны, чаромхі, бярозы): *Чырвоная* ***каліноньку*** */ На дол падалася. / Маладая* ***дзяўчыноньку*** */ Ў казака ўдалася* [1, с. 169]; *Няможна з той* ***чаромушкі*** */ Лісточка сарваць, / Няможна і* ***дзяўчоначкі*** */ Засватанай браць* [1, с. 241]; *Ой, што па той* ***каліноньцы****, / Што па ёй ветрык вее, / Ой, што па той* ***дзяўчыноньцы****, / Што на чужой краіне* [1, с. 269]; *Ой,* ***рабіначка****, / Ты зялёная, / Ой, калі ж ты ўзышла, / Калі вырасла? / Ой,* ***дзяўчыначка****, / Ты прыгожая, / Дзе ты, красна, расла, / Гадавалася?* [1, с. 47]; *Ой, белая* ***бярозанька*** */ Голлечкам да сонца. / Заплакала* ***дзяўчыначка****, / Седзячы ў ваконца* [1, с. 162]. Найчасцей у тэкстах беларускіх народных песень пра каханне сустракаецца вобраз дзяўчыны-каліны. Каліна, распаўсюджаная на тэрыторыі Беларусі, – вельмі прыгожае і каштоўнае дрэва. Лічылі, што маладое дрэва ахоўвае ў хаце бацькоў незамужнюю дачку, лічылі гэтае дрэва дзявочым талісманам. І калі маці зламвала верх дрэва, гэта рыхтавала выхад духу з гэтага дрэва-пакравіцеля дзяўчыны, каб ён змог пасля пераляцець у дрэва, што расце побач з домам, у якім будзе жыць ужо замужняя жанчына.

Перад характарыстыкай памяншальна-ласкальных суфіксаў неабходна ўзгадаць катэгорыю суб'ектыўнай ацэнкі, якая разглядалася ўжо ў «Расійскай граматыцы» М.В. Ламаносава ў межах назоўнікаў і прыметнікаў, што мелі памяншальныя або павелічальныя суфіксы. Катэгорыя суб'ектыўнай ацэнкі разумеецца як індывідуальнае меркаванне пра які-небудзь прадмет, яго прыметы і якасці, а таксама станоўчыя або адмоўныя адносіны да таго, пра што ці пра каго мы вядзём размову. Суб'ектыўная ацэнка, такім чынам, з'яўляецца вынікам мысленчай і псіхічнай дзейнасці чалавека.

Ацэначныя адценні памяншальнасці, ласкальнасці, уласцівыя шматлікім назоўнікам, якія часта сустракаюцца ў мове беларускіх народных песень пра каханне, звычайна залежаць ад таго, хто стварае песенны тэкст. Суфіксы, пры дапамозе якіх найменні набываюць такія адценні, у мовазнаўстве прынята называць суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі [2, с. 83]. Назоўнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі не толькі называюць прадмет, але і выражаюць станоўчыя або адмоўныя адносіны да яго таго, хто спявае, з'яўляюцца сродкам эфектыўнага ўздзеяння на слухача. Адзначым, што ў песнях пра каханне большасць назоўнікаў, якія ў сваім складзе маюць суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі, перадаюць адносіны пяшчоты і замілавання: *Ой, у полі* ***ліпінушка****, пад ёю вада, / Бедна мая* ***галованька****, што долі няма* [1, с. 143]; *Адна* ***Ганулька*** *зблудзіла / І свой* ***вяночак*** *згубіла* [1, с. 202]; *Закувала* ***зязюлька*** */* ***У*** *вішнёвым* ***садочку****, / Ой, баліць, баліць маё* ***сэрданька*** */* ***Па*** *маім* ***галубочку*** [1, с. 271]; *Цяжка* ***рыбцы без вадзіцы****, / Так мне, беднай* ***маладзіцы****. / Цяжка* ***рыбцы на пясочку****, / Так мне, беднай,* ***без дружочка*** [1, с. 306].

Сярод памяншальна-ласкальных суфіксаў у тэкстах беларускіх народных песень пра каханне найбольш ужывальныя наступныя:

– суфікс -аньк-: *– Ты, дзяўчына, скажы, / Не утоівай, / Скажы* ***праўданьку*** *ўсю, / Дзе ўзяла красу?* [1, с. 47]; *Я не малявана, / Такая ўжо з роду, / Што ў майго* ***татанькі*** */ Добрая выгода* [1, с. 50]; *Ты,* ***рэчанька****, ты, быстрая, / Чаго замучона?* [1, с. 52]; *Там* ***дзяўчынанька*** *воду брала, /* ***Дзяўчынанька*** *малада* [1, с. 60]; *Пытаецца казак ў дзеўкі, / Скуль* ***дарожанька*** *ідзе* [1, с. 64]; *Спадабалася* ***над крынічанькай*** *– / Руса каса, сіні вочы, / Бела* ***лічанька*** [1, с. 70]; *І туды гара, і сюды гара, /* ***Паміж*** *тымі* ***горанькамі*** *– / Ясная гара* [1, с. 70]; *Ой,* ***матанька****, што рабіць?* [1, с. 103];

– суфікс -эньк- (-еньк-): – *Ах,* ***Ясенька***, ***Ясенька***, */ Чаму ты не жэнішся?* [1, с. 60]; *Любіў* ***казачэнька*** */ Харошу дзяўчынку, / Хацеў яе ўзяці, – / Не давала маці* [1, с. 404]; – *Казачэ, саколе, / Трэба гэта знаці, / Да свайго* ***сардэнька*** */ Другое шукаці* [1, с. 404]; ***Варажэнькі*** *кажуць, чаму я не плачу, / Выйду на вуліцу, сцежачкі не бачу* [1, с. 409]; *Ад'язджае мой* ***міленькі***, *ад'язджае, / Не пры кім мяне, малоду, пакідае* [1, с. 411]; – *Дзяўчына мая, / Напой мне каня / З тое да з тое, з тое* ***крынічэнькі***, */ Да з поўнага вядра!* [1, с. 69]; *Буду табе праўду я тады казаці, / Як маю* ***ручэньку*** *ды з тваёю звяжуць* [1, с. 87];

– суфікс -к-: ***Пташкі-салавейкі*** *жалосне паюць, / Нам з табою, мой Ясю, разлуку даюць* [1, с. 405]; ***Сярод ночкі***, *як прачнуся, прыхінуся, / А назаўтра чуць святочак наплачуся* [1, с. 411]; *Набіў мяне* ***татка*** *ды шаўковай* ***пужкай*** [1, с. 49]; *Толькі выплыві* ***к*** *майму* ***бережку*** */ Ты, маё каханне* [1, с. 53]; *Казак каня вядзе, / Пытаецца* ***ў дзяўчынкі:*** */ – Дзе* ***дарожка*** *ідзе* [1, с. 60]; ***На ганачку*** *стаяла, / Бровачкамі маргала* [1, с. 74];

– суфікс -ц-: *Ці не едзе мой Іванка / На коніку вараненькім, /* ***На сядзельцы*** *залаценькім?* [1, с. 56]; – *Як буду я твая, / Напаю каня. / Коніка* ***з вядзерца***, *міленькага з сэрца, / Як буду я твая* [1, с. 65]; – *Я ішоў к табе расою, /* ***Па пожаньцы*** *над ракою* [1, с. 74]; *Эх, сяду, сяду* ***у акен(ы)ца*** [1, с. 75]; *Ходзіць Ясенька / Ды* ***скрай ваконца*** [1, с. 88]; *Ой, у полі* ***азерца***, *Там плавала* ***вядзерца*** [1, с. 121];

– суфікс -ок (-ак): – *Выйдзі, дзеўка,* ***на ганачак***, */ Дай каню вады, дай каню вады!* [1, с. 67]; *Травачка-муравачка, / Зялёненькі* ***лужок*** [1, с. 81]; *Я па табе скучыла, / Мой міленькі* ***дружок*** [1, с. 81]; *Пайзджай,* ***браток***, *да тае дзеўкі, / Каторая ждала* [1, с. 89];

– суфікс -ік (-ык): *Гай зялёны завывае, / Дзеўка* ***хлопчыка*** *чакае* [1, с. 54]; *Вочы яго ясны, / Бровы яго чорны, /* ***Лічыка*** *беленька* [1, с. 52]; *Каня варанога, /* ***Коніка*** *сядлае, / Сядло залатое / На яго ўскладае* [1, с. 55]; *Там арала дзяўчыначка /* ***Волікам*** *чарненькім* [1, с. 81];

– суфікс -ачк-: – *Пастой, пастой,* ***дзяўчыначка***, */ Дай каню вады* [1, с. 63]; *Пад'ехаў мазур / Пад матулін двор – / Стук, бразь* ***ў акеначка*** [1, с. 67];

– суфікс -оньк-: *Бадай твая* ***красонька*** */ Марна загінула* [1, с. 66]; *Аж там мая* ***дзяўчынонька*** */ Па ваду ішла* [1, с. 71];

– суфікс -очак- (-очк-): ***Пад*** *белым* ***шатрочкам*** *дзеўка стаяла* [1, с. 87]; *Ой, адзін* ***слядочак*** *– / Каня варанога, / А другі* ***слядочак*** *– Майго міленькога* [1, с. 407]; *Сярод ночкі, як прачнуся, прыхінуся, / А назаўтра чуць* ***святочак*** *наплачуся* [1, с. 411];

– суфікс -ушк-: – *Чым цябе лячыць,* ***дачушка***, */ І дзе цябе дзеці?* [1, с. 56]; ***Травушка-муравушка*** *– зялёны лужок* [1, с. 87]; ***Пра матушку*** *гавараць, / Гей, гей,* ***пра матушку*** *гавараць* [1, с. 130];

– суфікс -іц-: *Маладая дзяўчынанька /* ***Па вадзіцу*** *йшла* [1, с. 65]; *Пад белым шатрочкам дзеўка стаяла, / Русую* ***касіцу*** *сваю часала* [1, с. 88]; *Дачка твая не лагодна, / Пайду* ***да ўдавіцы*** [1, с. 97].

Прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі ў песенных тэкстах пра каханне наступныя суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі:

– суфікс -ейк-: *А дай божа вечар, да* ***сонейка*** *зыйдзе, / Можа, мой міленькі дай да мяне прыйдзе* [1, с. 87];

– суфікс -ул-: *Мне* ***матуля*** *прыказала, / Каб я з хлопцам не стаяла* [1, с. 67];

– суфікс -онк-: – *Красная* ***дзяўчонка***, */ Напой майго каня* [1, с. 72];

– суфікс -енк-: *А ў той калыбелі калышуцца дзеўкі, / Калышуцца дзеўкі, красныя* ***паненкі*** [1, с. 49];

– суфікс -чык: *Шчэ й* ***карэньчык*** *не ўскіпеў, / А ўжэ мілы прыляцеў* [1, с. 103];

– суфікс -ёчк-: *Ручкі* ***ў кішанёчку*** [1, с. 58];

– суфікс -етк-: – *Не едзь,* ***брацетка***, *не едзь, родненькі, / Бо туды не даедзеш* [1, с. 90];

– суфікс -ятк-: – *Не тапіся, маё* ***дзіцятка***, */ Бо ты душу загубіш* [1, с. 134].

Асобныя назоўнікі для абазначэння высокай ступені ласкальнасці або памяншальнасці ў тэкстах песень могуць ужывацца з двума суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі: *Сівенькі* ***галуб-ч-ык*** */ Сядзеў* ***на дуб-оч-к-у***, */ Кліча* ***галуб-оч-к-у*** [1, с. 54]; *Ой, пайду, пайду* ***па*** *тых* ***сцеж-ач-к-ах,*** */ Дзе я даўна хадзіла* [1, с. 58]; – *Ой,* ***рабін-ач-к-а***, */ Ты зялёная, / Ой, калі ж ты ўзышла, /*

Калі вырасла? [1, с. 411]; *Пайду* ***у сад-оч-ак****, вышчыпну* ***ліст-оч-ак****, / Вышчыпну* ***ліст-оч-ак****, накрыю слядочак* [1, с. 408]; *Гэтыя слядочкі / Буду прыкрываці. / З вішнёвага саду /* ***Пташ-ач-к-і*** *ганяці* [1, с. 409]; *Адлятае* ***сакол-іч-ак****, адлятае, / Пакідае сакаліну, пакідае* [1, с. 410].

Найменні з памяншальна-ласкальным значэннем прадстаўлены ў мове беларускіх народных песень пра каханне разнастайнымі лексіка-тэматычных групамі. Сярод адушаўлёных назоўнікаў можна вылучыць наступныя групы:

1) уласныя назвы асоб: *А павышай салаўя, /* ***Іванька*** *дамок строіць* [1, с. 188]; *Казаў мне* ***Ясенька*** */ Чакаць да васені* [1, с. 52]; *– Ці не едзе мой* ***Іванка****?* [1, с. 56]; *То* ***Мар'яначка*** *была, / То дзяўчыначка міла* [1, с. 73]; *Ці не пусціш* ***Ганулечку*** */ У сад пагуляць?* [1, с. 85]; *Ой, едзе, едзе* ***Іванка*** *п'яны. / – Адчыні,* ***Ганнулька****, я твой каханы* [1, с. 325];

2) назвы роднасці і сваяцтва: *А* ***ў мамачкі*** *жаласці нямнога, / Не зняла мяне з камушка бялога* [1, с. 51]; *– А* ***татачка****,* ***татачка****, нябога, / Знімі мяне з камушка з бялога* [1, с. 51]; *– Ой, не нойдзеш мне лякарства, /* ***Мамачка****, на свеце* [1, с. 56]; *– Не йдзі, не йдзі, мой* ***сыночак****, / Табе горай будзе* [1, с. 205]; *А ў каго ты,* ***дачушачка****, / Вочанькі ўкляпала?* [1, с. 134]; *Лепей мне* ***ў таткі****, чым мне з нялюбым / Увесь век жыць і гараваці* [1, с. 180]; ***Матулька з татулькам*** *няверна жывець* [1, с. 149]; ***Мамачка*** *старэнькая, /* ***Сястрыца*** *маленькая, /* ***Братцы*** *– пераспелачкі, / Ходзяць да дзевачкі* [1, с. 211];

3) назвы паводле полу і ўзросту: *Журылася ды красная* ***дзевачка****, / Хто давядзе дадому* [1, с. 83]; *Гэй, у лесе на дубочку / Калыхала* ***дзяўчынонька*** */ Сваю дочку* [1, с. 351]; *Казак ад'язджае, /* ***Дзяўчынанька*** *плача* [1, с. 363]; *Зялёны дубочак / На бок пахіліўся, / Малады* ***мальчышка****, / Аб чым зажурыўся?* [1, с. 209]; *А мая* ***дзяўчыначка*** *– / Бедна сіраціначка* [1, с. 211];

4) назвы паводле роду заняткаў або сацыяльнага становішча: *Наймай сабе* ***музычэнькаў*** */ Так, як наймала* [1, с. 71]; *Ой, цяжанька* ***сіротаньцы*** */ Ў чужых людзях жыці* [1, с. 138]; *Да хто любіць далёкую, / А я* ***суседачку*** [1, с. 158]; *А наверна* ***дружок****, /* ***Палюбоўнічак*** [1, с. 217]; *Ой, да не пакіну я /* ***Удовачку*** *любіці* [1, с. 232]; *Што за міленькі* ***дружочак****, – / Калі прыйдзе, калі не* [1, с. 123]; *Паб'юць цябе,* ***разлучнічку****, / Дзявоцкія слёзы* [1, с. 297]; *Любіў* ***казачэнька*** */ Харошу дзяўчынку* [1, с. 404]; ***Музычэнька*** *йграе, / Вочкамі маргае* [1, с. 81];

5) назвы птушак: *Эй, кукавала* ***зязюленька*** */ У садзе на памосце* [1, с. 96]; *Там* ***салавейка*** *шчабятаў* [1, с. 90]; *Адлятае* ***саколічак****, адлятае* [1, с. 410]; ***Пташкі-салавейкі*** *жалосне паюць* [1, с. 405];

6) назвы жывёл, рыб: *А ні мяне вална збіла, / Ні* ***рыбка*** *змуціла* [1, с. 52]; *Гой, гой, / Едзе міленькі мой / На шэрым* ***канёчку*** [1, с. 58]; *Не салёну* ***рыбку*** */ Вячэраць давала* [1, с. 102]; *Разлучыла нас з табою, / Як* ***рыбаньку*** *з вадою, / Белу* ***рыбку*** *з* ***акуньцамі****, / Мяне, младу, з маладцамі* [1, с. 307]; ***Конічак*** *спужаецца, / Мой міленькі звaліцца* [1, с. 282].

Неадушаўлёныя назоўнікі, якія маюць памяншальна-ласкальнае значэнне, прадстаўлены наступнымі групамі:

1) дрэвы, расліны і іх часткі: ***За*** *густымі* ***лозанькамі*** */ Плача дзеўча слёзанькамі* [1, с. 136]; *Ой, вырасла* ***бярозачка****, / Дзе яе садзіла* [1, с. 132]; *Захацела ў садзе спаці / Там* ***пад яблынькамі*** [1, с. 116]; *Ой, тонка, тонка* ***сасонка*** [1, с. 93]; *Ой,* ***елачка****,* ***елачка****, чом ты зелена?* [1, с. 148]; *А белая* ***бярозачка*** */ Раненька ўзбудзіць* [1, с. 63]; *Прапалола дзеўка* ***васілёчкі*** */ Да й ажыдала казачэнька з поля* [1, с. 73]; *Прахадзіла ўсю цёмну ночку, / Прыблудзіла* ***к*** *зялёнаму* ***дубочку*** [1, с. 74]; *Ой, там у саду, саду-садочку / Там расцвітаюць розныя* ***цвяточкі*** [1, с. 109]; *Пайду ў лясок, пайду ў лясок, / Дзе* ***ліпаньку*** *чэшуць* [1, с. 120]; *А за ліхімі марозамі /* ***Рутачка*** *не ўсходзіць* [1, с. 111]; *Там мая дзяўчынанька / Ды й* ***пшанічку*** *поле* [1, с. 103]; *Пасею я* ***канапелькі****, / З густа зеляненькі* [1, с. 121]; *Я па табе,* ***травачка****, / Не нахаджуся* [1, с. 82]; *Ходзіць жа, гуляе па маім саду, / Крышыць жа, ламае* ***вішаньку*** *маю* [1, с. 87]; *Яе лічка, як* ***бруснічка****, / А сама малада, як ягада* [1, с. 291]; *Вытаптаў сцежачку / Цераз* ***фасольку*** [1, с. 227]; *А сяду я, малада, /* ***У*** *арэхавым* ***кусціку*** [1, с. 282]; *У полі* ***дубочак****, / На вярху* ***жалудочак*** [1, с. 293];

2) з'явы прыроды і нябесныя целы: *Да ўжо* ***сонейка*** *заходзіць, / Дзеўка з бору не выходзіць, / Не нясе грыбоў* [1, с. 54]; *Зыдзі,* ***месячык****, зыдзі, ясненькі, / Як млынава кола* [1, с. 167]; *Скацілася ды ясная* ***зорачка*** */ Ды ўпала да долу* [1, с. 83]; ***Соўнейка*** *ўзыдзе,* ***ветрык*** *павіне, / Ападзе ж яна ўся* [1, с. 285]; *А як выпаў* ***сняжочак*** *бяленькі, / Начаваў у нас казак маладзенькі* [1, с. 347];

3) поры года і адрэзкі часу: ***У*** *няшчасну* ***гадзіначку*** */ На святок пусціла* [1, с. 140]; ***У нядзельку*** *раненька на зары / Шчабятала ластаўка на моры* [1, с. 50]; ***Ночка*** *цёмна, рэчка быстра, кладка не мошчана* [1, с. 53]; *Не бачыла міленькага / Ўжо другі* ***дзянёчак*** [1, с. 117]; *Я думала, маладзенька, / Што* ***нядзелек*** *сорак* [1, с. 117]; *Ах ты,* ***зімачка-****зіма* [1, с. 82]; *Жалка, жалка* ***вечарочка****, / Што я была дома* [1, с. 271];

4) прадметы рэчаіснасці: *Ляці,* ***мой лісточак****, / Ляці на Ўкраіну, / І ўпадзі,* ***лісточак****, / Міламу ў пярыну* [2, с. 380]; *Штобы міла не заснула, /* ***Вароцечак*** *не замкнула* [1, с. 188]; *Мілы* ***за вядзерка****, / А я за другое* [1, с. 50]; *Грыба краснага схваціла / Ды* ***ў карзінку*** *палажыла* [1, с. 182]; *Трэці стаіць* ***пад аконцам****, / "Добры вечар" кажа* [1, с. 97]; *А на возеры ды на сіненькім / Рыбак рыбку ловіць, / Яго* ***чаўночак*** *белакрыленькі / Па вадзіцы бродзіць* [1, с. 52]; *– А ўстань, устань, мілая, дай прачніся, / На маю* ***калясачку*** *падзівіся* [1, с. 94]; *Да мая* ***калясачка*** *залатая, / Дай мая* ***падушачка*** *пухавая* [1, с. 95]; *Без дроў, без дроў,* ***без лучыначкі*** */ Не адну ночку начую* [1, с. 58]; ***Свечанька*** *гарыць, / Матуля не спіць* [1, с. 88]; *Едуць, едуць мазурочкі, / Вязуць, вязуць два* ***вяночкі*** [1, с. 67]; *Мусіў каня ўняці, /* ***Сярпочак*** *скаваці* [1, с. 114]; *Хлопец тое* ***вядзерца*** *дастане, / Ён з табою на ручніку стане* [1, с. 81]; *Ці на том* ***на зеркальцы****, / Што я ўглядалася* [1, с. 82]; *Там, у каморы, пад дзверачкамі, / Стаіць* ***пасцелька з падушачкамі*** [1, с. 252];

5) абстрактныя паняцці: *Падай, мілы,* ***галасочак****!* [1, с. 95]; *Сама бо ты, дзевачка, /* ***Славачку*** *даходзіш* [1, с. 112]; *Як на мяне, маладую, /* ***Няславанька*** *выйшла* [1, с. 116]; ***Нядолечка*** *да* ***няшчасцечка*** *– / Ніхто праўды не скажа* [1, с. 134]; *Няхай са мной мілы ляжа, / Мне ўсю* ***праўданьку*** *раскажа* [1, с. 150]; *Як зайдземся да парачкі, / Люба наша* ***размованька*** [1, с. 159]; *Дай* ***волечку*** *мне, да мне, маладой, / Дык помніці буду* [1, с. 127]; *Дзе ж мая* ***красотачка*** */ Падзявалася* [1, с. 82]; *Мілы да другой ідзе, / Сабе* ***песеньку*** *пяе* [1, с. 279]; *Апусціліся ручанькі /* ***Ад*** *цяжкай* ***работанькі*** [1, с. 296];

6) назвы частак цела чалавека: *Яшчэ мае* ***вочкі*** */ Любосці не знаюць* [1, с. 50]; *Там Таццяна жыта жала, /* ***Ў*** *правай* ***ручцы*** *серп дзяржала* [1, с. 56]; *Адлягла боль* ***ад галоўкі****, / Сэрцу лепей стала* [1, с. 57]; *– Рада б пастаяць, / Каню вады даць, / Мае босенькія* ***ножкі****, – / Сцюдзёна стаяць* [1, с. 61]; *Адзін ў адну* ***шчочку*** *цалуе, / А другі – ў другую* [1, с. 79]; *– Ой, чарую* ***ручкі****,* ***ножкі****, / Аленькія* ***шчочкі****, / Штоб не бегаў да другея / Цёмненькаю ночкай* [1, с. 100]; *Разарвіце маё* ***сэрданька*** */ Ды на дзве палавіне* [1, с. 79]; *Румяныя* ***губкі*** */ Хоць раз пацалуе?* [1, с. 215]; ***Броўкі*** *ажынаю, /* ***Шчочкі*** *малінаю* [1, с. 302];

7) назвы навакольных паселішчаў, гарадоў, краін: *Ах, мой міленькі,* ***з Украіненькі*** */ Вярніся дадому* [1, с. 319];

8) назвы навакольных прыродных аб'ектаў: *– Пашла* ***да гаёчку*** *збіраці грыбочкаў* [1, с. 187]; *Я* ***на*** *белым* ***камушку*** *сядзела, / Я* ***ў*** *крутыя* ***бераж кі*** *глядзела* [1, с. 50]; ***З-пад*** *белага* ***камушыка*** */ Вадзіца бяжала* [1, с. 55]; ***На дарожку*** *паглядала* [1, с. 56]; *Абляцела ўсю Украіну / І цёмны* ***лясочак*** */ І пачула міленькага / Ціхі галасочак* [1, с. 57]; *Чаму ж ты не поўная, /* ***З бераж ком*** *не роўная?* [1, с. 59]; *І туды гара, і сюды гара, /* ***Паміж*** *тымі* ***горанькамі*** *– / Ясная зара* [1, с. 69]; *Мала пташачка, невялічкая / Да* ***па ельнічку*** *скача* [1, с. 119]; *Я й палячу, малада, / У чыстае* ***полечка*** [1, с. 282];

9) назвы водных аб'ектаў: *Ў полі пад калінай, / Што* ***ля ручаёчка****, / Прасядзім мы доўга, / Да рання ўсю ночку* [1, с. 85]; *Ой,* ***рэчанька****,* ***рэчанька****, / Чаму ж ты не поўная?* [1, с. 59]; *Хаджу, хаджу па балоту – /* ***Балоцейка*** *суха* [1, с. 133]; *Там дарожка ідзе, / Дзе крыніца стаіць, /* ***На*** *той жа* ***крынічаньцы*** */ Усё войска ляжыць* [1, с. 60];

10) назвы прадуктаў харчавання: *Пойдзем прынясема /* ***Вадзічкі*** *абое* [1, с. 50]; *Ой, выпіла* ***чарачку*** *для прыметы, / А майго мілага дома нету* [1, с. 94]; *Драмліва поле, драмліва, / А* ***на ягадкі*** *ўрадліва* [1, с. 110]; *Ой, коцяцца два* ***яблычкі****, / Абодва садавыя* [1, с. 79]; *Адзін любіць, мёд-віно носіць, / А другі* ***гарэлачку*** [1, с. 79]; *Напілася я* ***мядочку*** [1, с. 327];

11) назвы атрутных рэчываў: *Бо я ў цябе, маладое, /* ***Атрутанькі*** *наеўся* [1, с. 107]; *– Ой, хто ж бо мне* ***зеллейка*** *дастане, / Ой, хто ж бо мне, ой, хто ж бо мне* ***зеллейка*** *дастане* [1, с. 107];

12) назвы музычных інструментаў: *Як* ***скрыпачка*** *зайграе, / То ўсё гора пазнае* [1, с. 148]; *Мусіў казак для дзяўчыны /* ***Цымбалачкі*** *наняць* [1, с. 115]; *За рэчкаю да за быстраю /* ***У цымбалікі*** *б'юць* [1, с. 243];

13) назвы адзення, абутку: *На ім **шапачка** ражкамі, / Галоўка з кудрамі* [1, с. 55]; *І застанеш, міленькі, мяне не сплючы, / Застанеш **кашулечку** табе шыючы* [1, с. 88]; *А то я шаўца люблю, / **У чаравічках** хаджу* [1, с. 75]; *Што ў дзяўчыны у каморы / **Чабаткоў** забываеш* [1, с. 107]; *Адзін любіць **хусткі** дарыць, / А другі **сукеначку*** [1, с. 79]; *Не жаль жа мне тых **боцікаў**, / Што я патаптаў, да гэй!* [1, с. 246];

14) назвы ўпрыгожванняў: ***Персцянёчкаў** не мяняла, / Шчырай праўды не казала* [1, с. 128];

15) назвы зброі: *Пайду я, пайду – / **Стрэльбачку** вазьму* [1, с. 253].

Акрамя ўласна назоўнікаў, у тэкстах беларускіх народных песень пра каханне прадуктыўнымі з'яўляюцца субстантываваныя найменні прыметнікавага паходжання: *Цяжка, цяжка каменне каціці, / Яшчэ цяжэй **за старэнькім** жыці* [1, с. 176]; *Ты ж, мой **міленькі**, галубчык сівенькі, / Не па праўдзе жывеш* [1, с. 285]; *Едзе мой **міленькі** / Ды й на сівым коню* [1, с. 55]. Памяншальна-ласкальным значэннем часта валодаюць эпітэты-прыметнікі і прыслоўі, а ў адзінкавых выпадках нават дзеепрыметнікі: *А ў **чысценькім** полі стаяла бяроза* [1, с. 49]; *А на возеры ды на **сіненькім** / Рыбак рыбку ловіць, / Яго чаўночак **белакрыленькі** / Па вадзіцы бродзіць* [1, с. 52]; *Каб я малада, / **Маладзюсенька** / Скора замуж выйшла* [1, с. 99]; *Як загудзе **галасненька**, – / Майму сэрцу **трудненька*** [1, с. 269]; *У нядзельку **раненька** на зары / Шчабятала ластаўка на моры* [1, с. 50]; *Яго платочак **вышыванекі**, / Сярод мора плывець* [1, с. 292].

Такім чынам, фальклор мае вялікі фактычны матэрыял, яшчэ не раскрыты ў многіх аспектах мовазнаўства. Плённы зварот да яго адкрывае шырокі прастор для новых лінгвістычных даследаванняў.

Літаратура

1. Песні пра каханне / пад рэд. А.С. Фядосіка, Г.І. Цітовіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.

2. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія : вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч [і інш.] ; пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мінск : Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 01.09.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

*УДК 821.161.3-31*А.Бароўскі*

Вобразы чараўнікоў, міфалагічныя ўяўленні пра вужа і гадзюку ў аповесцях Анатоля Бароўскага «Вужык», «Сцеражыся майго гневу»

С.Б. Цыбакова

Даследуецца спецыфіка адлюстравання ў аповесцях «Вужык», «Сцеражыся майго гневу» Анатоля Бароўскага вераванняў пра людзей, якія ў палескай народнай дэманалогіі з'яўляюцца носьбітамі звышнатуральных здольнасцей і магічных ведаў. Вызначаецца, што персанажы твораў Міхась і Нікадым адпавядаюць у значнай ступені народным уяўленням пра знахароў, якія дапамагаюць людзям. Аналізуюцца пераасэнсаваныя пісьменнікам міфалагічныя ўяўленні пра вужа, гадзюку, ўвасабленне ў супрацьпастаўленні гэтых хтанічных істот бінарнай апазіцыі дабро/зло.
Ключавыя словы: траўнік, чараўнік, знахар, Чарадзей, звышнатуральныя здольнасці, міфалагічныя ўяўленні, вуж, гадзюка.

The stories «A Little Grass-Snake» and «Watch out for my Anger» by Anatoly Borovsky are considered. The specificity of the reflection of beliefs about people who in the Polissya folk demonology are carriers of supernatural abilities and magical knowledge is investigated. It is determined that such the characters in the works as Michael and Nicodemus correspond to a large extent to popular ideas about healers that help people. The author's interpretation of mythological ideas about grass-snakes and asps, as well as a picture of the contrast of these chthonian creatures of the binary opposition of the good and evil are analyzed.
Keywords: herbalist, magician, quack, Fascinator, supernatural power, mythological ideas, grass-snake, asp.

У аповесцях «Вужык» і «Сцеражыся майго гневу» Анатоль Бароўскі адлюстраваў асаблівасці светапогляду, рэлігійна-магічныя ўяўленні беларусаў-палешукоў, жыхароў Мазырскага краю, сваёй малой радзімы. Найбольш загадкавымі ў творах з'яўляюцца вобразы людзей са звышнатуральнымі здольнасцямі – дзядуляў Міхася і Нікадыма, названых пісьменнікам чараўнікамі. У аповесцях знайшлі адлюстраванне беларускія народныя вераванні пра вужа і гадзюку. Мэта артыкула – выяўленне спецыфікі вобразаў дзеда Міхася («Вужык») і дзеда Нікадыма («Сцеражыся майго гневу»), вызначэнне асаблівасцей ідэйна-мастацкага пераасэнсавання аўтарам аповесцей нацыянальных міфалагічных уяўленняў, звязаных з хтанічнымі істотамі – анімалістычнымі персанажамі твораў.

Чараўнікі і знахары займаюць адметнае месца ў сістэме дэманалагічных вераванняў беларусаў. У этнографаў не існуе адзінай думкі наконт размежавання характарыстык і функцый вышэйзгаданых персанажаў, іх дакладнага з навукова-тэарэтычнага пункту гледжання тэрміналагічнага азначэння. Так, аналізуючы семантыку персанажа са звышнатуральнымі здольнасцямі, звязанага з нячыстай сілай, Л.М. Вінаградава сярод яго шматлікіх палескіх назваў вылучае «*чародéй, чаровни́к*» [1, с. 257]. «Цяжкасці ў апісанні персанажаў, якія адносяцца да катэгорыі калдуноў і знахароў, звязаныя з тым, што ў мясцовай традыцыі тэрміналагічна не адрозніваюцца два класы паўдэманічных істот: **калдун** (чалавек, які выкарыстоўвае сваё веданне пераважна ў шкоднасных мэтах) і **знахар** (чалавек, які выкарыстоўвае сваё звышведанне пераважна ў мэтах дапамогі аднавяскоўцам). Для абодвух персанажных тыпаў у Палессі ў роўнай ступені характэрныя назвы і *калду́н*, і *зна́хор*», – заўважае даследчыца [1, с. 257]. У. Лобач і С. Санько лічаць, што знахар, «паводле народных уяўленняў – чалавек, надзелены звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі, якія ў адрозненне ад *чараўніка* выкарыстоўвае для дапамогі людзям» [2, с. 192]. У.І. Коваль выказвае наступнае разуменне сутнасці знахара: «У народнай свядомасці знахар (чалавек, які валодае таемнымі ведамі) прынцыпова адрозніваецца ад вядзьмарак і ведзьмакоў сваім добразычлівым стаўленнем да людзей і сувяззю з хрысціянскай рэлігіяй» [3, с. 163]. Паводле назіранняў, вопыту этнаграфічнай дзейнасці А.К. Сержпутоўскага, чараўнікі поруч з ведзьмамі і калдунамі, згодна з міфалагічнымі уяўленнямі беларусаў-палешукоў, – гэта «людзі-духі» [4,

с. 406], якія робяць зло, уяўляючы сабой шкаданосныя істоты, звязаныя з нячыстай сілай. У зборніку «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» А.К. Сержпутоўскі, напрыклад, прыводзіць наступнае народнае вераванне: «Ведзьмы й чараўнікі псуюць у кароў малако, адбіраюць яго сабе» [4, с. 417]. Таксама беларускі этнограф прыводзіць тэкст пад нумарам 2174, адзін са шкаданосных персанажаў якога знахор: «Каб зрабіць суседу ці каму-небудзь ліхо, знахор ці ведзьма скідае з сябе адзежу й голым ідзе ў поле <…>» [4, с. 416]. «Даволі часта атрымлівалася так, што ў разуменні нашых продкаў знахарства асацыіравалася і са… шкодніцкай магіяй», – сцвярджае А.М. Ненадавец [5, с. 254]. У. Ганчар вылучае тып палескіх знахароў, якія нібыта атрымлівалі свае здольнасці ад нячыстай сілы, згодна з пашыраным меркаваннем, надзяляліся здольнасцю ўплываць на навакольны свет у станоўчым і адмоўным кірунку <…> [6, с. 203]. У «Руска-беларускім слоўніку», дапоўненым выданні слоўніка, апублікаванага ў 1953 г. пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы і П. Глебкі і перавыдадзенага ў 1982 і 1991 гг., адзін з перакладаў слова «знахарь» на беларускую мову: «чараўнік» [7, с. 531].

Літаратурныя персанажы – чараўнікі Міхась і Нікадым – увасобілі ў сабе пераважна народныя ўяўленні пра знахароў, якія пакліканы небам дапамагаць людзям. Дзед Міхась і дзед Нікадым вераць у Бога і сілу хрысціянскай малітвы, валодаюць магічнымі ведамі, свае звышнатуральныя здольнасці выкарыстоўваючы выключна дзеля дабрыні. Вылучаючы знахароў, якія дапамагаюць людзям у адрозненне ад «знахароў-шкоднікаў», Л.М. Вінаградава адзначае, што «знахар-памочнік» «нейтралізуе псоту, вылечвае людзей і хатнюю жывёлу, вяртае жывёлін, якія зніклі, абясшкоджвае “завітку”, распазнае віноўніка бедстваў альбо прычыну гаспадарчага заняпаду» [8, с. 411–412]. У аповесці «Сцеражыся майго гневу» Анатоль Бароўскі згадвае пра Нікадымавыя «абразы Божай Маці з маленькім Ісусам Хрыстом» [9, с. 215], якія калісьці пасеклі зласліўцы. Ствараючы вобразы людзей, звязаных з паралельным светам, пісьменнік называе Міхася і Нікадыма чараўнікамі. Таксама ў тэксце аповесці «Вужык» лячэбная практыка дзеда Міхася вызначаецца як «знахарства-лячоба» [10, с. 39]. Падзеі, адлюстраваныя ў творы, адбываюцца ў вёсцы Крушнікі, што на Мазыршчыне ў перыяд афіцыйнага панавання атэізму, калі знахарства лічылася шарлатанствам. Анатоль Бароўскі выказвае адно з народных меркаванняў адносна негатыўнага стаўлення прадстаўнікоў савецкай ўлады і прафесійнай медыцыны да знахарства: «Урачы, мусіць баяліся, што дзед Міхась адбярэ ад іх хлеб і падарве аўтарытэт савецкай, самай перадавой медыцыны ў свеце…» [10, с. 40].

Апісанне кампанентаў знахарскай практыкі Міхася і Нікадыма не выходзіць за межы светапогляднай сістэмы, характэрнай для традыцыйнай народнай культуры. У вобразах персанажаў аўтарам твораў падкрэсліваюцца такія рысы, як суладдзе з прыродай, веданне таямніц флоры і жывёльнага свету роднага краю, уменне прымяняць карысныя для чалавека адвары і настоі з зёлак. Анатоль Бароўскі апісвае, як дзед Нікадым і Міхаська, яго ўнук, гатавалі ў чыгунках адвары і настоі з зёлак, «расклаўшы агонь каля самага ўзболатка, куды ніхто не мог дабрацца і перашкодзіць рабіць тую працу, якая доўжыла ім жыццё, давала сілы…» [9, с. 213]. Калі знахар «выкарыстоўваў для лекавання сілу траў або адвары і настоі, яго называлі “траўнікам” <…>» [11, с. 245]. У лячэнні жаночага бясплоддзя Нікадым ужываў узятую ў жыхаркі сваёй хаты атруту: «…дабаўляў кропельку яе ў адвар з сямнаццаці зёлак. Гэты сакрэт трымаў дзед у тайне <…> » [9, с. 214]. Стары Міхась валодае таямнічым дарам вылечваць ад розных хваробаў людзей і хатніх жывёл, ведае месцазнаходжанне кароў, «якія адбіліся ад статка і намерыліся начаваць у лясных нетрысках» [10, с. 39]. Ён паспяхова лечыць людзей, якім не змаглі дапамагчы і ў «самых лепшых клініках і інстытутах» [10, с. 40]. Так, дзед Міхась выратоўвае дзяўчынку, якая «не магла хадзіць – адняліся ногі» [10, с. 39]. Аўтар твора адзначае, што дзед «нешта шаптаў над яе галавой» [10, с. 39]. Аналагічны выпадак адлюстраваны ў аповесці «Сцеражыся майго гневу»: жыхар глухога паляшуцкага лесу Нікадым вылечвае дачку жанчыны, усе намаганні якой знайсці сродкі вылячэння хворага дзіцяці ў прафесійных медыкаў заставаліся безвыніковымі: «Цэлы свет аб’ездзіла – нідзе не далі рады» [9, с. 211]. Дзякуючы чараўніку, пачынае зноў хадзіць адна з гераінь аповесці «Сцеражыся майго гневу» Мальвіна, маці персанажа твора Вінцука Уюнова. У яе

таксама адняліся ногі пасля ўбачаных злавесных дзеянняў вядзьмаркі Макушыхі, якая «стоячы ззаду, бы грак, махала рукамі» [9, с. 177], «наводзіла на яе сурок, бяду» [9, с. 177]. Згодна з успамінамі Вінцука, яго маці «рэзка тады азірнулася, адчуўшы, як па спіне прайшоўся колкі халадок, і тая не паспела нават апусціць рукі – так і засталася з паднятымі. А потым ужо рэзка апусціла, сагнулася, і нішком пашкандыбала прэч…» [9, с. 177].

Пісьменнік паказвае адухоўленасць чараўнікоў, іх абыякавасць да каштоўнасцей, якія спакон вякоў з'яўляюцца прадметамі чалавечага культу. Нікадым здаваўся людзям дзіваком, а ён, у сваю чаргу, «не мог уцяміць, як можна жыць пад прымусам Сатаны, падпарадкоўвацца начальнікам і абставінам, мітусіцца ў чалавечым мурашніку <…>» [9, с. 209]. Чараўнік не перашкаджае свайму ўнуку, які знайшоў скарб з золата і брыльянтаў, закінуць гэтае зіхоткае багацце ў багну. Пазітыўная духоўнасць дзеда Міхася праяўляецца ў яго сумленнасці: «Адчуў, што з гадамі страціў сваю цудадзейную сілу як народны лекар, а падманваць людзей сваім бяссіллем не хацеў» [10, с. 40]. Чараўнікі дапамагаюць людзям амаль бескарысліва. Міхась дазваляе сабе прыняць ад тых, каго ён вылечыў, толькі «траячку», адказваючы, калі настойвалі на іншай плаце: « – То не я вылечыў, то Святая Тройца яго вылечыла… Адсюль і траячка» [10, с. 39]. У Нікадыма і зусім «ніколі не вадзіліся грошы» [9, с. 220], а «кольцы каўбасы і хлеб, што прыносілі людзі, так і ляжалі некранутымі на стале» [9, с. 214]. Знакавую функцыю выконвае ў адлюстраванні духоўнай адметнасці Нікадыма згадванне аб трох боханах, якімі частавалі дзеда падчас свята Багача, і гэты хлеб у хаце чараўніка на працягу года «быў як толькі што выпечаны» [9, с. 214].

Дзед Міхась вымушае выпаўзці з малінніка каля Гіблага балота велізарную гадзюку, якая ўджаліла пастушка Васілька, і абламаўшы змяі атрутны зуб, разадраўшы яе, абгортвае крывавым мясам рэптыліі нагу хлопчыка, якому не змаглі дапамагчы ў бальніцы. Загадкавым магізмам пранікнута знішчэнне чараўніком знятых праз трое сутак з соннага Васілька «шэрых "бінтоў"» [10, с. 41]: «Вынес потым усё на поплыў, і перад самым заходам сонца спаліў на раскладзеным агні. Попел прысыпаў зямлёй» [10, с. 41]. Адлюстраванне падпарадкаванасці гадзюкі дзеду Міхасю ў аповесці «Вужык» з'яўляецца міфапаэтычным кампанентам ідэйна-мастацкага зместу твора. Анатоль Бароўскі пераасэнсоўвае народныя павер'і пра Змяінага цара (Вужынага цара). Вуж Дабрусь, валадар вужынага падземнага царства, пачуўшы працяжны свіст чараўніка, загадвае вінаватай гадзюцы паўзці да дзеда. Дабрусь – сябар Васілька, які некалі выратаваў хлопчыка ад смяротнага гадзючынага ўкусу. Апісанне сяброўства вужа і чалавека ўтварае адзін з найбольш яркіх, глыбокіх па сэнсе і функцыянальна значных матываў аповесці «Вужык». Лясны паўзун рашуча і самаахвярна ўступае ў бой з вялізнай і тоўстай гадзюкай, перамагаючы яе. Анатоль Бароўскі перадае міфалагічныя ўяўленні пра знешні выгляд Цара вужоў, спецыфічнай рысай якога была залатая карона «…сканаў ад старасці вужыны Цар Акай. Старэйшыя вужы знялі з галавы царскую карону – з чыстага золата – і надзелі на галаву Вужыку-Тужыку. Назву яму новую далі – Дабрусь» [10, с. 55]. Пісьменнік адлюстроўвае ўласцівае міфалагічнай свядомасці беларусаў шанаванне вужа і негатыўныя адносіны да гадзюкі. А.М. Ненадавец адзначае: «Але ў беларускім фальклоры гадзюка так і не атрымала "царскі" трон, бо ён, паводле народнага ўяўлення, моцна ўтрымліваўся вужом» [12, с. 350]. Гадзюка ў аповесці паўстае злой і помслівай істотай, але яна знаходзіцца пад уладай Дабруся, падпарадкоўваецца законам вужынага царства. Аўтар аповесці паказвае суд над вінаватымі змеямі, іх бязлітаснае, але справядлівае пакаранне па загадзе Дабруся. У супрацьпастаўленні вужа і гадзюкі выяўляецца ў анімалістычным варыянце бінарная апазіцыя дабро/зло. Невыпадкова ў адным з эпізодаў аповесці «Сцеражыся майго гневу» юнаку Вінцуку замест гадзючай галавы бачыцца твар вядзьмаркі Аксаны Журавель. Дзяўчына ўступае ў хаўрус з нячыстым духам, звяртаецца да чорнай магіі, каб абудзіць у хлопца жарсць да сябе. З містычнага пункту гледжання, выражанаму ў аповесці, вялізная гадзюка, якая пагрозліва шыпела і ледзь не ўджаліла Вінцука, выконвае ролю злавеснага магічнага знака, пакінутага ведзьмай, каб выклікаць у ненавіснага каханага пачуццё страху. Вышэйзгаданы эпізод твора нагадвае пра міфалагічныя вераванні ў здольнасць вядзьмарак ператварацца ў розныя істоты. Л.М. Вінаградава вылучае змяю сярод іншых, даволі разнастайных «іпастасей» палескай

вядзьмаркі [13, с. 123]. Дабрусь надзяляецца пісьменнікам вялікай мудрасцю, здольнасцю прадбачання, справядлівасцю, пачуццём адказнасці за лёс сваіх суродзічаў. Беларускія народныя павер'і, звязаныя з хрысціянскім святам Уздвіжаннем, калі «"змеі ў вырай ідуць"» [12, с. 346], пераасэнсоўваюцца аўтарам аповесці ў значнай ступені з мэтай актуалізацыі экалагічнай праблематыкі. Герой твора Васіль Зубрыцкі, каб выратаваць лясных паўзуноў ад гібелі пад коламі машын, агароджвае бетонную дарогу, па якой перапаўзаюць вужы, аб'яднаныя Дабрусём, слупкамі з прымацаванымі на іх зробленымі сваімі рукамі новымі, прыдуманымі дарожнымі знакамі. Вадзіцелі, «дысцыплінаваныя кіроўцы» [10, с. 58], павінны ўбачыць напісанае на іх: «"Спадар вадзіцель! Увага! Тут вужы перапаўзаюць дарогу. Спыніся, перачакай, не губі жывую істоту – ты ж любіш, як і ўсе мы, жывую прыроду!"» [10, с. 58]. Анатоль Бароўскі заклікае да любові, спагады і павагі да прыроднага свету, выказваючы па сутнасці біяцэнтрычную пазіцыю.

У адлюстраванні надзвычайных уласцівасцей Нікадыма асобая роля належыць апісанню яго жылля. Дзедава хата знаходзіцца ў лесе, у густым ельніку, і каб дабрацца да яе, трэба прайсці праз балоты, па гразкіх сцежках. Аднак локус чараўніка вызначаецца не толькі аддаленасцю ад вёскі, але і магічнай недасягальнасцю для тых, каго гаспадар лясной хаты не жадаў бачыць. Нікадым мае здольнасці яснабачання і прадбачання, ён на адлегласці ведае людзей, якія ішлі да яго, не дазваляючы пранікнуць у сваю прастору носьбітам незамоленых грахоў і нядобрых памкненняў. Тыя, з кім чараўнік не жадаў сустракацца, блукалі па лесе, «не знаходзячы ніякай сцежкі ці дарогі» [9, с. 221]. Побач з чараўніком жывуць яго сябры: вуж Маўчун, гадзюка Царыца, чорны бусел Бацян, іншыя прадстаўнікі жывёльнага царства, пералічаныя па мянушках: Цыба, Шустрая, Клык, а таксама вавёркі, сарока Чака, якая «трывожна чахкала» [9, с. 214], калі ў «Нікадымавыя нетрыскі» [9, с. 214] кіраваўся нейкі чалавек. Да селішча дзеда прыходзяць лось і алянуха, воўк, ліса. І ўсе лясныя госці, пачуўшы сігнал трывогі, пададзены сарокай, «вярталіся на свае сцежкі і ў свае сховішчы – не жадалі сустракацца з людзьмі, паказвацца ім на вочы…» [9, с. 214]. Вуж адчувае фізічны і душэўны стан гаспадара хаты, бярэ сардэчны боль старога чараўніка на сябе, абуджаючы ў дзеда волю да жыцця. Маўчун, як і Нікадым, з'яўляецца адзінотнікам і дзіваком. Лясны паўзун баіцца дзедавай смерці, паколькі падпарадкоўваецца забароне вужынага цара і не можа вярнуцца да суродзічаў, якіх яму замяніў незвычайны чалавек. Вуж і гадзюка ў аповесці – персанажы-антаганісты. Маўчун і Царыца жывуць «асобна, у розных кутках хаты» [9, с. 214]. Дзед цалкам давярае вужу, які любіць запаўзаць на калені, плечы і хударлявую грудзіну чараўніка. Царыцу ж чараўнік бярэ ў рукі толькі, «калі трэба было пазычыць у яе атруты – для лячэння бясплоднай жанчыны» [9, с. 214]. Селішча Нікадыма ўяўляе сабой эзатэрычную мадэль гарманічнага суіснавання чалавека, раслінага і жывёльнага царстваў, раўнавагі сіл дабра і зла.

Пісьменнік акцэнтуе ўвагу на даўгалецці Нікадыма: дзедаў узрост налічваў «ці дзевяноста, ці ўжо даўно за сто лет» [9, с. 210]. Крыніца моцнай жыватворнай энергіі для чараўніка – лес, які мае рысы жывой істоты, разумнай і адушаўлёнай. Аўтар аповесці неаднаразова называе Нікадыма Чарадзеем [9, с. 214], што з'яўляецца водгукам уяўленняў пра чарадзейства, вытокі якога караняцца ў рэлігійна-магічнай свядомасці дахрысціянскай эпохі. Разглядаючы чарадзейства як больш старажытную ў параўнанні са знахарствам і вядзьмарствам форму магіі, В.С. Цітоў лічыць: «Маг-чарадзей выступаў як медыум (пасрэднік паміж духамі і людзьмі) і мог выкарыстоўваць свае неардынарныя здольнасці незалежна ад маральна-рэлігійных установак як на карысць, так і на зло людзям» [14, с. 230]. Аб духоўна-генетычнай сувязі з паганскімі святарамі, валхвамі, нагадвае белая, «бы воблакі ў небе» [9, с. 222] барада Чарадзея Нікадыма. Валхвы валодалі магічнымі ведамі, маглі «кіраваць аблокамі» [15, с. 190]. Белы колер выконвае ролю знака, які маркіруе пазітыўныя якасці персанажа – носьбіта звышнатуральных здольнасцей, яго душэўную чысціню і дабрату. І. Швед адзначае, што белы колер «увасабляе канцэпты святасці (адно са значэнняў ст.-інд. sveta – белы), чысціні (колеравы і светлавы сімвал нячыстага – чорны і цёмны), чалавечага ў процілегласць дэманічнаму» [16, с. 45]. Аўтарскае згадванне пра шаптанне дзеда Міхася над дзяўчынкай, у якой адналіся ногі ў аповесці «Вужык», дазваляе ўбачыць у вобразе персанажа прадстаўніка «валхвілій»: «у некаторых вёсках Веткаўскага р-на і

беларускіх вёсках памежнай Браншчыны тое самае, што і *знахары*» [17, с. 68]. «Характарызуючы іх дзеянні, у тых мясцінах “валхвіць” – па-дзеравенску – “шаптаць”. Самое вызначэнне валхвілій дае падставы меркаваць аб сувязі ўяўленняў пра іх з ведамі пра *валхвоў*», – лічыць Г. Лапацін [17, с. 68].

На думку дзеда Нікадыма, можна быць удзячным толькі Богу, «з Яго ласкі ўсё мае быць» [9, с. 223]. Адметная рыса персанажа-чараўніка – самаахвярнасць. Перадаючы аблытанаму вядзьмарскімі чарамі Вінцуку асабісты срэбны крыжык, ён раіць хлопцу чытаць малітву «Ойча наш» на роднай мове. У адпаведнасці з семантыкай колеравай апазіцыі белы/чорны Нікадым супрацьпастаўляецца вядзьмарцы Журавель, якая вырашыла згубіць Уюнова пры дапамозе чорнай сілы. Постаць дзеда-абаронцы ўзнікае падчас смяротнай для Вінцука небяспекі, у прывіднай рэчаіснасці, дзе валадарыць служка нячысціка. Аўтар аповесці ўзвышае вобраз чараўніка да ідэалу хрысціянскага падзвіжніка, нават да Ісуса Хрыста: «…ўсе хваробы, якія прыставалі да людзей, якія не мог ужо вылечыць Чараўнік, ён браў на сябе.

І нёс іх на сабе, як сын Божы, нёс крыж, ідучы на Галгофу…» [9, с. 255]. Божая сіла перамагае ў аповесці сілу д’ябальскую. Цуд, здзейснены Нікадымам, з’яўляецца апошнім у яго жыцці: Чарадзей памірае ў той жа дзень, калі загінула вядзьмарка.

Такім чынам, Анатоль Бароўскі адлюстраваў складанае спалучэнне ў народнай і ў сваёй свядомасці элементаў язычніцкага светаўспрымання, веры ў магію і хрысціянскія каштоўнасці. У вобразах дзядуляў Міхася і Нікадыма пісьменнік увасобіў шэраг уяўленняў пра знахароў, якія бескарысліва дапамагаюць людзям, калі яны трапляюць у бязвыхаднае становішча. Незвычайны дар персанажаў заключаецца перш за ўсё ў іх здольнасці вылечваць людзей ад розных хваробаў, просячы пры гэтым дазволу і дабраслаўлення ў Бога. Агульная рыса чараўнікоў, якія звязаныя з іншым вымярэннем сусвету, – здольнасць бачыць скрозь прастору часу, – магічнае пранікненне ў таямніцы навакольнага свету. Найбольш яскравым і выразным паўстае вобраз Нікадыма – носьбіта магічнай, чарадзейнай мудрасці і адначасова хрысціянскай самаахвярнасці, у характарыстыках, апісанні селішча якога прасочваецца духоўна-генетычная сувязь з валхвамі. У аповесцях знайшлі адлюстраванне нацыянальныя міфалагічныя ўяўленні пра вужа і гадзюку. Дзед Міхась паўстае ў якасці медыятара паміж зямным светам і вужыным царствам. Нікадым і вядзьмарка Журавель, вышэйзгаданыя хтанічныя істоты ў мастацкай сістэме твораў з’яўляюцца антаганістамі, увасабляючы бінарную апазіцыю дабро/зло. Гадзюкі ў аповесці «Вужык» асацыіруюцца са злом, вужы надзяляюцца пазітыўнымі якасцямі, дапамагаючы персанажам з надзвычайнымі здольнасцямі дабівацца сваёй мэты ў дапамозе людзям і паляпшэнні свету.

Літаратура

1. Виноградова, Л.Н. Колдун / Л.Н. Виноградова // Народная демонология Полесья: публикации текстов в записях 80–90-х гг. XX в. / Сост. Л.Н. Виноградова, Е.Е. Левкиевская. – 2-е изд. – М. : Издательский Дом ЯСК: Языки славянской культуры, 2017. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – С. 257–322.

2. Лобач, У. Знахар / У. Лобач, С. Санько // Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 192–193.

3. Коваль, В.И. Мифологические верования восточных славян : пособие / В.И. Коваль. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – 270 с.

4. Сержпутоўскі, А.К. Русальная нядзеля. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі ; склад., уступ. арт., пасляслоўе, навук. рэд., літ. апрац. У.К. Касько. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 478 с.

5. Ненадавец, А.М. Сілаю слова. Чорная і белая магія / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2002. – 350 с.: іл.

6. Ганчар, У. Замоўная традыцыя ў знахарстве беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст.: пераемнасць і змены / У. Ганчар // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навуковых прац / Рэд. калегія : Т.В. Валодзіна (гал. рэд.), Г.А. Барташэвіч, А.С. Ліс, В.М. Шарая, І.А. Швед. – Мінск : «Беларуская навука», 2016. – Вып. 3. – С. 198–217.

7. Русско-белорусский словарь: в 3-х т. : около 110 000 слов / АН Беларуси, Ин-т языкознания им. Я. Коласа. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : БелЭн, 1993. – Т. 1. А–Л. – 735 с.

8. Виноградова, Л.Н. Знахарь (шептун), знахарка (шептунья) / Л.Н. Виноградова // Народная демонология Полесья: публикации текстов в записях 80–90-х гг. XX в. / Сост. Л.Н. Виноградова, Е.Е. Левкиевская. – 2-е изд. – М. : Издательский Дом ЯСК: Языки славянской культуры, 2017. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – С. 411–436.

9. Бароўскі, А.М. Сцеражыся майго гневу / А.М. Бароўскі // Аповесці. Апавяданні. Нарысы. – Гомель : ОАО «Полеспечать», 2012. – С. 153–255.

10. Бароўскі, А.М. Вужык / А.М. Бароўскі // Аповесці. Апавяданні. Нарысы. – Гомель : ОАО «Полеспечать», 2012. – С. 5–61.

11. Дучыц, Л. Язычніцтва старажытных беларусаў / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск : Харвест, 2014. – 368 с.: іл. – (Неизвестная история).

12. Ненадавец, А.М. Нарысы беларускай міфалогіі / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 535 с.

13. Виноградова, Л.Н. Ведьма / Л.Н. Виноградова // Народная демонология Полесья: публикации текстов в записях 80–90-х гг. XX в. / Сост. Л.Н. Виноградова, Е.Е. Левкиевская. – 2-е изд. – М. : Издательский Дом ЯСК: Языки славянской культуры, 2017. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – С. 36–256.

14. Цітоў, В.С. Магія / В.С. Цітоў // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад рэд. В.С. Цітова ; маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 230.

15. Шапарова, Н.С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: Ок. 1000 ст. / Н.С. Шапарова. – М. : ООО «Издательство АСТ» : ООО «Издательство Астрель» : ООО «Русские словари», 2003. – С. 190–191.

16. Швед, І. Белы колер / І. Швед // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 44–46.

17. Лапацін, Г. Валхвіліі, ваўфіліі, ваўхвіліі / Г. Лапацін // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 68.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 30.08.2018

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3’42:821.161.3

Ідыястыль У. Караткевіча ў аспекце тэорый інтэртэкстуальнасці і прэцэдэнтнасці

Л.М. Шэцка

Артыкул прысвечаны даследаванню проза-паэтычнага ідыястылю У. Караткевіча ў аспекце інтэртэкстуальнасці і прэцэдэнтнасці. Характарызуюцца прэцэдэнтныя феномены і інтэртэкстэмы, апісваюцца асноўныя тыпы прэцэдэнтных феноменаў, уласцівых ідыястылю пісьменніка. Падаецца вывад пра разнастайнасць сродкаў выражэння прэцэдэнтнасці і інтэртэкстуальнасці як адной з асноўных прымет ідыястылю пісьменніка.
Ключавыя словы: ідыястыль, інтэртэкстуальнасць, інтэртэкстэма, прэцэдэнтнасць, прэцэдэнтныя феномены.

The article is the study of V. Korotkevich’s prose-poetic idiostyle in terms of intertextuality and precedence. Precedential phenomena and intertextemes are characterized; basic types of precedential phenomena are analyzed. It is concluded that intertextuality and precedence as a basic feature of a writer’s idiostyle is characterized by a variety of means of its expression.
Keywords: idiostyle, intertextuality, intertexteme, precedence, precedential, precedential phenomena.

Уводзіны. Праблема вызначэння істотных рыс катэгорыі ідыястылю адносна маладая. Акрамя таго, існуюць розныя тэрміналагічныя вызначэнні гэтай з’явы (параўн.: аўтарскі стыль, стылявая манера, індывідуальны стыль, ідыялект і інш.). Аднак погляды лінгвістаў на яе даволі падобныя. «Ідыястыль з’яўляецца адначасова і стылем мовы, і стылем маўлення, які дыферэнцыруецца на аснове структурных ці канструктыўных проціпастаўленняў і суадносін паміж прыватнымі сістэмамі выражэння» [1, с. 147]. В.У. Вінаградаў адзначаў, што стыль пісьменніка ўяўляе сабою сістэму індывідуальна-эстэтычнага выкарыстання сродкаў славеснага выражэння [2].

Такім чынам, ідыястыль уяўляе сабою сукупнасць лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў (творчая індывідуальнасць аўтара + сродкі яе выражэння).

У спалучэнні з паняццем ідыястылю разглядаецца праблема вывучэння дыялагічных адносін тэкстаў. Тэкст, асабліва мастацкі, не існуе ізалявана, а ўступае ў дыялог з іншымі тэкстамі, што прыводзіць да разгляду дыялогікі тэксту як бясконцай сэнсавай прасторы [3, с. 8], дзе неабходна ўлічваць мноства састаўных: вертыкальны кантэкст, фонавыя веды, агульны код і інш. [4, с. 340].

Сукупнасць тэкстаў аднаго аўтара, пазначаная як ідыястыль, фарміруе, такім чынам, «унутраную інтэртэкстуальнасць», у адносінах да якой «знешняй інтэртэкстуальнасцю» з’яўляецца ўзаемадзеянне тэкстаў аднаго аўтара з тэкстамі іншых аўтараў. Як унутраная, так і знешняя інтэртэкстуальнасць могуць быць сродкамі рэалізацыі міжкультурнага ўзаемадзеяння ў тэксце мастацкага твора.

Гэта спецыфічна выяўляецца ў поліжанравым (проза-паэтычным) ідыястылі У. Караткевіча.

Для абазначэння міжтэкставых дыялагічных адносін паралельна з тэрмінам «інтэртэкстуальнасць» выкарыстоўваюцца такія тэрміны, як «феномен прэцэдэнтнасці», «чужое слова», «звыштэкставыя сувязі», «міжтэкставая камунікацыя» і інш. Інтэртэкстуальнымі крыніцамі ў мастацкай літаратуры, дзякуючы глабальнасці камунікацыі, часцей за ўсё з’яўляюцца прэцэдэнтныя тэксты «як самадастатковы прадукт маўленча-разумовай дзейнасці» [5, с. 33].

Сучасныя напрамкі лінгвістычных даследаванняў інтэртэкстуальнасці фарміруюцца вакол трох асноўных праблем: крыніца «чужога тэксту», спосаб яго ўключэння ў аўтарскі тэкст і функцыі інтэртэкстуальных кампанентаў. Істотную ролю пры аналізе гэтых праблем адыгрывае пытанне пра адзінкі інтэртэкстуальнасці.

Спосабы ўключэння чужога тэксту лінгвісты вызначаюць як маркеры інтэртэкстуальнасці, сродкі выражэння прэцэдэнтнасці, інтэртэкстуальныя спасылкі і інш.

Мы лічым мэтазгодным выкарыстанне тэрміна «інтэртэкстэма», пад якім будзем разумець «міжузроўневы рэляцыйны (суадносны) сегмент змястоўнай структуры тэксту ..., далучаны ў міжтэкставыя сувязі» [6, с. 11]. Інтэртэкстэма ў нашым разуменні – гэта сродак рэалізацыі інтэртэкстуальных сувязяў, любая праява інтэртэкстуальнасці. Інтэртэкстэма складаецца з тэксту і знака культуры, якія ўваходзяць у арсенал фонавых ведаў прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальна-культурнай супольнасці.

Ва ўзаемадзеянні з катэгорыяй інтэртэкстуальнасці намі разглядаецца тэорыя прэцэдэнтнасці. В.У. Красных і Д.Б. Гудкоў вылучаюць прэцэдэнтныя феномены (ПФ) як родавае паняцце ў адносінах да відавых – прэцэдэнтных тэкстаў, выказванняў, імён, сітуацый [7, с. 104–110]. Іх спектр даволі шырокі і разнастайны: назвы літаратурных твораў і цытаты з іх, імёны персанажаў і гістарычных асоб, гістарычныя падзеі і сітуацыі, выказванні вядомых дзеячаў, афарызмы і г. д.

Прыкметы ідыястылю адлюстроўваюцца ў прынцыпах адбору крыніц інтэртэкставых і прэцэдэнтных адзінак у іх шматлікай разнастайнасці, спецыфічных спосабах іх увядзення ў моўную тканіну тэксту, асаблівасцях камбінацый у межах аднаго твора, характэрным рэпертуары функцый і інш. Ю.М. Лотман адзначаў: «Адзін тэкст падаецца як суцэльнае апавяданне, а другія ўводзяцца ў яго ў спецыяльна фрагментарным выглядзе (цытаты, спасылкі, эпіграфы і г. д.). Лічыцца, што чытач разгорне гэтае зерне іншых структурных канструкцый у тэксты. Такія ўключэнні могуць чытацца і як аднародныя з тэкстам, які іх акружае, і як разнародныя з ім» [8, с. 159]. Ю.М. Лотман для такіх выпадкаў выкарыстоўвае тэрмін «тэкст у тэксце» [9], які суадносіцца з усёй культурнай прасторай, але ў той жа час звужаецца да дыялогу канкрэтных тэкстаў.

Распазнаванне чытачом вызначанага ўласнага імені прадугледжвае і веданне далучанага да яго прэцэдэнтнага тэксту ці сітуацыі. Культурным кампанентам у такім выпадку выступае частка лексічнага значэння слова. Пры гэтым, дзякуючы асацыятыўна-сэнсавым парадыгматычным і сінтагматычным сувязям слова ў тэксце, уласнае імя паведамляе пра рознае індывідуальна-аўтарскае і эмацыйна-ацэначнае ўспрыняцце.

